Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

Гістарычны факультэт

Кафедра гісторыі Беларусі

(рэг. № УМ 27-01-37 2014 ________)
26.06.2014

| | |
|---|---|
| УЗГОДНЕНА | УЗГОДНЕНА |
| Загадчык кафедры | Дэкан гістарычнага факультэта |
| ________________А.М. Люты | ________________М.М. Забаўскі |
| 18.03.2014, пр. № 9 2014 г. | 20.03.2014 Пр. № 7. 2014 г. |

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ**

**Інтэграваны модуль "Гісторыя"**

**для спецыяльнасцей профіля А - педагогіка**

Складальнік: дацэнт кафедры гісторыі Беларусі,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт Рацько А.Ф.

Разгледжана і зацверджана
на паседжанні Савета БДПУ 26 06 2014 г. пратакол № 9

**Оглавление**


ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА ........ 5

ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ........ 6

Тэма 1. Уводзіны. ........ 6

1. Прадмет, задачы і змест курса “Гісторыя Беларусі”. ........ 6

2. Крыніцы вывучэння гісторыі Беларусі. ........ 9

3. Перыядызацыя айчыннай гісторыі ........ 11

Тэма 2. Цывілізацыйная спадчына старажытнага свету, сярэдніх вякоў і Беларусь ........ 13

1. Старажытнае грамадства Беларусі. ........ 13

2. Балты і славяне ў VI-IX стст. Усходнеславянскія саюзы плямён ........ 16

3. Першыя княствы-дзяржавы на беларускіх землях. Палітычнае і сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель ў IX–XIII стст ........ 18

4. Беларусь у часы Вялікага Княства Літоўскага. ........ 23

5. Культура ўсходніх славян у эпоху ранняга сярэднявечча. ........ 29

Тэма 3.1. Беларусь у складзе Рэчы Паспалітай. ........ 33

1.Утварэнне Рэчы Паспалітай ........ 34

2. Асаблівасці фарміравання канфесійных адносін на тэрыторыі Беларусі ў XVI–XVII стст. ........ 36

3. Эканамічны і палітычны стан беларускіх зямель у XVI – XVIII ст. ........ 40

4. Культура беларускага народа ў XVII–XVIII стст. ........ 45

Тема 3.2. Беларусь у складзе Расійскай дзяржавы. ........ 49

1.Асноўныя напрамкі палітыкі самадзяржаўя ў Беларусі ў першай палове XIX ст. ........ 49

2. Расійскі шлях палітычнай і эканамічнай мадэрнізацыі (другая палова XIX – пачатак XX ст.) ........ 51

3. Грамадска-палітычнае жыццё Беларусі ў пачатку XX ст. ........ 56

4. Беларускі нацыянальна-культурны рух. ........ 58

5. Культура Беларусі XIX – пачатку XX ст. ........ 61

Тэма 4.1. Станаўленне беларускай дзяржаўнасці. Усталяванне савецкай грамадска-палітычнай сістэмы ў Беларусі (20-30-я гг. XX ст.) ........ 69

1.Утварэнне Беларускай Народнай Рэспублікі. .......... 69
2. Стварэнне беларускай савецкай дзяржаўнасці. .......... 72
3. Грамадска-палітычнае жыццё БССР. .......... 75
4. Шляхі і метады будаўніцтва індустрыяльнага грамадства ў савецкай Беларусі .......... 77
5. Станаўленне і развіццё савецкай беларускай культуры .......... 81
Тэма 5.1. Заходняя Беларусь у складзе Польскай дзяржавы. .......... 84
1.Рыжская мірная дамова ў гістарычным лёсе беларускага народа. .......... 84
2.Грамадска-палітычнае, эканамічнае, нацыянальна-культурнае становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польскай дзяржавы. .......... 85
3.Рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі. .......... 88
Тэма 6.1. Беларусь у гады Другой сусветнай вайны і Вялікай Айчыннай вайны .......... 92
1.Прычыны і пачатак Другой сусветнай вайны. .......... 92
2.Акупацыя фашысцкай Германіяй Беларусі. Акупацыйны рэжым. .......... 94
3. Баявая дзейнасць партызан і падпольшчыкаў .......... 96
4. Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў .......... 99
5. Вынікі вайны для беларускага народа і яго ўклад у Перамогу над фашызмам. .......... 101
Тэма 7.1. Беларусь у 1945 – 1991 гг. .......... 103
1.Міжнароднае становішча. .......... 104
2.Эканамічнае развіццё БССР. .......... 106
3.Грамадска-палітычнае жыццё ў СССР і БССР .......... 110
4.Адукацыя, навука і культура ў БССР .......... 112
Тэма 8.1. Рэспубліка Беларусь у 1990-2012 гг. .......... 117
1.Абвяшчэнне і ўмацаванне дзяржаўнага суверэнітэту .......... 117
2.Эвалюцыя палітычнай сістэмы ў Рэспубліцы Беларусь .......... 118
3. Эканамічныя пераўтварэнні, пераадоленне крызісу і пераход да ўстойлівага росту. .......... 121
4. Геапалітычнае становішча Рэспублікі Беларусь. .......... 123
5.Адукацыя, навука і культура Рэспублікі Беларусь. .......... 125

ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ .......... 129
ПЛАНЫ СЕМІНАРСКІХ ЗАНЯТКАЎ, ХРАНАЛОГІЯ, ТЭРМІНАЛАГІЧНЫ СЛОЎНІК, ТЭМЫ РЭФЕРАТАЎ .......... 129
Семінар 1.Старажытнае грамадства, ранняе і высокае сярэдневякоўе на тэрыторыі Беларусі (ад старажытных часоў – да другой паловы XIII ст.). .......... 129
Семінар 2. Беларускія землі ў складзе ВКЛ (XIII-XVI стст.) .......... 137
Семінар 3. Беларусь у складзе Рэчы Паспалітай (1569 г. – канец XVIII ст.) .......... 146
Семінар 4. Беларусь у складзе Расійскай дзяржавы(1795-1917 гг.) .......... 156
Семінар 5. Станаўленне беларускай дзяржаўнасці. Усталяванне савецкай грамадска-палітычнай сістэмы ў Беларусі .......... 164
Семінар 6. Беларусь у гады Другой сусветнай вайны і Вялікай Айчыннай вайны .......... 171
Семінар 7. Савецкая Беларусь: дасягненні і праблемы стваральнай працы народа (другая палова 40-х – 80-я гады XX ст.) .......... 177
Семінар 8. Суверэнная Рэспубліка Беларусь ва ўмовах глабалізацыі .......... 182
РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ .......... 190
ДАПАМОЖНЫ РАЗДЕЛ .......... 208
ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА .......... 208
ЗМЕСТ ІНТЭГРАВАНАГА МОДУЛЯ "ГІСТОРЫЯ" .......... 212
ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА .......... 218
МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ .......... 227
ЛІТАРАТУРА .......... 234
ТЭМАТЫКА РЭФЕРАТЫЎНЫХ РАБОТ .......... 237
ПРЫКЛАДНЫЯ ПЫТАННІ ДА ЭКЗАМЕНА ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ .......... 239

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбна-метадычны комплекс складзены ў адпаведнасці з праграмай дысцыпліны “Інтэграваны модуль “Гісторыя” і патрабаванняў Дзяржаўнага адукацыйнага стандарту Рэспублікі Беларусь; прадназначаны для выкладчыкаў, а таксама для студэнтаў спецыяльнасцей профіля А-педагогіка.

Мэта дадзенага вучэбна-метадычнага комплекса – стварыць умовы дзеля найболей эфектыўнай рэалізацыі патрабаванняў адукацыйнай праграмы па гісторыі Беларусі і адпаведнага адукцыйнага стандарта вышэйшай адукацыі.

Вучэбна-метадычны комплекс уключае:

- тэарэтычны раздзел (канспект лекцый па дысцыпліне);
- практычны раздзел (планы семінарскіх заняткаў, храналогію, тэрміналагічны слоўнік, тэмы рэфератаў);
- раздзел кантролю ведаў (кантрольныя тэсты);
- дапаможны раздзел (вучэбная праграма, вучэбна-метадычная карта дысцыпліны, метадычныя рэкамендацыі, пералік вучэбных выданняў).

Праграмны матэрыял дысцыпліны ўключае ў сябе лекцыі і практычныя заняткі, што прадстаўлена ў вучэбна-метадычным комплексе.

Вучэбна-метадычны комплекс разлтчаны на самастойнае выкарыстанне выкладчыкамі і студэнтамі ў працэсе падрыхтоўкі да лекцыйных і семінарскіх заняткаў, а таксама да экзамена.

Вучэбна-метадычны комплекс складзены ў адпаведнасці з рэкамендаванымі тыповым вучэбным планам агульным аб’ёмам дысцыпліны (100 гадзін) і відамі вучэбнай работы.

| Віды вучэбнай работы | Колькасць гадзін |
|---|---|
| Аўдыторныя заняткі:<br>- лекцыйныя<br>- семінарскія | 34<br>18<br>16 |
| Агульная працаёмкасць дысцыпліны | --- |
| Від выніковага кантролю | экзамен |

# 1. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 1.1. КАНСПЕКТ ЛЕКЦЫЙ ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ

### Тэма 1. Уводзіны.

*Кючавыя паняцці:* гісторыя; гісторыя Беларусі; функцыі гісторыі; метады даследавання гісторыі; крыніцы вывучэння гісторыі Беларусі; перыядызацыя айчыннай гісторыі.

**План лекцыі:**

1.Прадмет, задачы і змест курса “Гісторыя Беларусі”.
2.Крыніцы вывучэння гісторыі Беларусі.
3.Перыядызацыя айчыннай гісторыі.

**1. Прадмет, задачы і змест курса “Гісторыя Беларусі”.**

Першапачаткова гісторыя існавала ў форме літаратурнага апісання падзей мінулага і лічылася адным з відаў мастацтва – муза *Klio*.Гісторыя (ад грэч. historia) – апавяданне аб мінулых падзеях, аб тым, што пазнана, што здзейснена.

Статус навукі яна набыла ў XIX ст., калі побач з апісаннем пачала карыстацца навуковымі метадамі даследавання: *агульнанавуковыя* (аналіз, сінтэз, лагічны і інш.); *уласнагістарычныя* (сінхронны, храналагічны, параўнальна-гістарычны, рэтраспектыўны, сістэмны аналіз); *спецыяльныя ці запазычаныя ў іншых навук* (матэматычныя, сацыяльныя, метады сацыяльнай псіхалогіі і інш.).

Прадметам гісторыі з’яўляецца дзейнасць чалавека ва ўсёй яе шматграннасці, прасторавай і часовай канкрэтнасці. Гісторыя Беларусі будзе вывучацца ў кантэксце цывілізацыйнага рэгіянальнага развіцця як складовай часткі ўсходнеславянскай і агульнаеўрапейскай гісторыі.

Задачы гісторыі:

*пазнавальная:*

- збіранне фактаў;
- сістэматызацыя і разгляд фактаў ў сувязі адзін з другім.

- *практычная, або прагнастычная:*

- падзеі мінулага цікавяць не самі па сабе, а з пунктаў пагляду іх уздзеяння на сучаснасць, выкарыстання для лепшай арыентацыі ў будучым.

- *выхаваўчая:*

- фарміраванне навуковага светапогляду;

- выхаванне ў людзей на аснове гістарычных матэрыялаў патрыятызму, інтэрнацыяналізму, маральнасці і г. д.

*Фармацыйны падыход*да вывучэння гісторыі распрацаваны ў межах *марксізму* (К. Маркс, Ф. Энгельс). У аснове яго знаходзіцца матэрыялістычнае тлумачэнне гісторыі, у адпаведнасці з якім галоўнай сферай грамадскага жыцця абвяшчаецца матэрыяльная вытворчасць. *Фармацыя* – гэта ўстойлівы тып грамадства, у аснове якога знаходзіцца пэўны спосаб вытворчасці. *Спосаб вытворчасці*, які ўключае ў сябе *прадукцыйныя сілы* (прадметы, сродкі працы і працоўная сіла) і адпавядаючыя ім *вытворчыя адносіны* (адносіны паміж людзьмі ў працэсе вытворчасці, абмену, размеркавання і спажывання прадуктаў) абвяшчаюцца *базісам* грамадства, які вызначае яго спецыфіку. *Надбудова* (сферы палітыкі, культуры, рэлігіі і г.д.) абвяшчаецца залежнай ад базісу. Усё чалавецтва праходзіць праз некалькі сацыяльна–эканамічных фармацый, якія вылучаюцца на аснове пануючых у пэўным грамадтве вытворчых адносін і правоў уласнасці на сродкі вытворчасці (першабытнаабшчынная, рабаўладальніцкая, феадальная, капіталістычная, а затым пасля пралетарскай рэвалюцыі павінна была прыйсці сацыялістычная-камуністычная). Крыніцай пераходу ад адной фармацыі да другой з’яўляюцца ўнутраныя супярэчнасці ў паміж прадукцыйнымі сіламі, якія пастаянна развіваюцца, і вытворчымі адносінамі, што з’яўляюцца стабільным элементам ў кожнай фармацыі. У перыяды найбольшага абвастрэння эканамічных супярэчнасцяў у грамадстве актывізуецца барацьба паміж сацыяльнымі класамі, якая прыводзіць да *сацыяльных рэвалюцый*, што становяцца непасрэдным штуршком змены фармацый.

*Цывілізацыйны падыход*да вывучэння гісторыі зфарміраваўся ў еўрапейскай сацыяльна-гуманітарнай думцы ў 19-20 стст. (М. Данілеўскі, А. Тойнбі, О. Шпенглер). У ім у якасці асноўнай адзінкі сацыяльнага быцця вылучаецца цывілізацыя. У аснову *цывілізацыйнага падыходу* пакладзены не вытворчыя адносіны, а чалавек з яго запатрабаваннямі, здольнасцямі, воляю і ведамі. Цывілізацыя – гэта ўзровень грамадскага развіцця, яго матэрыяльнай і духоўнай культуры. Пад цывілізацыяй маецца на ўвазе буйное аб’яднанне

чалавечага грамадства на пэўнай тэрыторыі, якое ўзнікае ў выніку рознабаковай дзейнасці людзей. Дзейнасць гэта ўключае ўсе сферы жыцця: гаспадарку, рэлігію, культуру, дзяржаву.

Розныя даследчыкі налічваюць ад 8 да 21 цывілізацыі. Да гэтага часу адсутнічаюць адзіныя крытэрыі вылучэння цывілізацый. У аснову аналізу звычайна ставяцца рысы культуры, а эканамічныя і палітычныя асаблівасці прасочваюцца не толькі колькасна, але і змястоўна. Даследчыкі на прыкладзе жыцця культур адрозніваюць агульныя стадыі, якія праходзяць цывілізацыі: нараджэнне, росквіт, заняпад ці вясна, лета, восень, зіма.

Вучоныя ўжываюць лакальны тэрмін “*цывілізацыя*” у сэнсе – асобны народ ці супольнасць народаў, асобная краіна, асобная культура, асобны кантынент і нават зямная цывілізацыя.

Вылучаецца асобная *ўсходнеславянская цывілізацыя*, у якую трапляе і Беларусь. Дакладнай методыкі класіфікацыі цывілізацый не існуе. Гісторыя адных расквечваецца станоўчымі характарыстыкамі гістарычных фактаў, з’яў працэсаў і асоб. Гісторыя другіх “нецывілізаваных” множыцца негатыўнасці інфармацыяй і антыгероямі.

Такім чынам, фармацыйны і цывілізацыйны падыходы да гісторыі прадстаўляюць гістарычны шлях народаў як лінейнае ўзыходжанне ад ніжэйшых формаў да вышэйшых.

Існуе яшчэ адзін падыход да гісторыі – *сінергетычны.* У 1973 г. нямецкі фізік Герман Хакен, які вывучаў эфекты самаарганізацыі ў лазерным выпраменьванні, увёў тэрмін “*сінергетыка*” (ад грэч. synergeia – сумеснае, саглааванае дзеянне). Гэты дыялектычны метад пазнання мае ўніверсальны характар, у тым ліку ўжываемы і для пасціжэння заканамернасцяў развіцця грамадства. У нашыя дні сінергетыка ўсё часцей адыгрывае ролю скразной междысцыплінарнай тэорыі, актыўна ўваходзіць у метадалогію сучаснай гістарычнай навукі.

Сінергетычны падыход заснаваны на такіх паняццях як нелінейнасць, няўстойлівасць, непрадбачанасць, альтэрнатыўнасць развіцця. Гісторыкаў такі падыход прыцягвае новым поглядам на развіццё няўстойлівых сітуацый у гістарычным працэсе. Патрабуецца ўлічваць уплыў на гістарычны працэс align рознага кшталту выпадковасцей, малых уздзеянняў, якія прынцыпова немагчыма прадбачыць і спрагназаваць. У рамках класічных падыходаў панавалі прынцыпы дэтэрмінізму, а ў сінергетыцы ідэя эвалюцыйнага падыходу спалучаецца з ідэяй шматварыянтнасці гістарычнага працэсу.

Вывучэнне “Гісторыя Беларусі” будзе весціся па перыядах ці тэмах, а ў сярэдзіне іх – па праблемах. Курс разлічаны на 34 гадзіны, з якіх 18 гадзін – лекцыі, 16 – семінарскія заняткі.

**2.Крыніцы вывучэння гісторыі Беларусі.**

*Крыніцы* па гісторыі Беларусі вельмі разнастайныя па форме, зместу і дакладнасці інфармацыі. Гісторыкі карыстаюцца некалькімі тыпамі крыніц. Кожны тып, у сваю чаргу, можа падзяляцца на больш дробныя састаўныя часткі.

*Археалагічныя крыніцы.* Гэты тып крыніц – асноўны для даследчыкаў да з’яўлення крыніц пісьмовых. Аднак і з існаваннем пісьмовых крыніц археалагічныя не страчваюць сваей вагі ў вывучэнні гістарычных падзей да XV-XVII ст. Да археалагічных крыніц адносяць: рэшткі старажытных паселішчаў, стаянак, гарадзішчаў, гарадоў; выкапнёвыя прылады працы, прадметы побыту, хатняе начыненне, адзенне; горныя выпрацоўкі, гідратэхнічныя збудаванні, палі старажытнага земляробства, дарогі; зброю, абарончыя збудаванні; магільнікі і інш. На ўсёй тэрыторыі Беларусі зарэгістравана каля 6 тысяч буйных археалагічных помнікаў, што ахопліваюць храналагічны перыяд ад часоў першых пасяленцаў (каля 100-40 тыс. гадоў да н.э.) і да XV ст.

*Тапанімічныя крыніцы.*Тапонімы – гэта назвы геаграфічных аб’ектаў. Яны былі дадзены яшчэ ў самыя старажытныя часы, захоўваючы звесткі пра этнічны склад старажытнага насельніцтва тэрыторыі, найбольш распаўсюджаныя яго заняткі. Так, існаванне падсечна-агнявой (ляднай) сістэмы земляробства знайшло адлюстраванне ў назвах населеных пунктаў Ляды, Чысць. Ад старадаўніх промыслаў і рамёстваў атрымалі назвы пунктаў Рудня, Кавалі, Пушкары. Ў 20-я – 60-я г. XX ст. праводзілася палітыка перайменавання паселішчаў. Шмат весак і гарадоў, што мелі нязвучныя назвы, страцілі іх. Так каля 1000 старадаўніх назваў населеных пунктаў зніклі з карты Беларусі. У выніку каштоўнасць гэтага тыпу крыніц значна знізілася.

*Помнікі пісьменнасці.* Пісьменнасць ва ўсходніх славян звязана з увядзеннем братамі Кірылам і Мяфодзіем у 863 г. кірылічнай азбукі, якая пакладзена ў аснову алфавітаў сучаснай беларускай, рускай і ўкраінскай моў.

*Раннія пісьмовыя крыніцы* – гэта «Аповесць мінулых гадоў», Лаўрэнцьеўскі, Іпацьеўскі, Радзівілаўскі летапісы, «Руская праўда», «Слова аб палку Ігаравым» і інш. дакументы. У іх мы знаходзім самыя раннія звесткі пра гарады Полацк, Тураў, Брэст, Мінск, Друцк, аб рассяленні ўсходніх славян на

тэрыторыі Беларусі, іх гаспадарчай дзейнасці, грамадскім ладзе. Разам з археалагічнымі крыніцамі яны даюць досыць поўнае ўяўленне аб жыцці і занятках насельніцтва старажытнай Беларусі.

*Беларускія летапісы* складаліся ў межах Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ў XIII-XVI стст. на старажытнарускай, старабеларускай і польскай мовах. Ранні этап беларускага летапісу прадстаўлены кароткімі летапіснымі рэдакцыямі. Гэта Супрасльскі, Увараўскі, Познанскі, Нікіфараўскі, Слуцкі, Акадэмічны летапісы. Да падрабязных летапісаў адносяцца «Хроніка Вялікага Княства Літоўскага і Жамойцкага», «Летапіс Быхаўца». Яны адлюстроўваюць заканчэнне працэсу этнічнай, палітычнай і эканамічнай кансалідацыі беларускіх земляў, што адбылася да XVI ст. Летапісы канца XVI-пачатку XVII ст. (Баркулабаўскі летапіс, Віцебскі летапіс) аб беларускіх землях гавораць як аб адзіным палітычным і эканамічным рэгіёне.

*Мемуарная літаратура і дзённікі* ўтрымліваюць вельмі каштоўныя звесткі аб настроях, якія панавалі ў грамадстве ў тыя часы, аб спосабах вядзення гаспадаркі ў кожным канкрэтным маёнтку, якім валодаў аўтар.

*Статыстычныя даведнікі* выдаваліся ў межах Расійскай імперыі з пачатку XIX ст. Адзін з першых даведнікаў: «Статистическое изображение городов и посадов Российской империи по 1825 год» (1829 г.) утрымліваў дакладныя звесткі аб эканамічным стане беларускіх гарадоў. Друкаваліся спецыялізаваныя даведнікі, яны ахоплівалі розныя сферы гаспадарчага развіцця («Фабрично-заводская промышленность России. Перечень фабрик и заводов» (1897 г.); «Статистика землевладений в 1905 г.» (1906-1907 гг.), а таксама матэрыялы рэвізій конскіх перапісаў і ўсеагульнага перапісу насельніцтва Расійскай імперыі 1897 г.

У савецкі перыяд перш за ўсё выдаваліся статыстычныя даведнікі па выніках кожнай пяцігодкі ці да юбілеяў існавання савецкай улады («Советская Белоруссия», 1921 г.; «Белорусская ССР в цифрах. К 10-летию существования БССР. 1919-1929 гг.», 1929 г.; «Ітогі першай пяцігодкі БССР», 1934 г.; «Белорусская ССР за годы Советской власти», 1967 г.; «Народное хозяйство Белорусской ССР. Юбилейный статистический ежегодник», 1978 г. і г.д.). Да кожнага з іх трэба падыходзіць творча і крытычна.

**3. Перыядызацыя айчыннай гісторыі.**

*Перыядызацыя гісторыі* – храналагічныя пласты, выдзеленыя з агульнай масы фактаў, ілюструючыя асобныя этапы эвалюцыі жыцця народа. Яны – своеасаблівы каркас, на якім узнімаецца гістарычны будынак.

*Палітычная перыядызацыя* вылучае перыяды згодна з існаваўшымі на тэрыторыі Беларусі дзяржавамі (В. Ластоўскі, У. Ігнатоўскі, І. Лойка):

Полацкае княства (IX-XIII стст.);

Вялікае Княства Літоўскае (сярэдзіна XIII ст. – 1569 г.);

Рэч Паспалітая (1569–1795 гг.);

Расійская імперыя (1795–1917 гг.);

Савецкая дзяржаўнасць (1917–1991 гг.);

Незалежная Рэспубліка Беларусь (з 1991 г.).

*Фармацыйная перыядызацыя* была пануючай у савецкай гістарычнай навуцы; згодна з ёй вылучаюцца перыяды гісторыі Беларусі ў адпаведнасці з панаваннем той ці іншай фармацыі:

першабытнае грамадства (да IX ст.);

феадальнае грамадства (IX ст. – 1861 г.);

капіталістычнае грамадства (1861–1917 гг.);

сацыялістычнае грамадства (з 1917 г.).

*Універсальная перыядызацыя* падзяляе гістарычны працэс ва ўсім свеце на наступныя кавалкі:

Першабытнае грамадства (3,5 млн. гадоў назад – V ст. н.э.);

Сярэднія вякі (V–XV стст.);

Новы час (XVI ст. – 1918 г.);

Найноўшы час (1918 г. (канец Першай сусветнай вайны) – да сённяшняга дня).

*Першабытнае грамадства;* характарыстыка:

- панаванне абшчыннага тыпу грамадскага ўладкавання;
- выкарыстанне прымітыўных тэхналогій ў гаспадарцы;
- панаванне традыцый ў сацыяльным жыцці.

*Сярэднія вякі*; характарыстыка:

- фарміраванне класавага грамадства і ўзнікненне дзяржаўнасці;
- развіццё феадальнай сістэмы, карпаратыўнасць сацыяльнага жыцця;
- перавага сельскай гаспадаркі ў эканоміцы;
- панаванне рэлігіі і традыцый у духоўнай сферы жыцця грамадства.

*Новы час*; характарыстыка:

- цэнтралізацыя і фарміраванне нацыянальных дзяржаў;

- індустрыялізацыя, хуткае развіццё навукова-тэхнічнага прагрэсу;
- генезіс і зацвярджэнне капіталістычных адносін;
- урбанізацыя;
- фарміраванне свецкіх культурных каштоўнасцяў.

*Навейшы час*; характарыстыка:
- глабалізацыя;
- навукова-тэхнічная рэвалюцыя;
- фарміраванне постіндустрыяльнага, інфармацыйнага грамадства.

**Кантрольныя пытанні і заданні для самападрыхтоўкі студэнтаў:**

1. Адкажыце, якімі навуковымі метадамі даследавання карыстаецца гісторыя?
2. У чым сутнасць фармацыйнага, цывілізацыйнага і сінергетычнага падыходаў да вывучэння гісторы?
3. Вызначце асноўныя метады гістарычнай навукі і дайце іх характарыстыку.
4. Пералічыце крыніцы па гісторыі.
5. Прывядзіце прыклад перыядызацыі гісторыі Беларусі.

**Літаратура:**

1. Беларусь: страницы истории / редсовет: А.А. Коваленя [и др.]. – Минск, 2011.
2. Гісторыя Беларусі: у 6 т. – Мінск, 2000–2006. – Т. 1: Старажытная . Беларусь: ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст.; Т. 2: Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага; Т. 3: Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (ХУІІ–ХУШ стст.); Т. 4: Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.); Т. 5: Беларусь у 1917–1945 гг. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.].
3. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. / А.А. Каваленя [і інш.] ; рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.]. – Мінск, 2011. – Кн. 1.
4. Иллюстрированная хронология истории Беларуси. – Минск, 1998.
5. Ходзін, С. М. Крыніцы гісторыі Беларусі (гісторыка-генетычнае і кампаратыўнае вывучэнне) : вучэбны дапаможнік / С. М. Ходзін. – Мінск, 1999.

## Тэма 2. Цывілізацыйная спадчына старажытнага свету, сярэдніх вякоў і Беларусь

*Кючавыя паняцці:* археалагічная перыядызацыя; прысвайваючая гаспадарка; родавая абшчына; індаеўрапейцы; балты; славяне; канцэпцыі паходжання беларусаў; Кіеўская Русь; раннекласавае грамадства; горад; Полацкае і Тураўскае княствы; полацкая княская дынастыя;асаблівасці грамадска-палітычнага ладу Тураўскага княства; паганства; хрысціянства; Вялікае Княства Літоўскае; Крэўская ўнія; Статуты ВКЛ; “Валочная памера”; вусная народная творчасць; помнікі пісьменнасці; архітэктура.

**План лекцыі:**

1. Старажытнае грамадства ў Беларусі.
2. Балты і славяне ў VI–IX стст.
3. Першыя дзяржавы-княствы. Палітычнае і сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель ў IX–XIII стст.
4. Беларусь у часы Вялага Княства Літоўскага.
5. Культура ўсходніх славян у эпоху сярэднявечча.

### 1. Старажытнае грамадства Беларусі.

У гісторыі першабытнага грамадства ў залежнасці ад выкарыстання таго ці іншага матэрыялу для вырабу прылад працы вылучаюць тры асноўныя перыяды:

1) каменны век (**3,5 млн. гадоў назад – канец 3-га тысячагоддзя да н. э.**);

2) бронзавы век (**пачатак 2-га тысячагоддзя да н. э. – канец VIII ст. да н.э.**);

3) жалезны век (**VII ст. да н. э. – канец V ст. н.э.**).

У сваю чаргу каменны век падзяляецца на эпохі. Першая з іх – старажытны каменны век, або *палеаліт.* Палеаліт падзяляецца на: *ранні (ніжні)* – **3,5 млн. гадоў назад – 100 тыс. гадоў да н.э.**; *сярэдні (мусцье)* – **100-35 тысяч гадоў да н. э.**; *верхні (позні)* – **35-9 тысяч гадоў да н. э.** За палеалітам ідзе *сярэдні каменны век (мезаліт)* – **9-5 тысяч гадоў да н. э.** Апошняя эпоха каменнага веку – *новы каменны век (неаліт)* – **канец 5-га – 3-е тыс. да н.э.**

На *каменны век* прыпадае пяць зледзяненняў тэрыторыі Беларусі, калі са Скандынаўскага паўвострава насоўваліся 2-кіламетровыя тоўшчы ільда. Першыя два, *беларускае* (600–560 тыс. назад) і *бярэзінскае* (480–460 тыс.

гадоў назад), пашкадавалі толькі поўдзень краіны. Трэцяе, самае магутнае і працяглае, *дняпроўскае* (320–250 тыс. гадоў назад), ахапіла ўсю тэрыторыю сучаснай Беларусі. Чацвертае, *сожскае* (220–110 тыс. гадоў назад), займала большую палову края. Пятае, *паазёрскае* (95–10 тыс. гадоў назад), пакрыла поўнач рэспублікі. Суадносна наступлення і адступлення ледавікоў мянялася ўсё прыродна-геаграфічнае асяроддзе.

Самыя раннія археалагічныя знаходкі Беларусі адносяцца да сярэдняга палеаліта. Гэта тры крамянёвыя прылады неандэртальскага чалавека: 1) *скрэбла-нож* каля вёскі Бердыж Чачэрскага раёна Гомельскай вобласці; 2) *востраканечнік* каля вёскі Свяцілавічы Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці; 3) *скрэбла* каля вёскі Абідавічы Быхаўскага раёна Магілёўскай вобласці.

На жаль, уладальнікаў знойдзенных прылад і іх паселішчаў пакуль не выяўлена. Знаходкі не маюць выразнай геалагічнай прывязкі і спадарожнай арганікі, што не дазваляе іх дакладна даціраваць. Вось чаму нельга сцвярджаць, але можна меркаваць, што неандэртальцы былі першымі жыхарамі Беларусі.

*Неандэртальцы* (назва паходзіць ад ракі Неандэр у Германіі) ростам былі 155–165 см. Абліччам прысадзістыя, моцнага целаскладу. Галава мела пакаты лоб, выступаючыя надвочныя валікі і скошаны падбародак. Жылі першабытным статкам.

40–35 тысячагоддзяў назад адна з галін неандэртальцаў развілася ў чалавека сучаснага – *краманьёнца* (назва паходзіць ад пячоры Кро-Маньён у Францыі). Пачаўся верхні палеаліт. Першыя сучасныя людзі стварылі за 100 відаў прылад працы. Авалодалі скульптурай, графікай, жывапісам, танцам, музыкай. Сярод найбольш вядомых прадметаў мастацтва вылучаюцца жаночыя статуэткі, так званыя Старажытныя Венеры. Прызначэнне мастацтва краманьёнцаў невядома. Верагодна яго выкарыстанне для культурных і адукацыйных мэт. Магчыма, яно напоўнена магічным ці містычным сэнсам. Не выключана адлюстраванне першых рэлігій: 1) *анімізма* – веры ў існаванне духаў і душы; 2) *фецішызма* – веры ў цудадзейную сілу асобных матэрыяльных прадметаў; 3) *татэмізма* – веры ў звышнатуральнае сваяцтва людзей і канкрэтнай жывёлы або расліны.

З высокімі інтэлектуальнымі здольнасцямі краманьёнцаў звязана асэнсаванне кроўнага сваяцтва, якое стала асновай грамадскай арганізацыі. Спачатку сваяцтва вызначалася па мацярынскай лініі. Узнік *матрыархат*.

Сфарміравалася парная сям'я. Сваяцкія па лініі маці сем'і складалі экзагамны род (родавую абшчыну). Усе члены рода валодалі роўнымі правамі.

У Беларусі адкрыты дзве краманьёнскія *стаянкі* на Гомельшчыне каля вёсак Бердыж Чачэрскага раёна і Юравічы Калінкавіцкага раёна. Юравіцкая стаянка з'яўляецца найбольш раннім помнікам першых сучасных людзей. Яе ўзрост складае 26 тысячагоддзяў.

10 тысячагоддзяў таму завяршылася ледавіковая эпоха. Старажытнакаменны век змяніўся *мезалітам*. Клімат, раслінны і жывёльны свет набывалі сучасны выгляд. Беларусь усё гусцей пакрывалася лесам. У ім валадарылі высакародныя алені, ласі, дзікі, туры, мядзведзі і іншыя лясныя звяры. Адступаючы, ледавік стварыў густую сетку азёр, рэк, балот – прыстанішча разнастайных відаў рыб, вадаплаваючых птушак і жывёл.

Стабілізацыя новага асяроддзя спыніла сезонныя міграцыі насельніцтва. На сёння знойдзена за 120 мезалітычных паселішчаў. Па распаўсюджанню агульных элементаў матэрыяльнай і духоўнай культуры археолагі вызначаюць з'яўленне *плямён* – устойлівых аб'яднанняў некалькіх родаў, звязаных кроўнымі сувязямі. Падчас мезаліта людзі вынайшлі ўкладышавую тэхніку вырабу прылад працы (нажы, сякеры). Шырока выкарыстоўвалі *лук і стрэлы*, вуды з касцянымі кручкамі, разнастайныя пасткі. Вядомы знаходкі першых выдзеўбаных з камля дрэва чаўноў. Узрасла роля збіральніцтва і рыбалоўства.

Найпершай адзнакай *неаліта* Беларусі стала керамічная вытворчасць вострадонных гаршкоў. Яны ўтыкаліся ў зямлю або ў агнішча. *Жывёлагадоўля* пачыналася з прыручэння жывёлаў. Затым перайшлі да спецыяльнага развядзення свіней, кароў, авечак, коз, коней. Пільнаваць статкі дапамагаў сабака. Першай зерневай культурай лічыцца ячмень. Пазней сталі вырошчваць жыта, проса, лён. Палеткі апрацоўвалі драўлянымі і рогавымі матыкамі. Адсюль паходзіць і назва архаічнага *земляробства* – матычнае.

Пачатак *бронзавага веку* звязваюць з прыходам індаеўрапейскіх народаў шнуравой керамікі ці баявых сякер. Прарадзімай *індаеўрапейцаў*, згодна найбольш абгрунтаванай канцэпцыі, з'уляецца Малая Азія (сучасная Турцыя). Адсюль на рубяжы 4–3 тыс. да н. э. пачалося Вялікае перасяленне старажытных індаеўрапейцаў, якое захапіла і Беларусь. Плямёны шнуравікоў распаўсюдзіліся ад ракі Рэйн на захадзе Еўропы да Уральскіх гор на ўсходзе, ад Прычарнамор'я на поўдні да Скандынавіі на поўначы. Яны сталі асновай фарміравання славянскіх, балцкіх і германскіх народаў.

З рассяленнем індаеўрапейцаў змянілася гаспадарка. З'явіліся металургія, апрацоўка, выкарыстанне медзі і бронзы. Нашы першыя металы пераважна прыкарпацкага і каўказкага паходжання, таму іх нешмат. Дамінавалі вырабы з костак і каменя. Вядучае становішча ў гаспадарцы занялі жывёлагадоўля і *лядна-агнявое (падсечна-агнявое, падсечнае,ляднае) земляробства.*

Духоўнае жыццё насельніцтва Беларусі бронзавага веку ўзбагацілася новымі індаеўрапейскімі светапогляднымі традыцыямі. На першы план выйшлі культ Сонца і агню. Пра гэта сведчыць абрад спальвання нябожчыкаў, абпальвання месца яго пахавання, над якім узводзіўся курган. Арнамент глінянага посуду набыў магічныя фігуры нябесных свяціл, агню, плоднасці.

*Ранні жалезны век Беларусі* характарызуецца з'яўленнем металургіі – ажалеза з балотнай і лугавой руды. Гэта сыравіна шырока распаўсюджана. Яе перапрацоўка не ўяўляла складанасці. Вось чаму жалезныя вырабы хутка і амаль цалкам выцеснілі каменныя.

Жалезныя прылады дазволілі рэзка павысіць вытворчасць працы. Распаўсюдзілася *ворыўнае земляробства*з выкарыстаннем *драўлянага рала (плуга).* Такое рала знойдзена ля вёскі Капланавічы Клецкага раёна Мінскай вобласці. Яно мела даўжыню каля 2,6 метраў. Выглядала круком, які ўтваралі частка ствала і сук дрэва. З часам з'явіліся металічныя наральнікі. У жывёлагадоўлі перавагу аддавалі рабочай жывёле – валу, быку, коням. Іх выкарыстоўвалі ў якасці цяглавай сілы пры апрацоўцы зямлі. З дапамогай жалезных інструментаў удасканальваўся рамёслы промысел.

У духоўным жыцці насельніцтва ранняга жалезнага веку фарміруецца *пантэон Багоў.* З'явіліся свяцілішча – культавыя збудаванні для ўшанавання звышнатуральных апекуноў чалавечага жыцця. Яны былі чатырохвугольныя ці круглыя ў плане. Мелі падмазаную глінай падлогу, гліняныя агнішчы-ахвярнікі.

## 2. Балты і славяне ў VI-IX стст. Усходнеславянскія саюзы плямён.

З эпохі бронзы (2-е тыс. да н.э.) тэрыторыя Беларусі была заселена балтамі, якія паходзілі ад індаеўрапейцаў. Жылі *балты* ў паўзямлянках зрубной канструкцыі на адкрытых неўмацаваных селішчах і ўмацаваных гарадзішчах. У цэнтры жытлаў размяшчаліся адкрытыя агнішчы, печы-каменкі круглай або авальнай формы. Гарадоў у балтаў да прыходу славян не было. Галоўнымі заняткамі балтаў было земляробства і жывёлагадоўля.

З **V-га па VIII-е ст. н.э.** тэрыторыя Беларусі зведала новыя міграцыйна-этнічныя перамены, звязаныя з прыходам і масавым рассяленнем на беларускіх землях усходняй галіны славянскіх плямёнаў. У час славянскага рассялення балты ў асноўным не пакідалімесцаў свайго пражывання. Можна меркаваць, што ўзаемаадносіныіх былі мірнымі. Яны пэўны час жылі на адной тэрыторыі, штопрывяло да іх змешвання, канчатковым вынікам чаго стала славянізацыя балтаў.

У выніку славяна-балцкага сінтэзу ў **VIII–X стст.** у ВерхнімПадзвінні і Падняпроўі сфарміравалісяўсходнеславянскія этнічныясупольнасці *(пранароднасці*), якія названы ў пісьмовых крыніцах, упрыватнасці, у старажытнарускім летапісу "Аповесць мінулыхчасоў", – дрыгавічы, радзімічы і крывічы – прабеларускіяўтварэнні, у якіх пераважалі славянскія рысы і якія займалісвоеасабліваe становішча сярод усходнеславянскіх этнасаў рускіх іўкраінцаў.

*Дрыгавічы* займалі тэрыторыю ад Папрыпяцця да вярхоўяў Нёмана. Сваю назву, згодна аднага з меркаванняў, атрымалі ад балоцістай мясцовасці пражывання – дрыгвы. Па іншай версіі, найменне «дрыгавічы» утварылася ад асабовага імя Драг ці Драгавіт. Летапіс падкрэслівае паходжанне дрыгавічоў ад старажытных славян, якія прыйшлі з Падунаўя, належылі да ўсходнеславянскай моўнай групы, жылі ў міры з іншымі славянскімі народамі.

Характэрнай археалагічнай адзнакай дрыгавічоў лічацца вялікія *медныя ці сярэбраныя зярнёныя пацяркі*. Рабіліся яны ажурныя (з дроту) ці суцэльныя. Мелі цыліндрычную, авальную або круглую форму. Былі ўпрыгожаны напаянымі дробненькімі сярэбранымі шарыкамі – зерню. Яшчэ адна этнавызначальная адзнака дрыгавічоў – скроневыя кольцы з круглага дроту, на якіх замацоўваліся па тры зярнёныя пацеркі невялікага памеру.

*Крывічы-палачане* ўваходзілі ў вялікае аб’яднненне разам з крывічамі смаленскімі і пскоўскімі (паводле назваў іх галоўных гарадоў). Для крывічоў-палачан характэрна археалагічная культура Доўгіх курганаў паўночнай Беларусі. Этнавызначальнымі з’яўляюцца *бранзалетападобныя драцяныя скроневыя кольцы* з завязанымі канцамі дыяметрам 5–11 см. Назва «крывічы» тлумачыцца па-рознаму: ад прозвішча легендарнага родапачынальніка ці правіцеля Крыў (Крыва) ці язычніцкага першасвяшчэнніка Крыва-Крывейтэ, ад слова «крэўныя» (блізкія па крыві, у сэнсе параднёныя), ад узгоркавай мясцовасці пражывання – крывізны.

*Радзімічы,* згодна «Аповесці мінулых гадоў», прышлі з ляшскіх (польскіх) зямель. Рассяліліся ў Пасожжы. Назву атрымалі ад імя свайго правіцеля Радзіма. Летапіс расказвае, што жылі радзімічы ў лясах быццам дзікуны. Спажывалі брудную ежу. Брыдкасловілі перад бацькамі і нявесткамі. Збіраліся на ігрышча, дзе танцавалі і спявалі. Тут выкрадалі сабе жонак, якіх мелі па 2–3. З суседзямі падтрымлівалі мірныя адносіны.

Этнавызначальнымі для радзімічаў служаць рознакаляровыя пацяркі ў спалучэнні з разнастайнымі прывескамі, а таксама бронзавыя або сярэбраныя *7-промневыя скроневыя кольцы*. Колькасць кольцаў вагалася ад аднаго да васьмі.

Славянская каланізацыя беларускіх зямель V–IX ст. амаль не закранула Панямонне на поўнач да вярхоўяў Віліі і на поўдзень да Заходнега Буга. Гэтыя рэгіёны былі ахоплены міграцыяй балтыйскіх народаў. На Нёманска-Заходнебугскай тэрыторыі (Беларускае Пабужжа) жыў заходнебалтыйскі народ *яцвягаў.* Яцвяжская мова не зберaглася. Некаторыя вучоныя лічаць яе пераходнай паміж балцкімі і славянскімі мовамі. У заходняй частцы Беларусі пражывалі таксама балцкія плямёны*літва, нальшчаны, дзяволтва* і інш.

### 3. Першыя княствы-дзяржавы на беларускіх землях. Палітычнае і сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель ў IX–XIII стст.

У **IX ст.** на аснове племяннога княжання крывічоў–палачан узнікла *Полацкае княства*. Яно ахоплівала паўночную і часткова цэнтральную частку сучаснай Беларусі. Цэнтрам княства становіцца Полацк – самы першы горад на тэрыторыі Беларусі, які ўзгадваецца ў летапісах пад **862 г.** Полацкае княства размяшчалася на *гандлёвых шляхах "з вараг у грэкі"* і кантралявала частку гэтых шляхоў уздоўж Заходняй Дзвіны і міжрэчча Дзвіны і Дняпра.

Полацкае княства перыядычна падтрымлівала саюзныя адносіны з іншымі славянскімі княствамі ва Ўсходняй Еўропе, буйнейшыя з якіх мелі цэнтры ў Кіеве і Ноўгарадзе. На чале гэтых славянскіх княстваў часта знаходзіліся варажскія (скандынаўскія) князі са сваімі дружынамі. Часам Полацк трапляў у непасрэднае падпарадкаванне гэтых княстваў. Палачане ў якасці саюзнікаў нярэдка прымалі ўдзел ў набегах славян і варагаў на сталіцу Візантыі – Канстанцінопаль. Пасля аднаго з іх, у **907 г.** сярод шэрагу князёў, якія атрымалі долю здабычы, узгадваецца полацкая князёўна – Прадслава.

У другой палове X ст. буйнейшай дзяржавай ва Ўсходняй Еўропе стала *Кіеўскае княства*. Пастулова яе князі шляхам ваенных захопаў або дагавораў

з мясцовымі князямі падначалілі сваёй уладзе большасць іншых славянскіх дзяржаў у рэгіёне. На чале Кіеўскай дзяржавы знаходзілася дынастыя варажскіх князёў – Русь, першым прадстаўніком якой з’яўляўся *Рурык*. Паступова паняцце *“Русь”* пачынае ахопліваць усе тэрыторыі, на якія распаўсюджвалася ўлада князёў дынастыі Рурыкавічаў. Гісторыкі традыцыйна называюць кангламерат усходнеславянскіх княстваў на чале з вялікім князем з дынастыі Рюрыкавічаў *Кіеўскай Руссю*.

Першым вядомым з летапісных крыніц полацкім князем з’яўляецца *Рагвалод*. Па найбольш верагоднай версіі ён быў варагам, аб чым сведчаць шведскія сагі, па іншых альбо быў крывічом, альбо палабскім ці паморскім славянінам. Падчас міжусобнай барацьбы паміж кіеўскім князем *Яраполкам* і наўгародскім князем *Уладзімірам*, **каля 980 г.**, ён і яго дачка *Рагнеда* становяцца на бок першага. За гэта і асабістую абразу, якую яму нанеслі, адвяргаючы сватаўства да Рагнеды, Уладзімір захапіў Полацк; паводле яго загаду былі забітыя Рагвалод і яго сыны, а Рагнеда гвалтоўна стала яго жонкай.

У канцы Х – пачатку ХІ стст. пад уладай Уладзіміра і яго дынастыі апынулася большасць усходнеславянскіх княстваў, у тым ліку і Полацкае. (канец Х ст.) Па ініцыятыве Уладзіміра ў канцы Х ст. у Кіеве, а потым ва ўсіх падначаленых яму землях пануючай рэлігіяй стала *хрысціянства* ва ўсходняй візантыйскай версіі. З таго часу ўсходняе хрысціянства (праваслаўе) ва Ўсходняй Еўропе называлася “рускай верай”.

У канцы Х ст. (каля 988 г.) было адноўлена *Полацкае княства* ў якасці ўдзельнага княства ў складзе Кіеўскай дзяржавы. На чале яго быў пастаўлены старэйшы сын Уладзіміра ад Рагнеды *Ізяслаў Уладзіміравіч* (**988–1001 гг.**). Паколькі Ізяслаў з’яўляўся непасрэдным нашчадкам Рагвалода, з устанаўленнем яго ўлады звязваецца аднаўленне полацкай княскай дынастыі. Пасля прыняцця Уладзімірам хрысціянства і няўдалага замаху на жыццё князя Рагнеда была астрыжана ў манашкі пад імём *Анастасія* (лічыцца першай манашкай ва Ўсходняй Еўропе) і саслана на Полаччыну, дзе яна памерла ў Ізяслаўскім манастыры ў **1000 г.**

Пасля смерці Ізяслава полацкімі князямі з’яўляліся яго сыны *Усяслаў* (**1001–1003 гг.**) і *Брачыслаў* (**1003–1044 гг.**).

Пасля смерці князя Уладзіміра Святаславіча ў Кіеўскай дзяржаве пачынаецца барацьба за ўладу паміж яго нашчадкамі, адным з якіх быў полацкі князь *Брачыслаў*. Пад яго кіраваннем палачане ў **1021** г. захапілі і разрабавалі г. Ноўгарад. Войска сына Ўладзіміра наўгародскага і кіеўскага

князя *Ярослава Мудрага* дагнала іх на р. Судамір. Пасля ўзброенай сутычкі быў заключаны мір, паводле якога да Полацкага княства былі далучаны Віцебск, Усвяты і валокі паміж Дняпром і Заходняй Дзвіной. Брачыслаў меў поўную ўладу ў Полацкай зямлі. Па сутнасці Полацкае княства аднаўляе сваю дзяржаўную самастойнасць.

Падчас княжання Брачыслава Полацкае княства захоўвала саюзніцкія адносіны з Кіеўскай дзяржавай. Дружыны полацкіх і кіеўскіх князёў сумесна ўдзельнічалі ў паходах на суседнія балцкія землі, у заснаванні Браслава і, верагодна, Навагародка.

Найвялікшага росквіту Полацкае княства дасягнула падчас княжання *Усяслава Брачыслававіча “Чарадзея”* (**1044–1101гг.**). У гэты час абвастраюцца адносіны Полацкага княства з Кіеўскай дзяржавай і падуладнымі ёй княствамі.

У **1065–1066** гг. палачане на чале з Усяславам здзейснілі рабаўнічыя паходы на Пскоў і Ноўгарад. У адказ князі Кіеўскай Русі накіравалі супраць Полацкага княства вялікія сілы, якія спалілі *Менск*. **3 сакавіка 1067 г.** паміж імі і палачанамі адбываецца *бітва на р. Нямізе*, якая скончылася велізарнымі стратамі для абодвух бакоў. Запрошаны на перамовы Ўсяслаў з сынамі быў захоплены ў палон і пасаджаны ў Кіеве ў поруб (турму). У выніку народнага паўстання кіян ў **1068 г.** Усяслаў Чарадзей на 7 месяцаў стаў князем у Кіеве. Але ў 1069 г. быў пазбаўлены пасады і вымушаны змагацца за полацкі трон. У **1071 г.** ён канчаткова вярнуў сабе ўладу ў Полацку. У **1077** і **1084 гг.** адзін з кіеўскіх князёў *Уладзімір Манамах* здзейсніў паходы на Полацк і Менск. У 1078 г. палачане спалілі Смаленск. Полацкае княства ў часы Ўсяслава Чарадзея заставалася палітычна цалкам незалежным.

Яшчэ адным з накірункаў знешняй палітыкі Усяслава з’яўлялася экспанія на землі балцкіх плямёнаў. Полацкае княства ўстанавіла сваю ўладу, якая выяўлялася ў выплаце даніны, над плямёнамі яцвягаў, літвы (на тэрыторыі сучасных усходняй Літвы і заходняй Беларусі), латгалаў і ліваў (на тэрыторыі сучаснай Латвіі). На землях латгалаў ствараюцца славянскія гарады – *Кукенойс і Герцыке.*

Пасля смерці Усяслава ў 1101 г. тэрыторыя Полацкага княства была падзелена на шэраг удзельных княстваў: Віцебскае, Менскае, Ізяслаўскае, Лагойскае, Друцкае, Лукомскае. Пачаўся *перыядфеадальнай раздробленасці*. Кожнае з удзельных княстваў мела ўласныя органы кіравання, войска, падатковую сістэму. У той жа час яны падпарадкоўваліся полацкаму князю (выплата даніны, адзіная знешняя палітыка, сумесныя ваенныя паходы). На

чале ўдзельных княстваў станавіліся князі полацкай дынастыі. Вялікі князь полацкі з'яўляўся свайго роду старшынёй федэратыўнага саюзу князёў Полацкай зямлі.

У першай трэці XII ст. працягваецца барацьба Полацкага княства з Кіеўскай дзяржавай. Найбольш актыўную палітыку, скіраваную супраць Кіева, праводзіў менскі ўдзельны князь *Глеб Усяславіч,* які ў **1116 г.** здзейсніў паход на Слуцк, а ў 1117 г. – на Оршу і Копысь. У выніку паходу кааліцыі князёў на чале з Уладзімірам Манамахам Глеб быў захоплены ў палон, дзе быў атручаны ў **1119 г.**

У **1127 г.** быў арганізаваны вялікі паход на чале з кіеўскім князем *Мсціславам* супраць Полацкай зямлі. Падчас яго былі захоплены Лагойск, Ізяслаўль; Полацкае княства фактычна было падпарадкавана Кіеву. У **1129 г.** шмат удзельных полацкіх князёў разам з сем'ямі былі высланы ў Візантыю, адкуль вярнуліся толькі ў 1139 г.

З 1230-х гг. адбываецца распад Кіеўскай дзяржавы і яна паступова губляе пануючы ўплыў у рэгіёне. У 1132 г. полацкае веча выгнала кіеўскага стаўленіка *Ізяслава* і выбрала на княжанне прадстаўніка полацкай дынастыі *Васільку Святаславіча.*

У XII–XIII стст. у Полацкай зямлі фарміруецца новая сістэма дзяржаўна-палітычнага ладу, якая можа быць ахарактарызавана як *вечавая дэмакратыя.* Асноўнымі органамі дзяржаўнай улады ў Полацкім і ўдзельных княствах з'яўляліся князь – кіраўнік дзяржавы, узначальваў ваенныя сілы і адміністрацыйны апарат, ажыццяўляў суд. Князь абапіраўся на *дружыну* – пастаянную ўзброеныя сілу. Надзвычай важную ролю ў Полацкай зямлі стала адыгрываць веча – агульны сход усіх свабодных дарослых жыхароў княства мужчынскага полу.

Такім чынам, Полацкае княства ў IX – XIII стст. з'ўлялася буйнейшым дзяржаўным утварэннем на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Пасля непрцяглага перыяду палітычнай залежнасці ад Кіеўскай дзяржавы яно на працягу XII – XIII стст. ажыццяўляла самастойную ўнутраную і знешнюю палітыку. Пад уплывам феадальнай раздробленасці ў Полацкім княстве склалася спецыфічная форма дзяржаўна-палітычнага ўладкавання – вечавая дэмакратыя.

Да паўднёвых меж Полацкай зямлі прымыкала *Тураўскае княства.* Яго тэрыторыя ў асноўным адпавядала рассяленню дрыгавічоў. Галоўным горадам быў *Тураў,* упершыню ўзгаданы пад **980 г.** Назва горада звязваецца з імем князя Тура, ад якога насельніцтва празвалась тураўцамі.

У **988** г. Вялікі князь кіеўскі Уладзімір аддаў Тураў свайму прыёмнаму сыну *Святаполку Яраполчычу*. Так закончылась існаванне княжання дрыгавічоў і пачалася гісторыя Тураўскага княства. На працягу каля 150 гадоў сваёй ранняй гісторыі яно займала важнае месца ў сістэме Кіеўскай Русі. Тураўскія князі, як правіла, пераходзілі на кіеўскі вялікакняжыцкі трон.

Святаполк Яраполчыч – першы гістарычна дакладны князь Тураўскага княства. Ён першым сярод усходнеславянскіх князёў выступіў за незалежнасць ад Кіева. Каля 1010 Святаполк жаніўся на дачце польскага князя. Адразу маладыя пачалі рыхтаваць замову супраць Уладзіміра, але няўдала. Былі схоплены і пасаджаны ў кіеўскую турму. Пагроза вайны з Польшай заставіла Уладзіміра вызваліць зняволеных. Праўда, ў Тураў Святаполка не адпусцілі. Пакінулі ў Кіеве пад наглядам. У **1015 г.** Уладзімір памёр, і тураўскі князь заняў кіеўскі трон.

З 1019 па 1042 гг. Тураўскае княства знаходзілася пад уладай Вялікага князя кіеўскага *Яраслава Мудрага*. Затым 70 гадоў (1042–1113) княства належыла дынастычнай лініі старэйшага сына Яраслава Мудрага – *Ізяслава* (*Ізяслаў, яго сыны Яраполк і Святаполк*). Любецкі з’езд **1097 г.** князёў Кіеўскай Русі зацвердзіў праналежнасць Тураўскага княства за дынастычнай лініяй Ізяслава. Але, калі ў **1113 г**. на кіеўскі трон уступіў Уладзімір Манамах, ён не перадаў Тураў нашчадкам Ізяслава, а захаваў за сабой. Да 1158 г. Тураўскае княства належыла Манамахавічам.

У **1158 г.** унук Святаполка Ізяславіча *Юрый Яраславіч* сілай вярнуў Тураўскае княства сваёй дынастыі. Тураўцы яго подтрымалі, адбілі две кіеўскія аблогі. Дынастыя Ізяславічаў і самастойнасць Тураўскага княства аднавіліcь.

*Асаблівасцямі грамадска-палітычнага ладу Тураўскага княства* з’яўляецца наяўнасць пасадніка, тысяцкага і роль веча. Звычайна тураўскія князі пераходзілі на вялікакняжыцкі трон у Кіеве, а Тураўскае княства пакідалі за сабой. Сюды назначаўся кіраваць княжыцкі намеснік – *пасаднік.* І нават калі князь вяртаўся, пасаднік працягваў працаваць. Паколькі дружына пакідала Тураў разам з князям, то ролю галоўнай ваеннай сілы адыгрывала апалчэнне. Налічвала яно каля тысячы ўзброеных гараджан. Узначальваў апалчэнне *тысяцкі*. У Тураве дзейнічала веча. Пры гэтым тураўцы мелі права голасу нават пры назначэнні епіскапа. Нагадаем, што ў Полацку епіскап назначаўся кіеўскім мітрапалітам.

**4. Беларусь у часы Вялікага Княства Літоўскага.**

У першай палове XIII ст. на тэрыторыі двух народаў – літоўскага і беларускага – узнікла новая дзяржава – *Вялікае Княства Літоўскае*. Пазней у яе склад увайшла частка ўкраінскіх і рускіх зямель. З самага пачатку гэта была шаматнацыянальная краіна, дзе ўсе народы мірна суіснавалі адзін з адным. Правячая дынастыя паходзіла з літоўскай знаці, а эканамічнае і культурнае аблічча дзяржавы вызначалі беларускія і ў пэўнай ступені іншыя ўсходнеславянскія землі.

У гістарычнай навуцы існуе некалькі канцэпцый утварэння ВКЛ. Прыхільнікі *“Літоўскай канцэпцыі”* сцвярджаюць, што ў часы аслаблення Русі і заваявання яе большай часткі мангола-татарамі, ва ўмовах барацьбы з крыжацкай агрэсіяй літоўскі князь *Міндоўг* змог аб’яднаць літоўскія землі, стварыць моцную дзяржаву і далучыць да яе шляхам заваёў ці дагавораў беларускія землі. Вялікае Княства Літоўскае падаецца як чужародная для беларусаў дзяржава-прыгнятальніца. ВКЛ ўзнікла як вынік эканамічнага і палітычнага развіцця балта-літоўскіх зямель і потым пашырылася за лік славянскіх.

Адзін з аўтараў *“Беларускай канцэпцыі”,* гісторык канца XX ст., *М.Ермаловіч* сцвярджаў, што з самага пачатку ВКЛ фарміравалася як дзяржава продкаў беларусаў, якія ў той час называліся ліцвінамі. Гістарычныя крыніцы, пісаў ён, не падцверджваюць літоўскага заваявання беларускіх зямель, а, наадварот, сведчаць аб заваяванні Навагародскім княствам сучасных літоўскіх зямель. На думку М. Ермаловіча, нельга атаясамліваць сучасную тэрыторыю Літоўскай рэспублікі з *летапіснай Літвой,* якая знаходзілася на тэрыторыі сучаснай Беларусі, паміж Маладзечнам, Навагрудкам, Слонімам і Мінскам, і была часткаю тэрыторыі, на якой фарміраваўся беларускі этнас.

Навукоўцы Літвы і Беларусі ў час міжнароднага круглага стала па тэме “Беларусь у Вялікім Княстве Літоўскім”, які адбыўся ў Мінску ў 1992 г., адзначылі, што ў першай палове XIII ст. у верхнім Панямонні ўзнікла беларуска-літоўская гаспадарства з цэнтрам у Навагародку, якое стала ядром магутнай шматнацыянальнай еўрапейскай дзяржавы – Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага і іншых зямель. У ВКЛ *“Літва”* тады адносілася да тэрытогрыі Верхняга і Сярэдняга Панямоння, а пад *“Руссю”* разумелася верхняе Падзвінне і Падняпроўе. Сучасныя заходнія этнічныя літоўскія землі – *Жмудзь* – былі канчаткова далучаны да Вялікага Княства ў першай палове XVст. У склад ВКЛ з другой паловы XIV ст. да 60-х гг. XVI

ст. уваходзіла частка ўкраінскіх зямель (Валынь, Падолле, Кіеўшчына). Усе народы, адзначалася ў дакуменце круглага стала, якія прымалі ўдзел у палітычным, эканамічным і культурным жыцці ВКЛ, і перш за ўсё *беларускі і літоўскі, з'яўляюцца гістарычнымі спадкаемцамі гэтай дзяржавы.*

Да XIII ст. літоўцы знаходзіліся на пераддзяржаўнай стадыі свайго развіцця. Па ўзроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця балты адставалі ад славян. У іх не было сапраўдных гарадоў і пісьменнасці, яны былі язычнікамі, але ўжо мелася дзяленне на знаць і просты народ, існавала неразвітае рабства.

*Неабходнасць барацьбы са знешняй небяспекай* (крыжакі, мангола-татары, а таксама галіцка-валынскія і польскія князі) стала асноўным штуршком да стварэння дзяржавы. Дзеля выжывання ў такіх умовах насельніцтва, што жыло на мяжы балцкіх і ўсходнеславянскіх зямель, павінна было аб'яднаць свае намаганні.

Істотнай *перадумовай утварэння беларуска-літоўскай дзяржавы* было эканамічнае развіццё (сельскагаспадарчая вытворчасць, рамёствы, гандаль), а таксама рост старажытных беларускіх гарадоў, якія сталі не толькі пунктамі абароны, месцамі накаплення і разгортвання сіл для баявых дзеянняў, але і рамесна-гандлёвымі цэнтрамі. Асабліва важную ролю ў пачатковы перыяд утварэння ВКЛ адыгралі гарады беларускага Панямоння і асабліва *Навагародак.* Феадальная раздробленасць, сацыяльныя супярэчнасці, якія звычайна вырашаліся з дапамогай сілы, выклікалі патрэбу ў забеспячэнні грамадскага парадку, стварэння дзяржавы, якая б усталявала законнасць і спакой.

У 1240-х гадах літоўскі князь *Міндоўг* захапіў уладу ў свае рукі на значных балцкіх землях і хутка распаўсюдзіў яе і на суседнія тэрыторыі Беларусі – Сярэдняе Панямонне з гарадамі Навагародак, Ваўкавыск, Слонім. У летапісах нама звестак пра тое, што Міндоўг захапіў Навагародак, як і таго, што ён знайшоў там прытулак, калі быў чамусці выгнаны з Літвы. Хучэй за ўсё ён валодаў Літвой і Навагародкам адначасова і са згоды мясцовага насельніцтва.

Узвышэнне Міндоўга выклікала незадаволенне іншых літоўскіх князёў, а таксама крыжакоў і галіцка-валынскіх князёў. Супроць уладара новай дзяржавы ўтвараецца небяспечны саюз. Міндоўг шукае падтрымку на захадзе. У 1251 г. ён прымае каталіцтва і **6 жніўня 1253 г.** карануецца ў Навагародку з бласлаўлення папы рымскага. Тытул караля ВКЛ падняў міжнародны прэстыж дзяржавы і даў магчымасць аслабіць ўціск крыжакоў,

якім была аддадзена частка Жамойці. Каб залагодзіць галіцка-валынскае княства, Міндоўг аддае сыну Данілы Галіцкага князю Раману гарады Ваўкавыск і Слонім на правах васальнай залежнасці. Акрамя гэтага, другому сыну галіцкага князя Данілы Шварну Данілавічу была аддадзена замуж дачка Міндоўга. Разбурыўшы кааліцыю ворагаў, Міндоўг змог перамагчы мяцежных літоўскіх князёў і ўмацаваць сваю ўладу.

Палітыку пашырэння тэтыторыі Наваградскага княства працягваў старэйшы сын Міндоўга *Войшалк* (1264-1267 гг.), князь *Шварн Данілавіч* (1267-1270 гг.) і князь *Трайдень* (1270-1283 гг.).

У канцы XIII ст. вялікім князем стаў *Віцень***(1295-1316 гг.).** Ён імкнуўся ўмацаваць беларуска-літоўскую дзяржаву, абапіраючыся на Навагародскае, Гарадзенскае і іншыя княствы. Віценю ўдалося дабіцца палітычнага адзінства дзяржавы. Нашчадкі іншых княжацкіх дынастый больш не прэтэндавалі на яго трон. Вялікі князь паспяхова змагаўся з Ордэнам. Асабіста вёў у бой сваё войска, вызначаўся храбрасцю і ўвайшоў у гісторыю як князь-палкаводзец. Пры ім быў уведзены *агульнадзяржаўны герб "Пагоня".* Пры Віцені тэрыторыя ВКЛ пачала пастулова пашырацца. У прыватнасці, была далучана Полацкая і Берасцейская зямлі.

Пасля смерці Віценя вялікім князем стаў яго брат *Гедемін* **(1316-1341 гг.).** Палітыка Гедеміна была накіравана на далейшае ўмацаванне Вялікага Княства Літоўскага і пашырэнне яго тэрыторыі. ВКЛ становіцца цэнтрам аб'яднання ўсходнеславянскіх зямель. У часы Гедеміна Менская, Віцебская, Турава-Пінская землі ўвайшлі ў склад ВКЛ. У **1323 г.** вялікі князь Гедемін пераносіць сталіцу дзяржавы ў *Вільню* – старадаўні цэнтр крывіцкай каланізацыі, які раней называўся Крывач-горад.

Аб'ядноўваючы ўсходнеславянскія землі пад сваёй уладай, Гедымін абыходзіўся, як правіла, без заваявання. Ён называў сябе "каралём літоўцаў і многіх рускіх". Назвава "рускія" тут распаўсюджана на беларусаў, якіх было ў тыя часы прыкладна ¾ насельніцтва краіны. Старажытнабеларуская мова ў XIV ст. набыла вялікае распаўсюджанне і стала дзяржаўнай. Частка літоўскай знаці прыняла праваслаўе.

Пасля Гедеміна вялікім князем літоўскім стаў *Альгерд***(1345-1377 гг.),** які кіраваў дзяржавай разам з братам *Кейстутам.* Да ВКЛ далучыліся беларускія землі Падняпроўя і заняпаўшага Галіцка-Валынскага княства, а таксама Чаргігава-Северскае княства, шэраг бранскіх і смаленскіх зямель. У гэты час узнікаюць два цэнтры "збірання" зямель былой Русі. Адна іх частка ўвайшла ў склад Вялікага Княства Літоўскага, другая – аб'ядноўвалася вакол

Масквы. Гэтым была закладзена прычына варожых адносін паміж літоўскімі і маскоўскімі князямі на доўгія гады. Каб паслабіць суперніка, у **1368, 1370 і 1372 гг.** вялікі князь літоўскі робіць паходы на Маскву, але да вызначальнай бітвы справы не дайшло. Канчаткова паслабіць свайго ўсходняга суседа Альгерду не ўдалося.

Значнай небяспекай для Вялікага Княства Літоўскага па-ранейшаму былі крыжакі, якія неаднаразова нападалі на Гродна, пустошылі землі Полаччыны. У адказ Кейстут вадзіў войска на тэрыторыю ордэнскіх уладанняў.

Перамога Альгерда над татарамі каля *Сініх Водаў* у **1362 г.** паклала пачатак вызвалення ўсходнеславянскіх земляў ад ардынскага панавання. У склад ВКЛ увайшлі ўкраінскія землі Падолля, Валыні і Кіеўшчыны. Бліскучы поспех Альгерда каля Сініх Водаў падрыхтаваў другую вялікую перамогу над татарамі – разгром хана Мамая на Куліковым полі ў **1380 г.**

У час княжэння Альгерда тэрыторыя ВКЛ павялічылася ў 2 разы. Фактычна большая частка ўсходнеславянскіх зямель была аб'яднана ў рамках адной дзяржавы. ВКЛ стала адной з буйнейшых шматнацыянальных дзяржаў Еўропы (уласна Літва ў ёй складала 1/12 частку тэрыторыі). Пераважную большасць насельніцтва складалі беларусі і ўкраінцы. На іх тэрыторыі знаходзілася і найбольш буйныя гарады.

ВКЛ стала федерацыяй,ядром якой разам з балта-літоўскімі сталі і ўсходнеславянскія землі. Насельніцтва было зацікаўлена ў захаванні гэтай дзяржавы, паколькі ў барацьбе са знешнімі ворагамі толькі адзінства народаў суседніх тэрыторый дазваляла супрацьстаяць агрэсіі крыжакоў і мангола-татараў.

Пасля смерці Альгерда на вялікакняжацкі пасад узышоў яго сын ад другога шлюбу – *Ягайла*(**1377-1392 гг.).** Пачатак яго княжання суправаджаўся абвастрэннем міжусобнай барацьбы з дзядзькам Кейстутам (братам Альгерда). У выніку Кейстут быў забіты, я яго сын *Вітаўт* стаў упарта змагацца з вялікім князем Літоўскім Ягайлам за ўладу ў краіне.

Каб трывала ўсталяваць сваю ўладу над ўсёй дзяржавай, Ягайла шукае дапамогу з боку суседніх хрысціянскіх краін. Саюз з суседняй Польшчай адпавядаў інтарэсам Ягайлы і саміх палякаў. Ён дазваляў аб'яднаць сілы супроць агульнага ворага – *Тэўтонскага ордэна.* Феадалы літоўскага паходжання, прыняўшы каталіцтва, якое панавала ў Польшчы, мелі б магчымасць захаваць сваё дамінуючае становішча ў ВКЛ. Польскія феадалы разлічвалі пашырыць свае ўладанні за кошт зямель княства.

У **1385 г.** у замку Крэва была заключана *унія* (саюз) Вялікага Княства Літоўскага і Каралеўства Польскага. Ягайла стаў каралём польскім і вялікім князем літоўскім. Ён абавязваўся прыняць каталіцтва і правесці акаталічванне Літвы, дапамагчы Польшчы вярнуць страчаныя землі, выпусціць усіх польскіх палонных, захопленых у мінулых войнах, перавезці казну ВКЛ у польскую сталіцу Кракаў.

У **1387 г.** адбылося хрышчэнне літоўскага насельніцтва ВКЛ па каталіцкаму абраду. Ягайла выдаў *прывілей*,які даваў феадалам дадатковыя правы і вольнасці пры ўмове прыняцця каталіцтва. Гэта была ў большасці сваёй знаць літоўскага паходжання. На праваслаўных феадалаў, ураджэнцаў беларускіх, украінскіх і рускіх зямель прывілей не распаўсюджваўся. Беларускія землі ўваходзілі ў склад *Віленскага епіскапства,* якое было створана ў 1387 г. Неўзабаве тут з'явіліся касцёлы і каталіцкія манастыры (кляштары).

У **1392 г.** у маёнтку Вострава каля Ліды паміж Ягайлам і Вітаўтам было заключана пагадненне, на падставе якога ўлада ў княстве перадавалася Вітаўту. Уладаром ВКЛ стаў *Вітаўт Кейстутавіч***(1392-1430 гг.).** Яму забяспечвалася незалежнасць дзеянняў, але ў саюзе з Польшчай і пад вярхоўнай уладай польскага караля Ягайлы.

Такім чынам, утварыўся фактычна саюз дзвюх раўнапраўных дзяржаў, які значна ўмацаваў іх абароназдольнасць. Гэты саюз спрыяў росту эканамічных і культурных сувязей паміж ВКЛ і Польшчай, а таксама з іншымі краінамі Заходняй Еўропы.

У першыя гады княжання Вітаўт пазбаўляе ўлады князёў найбольш аўтаномных зямель (Кіеўскага, Уладзімера-Валынскага, Ноўгарад-Северскага, Падолля і інш.). Гэтым самым умацоўваецца адзінства дзяржавы і адначасова аўтарытэт вялікага князя. Месцы спадчынных князёў займаюць прызначаныя Вітаўтам *намеснікі*, гатовыя па першаму патрабаванню выступіць з войскам на яго баку. Пазіцыі цантральнай улады становяцца больш трывавлымі.

У **1409 г.** пачалася *"Вялікая вайна"* ВКЛ і Польшчы супраць крыжакоў, цэнтральнай падзеяй якой стала *Грунвальдская бітва.* Прычынамі гэтай вайны былі і бесперапынныя набегі на літоўска-беларускія і польскія землі, "дыпламатычныя канфлікты" і немагчымасць іх мірнага ўрэгулявання, і пагроза анямечвання палякаў, і г.д.

**15 ліпеня 1410 г.** каля вёскі Грунвальд (тэрыторыя Польшчы) адбылася адна з найвялікшых бітваў эпохі сераднявечча. Крыжакі былі разбіты.

Значэнне перамогі пад Грунвальдам цяжка пераацаніць. Была спынена агрэсія нямецкіх рыцараў на ўсход. Разгромлены Ордэн так і не змог узнавіць сваіх ранейшых сіл. ВКЛ вярнула сабе Жамойцкія землі. Акрамя таго, Ордэн павінен быў выплаціць пераможцам вялікую суму грошай. Сітуацыя ў Цантральнай і Ўсходняй Еўропе змянілася на карысць славянскіх народаў. Міжнародны аўтарытэт ВКЛ значна павысіўся.

У **1413 г.** у замку Гародлі (на рацэ Заходні Буг) адбыўся з’езд польскіх і літоўскіх феадалаў-католікаў. Падцвярджалася аб’яднанне дзяржаў, пры гэтым прызнавалася самастойнасць ВКЛ. Кароль і польская шляхта вырашылі абапірацца ў сваёй дзейнасці толькі на феадалаў каталіцкага веравызнання. 47 польскіх феадалаў надзялілі такую ж колькасць феадалаў ВКЛ сваімі гербамі і прымалі іх у свае гербавае брацтва. Феадалы ВКЛ абяцалі польскім феадалам быць з імі ў “вечнай дружбе і саюзе”.

Толькі феадалам-каталікам дазвалялася ўдзельнічаць у выбарах вялікага князя і займаць дзяржаўныя пасады. А феадалы сучасных беларускіх, украінскіх і рускіх зямель, у сваёй большасці праваслаўныя, заставаліся нераўнапраўнымі. Такім чынам, *Гарадзельская унія 1413 г.* зрабіла каталіцтва прывілеяванай рэлігіяй дзяржавы, што абвастрыла канфесійную сітуацыю ў ВКЛ. Значная частка праваслаўнага насельніцтва княства была дыскрымінавана.

Пасля смерці Вітаўта (1430 г.) вялікім князем стаў малодшы сын Альгерда *Свідрыгайла*(**1430-1432 гг.**), які насуперак Гарадзельскай уніі прыцягвае да дзяржаўнага кіравання ў большасці “русінаў” (беларусаў і ўкраінцаў) праваслаўнага веравызнання. Гэта выклікала незадавальненне літоўскай арыстакратыі, якую ўзначаліў малодшы брат Вітаўта *Жыгімонт Кейстутавіч.* Пачалася *грамадзянская вайна* (**1432-1436 гг.).** Вайна вялася за вялікакняжацкі стол, за ўладу буйных тэрытарыяльных груповак феадалаў. Інтарэсы шырокіх слаёў насельніцтва яна не кранала. Немалаважную ролю ў канфлікце адыгрывала рэлігійнае пытанне.

Рашаючая бітва паміж супернікамі адбылася ў **1345 г.** пад *Вількамірам* (сённяшняя Літоўская Рэспубліка). Войскі Свідрыгайлы пацярпелі паражэнне. Вайна скончылася перамогай Жыгімонта Кейстутавіча, які і стаў адзіным уладаром ВКЛ да 1440 г.

У **1468 г.***Казімір*(**1440-1492 гг.**) выдаў *Судзебнік* – першы збор законаў ВКЛ. Ён быў напісаны на старажытнабеларускай мове. Судзебнік устанаўліваў адзіныя віды пакарання супроць феадальнай уласнасці (грашовы штраф, цялеснае пакаранне, смяротнае пакаранне). Згодна з гэтым

дакументам сяляне пазбаўляліся права свабоднага пераходу ад аднаго феадала да другога, гэта значыць, яны прымацоўваліся да зямлі, на якой жылі і якую апрацоўвалі. Судзебнік прадугледжваў пакаранне за дапамогу пры ўцёках чэлядзі і залежных людзей ад феадалаў і за арганізацыю такіх уцёкаў. Выданне Судзебніка азначала *пачатак юрыдычнага афармлення запрыгоньвання сялян* – страты сялянамі свайго права ўласнасці на зямлю і ператварэнне іх у залежных ад феадала.

Абарона ад крымскіх татараў была доўгі час малаэфектыўнай з прычыны недасканаласці ваеннай арганізацыі Вялікага Княства і недахопу сродкаў. І толькі летам **1506 г.** князь *Міхаіл Глінскі* з паспалітым рушаннем здолеў разграміць татараў у *бітве пад Клецкам* і вызваліў дзясяткі тысяч палонных беларусаў.

У часы кіравання *Жыгімонта Старога*(**1506–1548 гг.)** працягвалася барацьба ВКЛ і Вялікага Княства Маскоўскага за дамінаванне на землях былой Кіеўскай Русі. Асабліва небяспечнай для вялікакняскай дзяржавы была вайна **1512–1522 гг.** У 1514 г. маскоўскія войскі захапілі Смаленск. **8 верасня 1514 г.** адбылася *Аршанская бітва*.Войска ВКЛ пад кіраўніцтвам гетмана *Канстанціна Астрожскага* нанесла паражэнне царскаму войску. Але Астрожскі не здолеў адабрацьзахоплены Смаленск, а вайна прыняла зацяжны характар.

**5. Культура ўсходніх славян у эпоху ранняга сярэднявечча.**

Усходнія славяне стварылі шматгранную культуру, якая ўключае вусную народную творчасць, пісьменства, архітэктуру, выяўленчае мастацтва, музыку. Старажытнейшым пластом усходнеславянскай культуры выступае *вусная народная творчасць* (фальклор). Да яе старадаўніх відаў належаць каляндарна-абрадавая і сямейна-абрадавая паэзія. Беларуская каляндарна-абрадавая паэзія прызнана найбагацейшай сярод славянскіх народаў. Яна дзеліцца на зімовыя (святкаванне Каляды), веснавыя (свята гукання вясны), летнія (свята Купалля), восеньскія (памінальны абрад Дзяды) цыклы. Сямейна-абрадавая паэзія прадстаўляе рытуалы вакол асноўных момантаў жыцця чалавека – нараджэння, вяселля, смерці.

Да нас дайшлі разнастайныя *помнікі пісьменнасці* ўсходніх славян. Стварэнне славянскай азбукі звязваюць з імёнамі братоў – манахаў Кірыла і Мяфодзія. Родам браты з горада Салуні (сёння Салонікі, Грэцыя). Большасць вучоных лічаць іх балгарамі. У сярэдзіне **IX ст.** браты склалі славянскую азбуку – кірыліцу, назва якой паходзіць ад імя Кірыл. Яна налічвае 43 літары:

24 візантыйскага паходжання, 19 створана ўпершыню. 27 літар абазначалі і лічбы. Літарны склад кірыліцы адпавядаў гукавай сістэме старажытнаславянскай мовы. З **XII ст.** кірыліца выцясняе глаголіцу. Першым датаваным узорам пісьменнасці Ўсходняй Еўропы з'яўляецца пячатка полацкага князя Ізяслава Ўладзіміравіча. На ёй напісана імя князя кірыліцай, але ў грэчаскім гучанні – «Ізяславос».

Каштоўным помнікам усходнеславянскага пісьменства служаць *берасцяныя граматы* – напісаныя на бяросце прыватныя лісты людзей. Археолагі знайшлі берасцяныя граматы ў Мсціслаўлі Магілёўскай вобласці і Віцебску, а таксама ў расійскіх гарадах Ноўгарадзе і Смаленску, якія, згодна тэксту, належылі палачанам. На фрагменце берасцяной граматы **пачатку XIII ст.** з горада Мсціслаўля гаворыцца пра пшаніцу за 4,5 грыўні. Дарэчы за такія грошы можна было купіць 9 кабаноў ці 2 каровы. У Віцебскай берасцяной грамаце нейкі Сцяпан просіць Няжылу купіць яму жыта за 6 грыўняў.

З развіццём пісьменнасці цесна звязана ўзнікненне *рукапісных кніг*. Першай рукапіснай кнігай Беларусі з'ўляецца *«Тураўскае евангелле»* ***XI ст.*** Напісана яно на пергаменце. Упрыгожана рознакаляровымі застаўкамі. Вокладкай служылі дзве дошкі, абцянутыя скурай. Зачынялася кніга з дапамогай спражкі.

У **XI ст.** пачалі складвацца *летапісы* – гісторыка-літаратурныя творы з апісаннем падзей па гадам (летам) у храналагічнай паслядоўнасці. Першы ўсходнеславянскі летапіс *«Аповесць мінулых часоў»* напісаны манахам Кіева-Пячэрскага манастыра Нестарам **каля 1113.** Ён паставіў сабе маштабную задачу паказаць, адкуль пайшла Руская зямля. Даў звесткі пра Рагвалода, Рагнеду, Ізяслава Уладзіміравіча, Усяслава Чарадзея, бітву на Нямізе. Ёсць звесткі пра існаванне Полацкага, Тураўскага, Навагрудскага летапісаў, якія не захаваліся да нашых дзён. Урыўкі з іх прысутнічаюць у іншых летапісных зводах. Расійскі гісторык Васіль Тацішчаў (1686–1750) карыстаўся Полацкім летапісам пры напісанні 5-томнай «Гісторыі Расійскай».

Кніжная культура дасягнула сваёй дасканаласці ў творчасці *Ефрасінні Полацкай* (**каля 1104–23 мая 1167 г.).** Яна займае пачэснае месца сярод першых асветнікаў Беларусі. У дзяцінстве насіла імя *Прадслава*. Яе дзедам быў полацкі князь Усяслаў Чарадзей, бацькам – яго малодшы сын Святаслаў-Георгій, маці – Софья, дачка Вялікага князя кіеўскага Уладзіміра Манамаха. У 12 гадоў Прадслава адмовілася ад дынастычнага шлюбу. Пайшла ў манастыр пад імем *Ефрасінні*. Перакладала і перапісвала кнігі. У канцы 20-х

гадоў XII ст. заснавала *жаночы Полацкі Спаса-Ефрасіннеўскі манастыр*. **Каля 1150 г.** па яе ініцыятыве будуецца дойлідам *Іаанам Спаская царква*. Заснаваныя манастыры сталі асяродкам асветы. Пры іх працавалі вучыльні, дзе выкладалі чытанне, пісьмо, нотную грамату, верагодна, грэчаскую мову. Дзейнічалі бібліятэкі, а таксама майстэрні іконапісныя, ювелірныя, па перапісванню кніг – скрыпторыі. Майстру *Лазару Богшу* ў **1161 г.** яна заказала *Узвіжальны крыж*, які выкарыстоўваўся ў дзень хрысціянскага свята "Узвіжанне крыжа". Мужчынскаму манастыру Ефрасіння падаравала ікону Божай маці, прывезеную з Візантыі.

Напрыканцы жыцця Ефрасіння здзейсніла паломніцтва па святым месцам у Іерусалім, дзе і памёрла. У 1187 г. Іерусалім захапілі арабы. Кіеўскіе манахі, пакідаючы горад, забралі мошчы Ефрасінні. Змясцілі іх ў Кіева-Пячэрскай лаўры. У 1910г. цела асветніцы вярнулася ў Спаса-Ефрасіннеўскі манастыр.

Сваёй асветніцкай і літаратурнай дзейнасцю праславіўся *Кірыла Тураўскі* **(каля 1130–каля 1182 гг.).** Ён паходзіў з багатай сям'і Турава. Атрымаў выдатную адукацыю. Затым пастрыгся ў манахі. Павагу сучаснікаў прынёс яму подзвіг *«стоўпніцтва»*, калі Кірыл замураваўся ў манастырскай вежы (стаўпе) і пэўны час жыў ізалявана ад людзей. Каля 1159 г. выбраны тураўскім веча на пасаду епіскапа. Захавалася дзесьці 70 твораў Кірылы Тураўскага розных жанраў: малітвы, павучанні, пропаведзі, прытчы, каноны. Сваім словам заваяваў такі высокі аўтарытэт, што яго называлі Златавустам.

З распаўсюджаннем хрысціянства *архітэктура(дойлідства)* узбагацілася каменнымі будынкамі па візантыйскаму ўзору. Спачатку для работы запрашалі грэчаскіх майстроў. Паступова сфарміраваліся мясцовыя архітэктурныя школы ў Полацку і Гродна. Візітоўкай полацкай школы дойлідаў стаў *Сафійскі сабор у Полацку* – першы мураваны (узведзеныў **50-я гг. XI ст.** з каменняў і цэглы, замацаваных растворам) храм Беларусі. Пры яго будаўніцтве ўпершыню выкарысталі *плінфу* – абпаленую цэглу, шырыня і даўжыня якой значна пераўзыходзіла таўшчыню (каля 4 см.). У аснове Полацкага Сафійскага сабора быў крыжова-купальны храм грэкаў. Але яго венчалі купалы, якія ўваскрашалі стыль усходнеславянскага драўлянага дойлідства.

У **канцы XV ст.** на тэрыторыі Беларусі склаліся перадумовы дляразвіцця культуры Адраджэння.*Адраджэнне (Рэнэсанс)* у гістарычным значэнні – эпоха ў развіцці духоўнай культуры Еўропы ў пераходны перыяд ад сярэднявечча да новага часу (XIV–XVI стст.), якая характарызавалася

ўздымам свецкай навукі і мастацтва, станаўленнем нацыянальнай мовы, літаратуры і нацыянальнай самасвядомасці, гуманістычным светапоглядам.

На Беларусі эпоха Рэнесанса мела свае адметнасці. Галоўнымчынам, гэта праяўлялася ў сутыкненні заходняй і ўсходняйкультурных традыцый, што выпрацавала адносную верацярпімасцьу краіне, а таксама ўзаемаўплыў беларускай, рускай, украінскай,польскай, літоўскай моваў.

Асноўнай ідэйнай плынню эпохі Адраджэння стаў *гуманізм* (чалавекалюбства), найбольш яскравымі прадстаўнікамі якога на Беларусі былі Ф. Скарына і М. Гусоўскі. Высокага развіцця ў тыячасы дасягнула літаратура на старабеларускай мове – афіцыйнаймове ВКЛ.

Выключнай з'явай з'яўляецца і тое, што пачынальнікамбеларускага, а разам з тым і ўсходнеславянскага кнігадрукаваннястаў палачанін *Францыск Скарына* (**1490 – каля 1551 г**.).

Эпоха Адраджэння прывяла да распаўсюджвання на тэрыторыі Беларусі шырокага грамадскага руху Рэфармацыі, які быў накіраваны супраць каталіцкай царквы. Асноўнымі накірункамі гэтага руху былі лютэранства, кальвінізм, антытрынітарызм. Найбольш вядомымі прадстаўнікамі Адраджэння былі *Сымон Будны, Васіль Цяпінскі*, традыцыі якіх у эпоху Контррэфармацыі працягвалі *К. Карповіч, С. Зізаній, П. Скарга.*

У архітэктуры гэтага перыяду ўжываліся нацыянальныя і заходнееўрапейскія традыцыі, якія прынеслі на тэрыторыю Беларусі гатычны, раманскі стылі і стыль барока (з'явіўся на Беларусі з канца XVI ст.).

У выяўленчым мастацтве найбольш важная роля належыларэлігійнаму мастацтву: іканапісі, фрэскам, скульптуры. З XV ст.з'яўляюцца творы свецкага жывапісу ў жанры партрэта.

**Кантрольныя пытанні і заданні для самападрыхтоўкі студэнтаў:**

1. На якія перыяды падзяляецца старажытнае грамадства Беларусі?
2. Назавіце асаблівасці грамадска-палітычнага ладу Тураўскага княства.
3. Назавіце прычыны ўтварэння Вялікага Княства Літоўскага.
4. Якую палітыку праводзіў вялікі князь Вітаўт?
5. Якое значэнне для культуры ўсходніх славян мела ўвядзенне хрысціянства?
6. Дайце характарыстыку культуры Адраджэння ў Беларусі.

**Літаратура:**

1. Алексеев, Л. В. Полоцкая земля в IX–XIII вв.: Очерки истории Северной Белоруссии / Л. В. Алексеев. – М., 1966.
2. Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2011. – Т. 2 : Л–Я.
3. Археалогія Беларусі : энцыклапедыя. У 2 т. Т. 1. А-К / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. Ю. У. Каласоўскі. – Мінск, 2009.
4. Вялікае Княства Літоўскае : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал.рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2005–2006.
5. Гістрыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.].– Т. 1 : Старажытная Беларусь: Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. – Мінск, 2000.
6. Дзмітрачкоў, П. Ф. Беларусь у складзе Вялікага княства Літоўскага (другая палова XIII – першая палова XVII ст.). – Магілёў, 2003.
7. Ермаловіч, М. Беларуская дзяржава Валікае Княства Літоўскае / М. Ермаловіч. – Мінск, 2003.
8. Загарульскі, Э. М. Заходняя Русь: IX–XIII стст. / Э. М. Загарульскі. – Мінск, 1998.
9. Рэлігія і царква на Беларусі: энцыклапед. даведнік. – Мінск, 2001.
10. Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 г: Тэкст. Даведнік. Каментарыі. – Мінск, 1989.
11. Францыск Скарына і яго час. Энцыклапедычны даведнік. – Мінск, 1988.
12. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1993–2003.

## Тэма 3.1. Беларусь у складзе Рэчы Паспалітай.

*Кючавыя паняцці:*Лівонская вайна; Люблінская ўнія; Рэч Паспалітая; Статут ВКЛ 1588 г.; Брэсцкая царкоўная ўнія; “валочная памера”; Магдэбургскае права; Паўночная вайна; “ліберум вета”; “залатыя шляхецкія вольнасці”; канфедэрацыі шляхты; Канстытуцыя 3 мая 1791 г.; Тадэвуш Касцюшка; падзелы Рэчы Паспалітай; Асветніцтва; Адукацыйная камісія.

### План лекцыі:

1. Утварэнне Рэчы Паспалітай.
2. Асаблівасці фарміравання канфесійных адносін на тэрыторыі Беларусі ў XVI–XVII стст.
3. Эканамічны і палітычны стан беларускіх зямель у XVII–XVIII стст.

4. Культура беларускага народа ў XVII–XVIII стст.

**1.Утварэнне Рэчы Паспалітай**

*Лівонская вайна* **(1558-1583 гг.).** У 1558 г. маскоўскі цар *Іван IV* распачаў вайну супраць былога *Лівонскага ордэна.* На той час Ордэн уяўляў сабой канфедэрацыю – саюз 5 княстваў, створаных нямецкімі рыцарамі. Асноўнай мэтай маскоўскага цара была здабыча выхаду да Балтыйскага мора, гэта давала магчымасць самастойна гандляваць з Еўропай без дапамогі шматлікіх пасрэднікаў. Атрымаўшы выхад да Балтыкі, Расія магла больш актыўна ўдзельнічаць і ў еўрапейскіх справах. Лівонія была аб'яўлена спадчынай маскоўскіх князёў на падставе таго, што ў старажытныя часы гэтай тэрыторыяй валодалі князі Кіеўскай Русі. Войска Івана IV у пачатку 1562 г. спустошыла ваколіцы Мсціслава, Шклова, Оршы, Віцебска, Дуброўны, Копыля. У студзені **1563 г.** 60-тысячнае войска асадзіла Полацк, а праз 2 тыдні гераічнай абароны (15 лютага) захапіла горад. У гэтых умовах ВКЛ патрабаваўся саюзнік, бо аднаму яму адбіць напады маскоўскага цара было немагчыма. Найбольш верагодным саюзнікам была Польшча, з якой у **1569 г.** была заключана *Люблінская ўнія.* У 1570 г. новая дзяржава – *Рэч Паспалітая* пайшла на перамір'е з Іванам IV, апошняму таксама патрабавалася часова замірыцца з Літвой і Польшчай, бо пачаліся ваенныя дзеянні супраць Швецыі. Хутка памёр апошні прадстаўнік дынастыі Ягеллонаў, бяздзетны *Жыгімонт II Аўгуст***(1548-1572 гг.),** таму ваенныя дзеянні аднавіліся толькі праз некалькі гадоў, калі ў Рэчы Паспалітай усталяваўся ўнутраны парадак.

*Люблінская ўнія* **(1569 г.).** У Польшчы, пачынаючы з Крэўскай уніі 1385 г., шырылася ідэя паглынання ВКЛ, што давала польскім магнатам і шляхце магчымасць займаць новыя пасады, набываць новыя багацці, у сваю чаргу, каталіцкая царква магла больш рашуча распаўсюджваць свой уплыў. Захопніцкія настроі палякаў тым больш выраслі, чым у больш складаныя абставіны трапляла Вялікае Княства Літоўскае. Асабліва відавочна гэта было падчас Лівонскай вайны. Палякі патрабавалі поўнага ўключэння княства ў склад Польшчы. Жыгімонт Аўгуст падараваў Польшчы на вечныя часы ўкраінскія тэрыторыі княства – Валынь, Падляшша, Падолле і Кіеўшчыну. Ва ўмовах Лівонскай вайны гэта было цяжкай стратай для дзяржавы. Да таго, вялікі князь (адначасова і кароль польскі) Жыгімонт Аўгуст загадаў дзяржаўным дзеячам і паслам ВКЛ падпісаць умовы ўніі пад пагрозай ліквідацыі дзяржаўнасці ВКЛ.

Сутнасцю новай уніі было стварэнне адзінай дзяржавы – *Рэчы Паспалітай,* але яна мела федэратыўны характар. Па ўмовах падпісаных дакументаў у Рэчы Паспалітай выбіраўся адзіны гаспадар, каранаваўся ён толькі ў Кракаве; сабіраўся агульны сейм, яго рашэнні павінны былі выконвацца на ўсёй тэрыторыі краіны; касаваліся законы ВКЛ, што супярэчылі ўмовам уніі; феадалы аб'яднанай дзяржавы маглі набываць маёмасць у любым рэгіёне новай дзяржавы; павінна была праводзіцца агульная знешняя палітыка; уводзілася агульная грашовая адзінка, ліквідавалася мяжа паміж дзяржавамі і мытні на ёй; страчаныя ВКЛ украінскія тэрыторыі адыходзілі да Польшчы, а Лівонія знаходзілася ў сумесным валоданні ВКЛ і Польшчы.

*Аднак ВКЛ не перастала існаваць пасля Люблінскай уніі.* Княства было пастаўлена ў залежнае ад Польшчы становішча, але пэўная самастойнасць была захаваная. У княстве захавалася асобнае войска, дзейнічала сваё заканадаўства, свая судовая сістэма, свая адміністрацыя. Захавалася свая пячатка і беларуская мова дзяржаўнага справаводства. Фактычна, насуперак рашэнням Люблінскага сейма, засталася і свая грашовая сістэма, пры *Стэфане Баторыі***(1576-1586 гг.)** была адноўлена і мяжа.

Умовы уніі расчаравалі і магнатаў, і шляхту. У наступныя дзесяцігоддзі ў княстве праводзіліся мерапрыемствы, накіраваныя на аслабленне наступстваў аб'яднання: працягвалі сабіраць асобныя ад палякаў соймы, стварылі ў **1581 г.***Галоўны Трыбунал* – вышэйшую судовую ўстанову ў княстве замест вялікакняскага суда. У **1588 г.** быў прыняты *трэці Статут ВКЛ.* У гэтым галоўным зводзе законаў княства Люблінская ўнія наогул не згадваецца. У княстве забаранялася прадаваць маёнткі іншаземцам, дзяржаўныя пасады мелі права займаць толькі ўраджэнцы ВКЛ. У Статуце была замацавана норма, згодна з якой гаспадар нес адказнасць за захаванне тэрытарыяльнай адзінасці дзяржавы. Аднак унія засталася, яе вынікамі была паланізацыя і акаталічванне пануючага саслоўя княства – шляхты і магнатаў. Узмацнілася запрыгоньванне сялянства, княства ўцягвалася ў новыя знішчальныя войны. Узмацніўся польскі культурны націск, рэзка пагоршыліся ўмовы для развіцця беларускай культуры. Але ўнія была меншым злом для ВКЛ у параўнанні з перспектывай быць заваяванымі Іванам IV.

Юрыдычна Люблінская ўнія была ліквідавана 3 мая 1791 г. з прыняццем Канстытуцыі Рэчы Паспалітай, згодна з якой дзяржава страчвала свой федэратыўны лад.

**2. Асаблівасці фарміравання канфесійных адносін на тэрыторыі Беларусі ў XVI–XVII стст.**

Праваслаўе і каталіцызм у ВКЛ мірна суіснавалі адно з другім. Аднак пасля заключэння Люблінскай уніі праваслаўная царква пачала губляць сваё вядучае становішча на беларуска-літоўскіх землях. На захадзе ВКЛ дзейнічала Віленская каталіцкая епархія, касцёлы, кляштары (манастыры); на ўсходзе заставалася ўплывовай ідэалогія праваслаўя. Сярод шляхты ўдзельная вага католікоў ў першай палове XVI ст. была нязначнай. Адносіны паміж праваслаўем і каталіцызмам набылі розныя формы: літаратурная палеміка, парламенцкая і ўзброеная барацьба.

У **1432 і 1436 гг.** былі прыяты два *прывілеі*, якія ўраўнялі ў эканамічных правах праваслаўную і каталіцкую знаць.

У XVI ст. каталіцкую царкву Заходняй Еўропы напаткаў крызіс. Ён быў звязаны з пашырэннем Рэфармацыі. *Рэфармацыя* – шырокі грамадска-палітычны рух, накіраваны супроць усеўладдзя каталіцкай царквы. Прыхільнікі Рэфармацыі выступалі за змены ў каталіцкай царкве, каб яна стала таннай для вернікаў, за богаслужэнне на роднай мове, выказвалі пратэст супроць царквы як буйнога землеўласніка і пышных каталіцкіх набажэнстваў.

Пачынаючы з выступлення прафесара Вітэнбергскага універсітэта *Марціна Лютэра***(1517 г.),** зараджаецца пратэстантызм. *Пратэстантызм* – хрысціянскае веравучэнне, накіраванае супроць панавання каталіцкай царквы. Тэрмін "*пратэстантызм"* узнік пасля таго, як у 1529 г. некалькі князёў і група гарадоў Свяшчэннай Рымскай імперыі выступілі з пратэстам супроць рашэння імператара аб забароне далейшага распаўсюджання некаталіцкіх хрысціянскіх рухаў. Пратэстанты адмаўлялі неабходнасць царквы як пасрэдніка паміж Богам і людзьмі.

*Асаблівасць Рэфармацыі на Беларусі* ў тым, што, у адрозненне ад Еўропы, яна не стала народнай, а ахапіла толькі вышэйшыя колы грамадства. Феадальная знаць хацела ўмацаваць сваё сацыяльна-эканамічнае становішча за кошт касцёлаў і кляштароў. Буйныя магнацкія рады – Радзівілы, Хадкевічы, Сапегі – далучыліся да рэфармацыйнага руху з палітычных меркаванняў: жадалі адасобіцца ад каталіцкай Польшчы і замацаваць самастойнасць ВКЛ.

Найбольшае распаўсюджанне атрымаў кальвінізм. *Кальвінізм* – плынь пратэстантызму, заснаваная *Жанам Кальвінам* (1509-1564) у Швейцарыі. Яе

прыхільнікі ўзялі за аснову ідэю *Марціна Лютэра* аб тым, шо кожны чалавек валодае правам на свабоду сумлення (свабоду веры), што нельга прымушаць людзей верыць у што-небудзь. Кальвіністы лічылі Біблію адзінай крыніцай веры і прапаведвалі спрадвечнае наканаванне чалавечага лёсу. Паводле кальвіністскага вучэння, Бог загадзя абраў адных людзей на выратаванне, а іншых – на пагібель. Але чалавек павінен верыць, што Хрыстос выраватаў менавіта яго і даказваць гэта сваёй працавітасцю. Кальвіністы разглядалі працу як доўг чалавека перад Богам і падтрымлівалі прынцып "Хто не працуе, той не есць".

З усіх магнатаў ВКЛ першым прыняў Рэфармацыю і стаў кальвіністам *Мікалай Радзівіл Чорны* (1515-1565 гг.). Яго найвялікшы аўтарытэт і блізкасць да манаршага двара спрыялі масаваму пераходу шляхты ў кальвінізм. Намаганнямі Мікалая Радзівіла Чорнага былі заснаваны друкарні ў Брэсце і Нясвіжы. У першай з іх за кошт магната выйшла ў **1563 г.** так званая *Радзівілаўская Біблія* – пераклад кальвініСцкай Біблії на польскую мову. У ВКЛ ствараюцца *кальвінісцкія акругі-зборы,* якія складаліся з абшчын. Будуюцца храмы, школы, тыпаграфіі, прытулкі. У **20-30я гг. XVI ст.** у ВКЛ усталявалася *рэлігійная талерантнасць – верацярпімасць.*

У сярэдзіне XVI ст. з кальвінізму вылучыўся асобны накірунак Рэфармацыі – *арыянства,або рух антытрынітарыяў.* Яны адмаўлялі дагмат аб трыадзінстве Бога (Бог-Бацька, Бог-Сын, Бог-Святы Дух), лічылі Ісуса Хрыста толькі чалавекам. Арыянства падзялілася на дзве плыні: памяркоўнае і радыкальнае. Прадстаўніком першай (радыкальнай, шляхетскай) плыні ў антытрынітарызме быў *Сымон Будны* (1530-1593 гг.). Менавіта ён у **1562 г.** выдаў у Нясвіжскай друкарні *"Катэхізіс",* напісаны ў форме пытанняў і адказаў. "Катэхізіс" быў выдадзены на старабеларускай мове. Потым Будны друкаваў творы ў Брэсце, Лоску, Вільні.

Аднадумцам Буднага быў *Васіль Цяпінскі* (1530-е гг. – 1603 г.). Свае погляды ён выказваў у прадмове да перакладу Евангелля. Гэты твор Цяпінскі выдаў у заснаванай ім друкарні ў маёнтку Цяпіна, што на Лепельшчыне. Пісьменнік абараняў родную мову, гісторыю, традыцыі.

Прадстаўнікамі радыкальнай (сялянскай) плыні ў антытрынітарызме былі *Якуб з Калінаўкі і Павел з Візны.* Яны крытыкавалі каталіцкую царкву, выступалі супроць прыватнай уласнасці, эксплуатацыі сялянства, вярхоўнай улады і дзяржаўных устаноў.

Па ініцыятыве феадалаў-пратэстантаў, якія займалі многія вышэйшыя пасады, у **1563 г.** кароль польскі і вялікі князь літоўскі Жыгімонт II Аўгуст

выдаў так званыя Віленскі, а таксама Гродзенскі (**1568 г.**)*прывілеі аб ураўнанні ў правах усёй шляхты ВКЛ незалежна ад веравызнання*. У **1573 г**. у Рэчы Паспалітай Варшаўская канфедэрацыя прыняла *акт аб свабодзе веравызнання,* тэкст якога ўвайшоў у Статут ВКЛ 1588 г.

Рэфармацыя праз пратэстанцкія школы, друкарні, літаратуру спрыяла распаўсюджанню адукацыі ў грамадстве, ідэй гуманізму, верацярпімасці, міралюбства. Рэфармацыя дазволіла пэўнаму колу насельніцтва ВКЛ пазнаёміца з дасягненнямі еўрапейскай культуры.

У другой палове XVI ст. каталіцкая царква, крыху аправіўшыся ад моцнага ўдару рэфармацыі, перайшла ў наступ. Пачалася *контррэфармацыя* – рэлігійна-палітычны рух у Еўропе**,** узначалены папствам і накіраваны супроць Рэфармацыі. Галоўную ролю ў барацьбе з пратэстантамі адыгралі *іезуіты* – члены каталіцкага манаскага ордэна Таварыства Ісуса, створанага ў **1534 г.** у Парыжы іспанскім шляхціцам *Ігнаціем Лаёлам*. Ордэн стаў галоўным сродкам барацьбы з Рэфармацыяй.

**У 1569 г.** ордэн езуітаў з'явіўся ў ВКЛ. Правячыя колы Рэчы Паспалітай спрыялі ўмацаванню пазіцый каталіцкай царквы і аказвалі ёй усялякую падтрымку. Інтэлектуальную частку беларуска-украінскага грамадства езуіты прыцягвалі ў касцёлы багаслоўскай навукай, добра наладжанай сістэмай адукацыі. Адноўлены і ўзмоцненны каталіцызм выцісну́ў не толькі пратэстантызм, але і праваслаўе. Працэс акаталічвання вышэйшых колаў, уцягнутых раней у рэфармацыю, набыў масавы характар.

У выніку контррэфармацыі ў Беларусі пашыраюцца функцыі і ўладанні каталіцкай царквы. Адчыняюцца новыя касцёлы і кляштары, расце ўплыў каталіцтва на палітычнае жыццё грамадства. Многія праваслаўныя князі і магнаты, а таксама магнаты-пратэстанты і заможная шляхта пераходзяць у каталіцтва.

*Брэсцкая царкоўная ўнія* (**1596 г.).** У XVI ст. выразна праявіліся рысы крызісу праваслаўя. Канстантынопаль быў захоплены туркамі, епархіі княства не здолелі стварыць незалежную сістэму адукацыі, падрыхтаваць кваліфікаваныя кадры нізавога духавенства, наглядаўся крызіс прапаведніцтва. Праваслаўе страчвала інтэлектуальную апору – тагачасную інтэлігенцыю. Езуіт *Пётр Скарга* ў **1577 г.** выдаў кніжку “Пра еднасць царквы Божай”. У ёй знакаміты публіцыст і багаслоў пісаў: “… папы схалопелі, навука ўпала”. Скарга сцвярджаў, што адзіным выйсцем з цяжкага для праваслаўнай царквы ВКЛ становішча з'яўлаецца саюз праваслаўя з каталіцызмам. Акрамя таго, ва ўмовах Лівонскай вайны з Расіяй арыентацыя

на Маскву (цэнтр праваслаўя, бо з 1589 г. у Маскве з’явіўся свой патрыярх) выглядала здрадніцтвам.

Неабходнасць рэфармавання царквы разумелі беларускія праваслаўныя іерархі. Ініцыятарамі ўніі выступілі епіскап берасцейскі і ўладзіміскі *Іпаці Пацей* і епіскап луцкі *Кірыла Цярлецкі*. Іх падтрымалі кіеўскі мітрапаліт *Міхаіл Рагоза,* кароль Рэчы Паспалітай *Жыгімонт III Ваза***(1587-1632 гг.)** і канцлер ВКЛ *Леў Сапега.* На царкоўным саборы вясной 1595 г. з намерам заключыць унію згадзіліся ўсе праваслаўныя епіскапы, акрамя львоўскага і перамышльскага. Былі выпрацаваны ўмовы аб’яднання, згодна з якімі:

- прызнавалася вяршэнства папы рымскага над праваслаўнымі вернікамі;
- захоўваліся ўсе царкоўныя святы згодна з праваслаўным каляндаром;
- на царкоўныя пасады прызначаліся толькі “рускія” людзі;
- манастыры і цэрквы не пераўтвараліся ў касцелы;
- забаранялася пераманьваць у каталіцтва ўніятаў;
- уніяты прымалі некаторыя дагматы каталіцкай царквы (сімвал веры і інш.).

Пасля прыняцця ўніі не павінна было быць ломкі звычаяў і традыцый – знешне нічога не змянілася. На гэта вельмі спадзяваліся ініцыятары аб’яднання цэркваў. І. Пацей і К. Цярлецкі сустрэліся ў Рыме з Кліментам VIII, які згадзіўся з усімі ўмовамі. У кастрычніку 1596 г. ў Брэсце на царкоўным саборы, куды з’ехаліся прыхільнікі ўніі, уніяцтва было канчаткова аформлена як рэлігійны накірунак. У **1596 г.** каралеўскім універсалам акт уніі быў зацверджаны на дзяржаўным узроўне. Афіцыйна праваслаўная царква ў ВКЛ перастала існаваць, была створана *грэка-уніяцкая царква*.

Аднак увядзенне ўніі выклікала канфрантацыю ў грамадстве. Адбываліся сутычкі, барацьба за храмы і епіскапскія катэдры, некаторыя падзеі прымалі жудасныя формы. Жорсткая дзейнасць уніяцкага архіепіскапа *Іасафата Кунцэвіча*ў Полацку і Віцебску выклікала выбух народнага гнева – Кунцэвіч быў забіты і выкінуты ў Дзвіну (**1623 г.**). Такія паўстанні жорстка падаўляліся ўладамі, якія спачатку падтрымалі новую царкву.

Калі з канца XVI – па пачатак XVII ст. адбывалася прымусовае навязванне уніі, то ўжо пачынаючы з 30-х гг. XVII ст., назіраецца адносна памяркоўны характар станаўлення ўніяцкай царквы на беларускіх землях. Шматлікія народныя выступленні прымусілі караля Рэчы Паспалітай

*Уладзіслава IV Вазу* (1632-1648 гг.) аднавіць у **1632 г.** праваслаўную царкву. Між тым уніяцтва хутка распаўсюджвалася на Беларусі. Гэтаму спрыяла падтрымка кіруючых колаў Рэчы Паспалітай. У літургічнай храмавай службе ўніяты карысталіся польскай, царкоўнаславянскай, беларускай і лацінскай мовамі. Уніяты Рэчы Паспалітай стварылі ордэн базыліян (Святога Васіля Вялікага), які актыўна наладжваў школьную адукацыю. Нягледзячы на тое, што дзяржаўная ўлада ставілася да ўніяцкай царквы як да другароднай, уніяты ў канцы XVIII ст. на тэрыторыі ВКЛ складалі ¾ насельніцтва краіны. На тэрыторыі Беларусі з праваслаўных епархій засталася толькі адна Магілёўская.

### 3. Эканамічны і палітычны стан беларускіх зямель у XVI – XVIII ст.

У эпоху сярэднявечча галоўным сродкам вытворчасці і галоўным багаццем краіны была зямля. Права ўласнасці на зямлю належала феадалам. Сялянства, якое працавала на зямлі, мела толькі права карыстання зямлёю, за што выконвала павінасці і сплачвала падаткі. Валоданне зямлёй забяспечвала багаце шляхты. Артыкул 26 раздзела III Статута ВКЛ 1588 г. поўнасцю адлучаў земляроба ад зямлі.

За карыстанне зямлёй сяляне былі абавязаны плаціць уласніку пэўную рэнту. *Формы рэнты* былі розныя і падзяляліся на тры асноўныя віды: адработачную, грашовую і прадуктовую.

*Адработачная рэнта* была адной з самых распаўсюджаных на тэрыторыі Беларусі, яна называлася паншчынай. Сяляне, якія былі на паншчыне, называліся *“цяглыя”.*Паншчыну селянін павінен быў адпрацаваць у гаспадарскім маёнтку. Часцей за ўсё гэта былі палявыя работы, на якіх селянін быў двойчы ў тыдзень разам з канём і сваім інвентаром: сякерай, касой, бараной. Цяглыя сяляне адбывалі паншчыну не толькі на полі. Некаторая частка сялян у якасці асноўнай павіннасці абкладалася *чыншам.* Такія сяляне называліся *асаднымі, ці чыншавымі.* Чынш уяўляў сабой грашовую форму рэнты.

Разам з паншчынай і чыншам, якія былі асноўнымі павіннасцямі, сяляне выконвалі і дадатковыя: *“талокі”* – агульныя сязонныя гаспадарчыя работы, *“гвалты”, ці “згоны”* – агульныя тэрміновыя работы, прывязаныя да пэўных выпадкаў: для рамонту дарог, гацей, для аблавы на звяроў, у выпадку стыхійных бедстваў і г.д.

Прывілей **1447 г.** паклаў пачатак *юрыдычнага афармлення прыгоннага права ў ВКЛ.* Па ім забаранялася прымаць беглых сялян з прыватных

уладанняў у дзяржаўныя маёнткі і наадварот. Затым Статут ВКЛ **1529 г.** увёў *"земскую даўніну"*. У адпаведнасці з ёй "пахожы" селянін, які пражываў на зямлі феадала больш за 10 гадоў, станавіўся "непахожым" – гэта значыць прыгонным. Статут **1566 г.** дапоўніў "земскую даўніну" 10-ці гадовым пошукам беглых сялян, а ў Статуце 1588 г. гэты тэрмін быў павялічаны да 20 гадоў. Такім чынам, *сяляне Беларусі былі канчаткова запрыгонены ў канцы XVI ст.*

У першай палове XVI ст. сельская гаспадарка ВКЛ перажывала ўздым. Гандаль збожжам у Заходняй Еўропе даваў феадалам усё большы прыбытак. Усё эта патрабавала ад іх карэннай перабудовы гаспадарчай дзейнасці ў сваіх уладаннях. Феадалы ствараюць фальваркі.*Фальварак* – гэта двор і гаспадарка землеўладальніка, прадукцыя якой прызначалася для продажу. Фальваркавая гаспадарка была заснавана на выкананні работ па апрацоўцы зямлі і зборы ўраджаю сялянамі (паншчыне). Першыя фальваркі ў Вялікім Княстве Літоўскім з'явіліся ў XV ст. Асаблівае пашырэнне яны атрымалі ў сувязі з правядзеннем аграрнай рэформы **1557 г.** за подпісам Жыгімонта II Аўгуста – "*Устава на валокі", ці "валочная памера".*

Да рэформы надзелы сялянскіх зямель не толькі называліся па-рознаму ("службы", "дворышчы", "дымы", "жарэб'і" і г.д.), але і па памерах былі рознымі. Гэта змяншала прыбыткі феадалаў. З'явілася неабходнасць увесці адзіную стандартную зямельную меру і патрабаваць з яе аднолькавыя падаткі і павіннасці.

Згодна рэформе землі дзяліліся на валокі. *Валока* – зямельная плошча памерам 21,36 гектара – стала адзінкай абкладання павіннасцямі. Увядзенне валокі ўпарадкавала сялянскае землекарыстанне, павялічыла прыбытковасць панскіх маенткаў за кошт росту прыгнёту сялян, якія згодна рэформе замацоўваліся за валокай. Сялянскі надзел часцей за ўсе складаў паўвалокі – 10,6 га, бо сялянская сям'я часта не магла апрацаваць валоку і сплаціць з яе павіннасці. Сялянскія сем'і замацоўваліся за валокай ці яе часткай, станавіліся як бы дадаткам да яе, часткай уласнасці землеўладальніка. Замест натуральнай панскай гаспадаркі ўтварылася таварная гаспадарка, арыентаваная на вытворчасць зерня для продажу. У ходзе правядзення рэформы ў якасці асноўнай формы феадальнай гаспадаркі стала *фальваркава-паншчынная сістэма,* што праіснавала на беларускіх землях да сярэдзіны XIX ст.

У XVI – першай палове XVII ст. павялічваецца колькасць гарадоў і гарадскога насельніцтва Беларусі. У сярэдзіне XVII ст. на нашых землях

налічвалася 462 гарады. Буйнымі гарадамі з'яўляліся Магілёў, Полацк, Віцебск, Слуцк, Пінск, Мінск, Брэст.

Павялічвалася колькасць мястэчак. *Мястэчка* – невялікае паселішча гарадскога тыпу. Яно адрознівалася ад вёскі тым, што рамяство і гандаль у ім адыгрывалі важную ролю.

Гарады і мястэчкі ВКЛ падзяляліся на дзяржаўныя і прыватнаўласніцкія. Апошнія складалі амаль палову ад агульнай колькасці. У гарадах меліся цэлыя кварталы, заселеныя вясковымі перасяленцамі, залежнымі ад сваіх феадалаў. Гэтыя асобныя часткі горада называліся юрыдыкамі. На жыхароў юрыдык не распаўсюджвалася адміністрацыйная і судовая ўлада магістрата.

Карэнных жыхароў горада, якія не былі залежнымі ад феадалаў, называлі мяшчанамі. Прывілеяванымі жыхарамі горада былі баяры, якія валодалі ў горадзе дамамі, дварамі, землямі і лясамі за горадам, і багатыя купцы. Да "чорных" людзей адносіліся рамеснікі, дробныя і сярэднія гандляры. Значны ўплыў на жыцце гаражан аказвала духавенства.

Да пачатку XVI стагоддзя *Магдэбургскае права* мелі Вільня (**1387 г.**), Брэст (**1390 г.**), Слуцк (**1441 г.**), Гродна (**1496 г.**), Полацк (**1498 г.**), Мінск (**1499 г.**). Грамату, якая даравала гарадам Магдэбургскае права, выдаваў вялікі князь ці феадал, на землях якога ў свой час узнік горад. Паводле Магдэбургскага права гаражане вызваляліся ад феадальнай залежнасці і розных павіннасцей. Горадам кіраваў *магістрат.* У ратушы знаходзіўся выбарны орган гарадской улады – магістрат, на чале горада стаяў прызначаны каралём войт. Гарады з'яўляліся цэнтрам раместваў, унутранага і знешняга гандлю. Насельніцтва гарадоў папаўнялася за кошт сялян – уцекачоў і рамеснікаў.

Рамеснікі аб'ядноўваліся ў прафесійныя арганізацыі – цэхі. *Цэх* – аб'яднанне гарадскіх рамеснікаў адной ці некалькіх прафесій з мэтай наладжвання збыту сваёй прадукцыі і абароны ад умяшальніцтва феадалаў у гаспадарчыя справы. Цэхі ў Беларускіх гарадах называліся па-рознаму: "сотні" ў Гродна, "староствы" ў Магілеве, "брацтвы" ў Полацку і Мінску. Рамеснік, які не ўваходзіў у цэх, не мог прадаваць прадукцыю на мясцовым рынку. Каб стаць майстрам, трэба было прайсці школу вучня, падмайстра, "зрабіць штуку" – здаць экзамен на званне майстра, не больш трох спроб.

Гарады з'яўляліся цэнтрамі ўнутранага і знешнега гандлю. Ва ўсіх гарадах і мястэчках дзейнічалі кірмашы. *Кірмаш* – месца, дзе гандлююць паміж сабой усе рэгіёны Вялікага Княства Літоўскага. У буйных гарадах

кірмашы займалі вялікую плошчу, у Магілеве больш 2 гектараў, дзе размяшчаліся 400 лавак. У іх прадавалі футры, жалеза, грабяні, прыправы, іголкі, бялілы, акуляры, серу, гузікі, струны, паперу, хусткі, медзь, рукавіцы, тканіну, панчохі і інш. Былі і харчовыя рады.

Замежным гандлем займаліся вярхі гарадскога купецтва, якіх называлі *"гасцямі"*. Паступова паміж вёскамі, гарадамі і мястэчкамі пракладваліся шляхі – "гасцінцы", што звязвалі рынкі гарадоў усёй Рэчы Паспалітай, а таксама вялі да Варшавы, Познані, Гданоска, Рыгі, Каралеўца (Кёнігсберг, Калінінград), Вялікага Ноўгарада, Цверы і Масквы. Гарадскіх гандляроў, якія забяспечвалі сувязь паміж горадам і вёскай, называлі "прасоламі".

У XVII–XVIII стст. намецілася *тэрытарыяльная вытворчая спецыялізацыя*. Магілёў славіўся кушнерскім майстэрствам (апрацоўкай аўчын), Капыль – ткацтвам і вырабам адзення, Слуцк – апрацоўкай шкур, пазней слуцкімі паясамі. Узрастаючая спецыялізацыя асобных рэгіонаў Беларусі вяла да ўстанаўлення трывалых эканамічных сувязей. Асноўным транспартным сродкам для перавозу тавару была фурманка. Найважнейшай гандлёвай воднай артэрыяй служыла Заходняя Дзвіна.

З развіццём фальваркавай гаспадаркі ў знешні гандаль уключаюцца, акрамя купцоў, феадалы. Асабліва высокім на Еўрапейскім рынку быў попыт на збожжа попел (паташ), лен, лес, воск, сала, футру, скуры, смалу, каноплю, мёд. Прадметамі ўвозу ў Вялікім Княстве Літоўскім былі тканіны, прыправы, акуляры, соль, віно, манеты (яхімкі – руская назва талера – сярэбранай манеты, якую пачалі выпускаць у пачатку XVI ст. у Чэхіі).

Павіннасны цяжар свавольства членаў магістрата, працідзеянне юрыдыкам выклікалі выступленні гараджан. Найбольш значныя *выступленні рамеснікаў і гарадской беднаты* адбыліся ў Магілёве ў **1606 – 1608 гг. і 1610 г.** Магілёўскія рамеснікі на чале са Стахорам Мітковічам, Пятром-кавалем, Мікітам-збройнікам, Харапонам – краўцом, Ходкам Багдановічам ліквідавалі гарадскую раду, і больш за два гады рамесніцкая рада кіравала горадам у інтарэсах рамеснага люду. У 1608 годзе ўлады вярнулі ўладу быломy магістрату. Удзельнікаў паўстання жорстка пакаралі.

У 10–30-х гадах XVIII ст. на беларускіх землях з'явіліся мануфактуры.*Мануфактура* – капіталістычнае прадпрыемства, якое заснавана на ручной працы і шырокім яе падзеле. Мануфактура з'яўляецца пераходнай формай ад рамеснай вытворчасці да капіталістычнай фабрыкі. Першыя мануфактуры – Налібоцкая і Урэцкая шкляныя мануфактуры, Свержаньская фаянсавая.

У другой палове XVIII ст. Рэч Паспалітая стала арэнай ваенных дзеянняў паміж буйнымі еўрапейскімі дзяржавамі. У **1700-1721 гг.** распачалася вайна Расіі супраць Швецыі (*“Паўночная вайна”*), якая таксама закранула тэрыторыю Беларусі. Рэч Паспалітая выйшла з яе аслабленай у палітычных, эканамічных, дэмаграфічных адносінах. Становішча краіны ўскладнялася таксама нацыянальна-рэлігійнымі і сацыяльнымі канфліктамі. Гэтыя канфлікты, асабліва рэлігійныя, ўсяляк заахвочвалі суседнія дзяржавы, якім было выгадна мець слабага суседа.

Моц дзяржавы падрывалася яшчэ і *феадальнай анархіяй,* якая паралізавала дзейнасць цэнтральнай улады. Улада караля была вельмі слабай, дзейнасць сеймаў паралізавала *права “ліберум вета”*. Гэтая анархія ўзмацнялася барацьбой паміж сабой магнацкіх груповак, якая часам набывала формы вайны у маштабах дзяржавы. Узброеныя сутыкненні часам перарасталі ў сапраўдныя бітвы з удзелам тысяч людзей, прымяненнем цяжкага ўзбраення, асадай замкаў і г.д. Эканамічны заняпад і палітычны разброд паслаблялі ваенную магутнасць Рэчы Паспалітай. Шляхта з неахвотай і неарганізавана збіралася на “паспалітыя рушэнні” і па сваіх баявых якасцях уступала рэгулярным войскам іншых краін.

У 1764 г. на польскі трон быў узведзены *Станіслаў Аўгуст Панятоўскі***(1764-1795 гг.).** Ён паспрабаваў правесці абмежаваныя рэформы: часткова адмяніў права “ліберум вета”, некаторыя эканамічныя прывілегіі шляхты, зрабіў захады па ўпарадкаванню фінансавай сістэмы дзяржавы. Але гэта не здавальняла суседнія дзяржавы, асабліва Расію і Прусію, якія былі зацікаўлены ў слабасці краіны.

Зачэпкай для прамога ўмяшання ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай стала рэлігійнае пытанне. Пад выглядам абароны правоў праваслаўных і ўніятаў Расія і Прусія садзейнічалі стварэнню ў Слуцку праваслаўнай, ў Торуні пратэстанскай *канфедэрацый*. На дапамогу ім былі накіраваны рэгулярныя войскі. Калі ж у **1767 г.** сейм ураўняў правы каталікаў і праваслаўных, гэта ўжо выклікала нездавальненне часткі каталічнай шляхты і магнатаў. Яны стварылі ў **1768 г.** ў г. *Бары каталіцкую канфедэрацыю*. Пачаліся ваенные дзеянні, у якіх актыўна ўдзельнічалі і рускія войскі. Гэтую сітуацыю выкарысталі Расія, Прусія і Аўстрыя, якія ў **1772 г.** прынялі рашэнне аб *першым падзеле Рэчы Паспалітай*. Згодна з ім да Расіі адыйшлі ўсходнія землі Беларусі і Ўкраіны.

З мэтай захавання застаўшайся часткі дзяржавы Сейм Рэчы Паспалітай, які працягваўся чатыры гады, **з 1788 па 1992 гг.,** аб’явіў сябе генеральнай

канфедэрацыяй, каб не прымяняць права “ліберум вета”, і прыняў шэраг законаў, накіраваных на ўзмацненне цэнтральнай ўлады. Важнейшыя з іх увайшлі ў *Канстытуцыю*, якая была прынята **3 мая 1791 года**. Згодна з ёю, заканадаўчая ўлада належыла сейму, пры гэтым адмянялася права “ліберум вета”, забараняліся канфедэрацыі. Адмянялася выбарнасць караля, яго ўлада аб’яўлялася спадчыннай. Пашыраліся паўнамоцтвы караля. Некалькі абмяжоўваліся правы шляхты, у прыватнасці, павышаўся маёмасны і ўзроставы цэнз пр выбарах дэпутатаў сейма. У той жа час пашыраліся правы мяшчан.

Частка шляхты, нездаволеная стратай шляхецкіх вольнасцей, у 1792 г. абвясціла *Таргавіцкую канфедэрацыю* з мэтай адмены Канстытуцыі 3 мая. Расія, зацікаўленая ў паслабленні цэнтральнай улады ў Рэчы Паспалітай, накіравала на дапамогу канфедэрацыі 100-тысячную армію. Пры гэтым яна выкарыстала склаўшуюся сітуацыю і ў студзені **1793 г.** разам з Прусіяй ажыццявіла *другі падзел*. Згодна з ім да Расіі адыйшла цэнтральная частка Беларусі. Канстытуцыя 3 мая 1791 г. была адменена, аднаўлялася выбарнасць караля.

У **сакавіку-лістападзе 1794 г.** на ўцалелай ад двух падзелаў Рэчы Паспалітай тэрыторыі разгарнулася *паўстанне пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі*. Мэтай яго было аднаўленне Канстытуцыі 3 мая 1794 года, Рэчы Паспалітай ў межах 1772 года. Паўстанцы авалодалі Вільняй, барацьба разгарнулася ў Літве і Заходняй Беларусі. Тут яе узначаліў *Якуб Ясінскі.* Найбольш значныя сутыкненні паўстанцаў з расійскімі войскамі адбыліся пад Слонімам, Вільняй. Паўстанне было падаўлена, пасля чаго ў **1795 г.** адбыўся *трэці падзел Рэчы Паспалітай* паміж Расіяй, Аўстрыяй і Прусіяй. Да Расіі адышлі Прыбалтыка, Заходнія Беларусь і Ўкраіна.

Такім чынам, у выніку трох падзелаў Рэч Паспалітая як дзяржава спыніла сваё існаванне. Беларускія землі адыйшлі да Расійскай імперыі. З аднаго боку, пашырэнне ўнутранага рынку і эканамічнай прасторы, больш спакойныя ўмовы жыцця без феадальнай анархіі і шматлікіх войн спрыялі эканамічнаму развіццю Беларусі. Але, з другога боку, асноўная маса насельніцтва трапіла пад больш цяжкі гнёт расійскай манархіі.

## 4. Культура беларускага народа ў XVII–XVIII стст.

*Асветніцтва* – гэта эпоха пашырэння адукацыі, развіцця навук, што мела месца ў еўрапейскіх краінах у XVII-XVIII стст. У Беларусі ідэі Асветніцтва распаўсюдзіліся ў **другой палове XVIIIст.**

Асветніцтва з'явілася працягам гуманістычных традыцый Адраджэння і было накіравана на аднаўленне і ўдасканаленне грамадства праз развіццё асветы і навукі. Галоўнай задачай асветніцтва было ліквідаванне сярэдневяковага феадальна-царкоўнага светапогляду і ўсталяванне новай буржуазнай культуры, а значыць, ліквідацыя феадальнага ладу, зжыўшага сябе, і пераход да новага буржуазнага ладу.

Правадніком ідэй Асветніцтва на Захадзе была буржуазія, у ВКЛ – перадавыя прадстаўнікі шляхты.

Ідэі Асветніцтва ў Беларусі ўвасаблялі ў жыццё асобныя актыўныя рэфарматары, якія марылі аб адраджэнні Рэчы Паспалітай, перабудове яе грамадска-палітычнага ладу. Вядомыя грамадскія дзеячы таго часу імкнуліся вырашыць сялянскае пытанне. Яны выступалі за роўнасць сялян з іншымі саслоўямі, за наладжванне сістэмы сялянскай асветы.

Віднейшым рэфарматарам, прыхільнікам Асветніцтва быў *Антоній Тызенгауз* – дзяржаўны і грамадскі дзеяч ВКЛ, мецэнат, які арганізаваў у Гродне шэраг мануфактур, тэатр, тэатральна-музычную школу, стаў ініцыятарам выдання *“Газеты гродзенскай”* (**1776 г.**) – першай газеты на беларускіх землях, заснаваў на каралеўскія сродкі кадэцкую землямерную, бухгалтарскую, медыцынскую школы, і запрасіў для працы ў іх замежных выкладчыкаў, сярод якіх быў выдатны французскі вучоны – натураліст *Жан Эмануэль Жылібер* (1741-1814 гг.). Жылібер узначаліў у 1775 г. гродзенскую медыцынскую школу, спрыяў стварэнню багатай школьнай бібліятэкі, анатамічнага тэатра, аптэкі. Ён заклаў у Гродне першы ў Рэчы Паспалітай батанічны сад, напісаў двухтомны твор "Літоўская флора".

*Іахім Храптовіч* – актыўны дзеяч Асветніцтва, рэфарматар, апошні канцлер ВКЛ, стварыў у сваім маёнтку Шчорсы (Наваградкі павет) і Вішнева (Ашмянскі павет) ўзорныя сельскагаспадарчыя абшчыны. Ён заключаў з кожным сялянскім дваром дагавор, па ўмовах якога прыгонным было выгадна мець як мага большыя ўраджаі. Храптовіч сабраў вялікую бібліятэку, у якой налічвалася звыш з 10 тысяч кніг.

У **1773 г.** у Рэчы Паспалітай была створана *Адукацыйная камісія* – першае у Еўропе Міністэрства адукацыі, якое ажыццявіла рэформу школы ў духу Асветніцтва. За 20 год на Беларусі было адкрыта 20 школ, якія давалі сярэднюю адукацыю і права паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы, якіх было на той час у Рэчы Паспалітай дзве: Кракаўскі ўніверсітэт і Галоўная школа ВКЛ, з **1803 г.** пераўтвораная ў *Віленскі ўніверсітэт*.

Рэформа адукацыі 1770–1790 гг. зрабіла яе больш даступнай, свецкай і арыентавала на развіццё разумовых здольнасцей дзяцей.

У **другой палове XVIII ст.** у Беларусі распаўсюдзіліся *ідэі фізіякратаў*, якія лічылі зямлю і земляробства адзінай крыніцай багацця, а сельскагаспадарчую працу – адзінай вытворчай працай (М. Карповіч, І. Страйкоўскі, І. Храптовіч).

У *выяўленчым мастацтве* Беларусі пашыраюцца іканапіс, фрэскі, дэкаратыўная скульптура палацаў і культавых збудаванняў. Сярод твораў жывапісу найбольшую цікавасць выклікаюць абразы "Адзігітрыі Іерусалімскай" з Варварынскай царквы ў Пінску, "Замілаванне" з Маларыты. Адзінай іконай XVIII ст., аўтар якой вядомы, з'яўляецца ікона "Нараджэнне Маці Боскай", створаная ў 1649 г. Пятром Яўсеевічам з Галынца. Фоны абразоў часта ўпрыгожваліся разьбяным залачоным арнаментам. З канца XVI ст. у жывапісе, акрамя партрэтнага, узнікаюць гістарычны, батальны і нацюрмортны. Усё больш важнае месца пачыналі займаць кніжная мініяцюра і гравюра. Захапленне шляхціцкім саслоўем сваімі генеалагічнымі каранямі прывяла да распаўсюджання "сармацкага партрэта".

У *дойлідстве* ў канцы XVI–XVIII стст. пануе еўрапейскае барока, заснавальнікам яго ў Беларусі стаў італьянскі архітэктар Джавані Бернардыні, які ў канцы XVI ст. пабудаваў у *Нясвіжы іезуіцкі касцёл.* Барочнай архітэктуры ўласціва прастор, ансамблевасць, дынамічнасць кампазіцыі. У XVII – першай палове XVIII ст. склаўся архітэктурны стыль – віленскае барока, які знайшоў увасабленне сярод уніяцкіх храмаў. У стылі віленскага барока перабудаваны Полацкі Сафійскі сабор, узведзена царква ў Жыровічах, Андрэеўскі касцёл у Слоніме.

У XVII-XVIIIстст. хутка развівалася *тэатральнае і музычнае мастацтва.* Значнай папулярнасцю карысталіся невялікія драматычныя творы – інтэрмедыі, якія ставілі навучэнцы сярэдніх школ і калегіумаў. Папулярнымі ў народзе былі скамарохі, якія выступалі з драматычнымі і камічнымі інтэрмедыямі, вандроўныя акцёры, якія карысталіся рознымі струннымі і ўдарнымі інструментамі (гудкамі, свістулькамі, бубнамі, скрыпкамі). У XVII ст. у Смаргоні была створана спецыяльная акадэмія па падрыхтоўцы акцёраў і дрэсіроўцы мядзведзяў, так званая мядзвежая акадэмія. У XVI ст. узнік народны лялечны тэатр – батлейка, які ўключаў песні, танцы, маналогі, дыялогі. У прыватных маёнтках у Нясвіжы, Слоніме, Ружанах узнікаюць спачатку аматарскія трупы з удзелам прыгонных акцёраў,

членаў сям'і гаспадара. Крыху пазней на іх аснове ўзніклі фактычна прафесійныя прыгонныя тэатры.

*Навука* развівалася намаганнямі геніяльных вучоных–адзіночак. Сярод іх *Казімір Семяновіч*(1600-1651 гг.). Ён у 1650 г. у Амстэрдаме выдаў кнігу "Вялікае мастацтва артылерыі". Ён першым у сусветнай навуцы стварыў праект многаступенчатай ракеты, стаў папярэднікам Цыялкоўскага і Каралёва ў справе асваення космасу.

*Казімір Лышчынскі* (1634-1689 гг.) напісаў трактат "Аб неіснаванні Бога", у якім сцвярджаў, што Бог з'яўляецца фантазіяй людзей. Каталіцкае духавенства вынесла вучонаму смяротны прысуд. 30 сакавіка 1689 г. у Варшаве К. Лышчынскі быў абезгалоўлены і спалены на вогнішчы.

*Сімяон Полацкі* (1629-1680 гг.) напісаў зборнікі "Вертаград мнагацветны", "Рыфмалагіён, ці Вершаслоў", пісаў на беларускай, лацінскай, польскай і стараславянскай мовах. С. Полацкі займаўся педагагічнай дзейнасцю, быў выхавацелем царскіх дзяцей, у 1679 г. надрукаваў для васьмігадовага Пятра І "Буквар языка славенска", а у 1680 г. выдаў "Псалтыр рыфмаваную", стаў заснавальнікам Славяна-грэка-лацінскай акадэміі.

**Кантрольныя пытанні і заданні для самападрыхтоўкі студэнтаў:**

1. Назавіце прычыны ўтварэння Рэчы Паспалітай.
2. Укажыце асаблівасці фарміравання канфесійных адносін на тэрыторыі Беларусі ў XVI–XVII стст.
3. Што такое "валочная памера"?
4. Пералічыце асаблівасці культуры беларускага народа ў XVII–XVIII стст.

## Літаратура:


1. Беларусь: страницы истории /редсовет: А. А. Коваленя [и др.]. – Минск, 2011.
2. Бригадин, П. И. История Беларуси в контексте европейской истории: курс лекций. – Минск, 2007.
3. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Т. 3. : Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (ХУІІ–ХУШ стст.). – Мінск, 2004.
4. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. / А. А. Каваленя [і інш.] ; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. – Мінск, 2011. – Кн. 1.
5. Канфесіі на Беларусі (канец XVIII – XX ст.). – Мінск, 1998.

6. Очерки истории науки и культуры Беларуси. IX—XX вв. – Минск. 1996.
7. Падокшын, С. А. Унія. Дзяржаўнасць. Культура: Філасофска-гістарычны аналіз / С. А. Падокшын. – Мінск, 2000.
8. Парашкоў, С.А. Гісторыя культуры Беларусі / С.А. Парашкоў. – Мінск, 2004.
9. Эканамічная гісторыя Беларусі : курс лекцый / В. І. Галубовіч [і інш.] – Мінск, 1993.

## Тема 3.2. Беларусь у складзе Расійскай дзяржавы.

*Кючавыя паняцці*: Беларускае генерал-губернатарства; мяжа “яўрэйскай аселасці”; шляхецкае паўстанне 1830-1831 гг.; Камітэт па справах заходніх губерняў; “разбор шляхты”; “Таварыствы філаматаў і філарэтаў”; народнікі; група “Гоман”; адмена прыгону; рэвалюцыя 1905-1907 гг.; сталыпінская аграрная рэформа; заходнерусізм; Беларуская Сацыялістычная Грамада; газета “Наша ніва”, Беларускае таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны; новая беларуская літаратурная мова.

### План лекцыі:

1. Асноўныя напрамкі палітыкі самадзяржаўя ў Беларусі ў першай палове XIX ст.
2. Расійскі шлях палітычнай і эканамічнай мадэрнізацыі (другая палова XIX – пачатак XX ст.).
3. Грамадска-палітычнае жыццё Беларусі ў пачатку XX ст.
4. Беларускі нацыянальна-культурны рух.
5. Культура Беларусі XIX – пачатку XX ст.

### 1.Асноўныя напрамкі палітыкі самадзяржаўя ў Беларусі ў першай палове XIX ст.

*Шляхецкае паўстанне 1830-1831 гг.*У лістападзе 1830 г. у Варшаве пачалося шляхецкае паўстанне ў адказ на парушэнне расійскімі ўладамі польскай Канстытуцыі 1815 г. Штуршком да пачатку паўстання быў намер расійскага цара *Мікалая I***(1825-1855 гг.)** паслаць польскае войска на падаўленне рэвалюцыі ў Францыі і Бельгіі.

Галоўнай мэтай паўстання было аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. У ходзе паўстання вылучыліся дзве плыні: шляхецка-рэвалюцыйная

на чале з гісторыкам *Іаахімам Ляевелем*, прыхільнікі якой вылучылі *лозунг “За нашу і вашу свабоду”* і імкнуліся пашырыць паўстанне на зямлі былога ВКЛ, і кансерватыўна-арыстакратычная на чале з князем *Адамам Чартарыйскім.*

Актыўнымі ўдзельнікамі паўстання былі шляхта, студэнцкая моладзь, частка каталіцкага і ўніяцкага духавенства. Сяляне і мяшчане набіраліся ў атрады пераважна пад прымусам і незаўсёды былі зацікаўлены ваяваць.

Кульмінацыяй паўстання стала *бітва за Вільню***19 чэрвеня 1831 г.,** у якой аб’яднаныя сілы паўстанцаў былі разбіты расійскім войскам на чале з генерал-фельдмаршалам І. Паскевічам. У жніўні 1831 г. паўстанне было падаўлена.

Многія яго ўдзельнікі былі аддадзены пад суд. У шляхціцаў – удзельнікаў паўстання – канфіскоўваліся маёнткі, асабліва ў Гродзенскай і Віленскай губернях. Удзельнікаў паўстання недваранскага паходжання аддавалі ў салдаты ці адпраўлялі ў ссылку ў Сібір.

Ва ўрадавай палітыцы на Беларусі ў 30-я гады адбыліся карэнныя змены з мэтай аслаблення польскага ўплыву і падаўлення вызваленчага руху. З **1831 па 1848 г.** у якасці дарадчага органа пры цару дзейнічаў *Камітэт па справах заходніх губерняў*, які праводзіў палітыку насаджэння рускага памешчыцкага землеўладання і чыстку ад памешчыкаў “польскага” паходжання і назначэння на іх месца рускіх чыноўнікаў.

У 1831 г. распачаўся *“разбор шляхты”*. Кожны шляхціц павінны быў прад’явіць дакументы на дваранскае званне. Хто не меў адпаведных папер, пераводзіўся ў падатковае саслоўе аднадворцаў у сельскай мясцовасці і грамадзян у гарадах. Цяпер ужо былыя шляхціцы пазбаўляліся права валодаць маёнткамі і павінны былі прадаць сваю ўласнасць, плаціць падымны збор, выконваць рэкруцкую павіннасць. У лік аднадворцаў у пачатку 40-х гг. было пераведзена больш за 20 тыс. мужчынскіх душ.

У **1831 г.** спынялася дзеянне Статута ВКЛ 1588 г. у Віцебскай і Магілёўскай, а ў **1840 г.** – у Гродзенскай, Віленскай і Мінскай губернях і ўводзілася расійскае заканадаўства.

Царскі ўказ **1840 г.** забараняў ужыванне тэрмінаў “Беларусь”, “Літва”, “беларускія”, “літоўскія губерні”, уводзілася назва “Паўночна-Заходні край”, ці назвы асобных губерняў: Віцебская, Магілёўская, Гродзенская, Віленская.

У **1832 г.** быў закрыты Віленскі ўніверсітэт. У 1832-1841 гг. царскім указам праводзіцца *секулярызацыя зямельных уладанняў* каталіцкай і ўніяцкай царквы. У **1839 г.** на царкоўным саборы ў Полацку было прынята

рашэнне аб *далучэнні ўніяцкай царквы да праваслаўнай*. Была адменена аўтаномія Польшчы і Канстытуцыя 1815 г. У **1836 г.** было забаронена выкладанне польскай мовы як вучэбнага прадмета, справаводства і школьнае навучанне пераводзілася на рускую мову. У 1855 г. Мікалай І выдаў указ, згодна якому ўсе значныя дзяржаўныя, гарадскія, земскія пасады павінны займаць рускія чыноўнікі праваслаўнага веравызнання. Русіфікацыя Беларусі ўзмацнялася.

Пад уплывам ідэй Французскай рэвалюцыі канца XVIII ст. на тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай разгарнуўся *нацыянальна-вызваленчы рух,* цэнтрам якога быў Віленскі ўніверсітэт. Рух быў прадстаўлены тайнымі таварыствамі і гурткамі ў якія ўваходзілі студэнты, навучэнцы гімназій, вайскоўцы.

У **1817 г.** па ініцыятыве студэнтаў Віленскага ўніверсітэта *Адама Міцкевіча, Тамаша Зана, Яна Чачота* было створана *"Таварыства філаматаў"* (аматараў ведаў), якое займалася культурна-асветніцкай дзейнасцю, даследваннем фальклору, вераванняў, гісторыі Беларусі, выступала з асуджэннем феадальнага ўціску сялян. З **1820 па 1823 гг.**дзейнічала *"Таварыства філарэтаў"* (аматараў дабрачыннасці), створанае Т. Занам і М. Рукевічам на аснове *"Таварыства прамяністых"* з мэтай пашырэння асветы ў грамадстве і прапаганды ідэі волі і роўнасці, што прывяло да забароны таварыства і масавых арыштаў. Ад працы былі адхілены надхняльнікі моладзі прафесары Віленскага ўніверсітэта Іаахім Лялевель, Міхаіл Баброўскі, Ігнат Даніловіч.

## 2. Расійскі шлях палітычнай і эканамічнай мадэрнізацыі (другая палова XIX – пачатак XX ст.).

**19 лютага 1861 г.** цар *Аляксандр ІІ***(1855-1881 гг.)** падпісаў *Маніфест аб адмене прыгоннага права* і заканадаўчыя акты (палажэнні) аб сялянах, якія выйшлі з прыгоннай залежнасці. 5 сакавіка 1861 г. гэтыя дакументы былі апублікаваны.

*"Агульнае палажэнне"* дэкларавала аб скасаванні назаўсёды прыгоннага права, вызначала асабістыя і маёмасныя правы сялян, парадак утварэння сельскага кіравання і выканання сялянамі дзяржаўных, земскіх і мірскіх павіннасцяў. *"Мясцовыя палажэнні"* ўстанаўлівалі ў залежнасці ад мясцовых умоў парадак надзялення сялян зямлёй і выканання імі павіннасцяў на карысць памешчыкаў. У Магілёўскай і васьмі паветах Віцебскай губерняў землеўпарадкаванне сялян праводзілася па "Мясцоваму палажэнню для

велікарускіх, новарасійскіх і беларускіх губерняў”, а ў Віленскай, Гродзенскай, Мінскай і чатырох паветах Віцебскай губерняў –па асобнаму “Мясцоваму палажэнню”.

Паводле “Агульнага палажэння” памешчык заставаўся ўласнікам усёй належачай яму да рэформы зямлі, але частку яе ён быў вымушаны адвесці для сялянскіх надзелаў. Сяляне атрымлівалі зямельны надзел не ў асабістую ўласнасць, а ў пастаяннае карыстанне. Да заключэння выкупной здзелкі селянін знаходзіўся ў станечасоваабавязанага і выконваў на карысць памешчыка вызначаныя павіннасці. Толькі пасля заключэння выкупной здзелкі з памешчыкам сяляне станавіліся ўласнікамі зямельнага надзелу. Памер выкупной сумы зямельнага надзелу вызначаўся на аснове 6%-най капіталізацыі гадавога аброку. Сяляне былі павінны заплаціць памешчыку 20 – 25 % гэтай сумы, а астатнюю частку (80–75 %) памешчыкі атрымлівалі ад дзяржавы ў выглядзе каштоўных папер. Для ажыццяўлення выкупной аперацыі дзяржава давала сялянам доўгатэрміновую грашовую пазыку (на 49 гадоў). Памер выкупу значна перавышаў фактычны кошт зямлі. Так, рыначны кошт зямлі ў Мінскай губерні складаў 18 руб. за дзесяціну, а па выкупу сяляне павінны былі заплаціць за яе 79 руб. 20 кап.

У сувязі з паўстаннем 1863-1864 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі царызм вымушаны быў увесці *пэўныя змены ў правядзенні рэформы для беларускіх губерняў*:

ліквідацыю “часоваабавязаннага” становішча сялян і ўвядзенне абавязковага выкупа сялянскіх надзелаў;

- памяншэнне на 20% выкупных плацяжоў;
- вяртанне сялянам зямлі, адабранай у іх з 1857 г. (адрэзкі);
- надзяленне беззямельных сялянскіх сем’яў трыма дзесяцінамі зямлі;
- передачу сялянам часткі зямлі ўдзельнікаў паўстання.

Адмена прыгоннага права спалучалася з шэрагам іншых рэформаў (ваенная, судовая, школьная, гарадская), якія спрыялі пераходу Расіі на капіталістычны шлях развіцця. Аднак у Беларусі гэтыя рэформы праводзіліся пазней, са змяненнямі і абмежаваннямі.

*Паўстанне* **1863-1864 гг.**Адмена прыгоннага права супала з актывізацыяй новай хвалі рэвалюцыйнага руху на землях былой Рэчы Паспалітай. Шляхецкія рэвалюцыянеры падзяляліся на «белых» і «чырвоных». Большасць «белых» паходзіла з памешчыцкіх колаў. «Чырвоная» плынь была значна больш стракатай па паходжанні. Калі *«белыя»* ставілі перад сабой мэту – толькі *адраджэнне былой дзяржавы ў*

*межах 1772 г.*, то *«чырвоныя» – вырашэнне эканамічных і сацыяльных пытанняў.*

Летам 1862 г. прадстаўнікі «левых» для падрыхтоўкі паўстання стварылі ў Вільні Літоўскі правінцыяльны камітэт (ЛПК). На чале яго стаяў выдатны дзеяч беларускага дэмакратычнага руху *Канстанцін Каліноўскі*. Ён выступаў за разгортванне сялянскай рэвалюцыі. Шляхта, на яго думку, з'яўлялася «прагніўшай і разбэшчанай кастай». Разам з *У. Урублеўскім і Ф. Ражанскім* у **1862–1863 гг.** К. Каліноўскі выдаваў першую нелегальную газету на беларускай мове *«Мужыцкая праўда».*

У студзені 1863 г. ў Польшчы пачалося паўстанне. 1 лютага 1863 г. ЛПК таксама звярнуўся да насельніцтва з адозвай браць у рукі зброю. У паўстанні прымала актыўны ўдзел шляхта, некалькі ў меншай ступені – сяляне. Ваенныя дзеянні паўстанцаў нагадвалі партызанскія акцыі: адкрыта ўступаць у бітву з расійскімі войскамі большасць не рашалася. 24 красавіка 1863 г. атрад Л. Звяждоўскага захапіў павятовы цэнтр Горкі. У гэтым яму дапамагалі студэнты мясцовага земляробчага інстытута.

Аднак спрэчкі паміж «белымі» і «чырвонымі», дрэнная падрыхтоўка і рэпрэсіі царскага ўрада прывялі да паражэння паўстання. 22 сакавіка 1864 г. захоплены ў палон К. Каліноўскі быў пакараны смерцю. Віленскі генерал-губернатар *М. Мураўёў*, які атрымаў ад цара неабмежаваныя паўнамоцтвы, жорстка расправуляўся з паўстанцамі. 128 з іх былі пакараны смерцю, 800 – адпраўлены на катаргу, больш за 12 тысяч – высланы з Беларусі.

Памешчыкі і сяляне-католікі абмяжоўваліся ў сваіх правах. Быў зачынены Гора-Горацкі земляробчы інстытут, апошняя вышэйшая навучальная ўстанова на Беларусі. Фактычна была забаронена і беларуская мова. Разам з тым, сяляне былі вызвалены ад стану часоваабавязаных. Беззямельныя сяляне атрымоўвалі невялікія надзелы. Пасля падаўлення паўстання царызм таксама правёў некаторыя ліберальныя рэформы: *земскую* (1864*), судовую* (1864*), гарадскую* (1870*) і ваенную* (1874*).* Аднак на Беларусі з-за недаверу царскага ўрада да мясцовага насельніцтва гэтыя рэформы ў поўным аб'ёме прайшлі толькі на пачатку XX ст.

У другой палове XIX ст. у палітычны рух актыўна ўключыліся спачатку прадстаўнікі трэцяга саслоўя – *разначынцы*, а на пачатку XX ст. – і *рабочыя*. Асаблівай папулярнасцю карысталіся рэвалюцыйныя ідэі, накіраваныя на радыкальныя змены ў грамадстве. З 1860-ых гг. сярод інтэлігенцыі Беларусі пачалі распаўсюджвацца *народніцкія ідэі.*У 1880-я гг. у розных гарадах дзейнічалі народніцкія гурткі, падпарадкаваныя расійскім

арганізацыям *«Чорны перадзел» і «Народная воля».* У **1882 г.** у Вільні была створана *«Арганізацыя «Народнай волі» у Паўночна-Заходнім краe».* Многія прадстаўнікі народніцтва на Беларусі актыўна цікавіліся жыццём народа, удзельнічалі ў палітычнай і асветніцкай рабоце. У асноўным, яны арыентаваліся на сялянскія масы і бачылі ў сялянскіх абшчынах правобраз будучага сацыялістычнага грамадства.

У **1880-я гг.** ў Пецярбургу дзейнічала беларуская народніцкая *група «Гоман»*, якая выдавала нелегальны часопіс на беларускай мове. У 1881 г. адзін з арганізатараў «Гоману», *Ігнат Грынявіцкі,* разам з рускімі рэвалюцыянерамі здзейсніў замах на Аляксандра ІІ. Бомба, кінутая ім, аказалася для цара смяротнай. Сам І. Грынявіцкі таксама загінуў.

У **1897 г.** прадстаўнікі яўрэйскіх марксісцкіх колаў аб’ядналіся ва *Усеагульны яўрэйскі рабочы саюз у Літве, Польшчы і Расіі (Бунд).* У **1898 г.** пры падтрымцы ЦК Бунда ў Мінску адбыўся першы з’езд *Расійскай Сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі (РСДРП).*

Працэс стварэння палітычных партый значна паскорыўся падчас *буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі*~~**1905–1907 гг.**~~ Асноўныя падзеі рэвалюцыі адбываліся па-за межамі Беларусі, аднак і тут праходзілі мітынгі, забастоўкі і сялянскія выступленні. **17 кастрычніка 1905 г.** апошні расійскі цар *Мікалай ІІ***(1894–1917 гг.)** падпісаў *Маніфест*, згодна якому ў Расіі былі дазволены асноўныя грамадзянскія свабоды, а таксама заканадаўчы орган – Дзяржаўная дума. **18 кастрычніка 1905 г.** па загадзе губернатара Курлова ў Мінску была расстраляна мірная дэманстрацыя гараджан. Сутычкі з паліцыяй і армейскімі часцямі адбыліся і ў іншых гарадах.

У 1905–1906 гг. былі створаны *Канстытуцыйна-каталіцкая партыя Літвы і Беларусі,* суполкі агульнарасійскіх партый *эсэраў, кадэтаў, акцябрыстаў* і інш. Актывізавалі сваю дзейнасць суполкі РСДРП, Бунда і іншых сацыялістычных партый.

Царскія ўлады актыўна падтрымлівалі стварэнне рэакцыйных крайне правых арганізацый, накшталт *Саюза Рускага Народа і Рускага Акраіннага Саюза*, прадстаўнікі якіх прапагандавалі вялікадзяржаўны шавінізм і арыентаваліся на манархію. **9 ліпеня 1906 г.** ўладамі была распушчана І Дума, а **3 чэрвеня 1907 г.** і ІІ Дума. Новае выбарчае заканадаўства павінна было садзейнічаць выбранню прыхільнікаў царскага самаўладдзя. Такім чынам, рэвалюцыя скончылася паражэннем. Але яна паказала, што сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне народа залежаць ад яго згуртаванасці і свядомасці.

У пачатку XX ст. аграрная праблема была ў ліку найбольш вострых як у Беларусі, так і ў цэлым у Расійскай імперыі, пра што сведчыў моцны выбух сялянскага руху падчас рэвалюцыі 1905-1907 гг. Усё гэта абумовіла правядзенне царскім урадам *аграрнай рэформы*, накіраванай на паскарэнне развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы, павышэнне яе прадукцыйнасці, а таксама стварэнне ў вёсцы новай апоры царызму з ліку прадпрымальных заможных сялян. Указ аб правядзенні рэформы быў выдадзены **9 лістапада 1906 г.** Паколькі яе галоўным ініцыятарам з’яўляўся кіраўнік царскага ўрада Петр Сталыпін, яна атрымала назву *сталыпінскай*. Рэформа ўключала ў сябе наступныя накірункі:

- замацаванне за сялянамі права на выхад з абшчыны і пераход зямельных надзелаў, якія імі апрацоўваліся, у прыватную ўласнасць;

- наданне сялянам права аб’ядноўваць надзелы, якія імі апрацоўваліся ва ўмовах цераспалосіцы, у адзіным комплексе (водруб), або ўвогуле высяляцца з вёскі і фарміраваць асобную сядзібу з прылеглымі да яе сельскагаспадарчымі ўгоддзямі (хутар);

- арганізацыя мерапрыемстваў, накіраваных на развіццё агратэхнікі, меліярацыі, распаўсюджанне сельскагаспадарчых машын і абсталявання, падрыхтоўку аграномаў, заатэхнікаў, ветэрынараў, заахвочванне развіцця сельскагаспадарчай кааперацыі;

- матэрыяльная падтрымка заможнага сялянства ў набыцці зямлі, сельскагаспадарчых машын, увядзенні перадавых форм гаспадарання, у першую чаргу шляхам выдачы крэдытаў праз Сялянскі пазямельны банк;

- арганізацыя перасялення сялян на свабодныя землі Сібіры, Цэнтральнай Азіі і Далёкага Усходу з мэтай змяншэння сялянскага малазямелля ў еўрапейскай частцы імперыі;

- адмена для сялян абмежаванняў на свабодны выбар пастаяннага месца жыхарства, паступленне ў сярэднія і вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Спецыфіка сітуацыі ў Беларусі складалася ў тым, што ў Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях абшчына на той час ужо не існавала, таму праблема фарміравання сялянскай прыватнай зямельнай уласнасці тут была неактуальнай. Рэформа праводзілася пераважна на тэрыторыі Віцебскай і Магілёўскай губерняў. Блізкасць гэтых губерняў да тэрыторый з падворным землекарыстаннем, а таксама адносна высокі ўзровень развіцця рыначных адносін у параўнанні з іншымі рэгіёнамі Расійскай імперыі абумовілі тут высокія тэмпы правядзення рэформы.

Правядзенне сталыпінскай аграрнай рэформы было спынена ў сувязі з Першай сусветнай вайной. Праведзеныя ў яе межах мерапрыемствы садзейнічалі развіццю рыначных капіталістычных адносін у сельскай гаспадарцы. Аднак дадзеныя працэсы не маглі карэнным чынам паскорыць мадэрнізацыю сельскай гаспадаркі, галоўнымі прычынамі чаго з'яўляліся захаванне буйнога памешчыцкага землеўладання і сялянскае малазямелле. Таму рэформа толькі часткова зменшыла вастрыню аграрнай праблемы.

У прамысловасці Беларусі пасля працяглай эканамічнай дэпрэсіі 1904-1908 гг. адбываецца прамысловы ўздым **1909-1914 г.** Сярэднегадовыя тэмпы росту прамысловай прадукцыі складалі 13,9%.

Прамысловы ўздым выклікаў наступныя працэсы ў прамысловасці Беларусі канцэнтрацыю вытворчасці. Адбываецца паскораны рост буйной фабрычна-заводскай прамысловасці. Сярод буйнейшых прадпрыемстваў, што ўзніклі ў пачатку ХХ ст., можна назваць мінскую шпалерную фабрыку, абутковую фабрыку "Арол" у Мінску, шклозавод "Неман" у Лідскім павеце.

У структуры прамысловасці Беларусі найбольш хутка развіваліся і мелі перавагу галіны, заснаваныя на *перапрацоўцы мясцовай сыравіны:* харчовая, дрэваапрацоўчая, шкляная, тэкстыльная, гарбарна-абутковая. Аднак у цэлым, нягледзячы на рост канцэнтрацыі вытворчасці і капіталу, у прамысловасці Беларусі пераважала дробная і рамесна-саматужная вытворчасць.

Развіццё прамысловасці і гандлю абумовіла далейшы рост гарадоў. На пачатку ХХ ст. у якасці буйнейшых гандлёва-прамысловых цэнтраў Беларусі вылучаліся Мінск і Віцебск. Аднак працэнт гарадскога насельніцтва за перыяд 1900-1913 г. вырас нязначна – з 14% да 16%.

## 3. Грамадска-палітычнае жыццё Беларусі ў пачатку ХХ ст.

У перыяд 1907-1914 гг. галоўныя намаганні царскага ўрада былі накіраваныя на ўмацаванне палітычных пазіцый царызму, якія пахіснуліся падчас рэвалюцыі 1905-1907 гг. На тэрыторыі Беларусі царызм праводзіў рэпрэсіі ў адносінах да "палітычна неблаганадзейных" асоб, закрываў большасць апазіцыйных перыядычных выданняў, прафсаюзаў і іншых грамадскіх арганізацый. Узмацнілася русіфікатарская палітыка ў сферы землеўладання (стварэнне асобных фондаў дзяржаўных зямель для ільготнага продажу рускім перасяленцам), адміністрацыі, адукацыі.

Ва ўмовах рэпрэсій царызму спынілася дзейнасць на тэрыторыі Беларусі ўсіх рэвалюцыйных палітычных партый. Таксама распусціліся кадэцкія

арганізацыі. У той жа час адбываецца значны рост правых манархічных арганізацый. Разам з агульнаімперкімі ўзнікаюць мясцовыя манархічныя арганізацыі: “Крестьянин”, “Белорусское общество” і г.д. Хутка развівалася сетка перыядычных выданняў манархісцкіх арганізацый, у межах якіх адбывалася прапаганда ідэй *заходнерусізму*і праводзілася актыўная агітацыя супраць палякаў, яўрэяў, каталіцкага касцёла, ліберальных і рэвалюцыйных арганізацый, а таксама беларускага нацыянальнага руху.

Ліберальная апазіцыя ў Беларусі была прадстаўлена яўрэйскімі нацыянальнымі арганізацыямі, а таксама *Краёвай партыяй Літвы і Беларусі,* створанай у 1907 г. Дадзеная партыя абапіралася ў першую чаргу на польска-каталіцкую шляхту і каталіцкі касцёл; яна дамагалася скасавання дыскрымінацыйных законаў у адносінах да каталіцкага насельніцтва і выступала за наданне землям былога ВКЛ шырокага абласнога самакіравання.

У дзяржаўна-палітычнай сістэме Расійскай імперыі працягвала функцыянаваць Дзяржаўная дума. Пасля ўвядзення новага выбарчага заканадаўства 3 чэрвеня 1907 г. у *III Дзяржаўнай думе* (**1907-1912 гг**.) і *IV Дзяржаўнай думе* (**1912-1917 гг**.) перавагу мелі правыя сілы; лібералы знаходзіліся ў меншасці, а левыя ўвогуле мелі нязначнае прадстаўніцтва. На выбарах у III і IV Думу ў беларускіх губернях абсалютную большасць дэпутацкіх месцаў атрымалі кандыдаты ад правых сіл. Пры гэтым на выбарах 1907 і 1912 гг. у “Паўночна-Заходнім краі” *саслоўнае прадстаўніцтва было дапоўнена нацыянальным*: утвараліся “руская”, “польская” і “яўрэйская” курыі; пры гэтым усе праваслаўныя аўтаматычна залічваліся да рускіх, а католікі – да палякаў. Выбарчая сістэма была арганізавана такім чынам, каб забяспечыць перавагу “рускім”, якія галасавалі пераважана за манархістаў.

Разам з правядзеннем рэпрэсій царызм, імкнучыся пашырыць сацыяльную базу ў краі, праводзіў у гэты перыяд некаторыя рэформы ў накірунку грамадска-палітычнай лібералізацыі. Улады дазволялі пераход з праваслаўя ў іншыя хрысціянскія веравызнанні, паводле закону аб верацярпімасці 1905 г. У адпаведнасці з гэтым адбываўся масавы пераход нашчадкаў былых уніятаў, гвалтоўна пераведзеных у праваслаўе, да каталіцызму.

Адкрываліся школы з мовамі выкладання нацыянальных меншасцяў імперыі ў адпаведнасці з законам 1905 г. і скасаваліся абмежаванні на развіццё друку на мовах нацыянальных меншасцяў. Гэта прывяло да фарміравання на тэрыторыі Беларусі польскамоўных школ. Развіваўся

польскамоўны друк: толькі ў Вільні ў 1914 г. налічвалася 28 польскамоўных перыядычных выданняў. У той жа час адкрыццё беларускамоўных школ забаранялася, паколькі *беларусы афіцыйна не прызнаваліся самастойнай нацыяй*. Аднак дазвалялася дзейнасць беларускамоўных перыядычных выданняў.

З **1911 г.** улады сталі праводзіць *земскую рэформу ў Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях*. Паводле яе, у губернях і паветах стваралася сістэма органаў мясцовага самакіравання *–земствы*. Земствы ўяўлялі з сябе выбарныя мясцовым насельніцтвам прадстаўнічыя органы – губернскія і павятовыя земскія сходы, якія прызначалі пастаянна дзеючыя выканаўчыя органы – земскія ўправы. У функцыі земстваў уваходзіла развіццё мясцовай прамысловасці, сельскай гаспадаркі, гандлю, шляхоў зносін, культуры, адукацыі, аховы здароўя за кошт сродкаў, сабраных са спецыяльных мясцовых (земскіх) падаткаў. У той жа час земскія ўстановы знаходзіліся пад кантролем губернатара і міністра ўнутраных спраў, якія маглі прыпыніць выкананне любой пастановы земскіх установ. У той жа час у Віленскай і Гродзенскай губернях земствы так і не былі ўведзены з-за перавагі католікаў ў структуры насельніцтва.

Такім чынам, грамадска-палітычнае і культурнае жыццё Беларусі ў 1907-1914 гг. характарызавалася ўмацаваннем пазіцый царызму, узмацненнем русіфікатарскай палітыкі і рэпрэсій у дачыненні рэвалюцыйнага руху. Аднак у той жа час адбываліся некаторыя мерапрыемствы, накіраваныя аб’ектыўна на мадэрнізацыю грамадска-палітычных і сацыяльна-культурных адносін у рэгіёне.

### 4. Беларускі нацыянальна-культурны рух.

У 1902 г. на базе маладзёжных асветніцкіх гурткоў была створана Беларуская Рэвалюцыйная Грамада. У **1903 г.** яна змяніла назву на *Беларускую Сацыялістычную Грамаду (БСГ).*БСГ напярэдадні і падчас рэвалюцыі 1905-1907 гг. з’яўлалася галоўным цэнтрам беларускага нацыянальнага руху.У ходзе рэвалюцыйных падзей 1905-1907 гг. дзеячы БСГ выступалі сумесна з прадстаўнікамі іншых рэвалюцыйных партый у Беларусі, удзельнічалі ў антыўрадавых выступленнях. У 1906 г. была прынята праграма партыі, выбраны Цэнтральны камітэт у складзе *Івана і Антона Луцкевічаў, Вацлава Іваноўскага і Алеся Бурбіса*. У праграме БСГ абвяшчалася неабходнасць рэвалюцыйнага звяржэння самадзяржаўя сіламі ўсіх працоўных Расійскай імперыі і пераўтварэнне імперыі ў федэратыўную

дэмакратычную рэспубліку. Для Беларусі БСГ патрабавала дзяржаўнай аўтаноміі са сталіцай у Вільні. Абвяшчалася неабходным адчужэнне памешчыцкіх, дзяржаўных і царкоўных зямель на карысць сялян.

У цэлым уплыў беларускага нацыянальнага руху на палітычнае жыццё ў ходзе рэвалюцыі 1905-1907 гг. быў нязначны. Гэта тлумачыцца адсутнасцю трывалай сацыяльнай базы: у гарадах, якія з'яўляліся цэнтрамі палітычнага руху, беларускае насельніцтва было вельмі нешматлікім, а сяляне ў асноўнай масе заставаліся малапісьменнымі і не мелі выразнай палітычнай і нацыянальнай самавядомасці.

У выніку паражэння рэвалюцыі БСГ фактычна самараспусцілася, яе дзеячы адмовіліся ад падпольнай дзейнасці. Кіраўніцтва БСГ засяродзіла сваю дзейнасць у нацыянальна-культурным руху. Яго цэнтрам становіцца новае легальнае перыядычнае выданне – газета *"Наша ніва",* якая пачала выходзіць з **10 лістапада 1906 г. да 1915 г.** у Вільні лацінкай і кірыліцай (рэдактарам у 1906-1914 гг. з'яўляўся *А. Уласаў*, у 1914-1915 гг. *Янка Купала*).

У мэтах захавання газеты "Наша ніва" пазбягала радыкальных палітычных дэкларацый, па агульнапалітычных і сацыяльна-эканамічных пытаннях займала ў асноўным ліберальна-асветніцкія пазіцыі. Яе дзеячы засяродзілі сваю публіцыстычную дзейнасць на наступных накірунках:

- тэарэтычнае абгрунтаванне факту існавання самастойнага беларускага этнасу са сваёй самабытнай мовай і культурай;

- крытыка русіфікатарскай палітыкі царызму і паланізатарскай палітыкі польска-каталіцкага руху;

- патрабаванні ўвядзення беларускай мовы ў сістэме адукацыі, грамадскіх і рэлігійных установах;

- прапаганда беларускай нацыянальнай самасвядомасці, беларускай культуры.

У перыяд паміж рэвалюцыяй 1905-1907 гг. і Першай сусветнай вайной *"Наша ніва" пераўтварылася ў своеасаблівы цэнтр беларускага нацыянальна-культурнага руху*. Пад яе кіраўніцтвам пачалі выдавацца "Беларускі каляндар", сельскагаспадарчы часопіс "Саха", літаратурны месячнік для моладзі "Лучынка", літаратурны і грамадска-палітычны альманах "Маладая Беларусь", дзейнічалі беларускія выдавецтвы "Загляне сонца і ў наша ваконца", "Наша ніва", "Наша хата" і інш. У нашаніўскім руху ўдзельнічалі прадстаўнікі беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі пераважна сялянскага або дробнашляхецкага паходжання.

Разам з “Нашай нівай” фарміруецца другі цэнтр беларускага нацыянальна-культурнага руху – *газета “Беларус”,* якая выдавалася на беларускай мове лацінкай са студзеня 1913 г. (рэдактары – А. Бычкоўскі і Б. Пачобка). Газета была арганізавана галоўным чынам прадстаўнікамі каталіцкага духавенства, якія далучыліся да беларускага нацыянальнага руху. У публікацыях выдання вырашэнне нацыянальна-культурных задач беларусаў звязвалася з абаронай каталіцкага веравызнання.

Намаганнямі дзеячоў беларускага нацыянальнага руху адбывалася *станаўленне беларускай літаратуры*. У 1908-1914 гг. было выдадзена 77 кніг на беларукай мове. Вялікі ўнёсак у развіццё мастацкай беларускай літаратуры зрабілі звязаныя пераважана з “Нашай нівай” паэты і пісьменнікі *Янка Купала, Якуб Колас, Цётка (Алаіза Пашкевіч), Карусь Каганец, Алесь Гарун, Максім Багдановіч, Цішка Гартны, Максім Гарэцкі*і інш. У 1910 г. была выдадзена ў Вільні “Кароткая гісторыя Беларусі” *Вацлава Ластоўскага,* у якой упершыню была адлюстравана нацыянальная канцэпцыя гісторыі Беларусі.

Такім чынам, на пачатку ХХ ст. назіраўся прыкметны рост беларускага нацянальнага руху як у палітычнай, так і ў культурнай форме. Адбывалася фарміраванне беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі, якая кіравала дадзеным рухам. Аднак уплыў беларускага нацыянальнага руху на шырокія народныя масы быў нязначным з-за шэрагу спецыфічных фактараў станаўлення беларускай нацыі.

Для развіцця беларускага нацыянальнага руху ў гады Першай сусветнайвайны скламіся неспрыяльныя ўмовы. Значная частка яго ўдзельнікаў вымушана была пакінуць Беларусь (Я. Купала, Я. Колас, В. Іваноўскі, М. Гарэцкі і інш.). Перасталі друкаваць беларускамоўныя газеты, часопісы, кнігі. Восенню 1914 г. спынілася выданне часопіса “Лучынка”, у студзені 1915 г. – сельскагаспадарчага часопіса “Саха”, у жніўні — газеты “Наша ніва”. Ва ўмовах вайны амаль адзінай жыццяздольнай формай арганізацыі беларускага нацыянальнага руху сталі дабрачынныя бежанскія камітэты. Першым **вясной 1915 г.** у Вільні было заснавана *Беларускае таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны* на чале з *В. Іваноўскім*, аддзелы якога былі арганізаваны ва многіх гарадах Беларусі (Вілейка, Мінск, Полацк і інш.). Таварыства займала дабрачыннасцю і наладжвала нацыянальна-культурную працу (ладзіліся беларускія вечарынкі з тэатральнымі пастаноўкамі, папулярызавалася беларуская мова і літаратура, адчыняліся беларускія пачатковыя школы і інш.).

*Пытанне аб незалежнасці беларускага народа* на міжнародным узроўні падымалася дзеячамі беларускага руху ў **маі 1916 г.** у Стакгольме на канферэнцыі падняволеных народаў Расіі (В. Ластоўскі, Я. Салавей) і ў чэрвені**1916 г.**на ІІІ-м з'ездзе народаў у Лазане (В. Ластоўскі, І. Луцкевіч). Але ва ўмовах Першай сусветнайвайны якога-небудзь значнага выніка абмеркаванне гэтага пытання міжнароднай грамадскасццю не мела.

**5. Культура Беларусі XIX – пачатку XX ст.**

У першай палове XIXст. у сістэме адукацыі адбываюцца значныя змены. У 1802 г. царскі ўрад ажыцявіў школьную рэформу, якая закранула Беларусь. Для падатных саслоўяў утвараліся аднакласныя прыхадскія вучылішчы, якія дазвалялі атрымаць пачатковую адукацыю. Павятовыя вучылішчы і гімназіі былі прызначаны для атрымання сярэдняй адукацыі, а ўніверсітэты — для вышэйшай.Навучальным і адміністрацыйным цэнтрам Віленскай навучальнай акругі, у якую ў гэты перыяд уваходзіла ўся тэрыторыя Беларусі, з'яўляўся*Віленскі універсітэт.* Доступ для дзяцей падатных саслоўяў у гімназіі быў абмежаваны, а ва ўніверсітэт іх наогул не дапускалі.

Сістэма асветы на Беларусі была значна спаланізавана: мовай выкладання з'яўлялася польская мова, школьнікі вывучалі польскую гісторыю і літаратуру. Толькі пасля падаўлення царскім урадам паўстання 1830-1831 гг. у сістэме асветы на Беларусі пачаліся значныя змены. У **1832 г.** быў зачынены Віленскі універсітэт, а яго выпускнікам было забаронена выкладаць у мясцовых школах. Падрыхтоўка выкладчыкаў для Беларусі была даручана Пецярбургскаму настаўніцкаму інстытуту і Віцебскай настаўніцкай семінарыі (дзейнічала з 1834 па 1839 гг.). Ва ўсіх тыпах навучальных устаноў выкладанне было пераводзена на рускую мову, а ва ўсходняй частцы Беларусі польская мова была выключана з вучэбнай праграмы (у заходняй – выкладалася як асобны прадмет па скарочанай праграме). У **1840 г. у** Горы-Горках была створана *земляробчая школа,* якая ў 1**848 г.** была пераўтворана ў *земляробчы інстытут.*

Падчас рэформы **1864 г.***школьная адукацыя* пераводзіцца пад кіраўніцтва Міністэрства народнай асветы. Пачатковую адукацыю на вёсцы вядуць пачатковыя і народныя вучылішчы (пераўтвораныя ў 1884 г. у царкоўна-прыходскія школы і школы граматы), у горадзе – гарадскія вучылішчы. Сярэднюю адукацыю за даволі высокую плату давалі класічныя і рэальныя гімназіі і прагімназіі, жаночыя 7-класныя гімназіі. Да пачатку XX

ст. сетка навучальных устаноў пашыраецца, але ўзровень адукацыі застаецца нізкім.

У пачатку XX ст. пачынаецца працэс паступовай замены царкоўнапрыходскіх школ *4-класнымі народнымі вучылішчамі*; колькасць вучняў у іх за 1905-1914 гг. павялічваецца ў 3 разы і дасягае 305 тыс. Таксама павялічваецца колькасць сярэдніх навучальных устаноў – *гімназій і рэальных вучылішчаў.* Востры недахоп спецыялістаў-педагогаў абумовіў адкрыццё ў 1909-1916 гг. новых *настаўніцкіх семінарый* у Рагачове, Оршы, Барысаве, Гомелі і Бабруйску, якія давалі няпоўную сярэднюю спецыяльную адукацыю, а таксама *настаўніцкіх інстытутаў* у Віцебску, Магілёве і Мінску, якія давалі сярэднюю спецыяльную адукацыю.

У першай палове XIX ст. *беларуская літаратура* ператвараецца ў своеасаблівую публічную трыбуну палітычнай думкі, месца ідэалагічнай барацьбы. Для яе характэрна ўзнікненне *ананімных твораў* (“Гутарка Данілы са Сцяпанам”, “Вось які люд стаў”, “Вясна гола перапала” і інш.), якім былі ўласцівы апазіцыйныя і антапрыгоніцкія настроі, спачуванне цяжкай долі беларускага сялянства. Любоў да радзімы і асуджэнне існуючага сацыяльнага парадкуяскрава выявілі вершы *П. Багрыма, Ф. Савіча, В. Каратынскага, У. Сыракомлі,*знакамітыя беларускія паэмы *“Тарас на Парнасе” і “Энеіда навыварат”* (аўтарамі якіх лічацца адпаведна К. Вераніцын і В. Равінскі).

Асобае месца сярод літаратурнай спадчыны першай паловы XIX ст. займае чатырохтомны польскамоўны зборнік *Я. Баршчэўскага*“Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях”, у якім шырока выкарыстаны беларускія казкі і паданні. Я. Баршчэўскаму таксама належаць вершы, напісаныя на беларускай мове (“Рабункі мужыкоў”, “Дзеванька”, “Гарэліца”).Значны ўклад у развіццё беларускай літаратуры ўнёс Ян Чачот, збіральнік беларускага фальклору і аўтар вершаў на беларускай і польскай мовах, змешчаных у фальклорных зборнікаў “Вясковыя песні” (1837-1846 гг.). Для развіцця беларускай літаратуры вялікае значэнне мела месца творчасць *А. Міцкевіча,Ул. Сыракомлі* і інш.польскіх літаратараў. Так, у ранніх творах А. Міцкевіча(“Мешка, князь Навагрудка”, “Бульба”, паэмы “Дзяды”, “Пан Тадэвуш”, “Гражына”) былі выкарыстаны вобразы беларускага фальклору, сюжэты беларускай гісторыі, таму яны лічацца культурнай спадчынай і беларускага народа.

У другой палове XIX – пачатку XX ст. значныя змены адбыліся ў гутарковай мове. Ішло паступовае змешванне мясцовых дыялектаў,

з’яўляліся новыя словы і тэрміны, паланізмы замяняліся русізмамі. Асабліва моцны ўплыў рускай мовы адчуваўся ў фанетычным складзе паўночна-ўсходніх беларускіх гаворак. На аснове жывой гутарковай народнай мовы фарміравалася *новая беларуская літаратурная мова*. Яна не магла развівацца на базе старабеларускай мовы, якая з XVIII ст. фактычна стала мёртвай. Таму ў новых гістарычных абставінах крыніцай развіцця беларускай літаратурнай мовы з’явілася вусная народная творчасць. Беларускія пісьменнікі і паэты ў сваіх літаратурных творах шырока выкарыстоўвалі народныя песні, казкі, прыказкі, прымаўкі, загадкі.

Беларуская літаратурная мова развівалася галоўным чынам як мова мастацкай літаратуры і часткова публіцыстыкі. У ёй пераважала побытавая лексіка. Істотнай перашкодай развіццю беларускай пісьмовай мовы з’яўлялася адсутнасць яе нарматыўнай граматыкі. Але паступова ішоў працэс складвання графічнай сістэмы, правапісных і граматычных норм, узбагачэння лексікі беларускай літаратурнай мовы.

У другой палове XIX ст. пачынаецца новы этап у развіцці беларускай літаратуры. Пісьменнікі паступова закладваюць асновы сучаснай беларускай літаратуры.

Асноўным жанрам творчасці *Янкі Лучыны*(І. Неслухоўскага) з’яўляецца лірычны верш. Аўтар пісаў на беларускай мове. Вершы паэта былі сабраны ў зборніку “Вязанка”, які быў выдадзены пасля яго смерці ў 1903 г.

Літаратурных твораў *Адама Гурыновіча*захавалася вельмі мала. У сваіх вершах ён асноўную ўвагу надае паказу жыцця беларускага сялянства. Творы А. Гурыновіча былі выдадзены толькі пасмяротна.

Вяршыняй развіцця беларускай літаратуры другой паловы XIX ст. стала творчасць *Францішка Багушэвіча*. Да сваіх зборнікаў “Дудка беларуская”, “Смык беларускі” Ф. Багушэвіч складаў прадмовы, праз якія імкнуўся абудзіць нацыянальную свядомасць беларускага народа. У іх ён абвясціў існаванне беларускага этнасу і адзначыў самастойнасць беларускай мовы. Цэнтральная тэма твораў Ф. Багушэвіча – жыццё сялянства, яго пошукі справядлівасці і выйсця з сацыяльнага бяспраўя.

На лепшыя дасягненні літаратуры другой паловы XIX ст. абапіралася беларуская літаратура пачатку XX ст. Новыя тэмы, матывы і вобразы прынесла ў беларускую літаратуру *Цётка (А. Пашкевіч)*. Яе кнігі “Скрыпка беларуская” і “Хрэст на свабоду” сталі першымі арыгінальнымі зборнікамі беларускай паэзіі XX ст. Цётка з’явілася адной з пачынальнікаў апавядальнага жанру. Як таленавіты паэт-наватар, адзін з пачынальнікаў

беларускай драматургіі і заснавальнікаў нацыянальнай школы перакладу ўвайшоў у гісторыю беларускай літаратуры Янка Купала (І. Луцэвіч). Ён узняў беларускую літаратуру на якасна новы ўзровень, садзейнічаў фарміраванню і развіццю беларускай літаратурнай мовы. Разам з Янкам Купалам заснавальнікам новай беларускай літаратуры і літаратурнай мовы стаў Якуб Колас (К. Міцкевіч). Адзіны паэтычны зборнік "Вянок" належыць *Максіму Багдановічу,* аднак ён дазволіў паэту заняць пачэснае месца сярод класікаў беларускай літаратуры. У пачатку XX ст. раскрыліся творчыя здольнасці *Максіма Гарэцкага, Змітрака Бядулі, Цішкі Гартнага, Каруся Каганца* і інш. Беларуская літаратура пачала знаходзіць прызнанне ў суседніх, перш за ўсё славянскіх, народаў, паступова ўключацца ў сусветны гісторыка-літаратурны працэс.

На Беларусі ў першай палове XIXст. адным з найбольш масавых відаў мастацтва становяцца *тэатр і музыка.* Галоўнай формай тэатральнага мастацтва ў гэты час з'яўляўся тэатр прыватнай антрэпрызы, які па форме дзейнасці быў "аб'язным". Тэатр размяшчаўся ў губернскім ці буйным павятовым горадзе і перыядычна рабіў гастролі па навакольных мястэчках, гарадах, маёнтках і кірмашах. Пастаянныя тэатральныя калектывы ў пачатку XIX ст. дзейнічалі ў Гродне і Мінску. На тэатральных сцэнах ставіліся п'есы нямецкіх, французкіх, польскіх і рускіх аўтараў (Ф. Шылера, В. Гюго, Я. Ясінскага, Д. Ленскага і інш.).

У фарміраванні беларускага прафесійнага нацыянальнага тэатра вялікую ролю адыграла тэатральная культура рускага, украінскага і польскага народаў. У беларускіх гарадах дзейнічалі мясцовыя рускія драматычныя трупы, а таксама гастралявалі акцёры сталічных тэатраў. Паспяхова выступалі артысты ўкраінскіх тэатраў, прыязджалі польскія тэатральныя калектывы. Пад уздзеяннем прафесійнага тэатра ў асяроддзі беларускай інтэлігенцыі наспявала ідэя неабходнасці стварэння беларускага нацыянальнага тэатра прафесійнага тыпу. У пачатку XX ст. арганізоўваюцца шматлікія музычна-драматычныя гурткі і так званыя "беларускія вечарынкі". Там звычайна выступалі хары, чыталіся беларускія літаратурныя творы, ставіліся п'есы.

На традыцыях "беларускіх вечарынак" у **1907 г.**узнікла "Першая беларуская трупа" *Ігната Буйніцкага.* Землямер па прафесіі, сапраўдны патрыёт, Ігнат Цярэнцьевіч Буйніцкі на ўласныя сродкі стварыў тэатральную трупу ў асабістым фальварку Палевачы Дзісенскага павета. У 1907 г. замацаваўся пастаянны склад удзельнікаў гэтага калектыву, а ў **1910 г.** пасля

ўдзелу ў "Першай беларускай вечарынцы" у Вільні тэатр І. Буйніцкага пераўтварыўся ў прафесійны. У рэпертуары "Першай беларускай трупы" былі песні, танцы, пастаноўкі п'ес, дэкламацыя твораў беларускіх паэтаў і пісьменнікаў. І. Буйніцкі і яго акцёры займаліся актыўнай гастрольнай дзейнасцю.

Пераемнікам "Першай беларускай трупы" ў працэсе фарміравання нацыянальнага тэатра стала "Першае таварыства беларускай драмы і камедыі", якое ўзнікла ў Мінску пасля Лютаўскай рэвалюцыі. Арганізаваў Таварыства вядомы беларускі акцёр і рэжысёр *Фларыян Ждановіч.*Нягледзячы на цяжкасці, калектыў ужо ў першыя тыдні свайго існавання ажыццявіў гастрольную паездку па Беларусі.

*Выяўленчае мастацтва.*У выяўленчым мастацтве з другой паловы XIX ст. паступова ўсталёўваецца стыль рэалізм, які прыходзіць на змену класіцызму з яго біблейскай і міфалагічнай тэматыкай.

Вядомай постаццю ў беларускім пейзажным жывапісе з'яўляецца фігура *Апалінара Гараўскага.* Мастак нарадзіўся ў Мінскай губерні, адукацыю атрымаў у Пецярбургскай акадэміі мастацтваў. Пасля заканчэння акадэміі быў узнагароджаны залатым медалём. Пейзажы А. Гараўскага вылучаюцца жыццёвай праўдай і высокім тэхнічным майстэрствам ("Вечар у Мінскай губерні", "Пінскія балоты" і інш.). Мастак быў вядомы не толькі ў Расіі, але і за мяжой, ён атрымаў званне акадэміка жывапісу. Асабісты сябра рускага мецэната П. Траццякова, А. Гараўскі дапамагаў у збіранні яго славутай калекцыі. Некаторыя работы беларускага мастака зараз знаходзяцца сярод экспанатаў Траццякоўскай галерэі.

З канца XIX ст. ў выяўленчым мастацтве Беларусі з'яўляюцца новыя імёны. У творчасці таленавітага беларускага мастака *Вітольда Бялыніцкага-Бірулі*развіваюцца традыцыі рускага лірычнага пейзажу. Ён набыў адукацыю ў Кіеўскай рысавальнай школе і Маскоўскім вучылішчы жывапісу, скульптуры і дойлідства. З 1904 г. ён з'яўляўся членам Таварыства перасоўных выставак, у сваёй творчасці развіваў традыцыі рускага лірычнага пейзажу. Эмацыянальныя і змястоўныя творы мастака вылучаюцца мяккім каларытам. У ранні перыяд былі напісаны пейзажы "З ваколіц Пяцігорска", якую набыў П. Траццякоў для сваёй калекцыі, "Вясна ідзе", што прынесла аўтару першую прэмію Маскоўскага таварыства аматараў мастацтваў. Шчырыя сяброўскія адносіны звязвалі мастака з І. Рэпіным.

Віды беларускай прыроды натхнялі ўраджэнца Ашмянскага павета *Фердынанда Рушчыца.*У яго лепшых работах “Зямля”, “Стары млын”, “Эмігранты” спалучаюцца пейзажны і бытавы жанры.

Майстрам бытавога жывапісу быў *Нікадзім Сілівановіч.* Мастак нарадзіўся ў вёсцы Цынцавічы Вілейскага павета Мінскай губерні ў сям’і дзяржаўных сялян. Атрымаўшы адукацыю ў Пецярбургскай акадэміі мастацтваў, ён стварае шэраг кампазіцый у бытавым жанры. У рэалістычнай манеры мастак выканаў карціну “Пастух са Свянцяншчыны”. Творы Н. Сілівановіча прынеслі яму высокі аўтарытэт сярод пецярбургскіх мастакоў, аб чым сведчыць запрашэнне да ўдзелу ў афармленні Ісакіеўскага сабора ў Пецярбургу. За мазаічнае пано “Тайная вячэра” Н. Сілівановічу прысвоілі ганаровае званне акадэміка.

Партрэтны і бытавы жанры былі прадстаўлены таксама ў творчасці *Юдаля Пэна.* Яго палотны “Аўтапартрэт у саламяным капелюшы”, “Гадзіншчык”, “Стары кравец” выкананы ў рэалістычнай манеры і адлюстроўваюць яўрэйскі побыт і традыцыі. Творчая спадчына мастака вельмі вялікая і разнастайная. Пэн набыў вядомасць і ў якасці педагога. Яго намаганнямі ў Віцебску была адкрыта прыватная мастацкая школа. Самым вядомым вучнем Пэна стаў *Марк Шагал.* Вялікае месца ў яго творчасці займаў родны Віцебск з яго яўрэйскім мястэчковым побытам, які мастак адлюстроўваў у сімвалічна-містычным духу.

Адным з вядомых прадстаўнікоў гістарычнага жанру ў беларускім жывапісе другой паловы XIX ст. быў *Казімір Альхімовіч.*Мастак прымаў удзел у паўстанні 1863–1864 гг., за што быў сасланы ў Сібір. Пасля ссылкі ён жыў за межамі Беларусі, аднак сюжэтамі сваіх палотнаў нязменна выбіраў гістарычны лёс роднага народа. Сусветную вядомасць набыла яго карціна “Пахаванне Гедыміна”.

Тэмы і матывы беларускай гісторыі выкарыстоўваў таленавіты мастак *Язэп Драздовіч,* стварыўшы серыю графічных работ і скульптурных партрэтаў дзеячаў гісторыі Беларусі.

*Архітэктура.*З сярэдзіны XIX ст. узмацняецца працэс паступовага заняпаду класічнай архітэктуры і адбываецца стылёвая пераарыентацыя дойлідства Беларусі. На змену класіцызму прыходзіць эклектыка (змяшэнне стыляў), якая атрымала яшчэ адну назву – “архітэктура гістарызму”. Яна вызначалася выкарыстаннем форм розных стыляў (готыкі, барока, ракако, класіцызму, раманскага і інш.).

Пасля падаўлення паўстання 1863 – 1864 гг. шырокае распаўсюджанне набыў рэтраспектыўна-рускі стыльу праваслаўным культавым дойлідстве. Рускія архітэктары распрацавалі тыпавыя варыянты праваслаўных цэркваў, скапіраваныя з візантыйскіх храмаў і рускіх бажніц XIV і XVII стст., каб паказаць пераемнасць рускага дойлідства ад візантыйскай архітэктуры. Ініцыятарам будаўніцтва падобных храмаў быў граф М. Мураўёў, таму ў народзе яны набылі назву “мураўёвак”. Царквы, пабудаваныя ў рэтраспектыўна-рускім стылі, можна сустрэць у многіх гарадах і мястэчках Беларусі.

У каталіцкай культавай архітэктуры наглядаецца росквіт неагатычнага стылю. Неагатычныя пабудовы ўзводзіліся з чырвонай добра абпаленай цэглы, прычым фасады не атынкоўваліся. Найбольш багатыя храмы мелі вітражы, падлогу з паліраваных керамічных плітак, фрэскавы роспіс. Праваслаўная культавая архітэктура, як і ў папярэдні перыяд, знаходзілася пад уплывам візантыйскага і старажытнарускага дойлідства. Мемарыяльная капліца ў в. Лясная (цяпер Слаўгарадскі раён) была ўзведзена архітэктарам А. Гогенам у гонар 200-годдзя перамогі рускіх войскаў над шведамі ў бітве, якая адбылася ў 1708 г. Лаканічнасць і манументальнасць помніка надаюць яму асаблівую велічнасць.

У архітэктуры Беларусі склаўся неараманскі стыль. Найбольш вядомы помнік, які спалучае матывы раманскай і гатычнай архітэктуры, – *Чырвоны касцёл у Мінску* (касцёл Сымона і Алены). Пабудова вытрымана ў раманскім стылі з дабаўленнем некаторых элементаў готыкі і мадэрна. Кампазіцыя касцёла складаецца з некалькіх злучаных паміж сабой аб’ёмаў і трох вежаў (дзвюх маленькіх і адной вялікай). Касцёл быў пабудаваны з чырвонай цэглы, якая шырока выкарыстоўвалася ў архітэктуры неаготыкі і мадэрна. Фундатарамі пабудовы Мінскага касцёла выступілі памешчык Эдвард Вайніловіч і яго жонка, якія вырашылі ўзвесці касцёл у памяць аб сваіх памерлых дзецях.

З канца XIX ст. адбываецца станаўленне новага стылю –*мадэрна*. Для помнікаў мадэрна характэрны пераплеценыя лініі, асіметрычныя кампазіцыі, багаты ляпны дэкор. Мадэрн прынёс новыя тыпы пабудоў (чыгуначныя вакзалы, масты, прамысловыя збудаванні), новыя будаўнічыя матэрыялы і канструкцыі (цэмент, металічная арматура, фабрычная дахоўка). У стылі мадэрн у Беларусі ўзводзіліся вакзалы, банкі, навучальныя ўстановы, даходныя дамы, сядзібы, некаторыя культавыя пабудовы. Прыкладамі архітэктуры мадэрна з’яўляюцца гасцініца “Еўропа” у Мінску, пабудавана ў

1906–1907 гг. Яе шасціпавярховы будынак з’яўляўся адным з найбольш значных дасягненняў архітэктуры мадэрна ў Мінску.

**Кантрольныя пытанні і заданні для самападрыхтоўкі студэнтаў:**

1. Як змянілася палітыка царызму на Беларусі пасля шляхецкага паўстання 1830-1831 гг.?
2. Вызначце асаблівасці адмены прыгону ў Беларусі.
3. Як царскі ўрад праводзіў буржуазныя рэформы на беларускіх землях?
4. Якое значэнне для развіцця нацыянальнага руху ў Беларусі мела дзейнасць БСГ?
5. Калі і як зараджаецца сучасная беларуская літаратурная мова?

## Літаратура:


1. Белоруссия в эпоху феодализма : сборник документов и материалов. – Минск, 1961. – Т. 3 : Воссоединение Белоруссии с Россией и её экономическое развитие в конце ХУШ – первой половине XIX века (1772–1860) / сост. В. В. Чепко и В. В. Шатило. – Минск, 1961.

2. Бобас, М.Ф. Развитие промышленности в Белоруссии (1795–1861 гг.) / М.Ф. Болбас. – Минск, 1966.

3. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал.рэд.) [і інш.].– Т. 4 : Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец ХУШ – пачатак XX ст.) / М. Біч [і інш.]. – Мінск, 2005.

4. Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да 1996 г. : у 3 т. – Т. 1: Гісторыя сялянства Беларусі ад старажытнасці да 1861 г. / Я. К. Анішчанка [і інш.]: пад рэд. В. Мялешкі. – Мінск, – 1997.

5. Довнар-Запольский, М. В. История Белоруссии. –3-е изд., испр. и доп. — Минск, 2011.

5. Канфесіі на Беларусі (к. ХУШ–XX стст.) / В. В. Грыгор’ева, У. М. Завальнюк; У. І. Навіцкі, А. М. Філатава. – Мінск, 1998.

6. Швед, В. Паміж Польшчай і Расіяй: Грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772–1863) / В. Швед. – Гродна, 2001.

7. Эканамічная гісторыя Беларусі / пад гал. рэд. В. І. Галубовіча. – Мінск, 1998.

8. Каханоўскі, А. Г. Гісторыя Беларусі другой паловы XIX ст. : вучэб.-метад. дапам. / А. Г. Каханоўскі. – Мінск, 2012.

## Тэма 4.1. Станаўленне беларускай дзяржаўнасці. Усталяванне савецкай грамадска-палітычнай сістэмы ў Беларусі (20-30-я гг. XX ст.)

*Кючавыя паняцці:*Беларускі нацыянальны камітэт; Цэнтральная рада беларускіх арганізацый; Вялікая беларуская рада; Абласны выканаўчы камітэт Заходняй вобласці і фронту; Усебеларускі з'езд (кангрэс); Беларуская Народная Рэспубліка; “Заходняя камуна”; Сацыялістычная Савецкая РэспублікаБеларусь; Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка Літвы і Беларусі; новая эканамічная палітыка; федэрацыя; узбуйненні тэрыторыі БССР; індустрыялізацыя; камандна-адміністрацыйная сістэма кіравання эканомікай; калектывізацыя; беларусізацыя; ”культурная рэвалюцыя”

**План лекцыі:**

1. Утварэнне Беларускай Народнай Рэспублікі.
2. Стварэнне беларускай савецкай дзяржаўнасці.
3. Грамадска-палітычнае жыццё ССРБ.
4. Шляхі і метады будаўніцтва індустрыяльнага грамадства ў савецкай Беларусі.
5. Станаўленне і развіццё савецкай беларускай культуры

### 1.Утварэнне Беларускай Народнай Рэспублікі.

Перамога Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. дала новы штуршок беларускаму нацыянальнаму руху. Пачынаючы з вясны 1917 г., у Беларусі ўтвараліся беларускія нацыянальныя партыі і арганізацыі. З мэтай аб’яднання гэтых сіл у **сакавіку 1917 г.** у Мінску адбыўся *першы з'езд беларускіх нацыянальных арганізацый.* З'езд прыняў дэкларацыю ў падтрымку Часовага ўрада, выказаўся за культурна-нацыянальную аўтаномію Беларусі ў складзе Расійскай дэмакратычнай рэспублікі.

На з’ездзе быў абраны *Беларускі нацыянальны камітэт(БНК)* на чале з буйным землеўладальнікам Мінскай губерні, дэпутатам I Дзяржаўнай думы, *Раманам Скірмунтам.* Дэлегацыя БНК накіравалася ў Петрагарад, каб падаць Часоваму ураду прапановы наконт аўтаноміі Беларусі. Аднак старшыня Часовага урада *кн. Львоў* і іншыя міністры, якія не лічылі беларусаў асобным народам, адмовіліся весці перамовы на гэту тэму.

У **ліпені 1917 г.** ў Мінску быў праведзены *другі з'езд беларускіх нацыянальных арганізацый і партый,* на якім замест БНК была абрана *Цэнтральная рада беларускіх арганізацый (ЦРБА).* Яна паставіла перад Часовым урадам пытанне аб утварэнні ў Беларусі органаў мясцовай

(беларускай краёвай) улады, якая павінна была выбірацца на Усебеларускім з'ездзе. ЦРБА выступала таксама за развіццё беларускай мовы і нацыянальнай культуры, а таксама арганізацыі беларускіх нацыянальных вайсковых фарміраванняў. Аднак гэтыя прапановы Часовы ўрад адхіліў.

У **кастрычніку 1917 г.** Цэнтральная рада беларускіх арганізацый была пераўтворана ў *Вялікую беларускую раду(ВБР).* Галоўная задача, якую паставіла перад сабой ВБР, заключалася ў скліканні Ўсебеларускага з'езда для канчатковага вырашэння пытання аб беларускай дзяржаўнасці.

Пасля прыходу да ўлады ў Пецярбургу бальшавікоў (**25 кастрычніка 1917 г.)** на працягу кастрычніка – лістапада савецкая ўлада была ўстаноўлена на ўсёй свабоднай ад немцаў тэрыторыі Беларусі. 27 лістапада ў Мінску быў ўтвараны *Абласны выканаўчы камітэт Заходняй вобласці і фронту(Абылвыканкамзах).* Яго старшынёй быў абраны бальшавік *М. Рагазінскі.* Для кіравання вобласцю і фронтам быў створаны абласны *Савет Народных Камісараў (СНК)* на чале з бальшавіком *К. Ландарам.* Яны адкрыта выступілі супраць беларускага нацыянальнага дзяржаўнага самавызначэння, прытрымліваючыся ідэі стварэння ўнітарнай савецкай дзяржавы. У сувязі з гэтым, прызнаючы ўладу Саветаў ў Расіі, Вялікая беларуская рада не прызнавала ўладу Абылвыканкамзаха на тэрыторыі Беларусі, разглядаючы яго выключна як франтавы орган ўлады.

З мэтай стварэння прызнанай дэмакратычнай улады Беларусі Вялікая беларуская рада разам з *Беларускім абласным камітэтам (БАК),* які складаўся з дэлегатаў ад беларускіх губерняў на Усерасійскіх з'ездах сялянскіх дэпутатаў, членаў Устаноўчага сходу, прадстаўнікоў арміі і флоту, а таксама *Беларускім нацыянальным камісарыятам (Белнацкомам)* на чале з *Аляксандрам Чарвяковым,* склікалі *Усебеларускі з'езд (кангрэс),* які адкрыўся **5 снежня 1917 г.** у Мінску.

Асноўная барацьба на з'ездзе разгарнулася вакол пытання аб формах самавызначэння Беларусі. Прыхільнікі Вялікай беларускай рады, якія прадстаўлялі нацыянальна-дэмакратычны напрамак у беларускім нацыянальным руху, выступалі за ўстанаўленне ў Беларусі нацыянальнай улады, абяшчэння Беларусі раўнапраўнай рэспублікай у складзе агульнарасійскай федэрацыі, у якой улада павінна належыць краёвай Радзе, выбранай на аснове ўсеагульнага роўнага, прамога і тайнага галасавання.

Дэлегаты сацыялістычнага напрамку, якія прадстаўлялі БАК і Белнацкам, выступалі за абласную аўтаномію Беларусі ў складзе Расійскай Савецкай Федэратыўнай Сацыялістычнай Рэспублікі (РСФСР). Так як з'езд

не прызнаў савецкую ўладу на тэрыторыі Беларусі, рашэннем СНК Заходняй вобласці і фронту (які адмоўна ставіўся да пытання аб дзяржаўнасці Беларусі) з'езд быў распушчаны, а ў ноч з 17 на 18 снежня былі праведзены арышты некаторых членаў прэзідыума і шэрагу дэлегатаў.

**18 лютага 1918 г.** германскае камандаванне аддало загад сваім войскам пачаць наступленне, што рэзка абвастрыла сітуацыю на Заходнім фронце. Пад пагрозай захопа Мінска нямецкімі войскамі кіраўніцтва Аблвыкамзаха і СНК Заходняй вобласці, штаб Заходняга фронтуў ноч на 19 лютага вымушаны былі спешна эвакуіравацца ў Смаленск.

У гэтых умовах *Выканаўчы камітэт* (Выканкам) *Рады Усебеларускага з'езда* зрабіў спробу ўзяць уладу ў свае рукі. **21 лютага 1918 г.**ён звярнуўся да беларускага народа з *1-й Устаўной граматай*, у якой заявіў аб неад'емным праве беларускага народа на поўнае самавызначэнне, а сябе абвясціў часовай уладай на тэрыторыі Беларусі і абавязаўся склікаць Усебеларускі ўстаноўчы з’езд. У якасці часовага выканаўча-распараджальнага органа з прадстаўнікоў сацыялістычных партый (БСГ, сацыялістаў-рэвалюцыянераў і інш.) быў сфарміраваны *Народны сакратарыят Беларусі* на чале з *Я. Варонкам.*Аднак ва ўмовах нямецкай акупацыі рэальнай улады Народны Сакратарыят не атрымаў і працягваў сваё існаванне толькі фармальна. У той жа дзень у Мінск увайшлі германскія войскі.

**3 сакавіка 1918 г.** у Брэсце быў заключаны *мір паміж бальшавікамі і Германіяй*. Інтарэсы Беларусі не былі прыняты пад увагу ніводным з бакоў. Па патрабаванню савецкай дэлегацыі, немцы ўзялі на сябе абавязак не прызнаваць новыя дзяржаўныя ўтварэнні на тэрыторыі былой Расійскай імперыі.

**9 сакавіка 1918 г.** на пашыранам пасяджэнні выканкама Усебеларускага з'езда была прынята *2-я Устаўная грамата*, ў якой Беларусь была абвешчана *Народнай Рэспублікай (БНР).* Выканкам быў перайменаваны ў *Раду БНР*, прэзідыум якой узначаліў прадстаўнік *БСГ І. Серада.* На тэрыторыі рэспублікі Устаўной граматай дэклараваліся дэмакратычныя правы і свабоды, пацвярждалася адмена прыватнай уласнасці на зямлю, якая бясплатна перадавалася тым, хто яе апрацоўваў, устанаўліваўся 8-гадзінны рабочы дзень.

**25 сакавіка 1918 г.**была прынята *3-я Устаўная грамата*, якой абвяшчалася *незалежнасць Беларускай Народнай Рэспублікі* і вызначалася тэрыторыя рэспублікі. У склад БНР былі ўключаны Магілёўская,

Мінская, Віцебская губерні, а таксама беларускія часткі Віленскай, Гродзенскай, Смаленскай, Чарнігаўскай і іншых губерняў.

Але Германія не прызнавала БНР. Не дапамагла тэлеграма Рады БНР германскаму імператару *Вільгельму II,* у якой выказвалася ўдзячнасць за вызваленне Беларусі ад бальшавіцкага прыгнёту і анархіі. Ініцыятыва пасылкі тэлеграмы зыходзіла ад Р. Скірмунта. На гэты шлях Раду падштурхоўваў прыклад Літвы, Украіны і Польшчы. Тэлеграма выклікала хвалю пратэсту ў палітычных партыях і ў розных слаях насельніцтва. Палітычны крызіс напаткаў таксама і саму Раду, што прывяло да расколу БСГ. Пасля *лістападаўскай рэвалюцыі 1918 г. у* Германіі Расія дэнансавала Брэсцкі мірны дагавор і рушыла Чырвоную Армію на Захад. 10 снежня 1918 г. Чырвоная Армія ўвайшла ў Мінск. Большасць членаў Рады і ўрада БНР пакінулі сталіцу.

У пачатку свайго ўтварэння БНР не знайшла падтрымкі шырокіх народных мас. Прычын таму многа. Яна была створана ў вельмі неспрыяльных умовах і існавала пад акупацыяй. Акупацыйны рэжым быў супраць нацыянальных імкненняў, нацыянальных органаў улады абвешчанай дзяржавы. І народам ён успрымаўся як варожы. У БНР адсутнічалі асобныя прыкметы дзяржаўнасці: ні суверэннай тэрыторыі (акупаваная немцамі), ні канстытуцыі, ні апарата прымусу, ні манаполіі на збор падаткаў, ні мясцовых органаў улады, ні судовай сістэмы. БНР так і не здолела стаць сапраўднай дзяржавай. У той жа час існаваў інстытут грамадзянства, дзяржаўная пячатка і сімволіка, сістэма адукацыі, выдаваліся паштовыя маркі. Былі абвешчаны межы тэрыторый, на якіх прадугледжвалася распаўсюдзіць суверэнітэт. Рабіліся спробы стварэння ўзброеных сіл.

Абвяшчэнне БНР з’явілася першай спробай рэалізацыі на практыцы беларускай ідэі, што ўзнікла яшчэ ў пачатку XIX ст., сукупнасці ўсіх трох яе асноватворных элементаў – нацыянальнай свядомасці, нацыянальна-культурнага адраджэння і нацыянальнай дзяржаўнасці. Гэта сведчанне таго, што беларускі нацыянальны рух у той час набыў такую моц і размах, што аказаўся здольным паспрабаваць здзейсніць жаданую ідэю. Гэта была першая спроба адрадзіць нацыянальную дзяржаўнасць на беларускай зямлі.

## 2. Стварэнне беларускай савецкай дзяржаўнасці.

Адразу пасля роспуску Усебеларускага з'езда пачалася падрыхтоўчая работа па стварэнню Беларускай савецкай рэспублікі. Ініцыятыву праявіў *Беларускі нацыянальны камісарыят (Белнацкам)* які быў створаны **31 студзеня**

**1918 г**. пры Народным камісарыяце па справах нацыянальнасцей РСФСР. Кіраўнікі і супрацоўнікіБелнацкама *(А. Чарвякоў, З. Жылуновіч, І. Пятровіч, Б. Тарашкевіч і інш.*) выступалі за стварэнне нацыянальнай дзяржаўнасці ў яе савецкім варыянце і развіццё беларускай культуры. У гэтым Белнацкам падтрымлівалі члены *беларускіх секцый РКП(б)*, якія існавалі ў 1918 г. ў розных гарадах Расіі (Петраград, Масква, Саратаў, Тамбоў, Казань і інш.) і на Беларусі. **21-23 снежня 1918 г.** у Маскве адбылася *канферэнцыя беларускіх секцый РКП(б),* на якой было прынята рашэнне аб неабходнасці стварэння Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Аднак Аблвыканкамзах адхіліў прапанову Белнацкама, даўшы вобласці назву *"Заходняя камуна".*

У снежні1918 г. ЦК РКП(б) прыняў рашэнне аб неабходнасці абвяшчэння незалежнай і суверэннай *Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі.Беларусь (ССРБ).***30-31 снежня 1918 г**. у Смаленску адбылася *VI Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РКП(б),* якая аб'явіла сябе *Першым з'ездам Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі.* Таксама на з'ездзе было прынято рашэнне аб тым, каб абвясціць ССРБ, вызначыўшы яе граніцы ў складзе Мінскай, Смаленскай, Магілёўскай, Віцебскай і Гродзенскай губерняў, а таксама асобных раёнаў Віленскай, Ковенскай, Сувалкаўскай і Чарнігаўскай губерняў. **1 студзеня 1919 г.***Часовы рабоча-сялянскі ўрад па радыё абнародаваў Маніфест,які абвясціў абутварэнні ССРБ.* 5 студзеня 1919 г. урад Савецкай Беларусі пераехаў са Смаленска ў Мінск, які стаў сталіцай ССРБ.

Аднак для ажыцяўлення беларускім народам свайго права на самавызначэнне палітычная і эканамічная сітуацыя была надзвычай неспрыяльнай. 16 студзеня 1919 г. ЦК РКП(б) па ініцыятыве *У. І. Леніна*прыняў рашэнне аб выдзяленні з ССРБ Смаленскай, Віцебскай і Магілёўскай губерняў і ўключэння іх у склад РСФСР. Мінскай і Гродзенскай губерням было прапанавана аб'яднацца з Літоўскай Савецкай Рэспублікай. Гэта рашэнне было выклікана неабходнасцю *ўтварэння буфернай дзяржавы паміж РСФСР і Польшчай,* кіраўнікі якой пачалі ўзмоцненую падрыхтоўку да вайны з Савецкай Расіяй з мэтай аднаўлення Рэчы Паспалітай ў межах 1772 года.

**2-3 лютага 1919 г.** у Мінску адбыўся *І Усебеларускі з'езд Саветаў рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў,* які адобрыў утварэнне ССРБ, зацвердзіў *першую Канстытуцыю Савецкай Беларусі (1-я Канстытуцыя),* герб і сцяг рэспублікі, прыняў рашэнне аб устанаўленні федэратыўных сувязей з РСФСР і пастанову аб аб'яднанні савецкіх сацыялістычных

рэспублік Беларусі і Літвы ў адзіную дзяржаву.27 лютага 1919 г. у Вільні адбылося аб'яднанае пасяджэнне ЦВК Літоўскай і Беларускай Савецкіх Рэспублік, на якім было прынята рашэнне аб стварэнні *Літоўска-БеларускайСавецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (ЛітБел ССР)* са сталіцай ў Вільні. Яна была ўтворана як *буферная дзяржава*, тэрыторяя якой выкарыстоўвалася для адмежавання РСФСР ад Польшчы. Аб'яднаны ЦВК ЛітБел ССР узначаліў *К.Г. Цыхоўскі,* а Рабочы-Сялянскі ўрад. – *В.С. Міцкявічус-Капсукас.* У склад ЛітБел ССР увайшлі тэрыторыі Мінскай, Гродзенскай, Віленскай, Ковенскай і частка Сувалкаўскай губерняў з насельніцтвам каля 6 млн. чалавек.

У лістападзе 1918 г. была створана незалежная польская дзяржава, якая абапіралася на ідэю адраджэння Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. Па сутнасці гэта азначала вайну з Савецкай Расіяй, да якой польскае кіраўніцтва пры фінансавай падтрымцы буйнейшых заходніх краін было падрыхтавана. У снежні 1918 г. Пачалася *Польска-савецкая вайна* **1919-1920гг**. Польшча перайшла ў наступленне на беларускія і ўкраінскія землі. Да сакавіка 1919 г. польскія войскі акупіравалі шэраг беларускіх гарадоў. Урад ЛітБел, які праводзіў жорсткую *палітыку ваеннага камунізму* (харчразвёрстка, палітычныя рэпрэсіі, адмова ад перадачы зямлі непасрэдна сялянам), не здолеў арганізаваць абарону. У жніўні 1919 г. быў захоплены Мінск. Восенню фронт усталяваўся на р. Беразіна.

На занятых тэрыторыях польскія акупанты праводзілі надзвычай жорсткую палітыку. Летам Чырвоная Армія пачала *контрнаступленне*, і да **жніўня 1920 г.** ўся тэрыторыя Беларусі была занята савецкімі вайскамі. ЛітБел перастала існаваць.

**31 ліпеня 1920 г.** у Мінску была прынята *Дэкларацыя, якая абвяшчала незалежнасць Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусь.* У выніку адбылося *другое абвяшчэнне рэспублікі на тэрыторыі Беларусі*. У жніўні 1920 г. польская армія здолела перайсці ў наступленне пад Варшавай і зноў заняць значную частку Беларусі. У кастрычніку 1920г. у Рызе быў падпісаны дагавор з Польшчай аб *перамір'і.*

**18 сакавіка 1921 г.**паміж Савецкай Расіяй, Украінай і Польшчай быў падпісаны *Рыжскі мірны дагавор*, паводле якога Польшча атрымала заходнюю частку Беларусі з больш чым 4-мільённым насельніцтвам. Усходняя частка Беларусі апынулася ў складзе Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусь і Расійскай Савецкай Федэратыўнай Сацыялістычнай Рэспублікі.

**3. Грамадска-палітычнае жыццё БССР.**

*Удзел БССР ва ўтварэнні СССР.*Яшчэ ў гады грамадзянскай вайныбыло заключана пагадненне – *дагавор аб ваенна-палітычным саюзе савецкіх рэспублік* ад **1 чэрвеня 1919 г.** Пасля заканчэння вайны паўстала пытанне аб новых формах аб'ядная савецкіх рэспублік у адну дзяржаву. *І. В. Сталін* выступіў з ідэяй *аўтанамізацыі,* паводле якой усе савецкія рэспублікі павінны былі абвясціць сябе састаўнымі часткамі РСФСР і ўвайсці ў яе склад на правах культурна-нацыянальных аўтаномій. У.І. Ленін прапанаваў ідэю *федэрацыі,* у адпаведнасці з якой усе савецкія рэспублікі аб'ядноўваюцца на раўнапраўнай аснове.

14-18 снежня 1922 года адбыўся IV Усебеларускі з'езд Саветаў, які выказаўся за аб'яднанне савецкіх рэспублік у адзіную саюзную дзяржаву. Для ўдзелу ў I з'ездзе Саветаў Саюза ССР дэлегаты Усебеларускага з'езда выбралі дэлегацыю на чале са Старшынёй ЦВК і СНК ССРБ А.Р. Чарвяковым. **30 снежня 1922 г.** у Маскве адкрыўся *I з'езд Саветаў Саюза ССР*, на якім была прынята *Дэкларацыя і Дагавор абутварэнні Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (СССР)* у складзе РСФСР, УССР, БССР і ЗСФСР. Ад БССР у абраны з'ездам Цэнтральны выканаўчы камітэт СССР увайшло 7 прадстаўнікоў, а А.Р. Чарвякоў стаў адным з старшынь ЦВК СССР. Пасля стварэння СССР за беларускай дзяржавай замацавалася назва БССР.

*Узбуйненні тэрыторыі БССР.*У **сакавіку 1924 г.** па прапановах і хадайніцтвах беларускага кіраўніцтва Прэзідыум ЦВК СССР прыняў рашэнне аб вяртанні Беларускай ССР 16 паветаў Віцебскай, Смаленскай і Гомельскай губерняў. У **снежні 1926 г.** вернуты яшчэ два паветы: Гомельскі і Рэчыцкі.У 1927 г. тэрыторыя БССР склала 125 950 км$^2$ з насельніцтвам каля 5 млн чалавек.

У **красавіку 1927 г.** была прынята *Канстытуцыя БССР (2-я Канстытуцыя)*, у якой былі замацаваны змены ў адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле рэспублікі ў выніку ўзбуйнення яе тэрыторыі, зацверджаны Дзяржаўныя герб і сцяг БССР. Такім чынам, у межах рэспублікі склаўся адзіны ў эканамічных, культурна-бытавых і нацыянальных адносінах раён, што садзейнічала эканамічнаму і культурнаму развіццюбеларускай нацыі.

У міжваенны перыяд (1920-1930-я гг.) грамадска-палітычнае жыццё ў рэспубліцы, як і ва ўсёй Савецкай краіне ў цэлым, было супярэчлівым, цесна звязаным з сацыяльна-эканамічнымі працэсамі, якія адбываліся ў тыя гады:

працоўны энтузіазм спалучаўся са страхам перад беззаконнем; імкненне будаваць сацыялізм і нястачы; звяртанне да народа і рост бюракратызму; ліквідацыя ўласніка ўвогуле; стварэнне глыбока ідэалагізаванага грамадства.

Ва ўмовах *новай эканамічнайпалітыкі (нэпа)* (да канца 1920-х гадоў) у рэспубліцы назіраўся грамадска-палітычны пад’ём:

1) паўсюдна адзначаўся яркі аптымізм у поспеху сацыялістычнага будаўніцтва;

2) пашырылася кампетэнцыя Саветаў як органаў улады, актыўна ўцягваліся працоўныя ў працу мясцовых Саветаў;

3) палітычная амністыя 1923 года.

У цэлым у сярэдзіне 1920-х гадоў у *грамадска-палітычным жыцці* існавалі і змагаліся дзве тэндэнцыі – курс на дэмакратызацыю ва ўмовах НЭПу і прадаўжэнне курсу палітыкі ваеннага камунізму, тэндэнцыя манапалізацыі КПБ усяго палітычнага жыцця.

У 1930-я гады паступова ўстанаўлівалася атмасфера ўсеагульнай падазронасці, адвольнае тлумачэнне законаў, паўсюдна з’яўляліся “ворагі”. Адбывалася метадычная і масіраваная апрацоўка грамадства, накіраваная на тое, каб выхаваць паслухмяных выканаўцаў, укараніць думку аб бязгрэшнасці і беспамылковасці вышэйшага кіраўніцтва краіны. У грамадстве былі створаны ўмовы, калі груба ігнараваліся правы чалавека. *Асноўнай прыкметайграмадска-палітычнага жыцця ў 1930-я гады* з’ўлялася існаванне аднапартыйнай палітычнай сістэмы, кантроль з боку КП(б)Б над грамадскім жыццём. У СССР усталяваўся культ асобы І.В. Сталіна, панавала сталінская тэорыя аб узмацненні класавай барацьбы па меры руху грамадства да сацыялізму, ужыванне палітычных рэпрэсій.

Змены ў розных формах жыцця савецкага грамадства былі замацаваны ў новых Канстытуцыях СССР (1936 г.) і БССР (**1937 г.** 3-й Канстытуцыі). У *Канстытуцыі БССР* намеціўся пераход да падзелу ўлады на заканадаўчую, выканаўчую і судовую. *Вярхоўным органам улады* ўпершыню абвяшчаўся *Вярхоўны Савет БССР.* Абвяшчаліся правы і свабоды грамадзян: права на працу, адпачынак, адукацыю, свабоду слова, друку, сходаў, мітынгаў; устанаўлівалісь абавязкі грамадзян: выконваць законы, абараняць краіну і г.д. Выбары дэпутатаў ва ўсе Саветы (Вярхоўны, акруговыя, раённыя) павінны былі здзяйсняцца на аснове ўсеагульнага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні.

Але ў рэальным жыцці большасць канстытуцыйных нормаў заставалася толькі на паперы. Сталінскае разуменне сацыялізму

разыходзілася з марксісцкім. Яго мэтай было нарошчванне магутнасці дзяржавы за кошт ушчамлення інтарэсаў большасці грамадзян, а не стварэнне эканамічных, палітычных і культурных передумоў для свабоднага развіцця кожнага члена грамадства.

**4. Шляхі і метады будаўніцтва індустрыяльнага грамадства ў савецкай Беларусі**

*Палітыка індустраялізацыі.* На пачатку 20-х гадоў ХХ ст. кампартыя ўзяла курс на *стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы сацыялізму,* пераўтварэнне СССР у эканамічна-незалежную дзяржаву з магутным эканоміка-вытворчым, навукова-тэхнічным і абарончым патэнцыялам. Сутнасць індустрыялізацыі заключалася ў наступным: пераўтварыць СССР з краіны, якая ўвозіць машыны і абсталяванне, у краіну, якая выпускае машыны і абсталяванне. Дзеля таго аб’яўлялася пераважным развіццё *цяжкай індустрыі*, г.зн. вытворчасці станкоў, машын, абсталявання.

На Беларусі меліся і*свае асаблівасці, і свае цяжкасці правядзення індустрыялізацыі.* Яны былі абумоўлены: геапалітычным становішчам нашых зямель ў міжваенны перыяд (прыгранічны рэгіён, адсюль немэтазгоднасць развіцця цяжкай прамысловасці прадпрыемстваў ваенна-прамысловага комплексу); адсутнасцю разведаных радовішчаў карысных выкапняў; арыентацыяй прамысловасці на мясцовую сыравіну – першачарговым развіццём *лёгкай і харчовай прамысловасці.*

З улікам гэтых асаблівасцей у Беларусі быў ўзяты курс на неабходнае і хуткае развіццё галін, якія базіраваліся на перапрацоўцы мясцовай сыравіны: керамічнай, шклянай, запалкавай, дрэваапрацоўчай, ільнопрадзільнай, папяровай, гарбарнай, харчовай іінш.

Асноўнай крыніцай правядзення індустрыялізацыі з’яўлялася сама прамысловасць праз скарачэнне выдаткаў, зніжэнне сабекошту прадукцыі, шырокай нацыяналізацыі прамысловасці, ўмацаванне дысцыпліны за кошт эканомііі павышэння рэнтабільнасці вытворчасці. Важнай крыніцай атрымання сродкаў з’явіліся таксама зберажэнні працоўных, падпіска на дзяржаўныя пазыкі.

У выніку правядзення індустрыялізацыі ў БССР у 1930-я гг. было пабудавана і рэканструявана каля 2 тыс. прамысловых прадпрыемстваў. Сярод найбольш буйных пабудаваных у гэты час, можна адзначыць такія, як швейная фабрыка “Сцяг індустрыялізацыі” і панчошна-трыкатажная фабрыка “КІМ” у Віцебску, Магілёўская фабрыка штучнага валакна, Бабруйскі і

Гомельскі дрэвaапрацоўчыя камбінаты, Гомсельмаш, Аршанскі ільнокамбінат, шэраг цеплавых і гідраэлектрастанцый.

Новая індустрыя вызначыла *спецыялізацыю прамысловасці БССР у агульнасаюзным падзеле працы.* Тут выраблялася ў асноўным фанера, запалакі, панчошна-трыкатажныя вырабы, торф, металарэзныя станкі. У структуры прамысловасці сталі пераважаць буйныя прадпрыемствы. Амаль усе дробныя прыватныя прадпрыемствы зачыніліся ў выніку непасільных падаткаў і адміністрацыйнага ціску, а таксама паскарэння працэсу ўрбанізацыі – перасялення насельніцтва з вёскі ў горад. Такія гарады, як Мінск, Віцебск, Магілёў, Гомель пераўтварыліся ў буйныя індустрыяльныя цэнтры.

У ходзе правядзення індустрыялізацыі была сфарміравана *каманднa-адміністрацыйная сістэма кіравання эканомікай.* Асноўнымі рысамі дадзенай сістэмы з'яўляюцца: манапольная дзяржаўная ўласнасць на сродкі вытворчасці і вынікі працы; цэнтралізаванае размеркаванне ўсіх відаў рэсурсаў і прадукцыі; дырэктыўнае планаванне ўсіх відаў вытворчасці; іерархічная вертыкальная структура кіравання эканомікай; наяўнасць шматлікага бюракратычнага апарату, які распараджаўся дзяржаўнай уласнасцю і кадрамі; шырокае выкарыстанне прымусовых форм працы.

Метады правядзення індустрыялізацыі прывялі да пагаршэння матэрыяльнага становішча працоўных. Выкарыстанне "стаханаўскай сістэмы", фактычнае павелічэнне працоўнага дня, а таксама рост цэн і інфляцыя, садзейнічалі паніжэнню рэальнай заработнай платы прамысловых рабочых. У 1928-1935 гг. дзейнічала картачная сістэма на асноўныя тавары спажывання. Хуткая урбанізацыя абумовіла вострую жыллёвую праблему.

Бюракратычная сістэма кіравання прадугледжвала рэпрэсіўныя санкцыі ў дачыненні кіраўнікоў прадпрыемстваў, інжынерна-тэхнічнага персаналу і рабочых за невыкананне планаў, фабрыкаванне карнымі органамі "спраў" т.зв. "шкоднікаў" і "ворагаў народа". Так, атрымалі шырокае распаўсюджанне судовыя працэсы над "шкоднікамі", яны былі "знойдзены" ў Віцебскім чыгуначным дэпо, на фабрыцы "Сцяг індустрыялізацыі", Гомельскім вагонарамонтным заводзе.

Да пачатку 1940-х гг. стала больш жорсткім *працоўнае заканадаўства*. У 1940 г. быў уведзены сямідзённы працоўны тыдзень. Адначасова забаранялася самавольна пакідаць прадпрыемствы і ўстановы; устанаўлівалася крымінальная адказнасць за спазненні на працу і парушэнні працоўнай дысцыпліны.

Такім чынам, на працягу **1930-х гг.** у БССР адбывалася правядзенне *паскоранай індустрыялізацыі*, як і ў цэлым у СССР. У выніку яе БССР ператварылася ў індустрыяльна-аграрную рэспубліку; значна ўзрос аб'ём вытворчасці ў буйной прамысловасці. Была сфарміравана каманднa-адміністрацыйная сістэма кіравання эканомікай. Разам з тым большая частка насельніцтва заставалася працаваць у сельскай гаспадарцы. Узровень развіцця прамысловай вытворчасці заставаўся значна ніжэйшым, чым у большасці еўрапейскіх краін. Захоўвалася адставанне ў эканамічным развіцці БССР ад прамыслова развітых рэгіёнаў СССР.

*Палітыка калектывізацыі.* Савецкія дзяржава ажыццяўляла правядзенне паскоранай індустрыялізацыі пераважна за кошт рэалізацыі сельскагаспадарчай прадукцыі на знешніх рынках. У часы нэпа арганізоўваліся масавыя закупкі збожжа ў сялянства. Аднак хутка ўзніклі цяжкасці, прычынамі якіх з'яўляліся беднасць большасці сялянскіх гаспадарак і заніжаныя закупачныя цэны на сельскагаспадарчую прадукцыю. Напрыканцы 1920-х гг., калі адбывалася згортванне нэпа, было прынята рашэнне аб правядзенні калектывізацыі сельскай гаспадаркі. *Сутнасць* яе заключалася ў ліквідацыі дробных індывідуальных сялянскіх гаспадарак і ўключэнні іх у склад буйных адзяржаўленых калектыўных і дзяржаўных гаспадарак – *калгасаў*. Стварэнне такіх гаспадарак адпавядала спецыфіцы каманднa-адміністрацыйнай сістэмы кіравання эканомікай, якая сцвярджалася ў гэты час і дазваляла ўладам манапольна кантраляваць працэс вытворчасці і рэалізацыі сельскагаспадарчай прадукцыі.

Непасрэднай перадумовай усеагульнай калектывізацыі стаў хлебанарыхтоўчы крызіс 1927-1928 гг., у выніку якога рэзка знізіўся экспарт збожжа. Рэакцыяй на крызіс з боку ўладаў стала правядзенне надзвычайных мер: гвалтоўная канфіскацыя збожжа ў сялян, крымінальныя пераследаванні ў адносінах да ўкрывальнікаў збожжа.

Пачатак *усеагульнай калектывізацыі* быў распачаты зімой **1929-30 гг.** Асобныя сялянскія гаспадаркі пры іх уключэнні ў калгасы ліквідаваліся; зямля, рабочая жывёла і асноўныя прылады працы пераходзілі ва ўласнасць калгасаў. Фармальна гэта выглядала як аб'яднанне індывідуальных гаспадарак у калектыўныя, фактычна – як дзяржаўная канфіскацыя маёмасці індывідуальных гаспадарак і пераўтварэнне сялян у пазбаўленых уласнасці сельскагаспадарчых рабочых буйных гаспадарак.

Сяляне, якія адмаўляліся ўваходзіць у калгасы, абкладаліся надзвычай высокімі падаткамі; для іх ствараліся неспрыяльныя ўмовы гаспадарання,

што прыводзіла да разарэння. Дадзены фактар, а таксама адміністрацыйны націск, небяспека рэпрэсій вымушалі сялян ўваходзіць у калгасы. Паралельна праводзілася т. зв. *раскулачванне* – прымусовая канфіскацыя маёмасці сялян, якіх улады адносілі да ліку заможных і называлі “кулакамі”. На практыцы да “кулакоў” залічвалі таксама тых сялян, якія супраціўляліся ўступленню ў калгасы. Сем’і раскулачаных сялян вывозілі ў паўночныя раёны Расіі, на Урал, у Казахстан.

Усеагульная калектывізацыя прынесла наступныя *вынікі*:

- да 1939 г. было створана звыш 10 тыс. калгасаў, у якія было ўключана звыш 90% сялянскіх гаспадарак; у карыстанні калгасаў знаходзілася каля 96% пасяўных плошчаў;

- на працягу 1930-х гг. было раскулачана каля 10-15% сялянскіх гаспадарак; каля 600-700 тыс. чалавек было вывезена за межы БССР;

- былі ўведзены абавязковыя пастаўкі сельскагаспадарчай прадукцыі з боку калгасаў па цэнах, ніжэйшых ў 10-12 разоў за рыначныя, у выніку чаго дзяржава атрымлівала значныя сродкі для паскоранай індустрыялізацыі;

- паскараецца працэс перасялення працоўных з вёскі ў горад; былыя сяляне, якія не жадалі ўваходзіць у калгасы, папаўняюць шэрагі рабочага класа ў прамысловасці;

- некалькі паляпшаецца матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне сельскай гаспадаркі; цэнтрамі канцэнтрацыі новай тэхнікі становяцца дзяржаўныя *машынна-трактарныя станцыі* (МТС); аднак у цэлым тэхнічны ўзровень сельскай гаспадаркі заставаўся невысокі;

- узровень сельскагаспадарчай вытворчасці ў цэлым заставаўся на ўзроўні да правядзення калектывізацыі, а ў некаторых яе галінах нават назіраецца заняпад (гэта тлумачыцца цяжкім эканамічным становішчам калгасаў, адсутнасцю у калгаснікаў стымулаў да працы).

На працягу 1930-х гг. адбылася *уніфікацыя ўнутранай структуры калгасаў*. У калгасным карыстанні захоўваліся большая частка калектывізаванай зямельнай плошчы, працоўнай жывёлы, асноўныя прылады працы. У карыстанні індывідуальных гаспадарак калгаснікаў заставаліся сядзібы з невялікімі зямельнымі надзеламі, частка жывёлы, некаторыя прылады працы. Кіраўніцтва калгасаў прызначалася партыйнымі і дзяржаўнымі органамі ўлады і пільна кантралявалася з іх боку. Умовы працы калгаснікаў былі цяжкімі. Аплата працы была нізкай (у сярэднім у 3 разы ніжэй, чым у прамысловасці), у многіх калгасах яна мела натуральны або паўнатуральны характар; адсутнічалі абмежаванні працоўнага дня,

аплочваемыя водпускі, сацыяльнае страхаванне, пенсіі для састарэлых. Асноўнай крыніцай для існавання калгаснага насельніцтва з’яўляліся прысядзібныя гаспадаркі, хаця іх прадукцыя таксама ўключалася ў планы абавязковых дзяржаўных паставак.

Цяжкія ўмовы жыцця і працы ў калгасах вымушалі калгаснікаў накіроўвацца на працу ў прамысловасць, на будаўнічыя работы, лесараспрацоўкі. У той жа час улады імкнуліся не дапусціць бескантрольнага перамяшчэння рабочай сілы з вёскі ў гарады. З гэтай мэтай сялянам не выдаваліся пашпарты, што фактычна азначала пазбаўленне іх грамадзянскіх правоў. Выхад з калгасаў былі магчымы толькі паводле спецыяльнага дазволу адпаведных улад.

Такім чынам, у выніку усеагульнай калектывізацыі 1930-х гг, якая ажыцяўлялася прымысовымі метадамі, была ліквідавана маса дробных сялянскіх гаспадарак, на месцы якіх сфарміраваліся буйныя адзяржаўленыя аграрныя гаспадаркі. Сельская гаспадарка была ўключана ў каманднa-адміністрацыйную сістэму кіравання эканомікай; яе рэсурсы выкарыстоўваліся пераважна для ажыццяўлення індустрыялізацыі.

## 5. Станаўленне і развіццё савецкай беларускай культуры

*Палітыка беларусізацыі.*Лібералізацыя эканомікі суправаджалася адпаведнымі мерапрыемствамі ў галіне нацыянальнай беларускай культуры і адукацыі, якія атрымалі назву *беларусізацыі* (**1924–1929 гг.**). Складалася яна з шэрагу мерапрыемстваў, сярод якіх вызначаецца ўвядзенне беларускай мовы як мовы справаводства ва ўсіх партыйных, савецкіх установах і арміі, перавод на беларускую мову выкладання ва ўсіх школах і ВНУ, вывучэнне беларускай гісторыі і культуры, стварэнне кафедраў беларусазнаўства ва ўсіх ВНУ краіны, арганізацыя дзейнасці беларускіх выдавецтваў. Асобным накірункам беларусізацыі становіцца працэс *карэнізацыі* (вылучэнне на адказную работу ў партыйныя і савецкія органы ўлады прадстаўнікоў карэннай нацыі, г.зн. беларусаў) мясцовых органаў улады і кіравання.

Разам з палітыкай беларусізацыі ў 20-я гг. праводзілася *барацьба з непісьменнасцю.*У пачатку 30-х гг. колькасць непісьменных сярод дарослага насельніцтва скарацілася да мінімуму. Адчыняліся новыя школы. У 1929 – 1930 гг. ўсавецкай краіне была ўведзена ўсеагульная пачатковая адукацыя. Прычым дзеці розныхнацыянальнасцей мелі магчымасць вучыцца на роднай мове. Для нацыянальных школрыхтаваліся спецыяльныя педагагічныя кадры. Да 1928 г. ўжо каля 80 % школправодзіла выкладанне на беларускай мове. У

**1921 г.** пачаў сваю працу *Беларускідзяржаўны універсітэт*, у **1922 г.** – *Інстытут беларускай культуры* (з 1929 г. – Акадэміянавук БССР). Былі таксама створаны політэхнічны, сельскагаспадарчы інстытуты (у1925 г. быў аб’яднаны з інстытутам у Горках у сельскагаспадарчую акадэмію) іветэрынарны інстытут у Віцебску. Усяго ў БССР у гэты перыяд працавала сораknавукова-даследчых устаноў.

З поспехам развівалася *тэатральнае і музычнае мастацтва.* Працаваў *першы Беларускідзяржаўны тэатр* (з 1926 г. – БДТ-1), мастацкім кіраўніком якога з 1921 г.з’яўляўся *Я. Міровіч*. У 1926 г. ў Віцебску адчыніўся БДТ-2. У 1930-я гг. пашыраецца сетка *прафесійных драматычных тэатраў*. У 1932 г. узнікае *трэці Беларускі дзяржаўны тэатр* у Гомелі (расфарміраваны ва ўмовах рэпрэсій у 1937-1938 гг.), які ўзначальваў вядомы беларускі тэатральны дзеяч *У. Галубок*. Рэпертуар тэатральных пастановак падлягаў жорсткай цэнзуры з боку партыйна-дзяржаўных органаў улады.

У Гомелі і Магілёве з’явіліся сімфанічныя аркестры. Значнымі падзеямі ў развіцці музычнага мастацтва з’явілася адкрыццё ў **1932 г.***Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі*, а ў **1933 г.** – *Беларускага тэатра оперы і балета*. У **1937 г.** у Мінску пачала працаваць *Беларуская дзяржаўная філармонія*.

Актыўна праходзіла і літаратурнае жыццё. У 20-я гг. існавала некалькі буйных *літаратурных аб’яднанняў*: “Маладняк” (*М. Лынькоў, М. Чарот, П. Трус, П. Галавач* і інш.), з якога ў 1926 – 1927 гг. адлучыліся “Узвышша” (*А. Бабарэка, П. Глебка, З. Бядуля, М. Лужанін, К. Крапіва* і інш.) і “Полымя” (*Я. Колас, Я. Купала, М. Зарэцкі, Ц. Гартны, М. Чарот* і інш.). У 1928 г. “Маладняк” ператварыўся ў Беларускую асацыяцыю пралетарскіх пісьменнікаў (БелАПП).

У разглядаемы перыяд у БССР з’яўляецца новы від мастацтва – *кіно*. У **1928 г.** у Ленінградзе была створана кінастудыя мастацкіх фільмаў “*Савецкая Беларусь*”, якая напрыканцы 1930-х гг. была пераведзена ў Мінск. Кінематограф становіцца гукавым, з’яўляецца рэспубліканская кінахроніка і фільмы для дзяцей, экранізуюцца літаратурныя творы. Найбольшае значэнне для гэтага перыяду мелі фільмы *Ю. Тарыча і У. Корш-Сабліна.*

У *жывапісе* разглядаемага перыяду стыль “сацыялістычнага рэалізму” праявіўся ў стварэнні карцін, прысвечаных падзеям, звязаным з устанаўленнем бальшавіцкай улады і індустрыяльнаму будаўніцтву савецкага часу. Да ліку найбольш значных мастакоў 1930-х гг. можна

залічыць *І. Ахрэмчыка, У. Волкава, І. Давідовіча, Я. Зайцава, У. Кудрэвіча* і інш.

У *архітэктуры* ўкараняецца стыль "савецкага класіцызму", для якога характэрныя пампезнасць і гігантаманія, што павінны былі падкрэсліць непарушнасць існуючага рэжыму. Найбольш вядомымі помнікамі дадзенага стылю з'яўляюцца Дамы ўрада, Чырвонай арміі, Акадэміі навук у Мінску.

У 1930-я гг. ва ўмовах паскоранай мадэрнізацыі грамадства назіраўся працэс развіцця адукацыі, навукі і розных галін культуры. Разам з тым усталяванне таталітарнага рэжыму істотным чынам тармазіла дадзены працэс у выніку правядзення масавых рэпрэсій супраць інтэлігенцыі, а таксама жорсткага дзяржаўнага кантролю ў духоўнай сферы жыцця грамадства.

**Кантрольныя пытанні і заданні для самападрыхтоўкі студэнтаў:**

1. Калі была абвешчана БНР? Назавіце асноўныя ідэі трох Устаўных грамат Выканкама Рады Усебеларускага з'езда.
2. Як адбывалася стварэнне беларускай савецкай дзяржаўнасці?
3. З якой мэтай была створана Літоўска-Беларуская ССР?
4. Чым адрозніваецца "палітыка ваеннага камунізма" ад НЭПа?
5. Як ажыццяўлялася калектывізацыя і індустрыялізацыя ў Беларусі?
6. Пералічыце асноўныя мерапрыемствы палітыкі беларусізацыі.

## Літаратура:

1. Беларусь: страницы истории /редсовет: А.А. Коваленя [и др.]. – Минск, 2011.

2. Бригадин, П.И. История Беларуси в контексте европейской истории: курс лекций. – Минск, 2007.

3. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. / М.У. Смяховіч [і інш.] ; рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.]. – Мінск, 2012. – Кн. 2.

4. На шляху станаўлення беларускай нацыі: гістарыяграфічныя здабыткі і праблемы / В. В. Яноўская [і інш.] ; навук. рэд. В. В. Яноўская. – Мінск, 2011.

5. Новик, Е.К., Качалов, И.Л., Новик, Н.Е. История Беларуси: с древнейших времен до 2012 г. : учебное пособие. — 3-е изд., испр. и доп. – Минск, 2012.

6. Очерки истории науки и культуры Беларуси. IX–XX вв. – Минск. 1996.

7. Ходзін, С. М.Гісторыя культуры Беларусі ў 1920–1930-я гг. – Мінск, 2001.

8. Эканамічная гісторыя Беларусі : курс лекцый / В. І. Галубовіч [і інш.]; пад агул. рэд. В. І. Галубовіча. – Мінск, 1993.

## Тэма 5.1. Заходняя Беларусь у складзе Польскай дзяржавы.

*Кючавыя паняцці:*“крэсы ўсходнія”; “пацыфікацыя”;асаднікі; камасацыя; рэжым санацыі; Таварыства беларускай школы; Беларуская рэвалюцыйная арганізацыя; Камуністычная партыя Заходняй Беларусі; Камуністычны Саюз Моладзі Заходняй Беларусі; Беларускі пасольскі клуб; Беларуская сялянска-рабочая грамада; пакт Молатава-Рыбентропа; вызваленчы паход Чырвонай Арміі.

### План лекцыі:

1. Рыжская мірная дамова ў гістарычным лёсе беларускага народа.
2. Грамадска-палітычнае, эканамічнае, нацыянальна-культурнае становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польскай дзяржавы.
3. Рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчы рух ў Заходняй Беларусі.

### 1.Рыжская мірная дамова ў гістарычным лёсе беларускага народа.

Паводле *Рыжскага мірнага дагавора*(**18 сакавіка 1921 г.**) да Польшчы была далучана заходняя частка Беларусі у складзе Гродзенскай, часткі Віленскай (Ашмянскі, Лідскі, Вілейскі, Дзісенскі паветы) і Мінскай (Навагрудскі, Пінскі, частка Слуцкага, Мінскага і Мазырскага паветаў) губерняў. Плошча Заходняй Беларусі складала 112 955 км$^2$. Палякі называлі гэтыя тэрыторыі *“крэсы ўсходнія” (“усходнія ўскраіны”),* “паўночна-ўсходнія землі Польшчы”, “Белапольшча”, што падкрэслівала пазіцыю непрызнання беларускіх зямель як асобнай не толькі тэрытарыяльна-палітычнай, але і этнічнай адзінкі.

Заходняя Беларусь была падзелена на чатыры ваяводствы: Беластоцкае,Віленскае, Навагрудскае і Палескае, якія падзяляліся на паветы і гміны. Згодна з гэтым падзелам былі ўтвораны мясцовыя органы кіравання і самакіравання. У Заходняй Беларусі на ўсе дзяржаўныя пасады ў ваяводствах, паветах і гмінах прызначаліся толькі палякі.

Колькасць насельніцтва Заходняй Беларусі ў 1931 г. складала 4,6 млн. чалавек. Паводле свайго складу яно было шматнацыянальным: беларусы

складалі 65 % насельніцтва, палякі – 15 %, яўрэі – 11 %, украінцы – 4 %, літоўцы – 2,5 %. У 1939 г. насельніцтва Заходняй Беларусі налічвала ўжо 5 млн. чалавек.

## 2.Грамадска-палітычнае, эканамічнае, нацыянальна-культурнае становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польскай дзяржавы.

Кіраўнікі буржуазнай Польшчы на тэрыторыі Заходняй Беларусі праводзілі *вялікадзяржаўную, шавіністычную палітыку*. Яны не прызнавалі беларусаў за нацыю і мелі на мэце паланізаваць цэлы народ. Беларуская нацыянальная культура праследавалася, закрываліся беларускія газеты, школы, бібліятэкі. У дзяржаўных установах забаранялася ўжываць беларускую мову.

У дапаўненне да сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту ў Заходняй Беларусі панаваў жорсткі палітычны рэжым і паліцэйскі тэрор. Рэпрэсіравалі ў першую чаргу камуністаў або спачуваючых камуністычнаму руху. Паводле крымінальнага кодэкса ад 11 ліпеня 1932 г., за прыналежнасць да камуністычнай партыі прадугледжвалася пакаранне аж да пажыццёвага турэмнага зняволення. За садзейнічанне камуністам было ўстаноўлена пакаранне да пяці гадоў турмы.

Па ўсёй тэрыторыі Заходняй Беларусі лютавалі карныя экспедыцыі, якія называліся *“пацыфікацыяй”*. У час пацыфікацый паліцэйскія разбуралі жыллё сялян, знішчалі маёмасць і харч, учынялі масавыя экзекуцыі. Пасля такога разбою жыхарам гэтых вёсак забаранялася запальваць агні вечарамі, збірацца разам некалькім чалавекам, хадзіць у суседнія вёскі. Вядучая роля ў правядзенні тэрору належала тайнай палітычнай паліцыі – дэфензіве. Яна шырока карысталася метадамі правакацый, паклёпу, запужвання і фізічных катаванняў.

Заходняя Беларусь і яе насельніцтва апынуліся ў вельмі цяжкім становішчы. Разбураная першай імперыялістычнай і затым грамадзянскай вайной гаспадарка амаль не адбудоўвалася, і беларускія землі ператвараліся ў сыравінны прыдатак Польшчы.

На заводах і фабрыках працоўны дзень працягваўся 10–11 гадзін, а на саматужных прадпрыемствах быў значна большым. За тую ж самую працу ў прамысловасці польскаму рабочаму плацілі больш, чым беларусу. Асабліва пакутлівай з’явай было беспрацоўе. У сярэднім на аднаго працуючага прыходзілася два беспрацоўныя. Людзі згаджаліся на любую работу і любую аплату.

85% насельніцтва Заходняй Беларусі пражывала ў вёсцы. Больш паловы зямельнага фонду належыла памешчыкам ці буйным уладальнікам, якія мелі ў сярэднім па 500 га. Такіх уладальнікаў было каля 1 % ад усіх жыхароў сельскай мясцовасці. На сялянскі двор прыходзілася каля 7 га. зямлі. Многія сяляне не мелі зямлі ўвогуле. У гэтых умовах польскія ўлады раздавалі буйныя ўчасткі зямлі *асаднікам* – былым афіцэрам і чыноўнікам, якія мелі заслугі ў савецка-польскай вайне 1919–1920 гг. Па сутнасці, гэта былі новыя памешчыкі, якія з'яўляліся сацыяльнай апорай уладам. Яны былі добра арганізаваны, узброены і выконвалі паліцэйскія функцыі ў адносінах да мясцовага насельніцтва. Да вызвалення на тэрыторыі Заходняй Беларусі было расселена каля 10 тыс. асаднікаў.

Адным з накірункаў зямельнай рэфоры 1920-х гг. у Польшчы была т.зв. *камасацыя* (землеўладкаванне) – ліквідацыя цераспалосіцы, ў выніку якой сяляне ўзамен раздробленых на вузкія палоскі зямель павінны былі атрымаць такую самую колькасць зямлі, але адзіным участкам (хутар). Сялян прымушалі высяляцца на хутары, але, каб уладкаваць хутарскую гаспадарку, патрэбны былі вялікія сродкі. Часта землі сялян пераходзілі да кулакоў і асаднікаў. Да 1939 г. на хутары было пераведзена 43 % усіх гаспадарак, якія карысталіся 45 % усёй зямлі.

Рэформа ліквідавала *сервітуты* – агульныя абшчынныя ўчасткі зямлі, у выніку чаго сяляне пазбавіліся пашы для жывёлы, вадаёмаў і сенакосаў. Аграрныя пераўтварэнні вялі да ўзрастання дыферэнцыяцыі сялян, колькасць бедных жыхароў вёскі пачала няўхільна павялічвацца.

Сяляне павінны былі пастаянна выконваць *дарожныя павіннасці* – шарваркі, задарма працаваць на пабудове ці рамонце мастоў, дарог, грэбляў. Медыцынскае абслугоўванне з-за недахопу ўрачоў, дарагавізны медыкаментаў і лячэння было недаступна для большасці насельніцтва. Адзін доктар прыходзіўся на 5–6 тыс. чалавек.

У пошуках заробкаў, даведзеныя голадам і ўціскам да адчаю, сяляне шукалі выйсця ў *эміграцыі.*У 1925–1938 гг. з трох ваяводстваў Заходняй Беларусі выехалі на пастаяннае жыхарства ў ЗША, Канаду, Лацінскую Амерыку, Заходнюю Еўропу, іншыя краіны 78,1 тыс. чалавек.

У выніку палітычнага перавароту ў **1926 г.,** здзейсненага групай вайскоўцаў на чале з маршалам *Ю. Пілсудскім,* у Польшчы ўсталяваўся ваенна-аўтарытарны рэжым (рэжым асабістай улады) – *"санацыя"* ("аздараўленне"). Афіцыйнымі задачамі санацыі выступалі дасягненне эканамічнай і палітычнай стабілізацыі ў краіне. Аднак на самой справе

Пілсудскі фактычна пераўтвараецца ў дыктатара. У 1930 г. ён разагнаў сойм і распачаў палітыку рэпрэсій у адносінах да апазіцыі. У **1934 г.***у Бярозе-Картузскай* у Заходняй Беларусі быў створаны *канцэнтрацыйны лагер* для палітычных зняволеных, праз які за 1934-1939 гг. прайшло каля 10 тыс. чалавек.

Пачатак санацыйнага рэжыму супадае па часе з эканамічным уздымам 1926-1929 гг. Гэта абумовіла падтрымку яго ў гэты час значнай часткай насельніцтва. У 1926-1927 гг. рэжым пайшоў на некаторыя саступкі беларускаму нацыянальнаму руху, дазволіўшы стварэнне шэрагу беларускамоўных школ. Аднак у далейшым ён працягвае праводзіць на заходнебеларускіх землях актыўную палітыку паланізацыі.

Тэрыторыя, якая апынулася пад Польшчай, выконвала ролю "санітарнага кардона" – буфера паміж СССР і капіталістычнымі краінамі з мэтай недапушчэння распаўсюджання камуністычных ідэй.

У 1920-1930-я гг. адбывалася паступовае развіццё *адукацыі* і розных форм духоўнай культуры ў Заходняй Беларусі. Аднак дадзены працэс істотна стрымліваўся павольнымі тэмпамі эканамічнай мадэрнізацыі, а таксама паланізатарскай палітыкай польскіх улад.

Важным накірункам адукацыйнай палітыкі польскіх уладаў з'яўлялася *паланізацыя школы*. Гэта суправаджалася дыскрымінацыяй беларускіх навучальных устаноў. Калі ў сярэдзіне 1920-х гг. у Заходняй Беларусі дзейнічала 77 беларускіх школ і 4 гімназіі (у Вільні, Радашковічах, Клецку, Навагрудку), то ў 1938 г. не засталося ніводнай.

У цэлым развіццё адукацыі суправаджалася істотнымі цяжкасцямі, такімі, як недахоп школ, іх матэрыяльнага забеспячэння, настаўніцкіх кадраў. Узровень пісьменнасці насельніцтва заставаўся невысокім: у 1931 г. у Заходняй Беларусі налічвалася 43% непісьменных, што было значна вышэйшым паказчыкам, чым у цэнтральных раёнах Польшчы.

Важнай падзеяй ў развіцці адукацыі стала аднаўленне ў **1919 г.***Віленскага універсітэта імя Стэфана Баторыя*, які стаў буйнейшым навуковым і культурным цэнтрам Заходняй Беларусі. Найбольш значныя навуковыя даследаванні ва ўніверсітэце праводзіліся ў галіне філалогіі.

У розных сферах духоўнай культуры (літаратура, тэатр, друк, музыка, выяўленчае мастацтва) дамінаваў польскі ўплыў. Цэнтрамі беларускай культурна-асветніцкай дзейнасці з'яўляліся *Таварыства беларускай школы(ТБШ)* (**1921-1937 гг.**), *Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры* (**1926-1936 гг.**), *Беларускае навуковае таварыства* (**1918–1939 гг.**),*Віленскі*

*беларускі гісторыка-этнаграфічны музей***(1921-1939 гг.),** беларускамоўныя газеты, часопісы і выдавецтвы і г.д.

Для заходнебеларускай літаратуры характэрна перавага паэтычнага жанру, у межах якога дамінуюць грамадска-палітычныя, а таксама рамантычна-лірычныя матывы (*М. Танк, В. Таўлай, М. Засім, Н. Арсеннева, К. Сваяк, У. Жылка, П. Пестрак* і інш.).

Выяўленчае мастацтва было прадстаўлена такімі жанрамі, як гістарычны і сімваліка-алегарычны (*Я. Драздовіч*); бытавы (*М. Сеўрук, П. Сергіевіч*); партрэтны і пейзажны (*Г. Семашкевіч*); карыкатурны (*Я. Горыд*).

Значны ўнёсак у развіццё музычнай культуры зроблены кампазітарамі *К. Галкоўскім, Л. Раеўскім*, оперным спеваком і выканаўцам народных беларускіх песень *М. Забэйда-Суміцкім.*

**3.Рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі.**

Рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчы рух ў Заходняй Беларусі меў два напрамкі: рэвалюцыяна-вызваленчы і нацыянальна-дэмакратычны. Рэвалюцыйна-вызваленчы напрамак прадстаўлялі *Камуністычная партыя Заходняй Беларусі*(КПЗБ), створаная ў **1923 г.** у Вільні, *Камуністычны Саюз Моладзі Заходняй Беларусі*(КСМЗБ), *Беларуская рэвалюцыйная арганізацыя* (частка эсэраў, якія ўзначальвалі партызанскую барацьбу). КПЗБ на правах тэрытарыяльна-аўтаномнай арганізацыі ўвайшла ў склад Камуністычнай партыі Польшчы. Сваёй мэтай КПЗБ ставіла барацьбу за інтарэсы рабочага класа, надзяленне сялян зямлёй без выкупу, самавызначэнне Заходняй Беларусі і ўз'яднанне яе з БССР. Арганізатарамі рэвалюцыйнага руху былі *І. Лагіновіч, В. Харужая, А. Славінскі* і інш.

*Нацыянальна-дэмакратычны напрамак* складалі дэпутаты-беларусы, выбраныя ў польскі сойм (парламент), прыхільнікі БНР, якія стаялі за выкарыстанне парламенцкіх формаў барацьбы, члены масавай культурна--асветніцкай арганізацыі – *Таварыства беларускай школы* (ТБШ), створанай ў **1921 г.**

У **першай палове 1920-х гг.***нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі* пераважна выступаў у форме ўзброенай партызанскай барацьбы з польскімі ўладамі. Сацыяльную базу партызанскага руху складалі беларускае сялянства, сельская інтэлігенцыя і рамеснікі. На Беласточчыне і Гродзеншчыне партызанскі рух разгортваўся пад кіраўніцтвам Беларускай партыі эсэраў, а на Палессі, Навагрудчыне і Віленшчыне — пад кіраўніцтвам камуністаў. З мэтай актывізацыі партызанскага руху **летам 1921 г.**

беларускія эсеры стварылі *Цэнтральны беларускі паўстанцкі камітэт* на чале з У. Пракулевічам. Партызанскія атрады звычайна налічвалі 30-50 чалавек, але існавалі і больш буйныя партызанскія злучэнні (да 100 чалавек). Партызанскія атрады ў 1924-1925 гг. ядналіся ў буйныя фарміраванні па ваеннаму прынцыпу, якімі камандавалі *К.П. Арлоўскі, В.З. Корж, С.А. Ваупшасаў* і інш.

Каб спыніць партызанскі рух, польскія ўлады прыцягнулі для барацьбы з беларускімі партызанамі дадатковыя вайсковыя сілы і ўзмацнілі паліцэйскі тэрор. Пад напорам шматразова перавышаючых сіл праціўніка ЦК КПЗБ заклікаў камуністаў і партызан спыніць узброеную барацьбу як несвоечасовую і пачаць рэвалюцыйную барацьбу супраць акупантаў. У сярэдзіне 1920-х гг. партызанская барацьба ў Заходняй Беларусі была спынена.

Актыўна змагаліся за свае эканамічныя і палітычныя правы рабочыя Заходняй Беларусі. Пад уплывам сусветнага эканамічнага крызісу моцная хваля стачачнай барацьбы ахапіла ўсю Заходнюю Беларусі ў 1929-1933 гг. У кастрычніку 1932 г. – лютым 1933 г. паспяхова бастравалі рабочыя лесараспрацовак у Белавежскай пушчы. У 1930-я гг. эканамічныя стачкі ўсё часцей перарасталі ў палітычныя, якія нярэдка завяршаліся сутычкамі з паліцыяй.

Адначасова з рабочым рухам у першай палове 1930-х гг. у Заходняй Беларусі актывізавалася барацьба сялян супраць эканамічнага і палітычнага прыгнёту.Для падаўлення сялянскіх выступленняў улады шырока выкарыстоўвалі карныя экспедыцыі паліцыі і вайсковыя падраздзяленні. Асаблівы размах набыло летам **1935 г.***выступленне нарачанскіх сялян-рыбакоў*, выкліканае спробай ўлад пазбавіць сялян права лавіць рыбу. У барацьбе, якая працягвалася аж да 1939 г., удзельнічала каля 5 тыс. чалавек.

У кастрычніку 1922 г. адбыліся выбары ў польскі сейм, у якія 11 абраных ад заходнебеларускіх зямель дэпутатаў утварылі сеймавую фракцыю — *Беларускі пасольскі клуб* (БПК). 24 чэрвеня 1925 г. група паслоў левага накірунку (*Б. А. Тарашкевіч, П. В. Мятла, П. П. Валошын, С. А. Рак-Міхайлоўскі*) беларускага пасольскага клуба стварыла *Беларускую сялянска-рабочую грамаду* (БСРГ), якая ў **маі 1926 г.** афармілася як самастойная палітычная арганізацыя. БСРГ выступала за канфіскацыю памешчыцкіх зямель і падзел іх без выкупу паміж беззямельнымі і малазямельнымі сялянамі, стварэнне сялянска-рабочага ўрада і ўстанаўленнн дэмакратычных свабод, самавызначэнне Заходняй Беларусі,

увядзенне 8-гадзіннага рабочага дня, ліквідацыю асадніцтва, адкрыццё школ на роднай мове і г.д.

Сацыяльную базу Грамады складала беларускае сялянства, у першую чаргу сярэдняе і беднейшае. У хуткім часе БСРГ ператварылася ў масавую арганізацыю, якая ў студзені**1927 г.** аб'яднала больш за 2 тыс. гурткоў з *120 тыс. членаў*. Рост уплыву БСРГ на беларускае сялянства напалохаў урад Пілсудскага, які ў студзені 1927 г. разграміў БСРГ. Былі арыштаваны кіраўнікі арганізацыі (Б.А. Тарашкевіч, П.В. Мятла, П.П. Валошын, С.А. Рак-Міхайлоўскі) і больш за 800 яе дзеячаў, над імі ўчынілі палітычныя працэсы. На разгром Грамады працоўныя Заходняй Беларусі адказалі шматлікімі рэзалюцыямі пратэсту, мітынгамі і масавымі дэманстрацыямі.

*Уз'яднанне беларускага народу ў складзе БССР*. **23 жніўня 1939 г.** быў падпісаны савецка-германскі дагавор аб ненападзе тэрмінам на 10 год. Дагавор вядомы ў гісторыі як *пакт Молатава-Рыбентропа*, які меў сакрэтны дадатковы пратакол аб размежаванні сфер уплыву СССР і Германіі ва Усходняй Еўропе. У сферу зацікаўленасці СССР увайшлі Заходняя Беларусь і Заходняя Украіна, якія знаходзіліся ў складзе Польшчы.

**1 верасня 1939 г.** войскі вермахта перайшлі граніцу Польшчы і, нягледзячы на мужнае супраціўленне польскай арміі, на працягу двух тыдняў захапілі ўсю Польшчу. Так пачалася *Другая сусветная вайна.* 14 верасня нямецкія войскі занялі Брэст. Польская абарона і сістэма дзяржаўнага кіравання былі канчаткова разбураны, а ваеннае і палітычнае кіраўніцтва пакінулі краіну. Германскія войскі акупіравалі амаль усю тэрыторыю Польшчы і падступілі да межаў Заходняй Беларусі.

**17 верасня 1939 г**. злучэнні Чырвонай Арміі перайшлі савецка-польскую граніцу. Гэтая падзея ўвайшла ў гісторыю як *вызваленчы паходЧырвонай Арміі* з мэтай абароны насельніцтва Заходняй Беларусі ад нямецкіх войск. Да 25 верасня 1939 г. савецкія войскі поўнасцю занялі Заходнюю Беларусь.

**28 верасня 1939 г.** СССР і Германія заключылі Дагавор аб сяброўстве і граніцы. Гэты дагавор вызначыў усходнюю граніцу Польшчы ў якасці граніцы паміж Германіяй і СССР.

Вільня і Віленскі край, якія таксама былі вызвалены Чывонай Арміяй ад улады Польшчы згодна з дагаворам, заключаным **10 кастрычніка 1939 г.** паміж СССР і ўрадам Літвы, адыйшлі да Літоўскай рэспублікі.

Адразу з прыходам Чырвонай Арміі на тэрыторыю Заходняй Беларусі пачаліся *палітычныя і сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні*.

Ва ўсіх гарадах і паветах былі створаны часовыя праўленні, у вёсках — сялянскія камітэты з мясцовых актывістаў, прадстаўнікоў Чырвонай Арміі і прысланых зусходніх раёнаў Беларусі камуністаў і камсамольцаў. Яны стваралі атрады рабочай гвардыі міліцыі, бралі на ўлік фабрыкі і заводы, устанаўлівалі рабочы кантроль, займаліся забеспячэннем насельніцтва харчаваннем, медыцынскім абслугоўваннем, вялі работу на выбарах у Народны (нацыянальны) сход.

Народны (нацыянальны) сход Заходняй Беларусі адбыўся **28-30 кастрычніка 1939 г.** у Беластоку. Ён прыняў *Дэкларацыі аб абвяшчэнні савецкай улады на ўсёй тэрыторыі Заходняй Беларусі і аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад БССР.*Працэс юрыдычна-прававога афармлення прыняцця Заходняй Беларусі ў склад СССР быў завершаны 2 лістапада 1939 г. на сесіі Вярхоўнага Савета СССР, а ў склад БССР — 12 лістапада на сесіі Вярхоўнага Савета БССР, калі адпаведна былі прыняты законы аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад СССР і ўз'яднанні яе з БССР. У выніку ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР насельніцтва Беларусі павялічылася да 11 млн чалавек, а беларускі народ аб'яднаны ў адзіны нацыянальна-дзяржаўны арганізм.

**Кантрольныя пытанні і заданні для самападрыхтоўкі студэнтаў:**

1. Якое значэнне мела Рыжская мірная дамова для гістарычнага лёсу беларускага народа?
2. Дайце характарыстыку палітыцы польскіх ўлад на тэрыторыі Заходняй Беларусі.
3. У чым сутнасць рэформаў у сельскай гаспадарцы Заходняй Беларусі?
4. Хто ўзначаліў барацьбу беларускага народа супроць палякаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі?
5. Што такое Таварыства беларускай школы і Беларуская сялянска-рабочая грамада?
6. У чым гістарычнае значэнне аб’яднання беларускага народа ў складзе БССР?

## Літаратура:

1. Беларусь: страницы истории / редсовет: А.А. Коваленя [и др.]. – Минск, 2011.

2. Бригадин, П.И. История Беларуси в контексте европейской истории: курс лекций. – Минск, 2007.
3. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. / М.У. Смяховіч [і інш.] ; рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.]. — Мінск, 2012. – Кн. 2.
4. Ковкель, И. И. История Беларуси с древнейших времен до нашего времени / И. И. Ковкель, Э. С. Ярмусик. – Минск, 2006.
5. На шляху станаўлення беларускай нацыі: гістарыяграфічныя здабыткі і праблемы / В. В. Яноўская [і інш.] ; навук. рэд. В. В. Яноўская. – Мінск, 2011.
6. Новик, Е.К., Качалов, И.Л., Новик, Н.Е. История Беларуси: с древнейших времен до 2012 г. : учебное пособие. — 3-е изд., испр. и доп. – Минск, 2012.

## Тэма 6.1. Беларусь у гады Другой сусветнай вайны і Вялікай Айчыннай вайны

*Кючавыя паняцці:* Другая сусветная вайна; «лінія Керзана»; генацыд;калабарацыя; антыфашысцкае падполле; "Суражскія вароты"; партызанская зона; партызанскі рух; "рэйкавая вайна"; Армія Краёва; наступальная аперацыя "Баграціён"; "Віцебскі кацёл".

**План лекцыі:**

1.Прычыны і пачатак Другой сусветнай вайны.
2.Акупацыя фашысцкай Германіяй Беларусі. Акупацыйны рэжым.
3.Баявая дзейнасць партызан і падпольшчыкаў.
4.Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.
5.Вынікі вайны для беларускага народа і яго ўклад у Перамогу над фашызмам.

### 1.Прычыны і пачатак Другой сусветнай вайны.

Другая сусветная вайна пачалася **1 верасня 1939 г.**нападам Германіі на Польшчу. У яе была ўцягнута 61 дзяржава (больш за 80% насельніцтва Зямлі). Ваенныя дзеянні ішлі на тэрыторыі 40 дзяржаў, а таксама паўсюдна на марскіх і акіянскіх прасторах. Палітычнае кіраўніцтва краін Захаду і Усходу не змагло выпрацаваць сумеснай пазіцыі па стрымліванні агрэсіўных намераў Германіі. Прычым Вялікабрытанія, Францыя, Польшча і Савецкі

Саюз аддалі перавагу кампрамісу з агрэсарам замест процістаяння, а ў выніку асудзілі сябе наваеннае выпрабаванне ў больш складаных умовах. Адсутнасць узгодненнай дзейнасці еўрапейскіх краін прывяла да таго, што перадваенныя палітычныя супярэчнасці паміж найбуйнейшымі краінамі перараслі ў вайну. Несумненна, што вядучую ролю ў распальванні ваеннага канфлікту адыгралі таталітарныя рэжымы Італіі, Японіі і найперш нацысцкай Германіі.

У айчыннай гістарыяграфіі вылучаюць пяць асноўных перыядаў Другой сусветнай вайны:

першы перыяд (**1*верасня 1939 - 21 чэрвеня 1941 г.)*** уключае пачатак Другой сусветнай вайны і захоп германскімі войскамі і іх сатэлітамі краін Заходняй Еўропы;

другі перыяд ***(22 чэрвеня 1941 - 18 лістапада 1942 г.)*** – гэта напад гітлераўскай Германіі на СССР, пачатак Вялікай Айчыннай вайны савецкага народа, пашырэнне маштабаў вайны і крах «маланкавай вайны»;

трэці перыяд ***(19 лістапада 1942 - 31 снежня 1943 г.)***звязаны з карэнным пераломам у вайне, прыпыненнем наступальнай стратэгіі фашысцкага блока і пераходам стратэгічнай ініцыятывы да краін антыгітлераўскай кааліцыі;

чацвёрты перыяд ***(1 студзеня 1944 - 9 мая 1945 г.)***уключае разгром фашысцкага блока, выгнанне гітлераўскіх войскаў з тэрыторыі СССР, адкрыццё другога фронту, заканчэнне Вялікай Айчыннай вайны, вызваленне ад германскай акупацыі краін Еўропы, капітуляцыю Германіі;

пяты перыяд ***(9 мая - 2 верасня 1945 г.)***звязаны з разгромам мілітарысцкай Японіі, вызваленнем народаў Азіі ад **японскіх акупантаў і заканчэннем Другой сусветнай вайны.**

У *першы перыяд вайны* асноўныя падзеі разгортваліся на захадзе Еўропы. Вялікабрытанія і Францыя, звязаныя пагадненнем з Польшчай аб узаемадапамозе, аб'явілі ***3 верасня 1939 г.***вайну Германіі. З аб'яўленнем вайны Германіі выступілі Аўстралія, Новая Зеландыя, Канада, Індыя, Паўднёва-Афрыканскі Саюз. Вайна набыла сусветны маштаб. Аднак неабходнай ваенна-эканамічнай дапамогі Польшчы ўсе гэтыя краіны не аказалі і баявых дзеянняў не распачалі. Планавалася, што французская армія на пятнадцаты дзень пасля нападу Германіі на Польшчу пяройдзе ў наступленне. Ваенныя магчымасці Вялікабрытаніі і Францыі былі дастатковыя для прыпынення германскай агрэсіі. Рашучы ўдар саюзнікаў на захадзе мог бы карэнным чынам змяніць ход ваенных падзей. Грамадскасць

разлічвала на падтрымку саюзнікаў. Але час ішоў, а самалёты саюзнікаў у польскім небе так і не з'явіліся.

Польскае камандаванне не паспела закончыць мабілізацыю і разгортванне войска. Нягледзячы на мужнае супраціўленне польскіх салдат і афіцэраў, германская армія, дзякуючы вялікай ваеннай перавазе да 16 верасня 1939 г., акупіравала большую частку тэрыторыі Польшчы і выйшла на *«лінію Керзана».* Польскі ўрад 16 верасня пакінуў краіну і эміграваў у Румынію, а потым у Лондан. Многія польскія патрыёты заставаліся вернымі прысязе і працягвалі змагацца, выконваючы свой вайсковы абавязак. Гераічна змагаліся абаронцы Варшавы, капітуляваўшы толькі 27 верасня, а таксама абаронцы Брэсцкай крэпасці, сярод якіх было шмат беларусаў. Агульнае становішча польскіх войскаў зрабілася катастрафічным. У другой палавіне верасня польскай арміі як арганізаванага цэлага ўжо не існавала. Узброеным сілам Польшчы былі нанесены значныя страты.

**2.Акупацыя фашысцкай Германіяй Беларусі. Акупацыйны рэжым.**

*Акупацыйны рэжым у Беларусі* – гэта сістэма палітычных, эканамічных, ваенных і ідэалагічных мер, накіраваных на ліквідацыю савецкага грамадска-дзяржаўнага ладу, рабаванне нацыянальных багаццяў і рэсурсаў, заняволенне і знішчэнне беларускага народа. Акупацыйны рэжым з’яўляўся сродкам правядзення ў жыццё палітыкі германскага фашызму ў адносінах да заваяваных тэрыторый і народаў.

Згодна з нямецкім генеральным *планам “Ост”,* землі Беларусі і прылеглых тэрыторый павінны быць каланізаваны і ў перспектыве ўвайсці ў тэрыторыю Германіі з карэнным насельніцтвам. Дзеля гэтага 25 % беларусаў, якіх акупанты лічылі блізкімі да арыйскай расы, планавалася анямечыць, астатніх выселіць або знішчыць.

Фашыстамі быў уведзены *новы адміністратыўны падзел*, які парушаў тэрытарыяльную цэласнасць Беларусі. Паўднёвыя яе землі адыходзілі да рэйхскамісарыята “Украіна”, заходняя частка Беларусі ўвайшла ў склад усходняй Прусіі, Віцебская, Магілёўская, амаль уся Гомельская і некаторыя раёны Мінскай і Палескай абласцей уключаліся ў зону так званай “вобласці армейскага тылу” групы армій “Цэнтр”, цэнтральная ж частка рэспублікі, уключаючая 77 раёнаў, была аднесена да генеральнай акругі “Беларусь” рэйхскамісарыята “Остланд”. Вышэйшым органам кіравання на тэрыторыі Беларусі з’яўляўся Генеральны камісарыят, які ўзначальвалі спачатку *В. Кубэ,* затым *К. Готберг.*

*Адміністратыўны апарат акупантаў* у асноўным складаўся з нямецкіх служачых. У якасці дапаможных мясцовых устаноў фашысты стварылі гарадскія і раённыя ўправы на чале з начальнікамі раёнаў або бургамістрамі гарадоў. На месцах ствараліся воласці на чале са старшынямі, ў вёсках прызначаліся старасты. Работу мясцовых грамадзянскіх органаў улады кантралявалі шэфы – “камісары”,”каменданты”, “зондэрфюрэры” і інш. У кіраўніцтве захопленымі тэрыторыямі акупанты абапіраліся на рэпрэсіўны апарат: пяць ахоўных дывізій, якія дыслацыраваліся на тэрыторыі Беларусі, асобныя карныя, так званыя нацыянальныя батальёны, спецыяльныя падраздзяленні – айнзатцкаманды і зондэркаманды, СС, гестапа, а таксама на паліцэйскія фарміраванні.

Гітлераўцы таксама імкнуліся выкарыстаць у сваіх мэтах людзей, якія былі не задаволены савецкай уладай, або эмігрантаў, якія знаходзіліся да яе ў апазіцыі. Людзей, якія супрацоўнічалі з акупантамі, пазней сталі называць *калабарантамі*. З ліку гэтых калабарантаў акупанты стваралі нацыяналістычныя арганізацыі: *Беларуская народная самапомач* на чале з *І. Ермачэнкам, Саюз беларускай моладзі (М. Ганько, Н. Абрамава)*, Раду даверу, якая затым у 1943 г. была пераўтворана ў *Беларускую Цэнтральную раду (Р. Астроўскі), Беларуская краёвая абарона*, але ў іх склад была ўцягнута нязначная частка насельніцтва.

Стрыжнем акупацыйнага рэжыму стала палітыка *генацыда*. На Беларусі было створана **260***канцэнтрацыйных лагераў*, дзе загінулі **1,4 млн.** чалавек. Толькі ў *канцлагеры Трасцянец* каля Мінска было знішчана **206 тыс.** вязняў. Існавала **больш за 100***гета.* Адно з найбольш буйных гета знаходзілася ў г. Мінску, там загінула каля **100 тыс**. яўрэяў, а ўсяго ў Беларусі гітлераўцы растралялі больш за **700 тыс.** беларускіх яўрэяў. Пад выглядам барацьбы з партызанамі фашысты ажыццявілі за гады вайны **140***карных аперацый*, у асноўным супраць мірнага насельніцтва. Былі *спалены разам з жыхарамі***628 вёсак**, а ўсяго за гады акупацыі *гітлераўцы знішчылі ў Беларусі больш* за **2,2 млн.** савецкіх грамадзян і ваеннапалонных.**Каля 400 тыс.** чалавек, пераважна беларускай моладзі, былі *адпраўлены на прымусовую работу ў Германію,* трэцяя частка з іх там і загінула.

Акупанты пачалі прамое *рабаванне захопленых тэрыторый.* У Германію было вывезена больш за 90% станочнага і тэхнічнага абсталявання, каля 22 тыс. аўтамашын, трактараў, камбайнаў, вялікая колькасць лесу, жывёлы, прадуктаў харчавання. На астаўшыхся прамысловых прадпрыемствах быў устаноўлены 10-12-гадзінны рабочы дзень у спалучэнні з мізэрным заробкам.

За правіннасці, сабатаж адміністрацыя мела права адпраўляць рабочых у канцлагеры.

У сельскай мясцовасці гітлераўцы спачатку захавалі калгасы і ўвялі ў іх прымусовую працу. Пазней яны былі перайменованы ў “абшчынныя гаспадаркі”, а з чэрвеня 1943 г. акупанты пачалі перадаваць зямлю ў прыватную ўласнасць, але ўвялі нормы абавязковых паставак, якія дасягалі да паловы вырашчанага ўраджаю.

**3. Баявая дзейнасць партызан і падпольшчыкаў**

Барацьба супроць акупантаў пачалася ва ўмовах хуткага наступлення нямецка-фашысцскіх войскаў. На захопленай ворагам тэрыторыі стваралася сетка падпольных цэнтраў, арганізацый і груп. Па задумцы партыйнага і камсамольскага кіраўніцтва, пакінутыя ў тыле ворага камуністы і камсамольцы павінны былі з’явіцца тым палітычным ядром, вакол якога належыла гуртавацца тым, хто змагаецца з акупантамі. У Мінску ўжо ў другой палове 1941 г. падпольшчыкі ўзрывалі склады са зброяй і ваеннай маёмасцю, цэхі і майстэрні па рамонту баявой тэхнікі, вырабу харчавання. Апрача дыверсій і баявой дзейнасці, падпольшчыкі ўжо з першых месяцаў акупацыі сабаціравалі розныя мерапрыемствы. Метады іх дзейнасці былі самыя розныя: утойванне сваіх прафесій, псаванне абсталявання і інструменту, невыхад на працу, хаванне ўраджаю, інвентару і інш.

Кіравалі партызанскім і падпольным рухам на Беларусі падпольныя абкамы і райкамы партыі, абкамы і райкамы камсамола.

*Мінскае падполле* было адным з найбольш актыўных. У 1942 г. асноўнымі напрамкамі яго дзейнасці была агітацыйная праца, дыверсіі, збор разведвальных звестак для партызан і інш. У сакавіку-красавіку 1942 г. немцам удалося нанесці сур’ёзны ўдар па мінскім падполлі, калі ў турмах апынулася каля 400 чалавек. Сярод іх І.*Казінец, Г.Сямёнаў* і іншыя. У верасні-кастрычніку акупанты абрушылі новы ўдар па мінскаму падполлю, зноў былі арыштаваны сотні ўдзельнікаў і глава гарадскога камітэту КП(б)Б *І.Кавалёў.* Большчасць арыштаваных загінула ў турмах, была павешана ці растраляна. Але і пасля другога правалу, падполле працягвала сваю дзейнасць.

У Віцебску ў 1941-42 гг. дзейнічала 56 падпольных груп. Адной з іх кіравала *В.Харужая,* якую ў 1942 г. фашысты схапілі. Шырокі размах набыў падпольны рух у Асіповічах, Барысаве, Бабруйску, Оршы, Жлобіне, Мазыры і іншых населеных пунктах. Вялікай актыўнасцю вызначаліся падпольшчыкі

на чыгуначным транспарце. Фактычна не засталося ніводнай станцыі, дзе не дзейнічалі б падпольныя групоўкі.

Ні на адзін дзень не спынялася антыфашысцкая барацьба ў акупаваным Магілёве. Вясною 1942 г. каля 40 груп (больш за 400 чалавек) аб'ядналіся ў *"Камітэт садзейнічання Чырвонай Арміі"*. Дзякуючы пільнасці, надзейнай канспірацыі і ўдалай структуры арганізацыі магілёўскаму падполлю доўгі час удавалася пазбягаць масавых правалаў і арыштаў.

Паражэнне немцаў пад Масквой аднавіла веру ў сілу Чырвонай Арміі, у яе здольнасць аказваць належнае супраціўленне ворагу. Усё гэта істотна паўплывала на настроі насельніцтва і актывізацыю савецкага падполля і партызан. Аднак партызанскія групы па-ранейшаму пазбягалі адкрытага сутыкнення нават з невялікімі нямецкімі атрадамі і накіроўвалі больш намаганняў на арганізацыйнае ўзмацненне, пашырэнне баз і сістэмы забеспячэння, шукалі павялічэння свайго ўплыву сярод насельніцтва, праводзілі больш мэтанакіраваную дыверсійную дзейнасць.

У першыя дні лютага 1942 г. контрнаступленне Чырвонай Арміі, пачаўшаяся ад Масквы, дасягнула паўночна-усходніх рубяжоў Беларусі, дзе дзейнічала некалькі невялікіх партызанскіх атрадаў. Такім чынам, зона партызанскай барацьбы і аператыўны абшар Чырвонай Арміі часова злучыліся, стварыўшы ўмовы для ўзаемадзеяння. Менавіта тады савецкае ваеннае і палітычнае кіраўніцтва прыняла рашэнне аб выкарыстанні партызанскага руху на Беларусі і ўключыла яго ў агульныя стратэгічныя планы вядзення вайны. Праіснаваўшыя да канца верасня 1942 г., так званыя *"Суражскія вароты"* ("Віцебскія вароты") шырынёю каля 40 км. былі выкарыстаны для актывізацыі партызанскай барацьбы, перасылкі на акупаваную тэрыторыю вялікай колькасці дыверсійных груп і партызанскіх атрадаў, перапраўкі зброі, радыястанцый, лістовак, тэхнікі і інш. У адваротны бок была перапраўлена значная колькасць жыхароў і харчавання.На Беларусь пераправілі вялікую колькасць спецыялістаў для пабудовы палявых партызанскіх аэрадромаў. За ўвесь перыяд акупацыі іх было пабудавана каля 50. Гэтыя аэрадромы і ў наступны перыяд дазвалялі працягваць пастаўку ваенных грузаў, вывозіць параненых, пошту і г.д.

У **маі 1942 г.** быў створаны *Цэнтральны штаб партызанскага руху* пры Галоўным камандаванні Чырвонай Арміі пад кіраўніцтвам першага сакратара ЦК КПБ(б) *П.К. Панамарэнкі,* а ў **верасні 1942 г.** – яго тэрытарыяльны аддзел – *Беларускі штаб партызанскага руху* (узначаліў яго *П.З. Калінін*). Такім чынам, толькі вясною 1942 г. былі створаны неабходныя

матэрыяльныя і арганізацыйныя ўмовы для развіцця партызанскага руху на Беларусі.

У выніку паспяховых баявых аперацый партызанскіх фарміраванняў на значнай тэрыторыі Беларусі была ліквідавана нацысцкая ўлада і ўтвораны *партызанскія зоны.* Найбольш буйнымі зонамі былі Акцябрска-Любанская, Барысаўска-Бягомльская, Клічаўская, Полацка-Лепельская, Расонска-Асвейская, Івянецка-Налібоцкая і інш. Да канца 1943 г. 20 партызанскіх зон кантралявалі 60% тэрыторыі БССР. У партызанскіх зонах аднаўлялася бальшавіцкая ўлада; гаспадарчыя рэсурсы падпарадкоўваліся патрэбам барацьбы з германскімі акупантамі.

Палітыка генацыду, праводзімая акупацыйнымі ўладамі, садзейнічала росту падтрымкі партызан сярод мясцовага насельніцтва. У 1943-1944 гг. партызанскі рух набывае масавы характар. Да лета 1944 г. у складзе партызанскіх фарміраванняў налічвалася каля 370 тыс. чалавек.

Буйнейнай акцыяй партызанскага руху ў Беларусі была т.зв. “*рэйкавая вайна*” – правядзенне адначасовага масавага разбурэння чыгуначных камунікацый у розных рэгіёнах Беларусі. У ходзе акцыі партызаны разбуралі чыгуначныя шляхі, пускалі пад адхон эшалоны, узрывалі чыгуначныя станцыі, масты. Было знішчана каля 90% чыгункі БССР. “Рэйкавая вайна” праходзіла ў тры этапы. У час *першага этапа*, які працягваўся **з жніўня да верасня 1943 г. (**акцыя праходзіла ў падтрымку наступлення Чырвонай арміі пад Курскам**),** партызаны пусцілі пад адхон 836 варожых эшалонаў, узарвалі 184 чыгуначных масты, пашкодзілі сотні кіламетраў чыгуначнага палатна. У выніку *другога этапа*, які атрымаў назву *“канцэрт”* і працягваўся **з верасня да лістапада 1943 г. (**акцыя праходзіла ў падтрымку наступлення Чырвонай арміі ва ўсходніх раёнах Беларусі**),** было ўзарвана 90 тыс. чыгуначных рэек, 1041 эшалон, 72 чыгуначных масты. *Трэці этап* пачаўся ў **чэрвені 1944 г.,**напярэдадні аперацыі “Баграціён”. У выніку яго былі паралізаваны важнейшыя чыгуначныя магістралі на тэрыторыі Беларусі, што аблегчыла савецкім войскам вызваленне рэспублікі ад акупантаў.

Важнай часткай антыфашысцкага руху ў Беларусі 1941-1944 г. з’яўляўся яўрэйскі рух супраціўлення,які праявіўся ў правядзенні антыфашыцкай прапаганды ў гета, уцёках з гета, сабатажы лагерных мерапрыемстваў, дыверсійнай працы, узброеных паўстаннях і партызанскім руху.

Акрамя савецкага партызанскага і падпольнага руху, на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі таксама іншыя антыфашысцкія арганізацыі.

Актыўна дзейнічала *польскае падполле*, якое падпарадкоўвалася польскаму эмігранцкаму ўраду ў Лондане. Яго буйнейшай арганізацыяй, якая стварыла сетку партызанскіх атрадаў, з'яўлялася *Армія Краёва* (АК). На тэрыторыі Беларусі найбольш значныя сілы АК знаходзіліся на Навагрудчыне. АК выступала за аднаўленне незалежнасці Польшчы ў межах 1939 г. У 1941 – 1943 гг. польскае падполле знаходзілася ў саюзе з савецкім. Пасля разрыву ў красавіку 1943 г. адносін паміж СССР і польскім эмігранцкім урадам АК перайшла да тактыкі барацьбы супраць "двух ворагаў" – Германіі і СССР. Разам з тым летам 1944 г., у перыяд наступлення Чырвонай арміі, некаторыя атрады АК прынялі ўдзел у баях за Вільню. Усяго ў атрадах Арміі Краёвай у перыяд акупацыі ў Заходняй Беларусі налічвалася каля 14 тыс. чалавек.

**4. Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў**

У ходзе *Сталінградскай бітвы***(жнівень 1942 – люты 1943 гг.)** і *перамогі на Курскай дузе* **(лета 1943 г.)** савецкія войскі не толькі здзолелі выстаяць пад націскам нямецкага наступлення, але і перайшлі ў контрнаступленне. Менавіта з лета-восені 1943 года пачынаецца новы, завяршальны этап у ходзе вайны – перыяд выгнання немецкіх захопнікаў, вызываленне акупаванай тэрыторыі СССР і еўрапейскіх народаў. Контрнаступленне савецкіх войскаў ад Курска і Белгарада перарасло ў агульнае наступленне на ўсім савецка-германскім фронце. Найбольш паспяхова яно разгортвалася на Украіне, дзе ў верасні была вызвалена ўся левабярэжная частка Украіны, быў фарсіраваны Днепр, а ў пачатку лістапада 1943 года вызвалена сталіца – Кіеў.

Восенью 1943 г., у ходзе паспаховага наступлення савецкай Арміі на Украіне, пачалося і вызваленне тэрыторыі Беларусі. **23 верасня 1943 г.** войскі 13-й арміі Цэнтральнага фронта вызвалілі першы раёны цэнтр Гомельскай вобласці – *Камарын*. 26 верасня 3-я і 50-я арміі Бранскага фронта вызвалілі першы раёны цэнтр Магілёўскай вобласці – Хоцімск. 28 верасня – Мсціслаў, 30 верасня – Крычаў. 26 лістапада 1943 г. – першы абласны цэнтр – Гомель, куды пераехалі кіруючыя органы рэспублікі, БШПР.

Удалымі ў восень 1943 – зіму 1944 гадоў наступальнымі аперацыямі на тэрыторыі Беларусі магчыма лічыць вызваленне Мазыра і Рагачова. Пры іх правядзенні найбольш выразна праявілася супрацоўніцтва частак арміі і партызан, якія не тролькі дапамагалі наступаючым войскам, але і ўключаліся ў склад дзеючай арміі.

Аднак з сярэдзіны красавіка 1944 года савецкія войскі спынілі наступальныя аперацыі, перайшлі ў жорсткую абарону. Пачалася падрыхтоўка да правядзення масштабнай аперацыі па вызвалені Беларусі.

Да лета 1944 г. становішча на савецка-германскім фронце склалася на карысць Чырвонай Арміі, якая пачала ўтрымліваць стратэгічную ініцыятыву. План разгрому нямецкай групы армій “Цэнтр” быў абмеркаваны ў Стаўцы Вярхоўнага Галоўнакамандавання і зацверджаны ў канцы мая 1944 г. Гэта аперацыя ўвайшла ў гісторыю пад назвай “Баграціён”. Планам прадугледжвалася нанесці магутныя наступальныя ўдары сіламі 4 франтоў: 1-га Прыбалтыйскага, 1-га, 2-га і 3-га Беларускіх (камандуючыя – генералы *І.Х. Баграмян, К. К. Ракасоўскі, Г. Ф. Захараў, І. Д.Чарняхоўскі*), Дняпроўскай ваеннай флатыліі, Першай арміі Войска Польскага і авіяцыі далёкага дзеяння. Важная роля надавалася непасрэднаму ўдзелу ў бітве беларускіх партызан.

Перад пачаткам Беларускай аперацыі сілы чатырох франтоў Чырвонай Арміі налічвалі звыш 1 млн. 430 тыс. чалавек баявога складу, каля 32 тыс. гармат і мінамётаў, 5 тыс. танкаў, каля 5 тыс. самалётаў. У тыле нямецкай групы армій “Цэнтр”, акрамя гэтага, знаходзілася 150 партызанскіх брыгад і 49 асобных атрадаў, якія мелі сувязь з Беларускім штабам партызанскага руху і павінны былі прытрымліватца агульнага стратэгічнага плану.

Да пачатку бітвы ў чэрвені 1944 г. лінія фронту на Беларускім напрамку праходзіла на ўсход ад Віцебска, Оршы, Магілёва, Бабруйска і ўяўляла сабой від выступа альбо дугі – ад Полацка на поўначы да Ковеля на поўдні, звернутай выпуклай часткай на ўсход. На *“беларускім выступе”* былі сканцэнтраваны 63 дывізіі і 3 брыгады праціўніка, якія налічвалі з тылавымі часцямі звыш 1 млн. 200 тыс. чалавек. Яны мелі на ўзбраенні 9,5 тыс. гармат і мінамётаў, каля 900 танкаў. Наземныя нямецкія войскі падтрымлівала каля 1350 самалётаў.

*Аперацыя “Баграціён”* пачалася **23 чэрвеня 1944 г.** Галоўныя сілы 1-га Прыбалтыйскага, 2-га і 3-га Беларускага франтоў пасля магутнай артылерыйскай падрыхтоўкі перайшлі ў наступленне на Віцебскім, Магілёўскім і Аршанскім напрамках. На другі дзень пачалі наступ і войскі 1-га Беларускага фронту. Дзеяннямі франтоў каардынавалі прадстаўнікі Стаўкі ВГК маршалы *А.М.Васілеўскі і Г.К.Жукаў*. 24 чэрвеня лінія абароны гітлераўцаў была прарвана. На трэці дзень баёў войскам 1-га Прыбалтыйскага і 3-га Беларускага франтоў удалося акружыць, а праз некалькі дзён і знішчыць віцебскую групоўку праціўніка *(“Віцебскі кацёл”),*

вызваліць г. Віцебск. У выніку гэтага праціўнік страціў 20 тыс. чалавек забітымі і каля 10 тыс. чалавек параненымі і палоннымі

**3 ліпеня 1944 г.***сталіца Беларусі была вызвалена ад захопнікаў.* Пасля вызвалення Мінска галоўныя сілы трох беларускіх франтоў працягвалі рухацца на захад. 4 ліпеня быў вызвалены Полацк, 5 ліпеня – Маладзечна, 6 ліпеня – Баранавічы. 14 ліпеня вораг быў выбіты з Пінска, 16 ліпеня – з Гродна, 28 – з Брэста. Вызваленнем Брэста завяршылася выгнанне нямецка-фашысцкіх захопнікаў з беларускай зямлі. Яшчэ 21 ліпеня Чырвоная Армія перасякла дзяржаўную мяжу ў раёне Белавежскай пушчы і пачала вызваленне Польшчы.

**5. Вынікі вайны для беларускага народа і яго ўклад у Перамогу над фашызмам.**

Савецкі Саюз унёс рашаючы ўклад у разгром фашысцкай Германіі. На працягу ўсёй вайны да 75% усіх узброеных сіл вермахта знаходзіліся на ўсходнім фронце. Тут было знішчана больш за 600 дывізій праціўніка, або дзве трэціх усіх яго сіл. З агульных страт Германіі ў 13,6 млн. чалавек больш за 10 млн. загінулі на савецка-германскім фронце. СССР страціў за гады вайны 27 млн. чалавек, з іх каля 9 млн. салдат і афіцэраў, астатнія – мірныя жыхары.

Вялікая Айчынная вайна і фашысцкая акупацыя прынеслі беларускаму народу велізарныя страты. *Захопнікі разбурылі і спалілі* **209** *гарадоў і райцэнтраў,***9200***сёл і вёсак. Загінула больш за* **3** *млн. чалавек.* Былі разбураны амаль усе прамысловыя прадпрыемствы і электрастанцыі, абсталяванне вывезена ў Германію альбо знішчана. Гітлераўцы разрабавалі маёмасць калгасаў і саўгасаў. Моцна пацярпелі транспартныя магістралі, было разбурана амаль тры чвэрці жылога фонду гарадоў, поўнасцю знішчана матэрыяльная база адукацыі, навукі, культуры. Па агульнаму ўзроўню развіцця эканомікі рэспубліка была адкінута да 1928 г., а па некатарых галінах. – да 1913 г.

*На франтах Вялікай Айчыннай вайны* змагалася больш за 1,3 млн. беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі. На фронт нярэдка накіроўваліся цэлымі сем'ямі. Тадора Храбрая з Бялыніч адправіла на фронт шасцярых сваіх сыноў, столькі ж сыноў паслаў у Чырвоную Армію быхаўскі калгаснік Акім Красоўскі. Старэйшы з яго сыноў Сцяпан, які лятаў на штурмавіку, стаў маршалам авіяцыі. Анастасія Купрыянава з Жодзіна паслала на фронт 5 сваіх сыноў. Малодшы з іх Пётр праславіўся пры ліквідацыі акружанай групоўкі

ворага на тэрыторыі Латвіі, паўтарыўшы подзвіг А. Матросава. У Жодзіне ўстаноўлены помнік маці-патрыётцы і пяці яе загінуўшым сынам. У хаце, дзе яна жыла, створаны музей.

Мужна змагаліся з ворагам на заснежаных палях Падмаскоўя ўраджэнец Бешанковіцкага раёна генерал-маёр *Л.М. Даватар*, гамельчане, браты-палкоўнікі *Аляксандр і Пётр Лізюковы,* уражэнец міншчыны *Д.У. Гліцэвіч.* Першы ў гісторыі вышынны паветраны таран здзейсніў у маскоўскім небе беларус *А.М. Катрыч,* першы начны паветраны таран – *Віктар Талаліхін.* За г. Ленінград змагаліся і аддалі свае жыцці віцэ-адмірал В.П. Дрозд, марскі лётчык *А.К. Антоненка,* снайпер *Ф.А. Смалячкоў.* Сын селяніна з в. Машканы Сенненскага раёна, лётчык *А.К. Гаравец* на Курскай дузе ўступіў у бой з 20-цю варожымі бамбардзіроўшчыкамі, збіў 9 самалётаў праціўніка. Ён – адзіны ў свеце лётчык, які ў адным паветраным баі збіў столькі самалётаў ворага. *А.К. Гаравец* загінуў у тым жа баі. Пасмяротна яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

444 беларусы і ўраджэнцы Беларусі былі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза, чацвёра – *П.Я. Галавачоў,І.І. Гусакоўскі, С.Ф. Шутаў, І.І. Якубоўскі* – удастоены гэтага звання двойчы, 67 – сталі кавалерамі ордэна Славы трох ступеней. Каля 400 тыс. воінаў – беларусаў узнагароджаны баявымі ордэнамі і медалямі. За гады вайны каля 400 беларусаў сталі генераламі і адміраламі. Больш за 140 тыс. партызан і падпольшчыкаў Беларусі былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі Савецкага Саюза, а 88 з іх прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

**Кантрольныя пытанні і заданні для самападрыхтоўкі студэнтаў:**

1. Назавіце прычыны Другой сусветнай вайны.
2. Пералічыце мэты акупацыйнай палітыкі фашысцкай Германіяй ў Беларусі.
3. Прывядзіце прыклады баявой дзейнасці партызан і падпольшчыкаў ў вашай мясцовасці.
4. Хто з савецкіх ваенаначальнікаў распрацоўваў і ажыццяўляў аперацыю “Баграціён”?
5. Назавіце вынікі вайны для беларускага народа і яго ўклад у Перамогу над фашызмам.

## Літаратура


1. Баландзін, К.І., Хромчанка, Дз. М. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай цывілізацыі / К. І. Баландзін, Дз. М. Хромчанка. – Мінск, 2009.
2. Беларусь: страницы истории /редсовет: А. А. Коваленя [и др.]. – Минск, 2011.
3. Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны): учеб. пособие / Под ред. А. А. Ковалени, Н. С. Сташкевича. – Минск, 2004.
4. Гісторыя Беларусі: у 6 т. – Т. 5: Беларусь у 1917–1945 гг. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2007.
5. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. / М. У. Смяховіч [і інш.] ; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. — Мінск, 2012. – Кн. 2.
6. Новик, Е.К., Качалов, И.Л., Новик, Н.Е. История Беларуси: с древнейших времен до 2012 г. : учебное пособие. — 3-е изд., испр. и доп. – Минск, 2012.


## Тэма 7.1. Беларусь у 1945 – 1991 гг.

*Кючавыя паняцці:* Арганізацыя Аб’яднаных Нацый; навукова-тэхнічная рэвалюцыя; камандна-адміністрацыйныя метады ў кіраўніцтве эканомікай;XX з’езд КПСС;экстэнсіўны і інтэнсіўны шляхі развіцця прамысловасці; ваенна-прамысловы комплекс; “застой”; дзяржразлік і самафінансаванне; аварыя на Чарнобыльскай АЭС;“Канстытуцыя развітога сацыялізму”;выхаванне “новага чалавека”; “эпоха застою”.

### План лекцыі:

1. Міжнароднае становішча.
2. Эканамічнае развіццё БССР.
3. Грамадска-палітычнае жыццё ў СССР і БССР.
4. Адукацыя, навука і культура ў БССР.

**1.Міжнароднае становішча.**

Выхад Беларусі на міжнародную арэну пасля Другой сусветнай вайны быў звязаны з утварэннем *Арганизацыи Аб'яднаных Нацый* (ААН). Урады заходніх дзяржаў далі згоду на тое, каб побач з СССР раўнапраўнымі членамі ААН сталі Беларусь і Украіна. Гэтым прызнаваўся іх вялікі ўклад у разгром фашызму і панесеныя імі ў ходзе вайны велізарныя людскія ахвяры і матэрыяльныя страты. У 1944 г. ва ўрадзе БССР быў створаны Народны камісарыят (з 1946 г. Міністэрства) замежных спраў.

**27 красавіка 1945** г. міжнародная канферэнцыія ў Сан-Францыска, сазваная з мэтай заснавання ААН, прыняла рашэнне аб уключэнні БССР у лік краін – заснавальніц гэтай арганізацыі. Так БССР упершыню стала членам самай прэстыжнай міжнароднай арганізацыі.

**26 чэрвеня 1945** года міністр замежных спраў Беларусі *К. Кісялёў* ад імя ўрада БССР падпісаў Статут ААН. Удзел у рабоце ААН даў магчымасць БССР, па-першае, выкарыстоўваць яе трыбуну для выступленняў з рознымі ініцыятывамі, напрыклад, "Аб выдачы і пакаранні ваенных злачынцаў" і інш., па-другое, больш актыўна ўдзельнічаць у міжнародных арганізацыях, у тым ліку такіх уплывовых, як Сусветны Савет міру, ЮНЭСКА (арганізацыя па пытаннях адукацыі, навукі і культуры), Магатэ (Міжнароднае агенцтва па атамнай энергіі) і інш., па-трэцяе, удзельнічаць у падрыхтоўцы і прыняцці канвенцый (за першае пасляваеннае дзсяцігоддзе БССР падпісала больш за 30 міжнародных дагавораў, канвенцый па розных пытаннях), па-чацвёртае, выкарыстоўваць ААН для рашэння ўнутраных праблем. Напрыклад, праз ААН Беларусь атрымала значную матэрыяльную дапамогу як краіна, якая найбольш пацярпела ў гады фашысцкай акупацыі. Канешне, у пасляваенны час Беларусь дзейнічала ў цэлым у русле знешняй палітыкі СССР, але тым не менш адмаўляць самастойныя дзеянні БССР на міжнароднай арэне таксама нельга.

У 1951 г. адбылося афармленне дзяржаўнасці БССР, выклікане ўваходжаннем рэспублікі ў склад ААН і звязанае з зацвярджэннем новага *Дзяржаўнага сцяга БССР.* Дзяржаўны сцяг БССР існаваў да 1991 г.

Дэлегацыя БССР актыўна ўдзейнічала ў барацьбе супраць "халоднай вайны". Яна падтрымлівала масавы рух за мір, які разгарнуўся ў свеце, адстойвала лінію на ўмацаванне міжнароднага міру і бяспекі, поўную ліквідацыю каланіялізму і інш. Яна выступала з асуджэннем вайны, якую вялі ЗША ў В'етнаме, асудзіла агрэсію Ізраіля ў 1967 г. супраць арабскіх дзяржаў, аказвала падтрымку народу Паўднёвай Афрыкі ў яго барацьбе

супраць расізму. Беларуская дэлегацыя ў 1963 г. падпісала Маскоўскі дагавор аб забароне выпрабаванняў ядзернай зброі ў трох сферах (атмасферы, космасе і пад вадой). Яна таксама падпісала шэраг міжнародных актаў па палітычных пытаннях, правах чалавека. У наступныя годы Беларусь паслядоўна выступала за забарону ядзернай зброі, патрабавала усеагульнага і поўнага раззбраення, знішчэння хімічнай зброі. У цэлым да сярэдзіны 80-х гадоў Беларусь падпісала больш за 160 міжнародных дагавораў і пагадненняў, у 1974-1975 гг. яна выбіралася пастаянным членам Савета бяспекі ААН, неаднаразова яе прадстаўнікі ўваходзілі ў склад Эканамічнага і Сацыяльнага Саветаў ААН.

Акрамя ААН, другім важным напрамкам удзелу Беларусі ў міжнародным жыцці у пасляваенные годы стала развіццё гандлёва-эканамічных адносін з заходнімі краінамі. Гэтаму спрыяла і геапалітычнае становішча Беларусі. Яна знаходзіцца ў непасрэднай блізасці ад Захаду, тут маецца развітая сетка аўтадарог і чыгунак, на тэрыторыі Беларусі дзейнічае шэраг прадпрыемстваў агульнасаюзнага падпарадакавання, якія выпускаюць высокаякасную прадукцыю. Вялікім попытам у Еўропе карысталася і карыстаецца прадукцыя такіх прадпрыемстваў, як МАЗ, МТЗ, Гомсельмаш, станкабудаўнічых заводаў Мінска, Віцебска і інш. Ужо ў 50-я гг. на экспарт пастаўлялася прадукцыя 120 прадпрыемстваў рэспублікі. У 1952 годзе ў Мінску было створана аддзяленне Усесаюзнай гандлёвай палаты, якое ў 1972 годзе было пераўтворана ў Гандлёва-прамысловую палату БССР. Рэспубліка, такім чынам, атрымала магчымасць удзельнічаць у міжнародных кірмашах, праводзіць такія кірмашы ў сябе. Толькі ў 60-е гг. ў Мінску было праведзена звыш за 30 міжнародных выставак.

У 50-80-е гг. 80% гандлёва-эканамічных сувязяў Беларусі прыпадалі на краіны сацыялістычнага лагера, на долю капіталістычных краін у 1970-1980 гг. прыпадала 20,2% экспартных паставак. У той жа час на Беларусі шырока выкарыстоўваліся тэхнічыя вырабы з развітых капіталістычных краін.

Значнае месца ў супрацоўніцтве Беларусі з замежнымі краінамі ў пасляваенные гады займалі культурныя сувязі. З 1958 года пачало дзейнічаць Беларускае таварыства дружбы і культурных сувязяў з замежнымі краінамі, да 1970 года – да 100 падобных мясцовых таварыстваў,якія падтрымлівалі сувязі з 400 арганізацыямі амаль 70 краін свету. Але прыярытэт аддаваўся перш за ўсё краінам сацыялістычнага лагера. Шырыліся кантакты па лініі створанага ў 1958 годзе Камітэта маладзёжных арганізацый рэспублікі, прафсаюзаў.

Дзейснай формай развіцця міжнародных культурных адносін з'яўлялася супрацоўніцтва ў галіне літаратуры. За 1946-1985 гг. за мяжой вышлі ў свет 342 творы 55 беларускіх пісьменнікаў. За гэты ж час колькасць перакладзеных кніг замежнай літаратуры склала каля 500 выданняў агульным тыражом звыш 4 млн. экзэмпляраў.

Такім чынам, у 50-80-я гады значна пашырыліся міжнародныя сувязі Беларусі, больш разнастайнымі сталі іх формы і змест, хаця самастойнасць БССР была абмежавана рамкамі Савецкага Саюза і агульнасаюзнай палітыкай.

**2.Эканамічнае развіццё БССР**

Вялікая Айчынная вайна прывяла да велізарных матэрыяльных і людскіх страт. З 1943 г. пачалося аднаўленне прамысловасці, і ўжо да 1950 г. яна перавысіла даваенны ўзровень. Быў асвоены выпуск аўтамабіляў, трактараў, ліцейнага абсталявання, пабудаваны шэраг прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці, праведзена рэканструкцыя ільнозаводаў, абутковых прадпрыемстваў. Пачатак 50-х гадоў характарызуецца разгортваннем *навукова-тэхнічнай рэвалюцыі*. Да сярэдзіны 50-х гадоў Беларусь дасягнула новых поспехаў. Пабудавана 150 прадпрыемстваў: Аршанскі завод швейных машын, Віцебская шоўка-ткацкая фабрыка, малочна-кансервавыя заводы і інш. Заводы папаўняюцца новым тэхналагічным абсталяваннем; укараняюцца паточныя метады вытворчасці. У выніку павышэння тэхнічнага ўзроўню павысілася прадукцыйнасць працы. З сярэдзіны 50-х гадоў пашыраецца капітальнае будаўніцтва, вытворчасць набывае характар навукова-індустрыяльнага тыпу. Навука становіцца ўдзельнікам механізаванай і аўтаматызаванай вытворчасці. За 1956-65 гг. было пабудавана 450 фабрык і заводаў (Беларускі аўтазавод у Жодзіне, 2 Салігорскія калійныя камбінаты, Полацкі нафтаперапрацоўчы завод і інш.).

**У 1957 г.** была ажыццёўлена *спроба рэфармаваць кіраўніцтва эканомікай.* Замест міністэрстваў, якія былі створаны па галінах вытворчасці, былі ўведзены *саветы народнай гаспадаркі (саўнаргасы),* якія павінны былі кіраваць усёй прамысловасцю і сельскай гаспадаркай у межах вызначанай тэрыторыі. Лічылася, што на месцах "знізу" можна значна лепш кіраваць гаспадаркай, чым з цэнтра "зверху". Аднак камандныя метады кіраўніцтва цалкам захаваліся, што прывяло да няўдачы гэтай рэформы.

У **1965 г.** была праведзена новая *эканамічная рэформа*, аўтарам якой быў Старшыня Савета Міністраў СССР А. Касыгін. Рэформа прадугледжвала

уключыць у дзеянне таварна-грашовыя механізмы, г.зн. элементы рыначнай эканомікі, не паслабляючы, аднак *камандна-адміністрацыйных метадаў у кіраўніцтве эканомікай*. Замест створанай у 1957 г. тэрытарыяльнай сістэмы кіравання (саўнаргасы) была зноў уведзена галіновая пад кіраўніцтвам асобных міністэрстваў. Рэформа прадугледжвала ўключыць у дзеянне таварна-грашовыя механізмы, г.зн. элементы рыначнай эканомікі, не паслабляючы, аднак, камандна-адміністрацыйных метадаў у кіраўніцтве эканомікай.

Удасканальвалася сістэма планавання: асноўным паказчыкам работы прадпрыемства станавіўся аб'ём рэалізаванай прадукцыі, што звярнула ўвагу на якасць выпускаемых тавараў. Пашыралася гаспадарчая самастойнасць прадпрыемстваў на аснове *гаспадарчага разліку* (прадпрыемствы атрымалі магчымасць свабодна распараджацца часткай прыбытку, а значыць будаваць жыллё, дзіцячыя садкі, санаторыі для сваіх супрацоўнікаў, што павялічвала стымуляванне працы), былі прыняты меры па барацьбе з безгаспадарчасцю, па лепшым выкарыстанні рэсурсаў.

Аднак развіццё прамысловасці характарызавалася пераважна колькасным ростам, г.зн. праходзіла *экстэнсіўным шляхам*. Ён звязаны перш за ўсё з павялічэннем колькасці выпускаемай прадукцыі за кошт колькасці працуючых, колькасці грошай на развіццё прамысловасці, колькасці прадпрыемстваў. Пераход на *інтэнсіўны шлях,* звязаны з ростам вытворчасці на аснове паляпшэння якасных пакашчыкаў, найпеш за кошт укаранення ў вытворчасць дасягненняў неавукі і тэхнікі і павялічэння прадукцыйнасці працы, аказаўся задачай цяжкай і невыканальнай. Гэты было сведчаннем няўдачы эканамічнай рэформы 1965 г., якая праводзілася ў жыццё параненйшаму каманднымі метадамі.

Асаблівасцю эканамічнага развіцця Белрусі з'явіўся пераважна хуткі рост цяжкай прамысловасці, якая ў 1970-я гг. усё больш пераўтваралася ў галіну вытворчасці для абслугоўвання *ваена-прамысловага комплексу* (ВПК, так званая абаронка – абаронная прамысловасць). Менавіта на прадпрыемствы абаронкі перш за ўсё пастаўляліся сыравіна і матэрыялы, новыя станкі і абсталяванне, ім у першую чаргу выдзяляліся фінансавыя рэсурсы. У той жа час лёгкая прамысловасць, якая выраблялa спажывецкія тавары, аказалася другароднай галіной.

Узровень аплаты працы заставаўся даволі нізкім. Пры агульным росце ўзроўня жыццянасельніцтва павялічвалася колькасць дэфіцытных тавараў, паколькі пры планавайэканоміцы немагчыма прадказаць рэальную патрэбу ў

асобных відах прадукцыі. Хранічнай праблемай заставалася нізкая якасць тавараў, іх небагаты асартымент.

Планавая сістэма кіравання савецкай эканомікай не прымала нязвыклыя для сябе метады кіравання, а нарастанне канфрантацыі з заходнімі краінамі паставіла на першае месца праблему ўмацавання абароназдольнасці краіны. У эканоміцы Беларусі, як і ўсяго СССР, склаўся механізм тармажэння сацыяльна-эканамічнага развіцця, сталі нарастаць застойныя, перадкрызісныя з'явы. Галойнай прычынай *застою* (1971-1985 гг.) было тое, што па-ранейшаму захоўваўся гаспадарчы механізм з манаполіяй дзяржаўнай ўласнасці, адміністрацыйна-каманднымі метадамі кіравання, цэнтралізаваным планаваннем і размеркаваннем. Улады не жадалі праводзіць рэфармаванне форм і метадаў гаспадарання.

Наспяванне крызісных з'яў у эканоміцы асабліва востра праяўляюццаў сярэдзіне 80-ых гадоў. Адзіная сістэма ўласнасці, цэнтралізаванае кіраўніцтва, улада партнаменклатуры прывялі да поўнага адмаўлення ўласцівых эканоміцы законаў яе развіцця. Станавілася відавочнай неабходнасць карэнных пераўтварэнняў у эканоміцы.

Вялікія надзеі звязваліся з удасканаленнем планавага кіравання і павышэннем самастойнасці і актыўнасці прадпрыемстваў і іх калектываў. Пры абмеркаванні дванадцатага пяцігадовага плана развіцця БССР на 1986-1990 гг. на XXX з'ездзе КПБ прадугледжвалася забяспечыць увесь прырост вытворчасці за кошт выкарыстаня ў першую чаргу інтэнсіўных, а не экстэнсіўных шляхоў развіцця эканомікі. Было прадугледжана ажыццяўленне пераходу на дзяржразлік і самафінансаванне многіх прадпрыемстваў БССР. У ліку першых у 1987г. на дзяржразлік перайшлі прадпрыемствы і арганізацыі Мінбыту, Мінгандлю, Беларуская чыгунка і інш. Была створана праграма "інтэнсіфікацыя". Яе мэта – паскарэнне НТР ва ўсіх галінах вытворчасці. Дапамогу ў ажыццяўленні праграмы аказалі навуковыя ўстановы. Гэта прывяло да таго, што былі дасягнуты некаторыя паляпшэнні ў капітальным будаўніцтве, рабоце транспарту і сувязі, аднак надзеі на набліжэнне да рыначнай эканомікі праз *дзяржразлік і самафінансаванне* не апраўдаліся.

Пераўтварэнні ў сельскай гаспадарцы накіроўваліся на змякчэнне каманднага кіраўніцтва з боку партапарату. У 1988 г. быў прыняты новы Прыкладны статут калгаса. Павышалася роля працоўных калектываў, брыгад, ферм і г. д. Але ўжо ў 1990 г. становішча на сяле не палепшылася, а, наадварот, стала яшчэ горшым, асабліва ў прадуктовым забеспячэнні

насельніцтва. Сістэма прадуктовых талонаў стала звычайнай з'явай. У гэтых умовах узнімаюцца пытанні аб пераходзе да розных форм і спосабаў гаспадарання на зямлі. Закон 1990 г. прадугледжваў прыватную уласнасць у БССР.

У сацыяльнай сферы адбыліся некаторыя змены. Зарплата рабочых павысілася на 30%, калгаснікаў – на 32%. Павялічыліся выплаты з грамадскіх фондаў спажывання. Былі падняты стаўкі зарплаты ў бюджэтнай сферы. Ажыццяўлялася жыллёвая праграма. 2 млн. чалавек атрымалі жыллё. Павялічыўся выпуск тавараў народнага спажываннння. Эканоміка пачынае пераарыентоўвацца на сацыяльную сферу. Стваралiся магчымасці падпарадкаваць вытворчасць інтарэсам і патрэбам працоўных. Але выявіўся шэраг недастаткаў: інэртнасць мыслення, арыентацыя на ВПК і г. д.

Нязмерную шкоду нанесла рэспубліцы *аварыя на Чарнобыльскай АЭС***26 красавіка 1986 г.** Яна прынесла Беларусі страты, роўныя 32 рэспубліканскім бюджэтам 1985 г. Радыёнуклідамі забруджана патая частка тэрыторыі рэспублікі, на якой пражывае больш за два млн. чалавек, г.зн. кожны пяты жыхар рэспублікі. З гаспадарчага абароту выведзена 20% сельгасугоддзяў. Узровень забруджвання рэк і азёр дасягнуў крытычнай мяжы. Пад канец 80-х гадоў становішча некалькі стабілізавалася. Былі пашыраны паўнамоцтвы Дзяржкамітэта БССР па ахове прыроды. У 1990 г. былі прыняты "Асноўныя напрамкі аховы і аздараўлення навакольнага асяроддзя і рацыянальнага выкарыстоўвання рэсурсаў Беларусі на 1991-1995 гг. і на перспектыву да 2000 г.

Такім чынам, у другой палове 50-х гадоў канчаткова завяршыўся этап аднаўлення разбуранай вайной народнай гаспадаркі. Прамысловасць Беларусі была не проста адноўлена, а, па сутнасці, створана па-новаму. З’явіліся новыя, сугучныя навукова-тэхнічнаму прагрэсу галіны, астатнія заводы і фабрыкі былі забяспечаны сучаснай тэхнікай. Гэтаператварыла Беларусь у індустрыяльную дзяржаву з адносна дынамічным узроўнем развіцця. Аднак непаваротлівасць цэнтралізаванай сістэмы кіравання і недастатковая стымуляцыя працы тармазілі аператыўнае ўкараненне ў вытворчасць навейшых дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэса. Беларусь, якая не мела ў дастатковай меры сваёй сыравіны і энерганосьбітаў, трапляла ва ўсё большую эканамічную залежнасць ад цэнтра, паступова ператваралася ў зборачны цэх. Спробы рэформ 60-х гадоў былі палавінчатымі, яны праводзіліся зверху, не былі падмацаваны матэрыяльнымі стымуламі і не знайшлі адпаведнага водгука ў нізах.Такім чынам, на рубяжы 80-90 гадоў у

сувязі са спадам вытворчасці, нязмерным ростам цэн, высокім узроўнем інфляцыі становішча ў сацыяльнай сферы ў рэспубліцы рэзка абвастрылася. Патрэбна было прыняць меры па выхадзе з гэтага стану.

**3.Грамадска-палітычнае жыццё ў СССР і БССР**

Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны таталітарны палітычны рэжым у БССР захаваўся. Дзяржава па-ранейшаму поўнасцю (татальна) кантралявала жыццё грамадмтва. Захоўвалася адзіная дзяржаўная ідэалогія, аднапартыйная палітычная сістэма. Рашэнні партыйных арганізацый з’яўляліся абавязковымі не толькі для ніжэйшых арганізацый партыі, але і для ўсіх дзяржаўных органаў і грамадскіх арганізацый.

Грамадска-палітычнае жыццё другой паловы 1940-х – пачатку 1950-х гг. характарызавалася бязмежным узрастаннем культу асобы І.В. Сталіна. Вялізнымі тыражамі выходзілі працы Сталіна, ствараліся тысячы гурткоў па засваенні яго біяграфіі, праводзіліся масавыя сходы і мітынгі для ўшанавання І.В. Сталіна.

Партыйна-дзяржаўныя ўлады ў БССР у разглядаемы перыяд жорстка кантраляваліся ў сваёй дзейнасці саюзным кіраўніцтвам. Яно ажыццяўляла прызначэнне на галоўныя кіруючыя пасады ў рэспубліцы. Пры гэтым перавага аддавалася кадрам з іншых саюзных рэспублік. Першымі сакратарамі ЦК КПБ гэтага перыяду з’яўляліся: П. К. Панамарэнка (1938-1947 гг.); М. І. Гусараў (1947-1950 гг.); М. С. Патолічаў (1950-1956 гг.).

Смерць І.В. Сталіна 5 сакавіка 1953 г. падштурхнула даўно наспеўшы працэс аднаўлення грамадства. Ён закрануў усе сферы жыцця грамадства – палітычную, эканамічную, сацыяльную, духоўную. “Хрушчоўская адліга”, *XX з’езд КПСС* **(1956 г.)** з яго выкрываннямі *культу асобы* выклікалі глыбокія змены ў грамадска-палітычнай свядомасці. Гэта стала спрыяльнай глебай для ажыўлення навукі, літаратуры, мастацтва.

Былі зроблены некаторыя намаганні па ўдасканаленні палітычнай сістэмы. Ужо ў 1953–1956 гг. было пачата правядзенне лініі на пашырэнне правоў саюзных рэспублік у дзяржаўным, эканамічным і культурным будаўніцтве.

Працэс аднаўлення грамадства, які разгарнуўся ў 50-я гады, востра паставіў задачу выпрацоўкі стратэгічнага курсу. Ім стала *“разгорнутае будаўніцтва камунізму”,* абгрунтаванае ў Праграме КПСС, якая была прынята на XXII з’ездзе партыі (1961 г.). Значныя паказчыкі эканамічнага росту, дасягнутыя да пачатку 60-х гадоў, высокія тэмпы сярэднегадовага

прыросту нацыянальнага даходу, вялікія поспехі ў некаторых галінах (напрыклад, у асваенні космасу) прывялі да памылковых вывадаў праграмы аб стане эканомікі, грамадства наогул і аб іх магчымасцях у бліжэйшай будучыні. Былі дапушчаны пралікі ў выяўленні перспектыў як унутранага развіцця краіны (стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізму да 1980 г.), так і міжнародных абставін (вывад аб паглыбленні агульнага крызісу капіталізму).

З другой паловы 70-х гадоў канцэпцыя пабудовы камунізму атрымала лагічны працяг у канцэпцыі развітога сацыялістычнага грамадства. Апошняя стала крыніцай дагматызму ў тэарэтычнай думцы.

Эканамічныя рэформы 60-х гг. таксама патрабавалі дэмакратычных змен у жыцці грамадства. Толькі яны не наступілі. Дэмакратычныя працэсы былі заблакіраваны сіламі бюракратычнага кансерватызму. Грамадскі ўздым паступпова змяніўся расчараваннем, і тэзіс аб пабудове развітога сацыялізму не толькі не змяніў грамадска-палітычную атмасферу, настрой людзей, але нават выклікаў іронію.

З сярэдзіны 50-х гадоў неаднаразова рабіліся спробы павялічыць ролю Саветаў у кіраванні дзяржавай і грамадствам. Для таго каб зрабіць дэпутацкую дзейнасць больш выніковай, ствараліся пастаянныя камісіі на розных напрамках дзейнасці. Аднак рэальная ўлада знаходзілася ў руках партыйных камітэтаў. І наогул ўсё грамадска-палітычнае жыццё было строга рэгламентавана і цэнтралізавана.

Кіруючай сілай беларускага грамадства з’яўлялася Кампартыя Беларусі. Важную ролю ў палітычнай структуры і жыцці грамадства ігралі грамадскія арганізацыі – прафсаюзы, якія ўключалі ў сябе амаль усіх працуючых, і Ленінскі камуністычны Саюз моладзі, які ахопліваў амаль усю моладзь. Аднак дзейнасць грамадскіх арганізацый была заарганізавана, цвёрда цэнтралізавана і паступпова пачала пакідаць усё менш месца для ініцыятывы асобнага чалавека, актыўнасць іх членаў усё больш фармалізавалася.

Сярод кіраўнікоў рэспублікі былі і даволі аўтарытэтныя, кампетэнтныя людзі. І сёння з павагай ўспамінаюць *К. Т. Мазурава* – першага сакратара ЦК КПБ з 1956 па 1965 гг., *С. В. Прытыцкага* – Старшыню Вярхоўнага Савета БССР з 1968 па 1971 гг., *П. М. Машэрава* – Першага Сакратара ЦК КПБ з 1965 па 1980 гг. і інш. Асабліва яскравай з’яўляецца асоба П.М. Машэрава, а перыяд яго кіраўніцтва – гэта перыяд развіцця эканомікі высокімі тэмпамі.

Успплеск грамадскай актыўнасці быў звязаны з абмеркаваннем і прыняццем Канстытуцыі СССР 1977 г. і *Канстытуцыі БССР***1978 г.** (3-я

Канстытуцыя) Іх вартасцю была арыентаванасць на абарону сацыяльных гарантый людзей. У параўнанні з папярэднімі канстытуцыямі ў іх падкрэслівалася асаблівая кіруючая роля КПСС-КПБ у грамадска-палітычным жыцці. У афіцыйнай ідэалогіі ў гэты час адбываецца пераход ад лозунгаў аб пабудове камунізму да канцэпцыі *"развітога сацыялізму"*, якая падкрэслівала дасягненні савецкага ладу. У межах дадзенай канцэпцыі развівалася таксама ідэя аб фарміраванні ў межах СССР новай супольнасці – савецкага народа, які падмяняў сабой паступова ранейшыя нацыі.

Другая палова 1970-х – першая палова 1980-х гг. увайшлі ў гісторыю пад назвай *"эпоха застою",* знешняй рысай якога стала канцэнтрацыя вышэйшай дзяржаўнай улады ў СССР у руках групы састарэлых партыйных лідэраў. Адметнай рысаю гэтага перыяду ў грамадска-палітычным жыцці з'яўлялася істотнае разрастанне партыйна-дзяржаўнага бюракратычнага апарату, карупцыі і пратэкцыянізму ў межах апарату. Акрамя гэтага, ўзмацніўся фармалізм ў працы партыйна-дзяржаўнага апарату, разгарнулася прапаганда з дапамогай СМІ "дасягненняў савецкага ладу", ствараўся ў пэўнай ступені культ кіраўнікоў партыі, асабліва Л. Брэжнева (гады кіравання – 1964-1982 гг.).

Абмежаванасць дэмакратычных свабод, узмацненне ролі цэнтральных органаў у кіраванні краінай, усеахопны кантроль за жыццём грамадства з боку адной палітычнай партыі, якая фактычна з'яўляляся ва ўмовах аднапартыйнай палітычнай сістэмы "дзяржавай у дзяржаве" выклікалі ў пачатку 1980-х гг. у насельніцтва адчуване таго, што курс кіраўніцтва краінай не зусім аптымальны.

## 4.Адукацыя, навука і культура ў БССР

За гады Вялікай Айчыннай вайны была разбурана амаль уся матэрыяльна-тэхнічная база ўстаноў адукацыі. Школьныя будынкі ў большасці былі знішчаны. Аднак з першых дзён вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў ішло аднаўленне сістэмы адукацыі. Поўнасцю сетка адукацыі была адноўлена да 1950 г.

У **1958 г.** у БССР быў прыняты Закон аб увядзенні *ўсеагульнай 8-гадовай адукацыі* замест сямігадовага навучання. У 1962 г. праведзена рэформа сярэдняй школы, яна была пераведзена на 11-гадовае навучанне з ухілам на працоўную адукацыю. Але з 1964 года было вырашана зноў вярнуцца да 10-гадовага навучання.

У 1966 годзе была пастаўлена задача перахода да *ўсеагульнай сярэдняй адукацыі.* Яна была выканана да **1975 г**. За гэты час значна ўмацавалася матэрыяльная база сістэмы адукацыі, большасць школ працавалі ў тыпавых будынках, дзе былі таксама спортзалы, майстэрні. Новым стала адкрыццё школ-інтэрнатаў, прадметных кабінетаў. 65% настаўнікаў мелі вышэйшую адукацыю. Але былі і праблемы. Абавязковае дзесяцігадовае навучанне часам прыводзіла да прыніжэння патрабавальнасці за якасць ведаў.

У 1984 г. была праведзена яшчэ адна рэформа агульнаадукацыйнай школы, згодна з якой навучанне пачыналася з 6 гадоў і працягвалася 11 гадоў. У цэлым да васьмідзесятых гадоў у СССР, у тым ліку і ў Беларусі, склалася ў цэлым якасная сістэма школьнага навучання, якая была прызнана адной з лепшых у свеце.

Развівалася сістэма вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Хуткае эканамічнае развіццё БССР вызывала неабходнасць падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў. Таму пасля вайны былі адкрыты шэраг ВНУ і адпаведна расла колькасць студэнтаў, якія вучыліся ў іх. У пасляваенные годы было адчынены 7 новых ВНУ па тэхнічных спецыяльнасцях, 5 гуманітарных. Агульная ж колькасць ВНУ у Беларусі павялічылася з 21 у 1946 да 33 у 1985 г., а колькасць студэнтаў адпаведна з 13 тыс. да 184 тысяч. Вядучымі навучальнымі установамі ў рэспубліцы былі і застаюцца БДУ і БНТУ. Па ўзроўню развіцця сістэмы вышэйшай адукацыі Беларусь выйшла на ўзровень развітых краін свету.

Паспяхова развівалася *навука***.** У 1944 г. была адноўлена дзейнасць Акадэміі навук, прычым ў яе структуры былі створаны шэраг новых навукова-даследчых інстытутаў. Навука гэтага перыяду характарызуецца станаўленнем фундаментальных даследаванняў. У сістэме АН БССР адкрываюцца інстытуты фізікі і матэматыкі, генетыкі, цепла- і масаабмену і інш. Ствараюцца цэлыя навуковыя школы (у галіне звычайных дыферэнцыяльных ураўненняў — школа *Н. П. Яругіна*, спектраскапіі і лазераў – *Б. І. Сцяпанава*, цепла- і масапераносу – *А. В. Лыкава*, тэарэтычнай фізікі – *Ф. І. Фёдарава,* антрапагенезу – *Г. І. Гарэцкага,* кардыялогіі – *Г. І. Сідарэнкі*, вылічальнай матэматыкі – *У. І. Крылова,* геалогіі і тэктонікі – *Р. Г. Гарэцкага*). Шырока вядомымі ў свеце сталі біёлаг *В. Купрэвіч,* матэматык *У. Платонаў,* фізік *М. Барысевіч.* Пераважнае развіццё ў рэспубліцы атрымалі тэхнічная і фізіка-матэматычная навукі, што звязана з развіццём навукова-тэхнічнага прагрэсу. Аднак толькі нямногія навуковыя распрацоўкі знаходзілі прымяненне на

практыцы. Пэўныя поспехі былі дасягнуты ў гуманітарных навуках, хаця яны былі ў большай ступені, чым іншыя, палітызаваныя.

Беларусы *Пётр Клімук* і *Уладзімір Кавалёнак* сталі лётчыкамі-касманаўтамі СССР, унеслі непасрэдны ўклад у асваенне космасу. Значны ўклад у развіццё абароназдольнасці СССР унеслі *Я. Зельдовіч* – адзін са стваральнікаў савецкай атамнай і вадароднай бомбаў, *П. Сухі* – авіяканструктар, распрацоўшчык самалётаў-знішчальнікаў.

*Літаратура і мастацтва*. У літаратуры пасляваенных гадоў выразна праслежваліся некалькі напрамкаў: узвелічэнне подзвігу савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, пафас стваральнай працы і маральна-этычныя праблемы сучасніка. Пры гэтым трэба адзначыць, што на змену апісальнасці літаратурных твораў 50-х гадоў у наступныя дзесяцігоддзі прыйшло больш глыбокае асэнсаванне падзей і людскіх характараў, іх унутранага свету. Апошняе стала больш характэрным у 60-я гады, калі XXII з’езд у якасці адной з галоўных трох задач паставіў праблему *выхавання “новага чалавека”.* У цэлым, нягледзячы на ідэалагічны кантроль з боку партыйных органаў, літаратура развівалася досыць паспяхова, перш за ўсё таму, што літаратары менш былі залежны ад фінансавых праблем, іх вырашала дзяржава.

Глыбокае асэнсаванне падзей Вялікай Айчыннай вайны, псіхалагічных партрэтаў людзей у годы ваенных выпрабаванняў характэрны для празаічных твораў *В. Быкава, М. Лынькова, І. Навуменкі, І. Чыгрынава, А. Адамовіча.*

Маральна-этычным праблемам сучаснасці прысвечаны раманы *І. Мележа, Я. Брыля, І. Шамякіна.*

Гістарычную тэматыку развіваў у сваіх раманах, аповесцях, п’есах У. Караткевіч.

Даволі паспяхова развівалася беларуская паэзія. У пасляваенныя дзесяцігоддзі шырока раскрыўся талент беларускіх паэтаў *К. Крапівы, А. Куляшова, П. Броўкі, П. Панчанкі, Н. Гілевіча, М. Лужаніна* і іншых. У васьмідзесятыя гады з’явіўся шэраг твораў паэтаў новага пакалення *А. Вялюгіна, К. Кірыенкі, Р. Барадуліна, У. Някляева, Я. Сіпакова, В. Зуёнка.*

40-80-я гады сталі часам росквіту беларускага кінематографа. Кожны год студыя “Беларусьфільм” выпускала да 60 фільмаў розных жанраў, пераважна па ваеннай тэматыцы. Многія з іх сталі вядомымі далёка за межамі рэспублікі: “Несцерка”, “Зялёныя агні”, “Міколка-паравоз”, “Гадзіннік спыніўся апоўначы”, “Дзяўчынка шукае бацьку” і інш.

Гістарычнай тэматыцы прысвечаны п’есы *П. Глебкі, І. Мележа.* Маральна-этычныя праблемы сучаснасці знайшлі адлюстраванне ў

драматычных творах і камедыях *А. Макаёнка, К. Крапівы, А. Дударава, А. Петрашкевіча.* У гэты час у Беларусі працавалі 17 тэатраў.

У *музычным мастацтве* развіваюцца жанры сімфоніі і інструментальнай музыкі (кампазітары *У. Алоўнікаў, М. Аладаў, А. Багатыроў, П. Падкавыраў, Я. Цікоцкі*). Наладжваецца цеснае супрацоўніцтва з тэатрамі (оперы *М. Аладава, Дз. Лукаса, Р. Пукста, Дз. Смольскага, Ю. Семянякі)*. Кампазітары звяртаюцца да ваенна-патрыятычнай тэматыкі, увасаблення вобразаў рэальных гістарычных асоб. Большасць кампазітараў працуе ў розных жанрах.

Цэнтрам музычнага жыцця рэспублікі былі тэатр оперы і балета, дзяржаўная філармонія, адкрыты ў 1971 г. Дзяржаўны тэатр музычнай камедыі БССР. З 60-х гг. беларускія тэатры захапляюцца маральна-этычнай праблематыкай. Ставяцца п'есы беларускіх драматургаў (*А. Дударава, А. Макаёнка, М. Матукоўскага*), рускіх і сусветных класікаў, савецкіх аўтараў. Сусветнае прызнанне атрымлівае балетная трупа Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балета пад кіраўніцтвам *В. Елізар'ева*, свайго роду заснавальніка беларускай школы балета ("Стварэнне свету" *А. Пятрова* і інш.). К сярэдзіне 80-х гг. у БССР працавалі 2 музычныя, 6 лялечных, 9 драматычных тэатраў.

Высокай актыўнасцю і майстэрствам адрозніваецца творчасць беларускіх кампазітараў *І. Лучанка, Э. Ханка, Л. Захлеўнага, У. Мулявіна.*

У 70–80-я гг. з'яўляюцца новыя тыпы музычных і танцавальных калектываў (вакальна-інструментальныя ансамблі "Песняры", "Верасы", "Сябры", фальклорна-харэаграфічны ансамбль "Харошкі").

Развівалася *выяўленчае мастацтва.* Як і ў іншых жанрах, тут пераважала гістарычная і ваенна-патрыятычная тэматыкі, а таксама партрэтны жанр і пейзаж. Тэме вайны прысвечаны палотны мастакоў *М. Савіцкага, Я. Зайцава, В. Волкава, Я. Ціхановіча, І. Давідовіча, А. Шыбнёва,* гісторыі – *Я. Кудрэвіча, П. Сергіевіча.* У жанры пейзажа плённа працавалі мастакі *І. Ахрэмчык, У. Кудрэвіч, В. Цвірка, М. Данцыг.*У 1960-70-я гг. пачалі сваю працу таленавітыя мастакі *А. Кішчанка, Я. Шчамялёў, Г. Вашчанка, У. Стальмашонак.* Беларуская графіка гэтага часу прадстаўлена серыямі па гісторыі і сучаснасці, з выкарыстаннем розных прыёмаў (работы *У. Басалыгі, С. Геруса, В. Шаранговіча*).

Ярка праявілася таксама творчасць беларускіх *скульптараўЗ. Азгура, А. Бембеля, С. Селіханава* і іншых.

У *архітэктуры* першых пасляваенных галдоў прадаўжалі пераважаць рысы так званага “сталінскага барока”, але з 50-х гадоў пачынае мяняцца архітэктурны воблік гарадоў. З аднаго боку, пачынаецца масавая застройка мікраараёнаў згодна з тыпавымі праектамі, з другога, з’яўляецца шэраг пабудоў ў стылі мадэрн паводле індывідуальных праектаў. Гэта, напрыклад, палацы мастацтва і спорту, павільён ВДНГ, кінатэатр “Кастрычнік”.

Значнае развіццё ў пасляваенные дзесяцігоддзі атрымала манументальнае мастацтва Беларусі. У гэты час ствараецца рад мемарыялаў і помнікаў, прысвечаных подзвігу савецкіх людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны. Найбольш значнымі з іх з’яўляюцца помнік Перамогі ў г. Мінску, мемарыяльныя комплексы “Хатынь”, “Курган славы”, “Брэсцкая крэпасць-герой” і інш., а таксама помнікі Я. Купалу, Я. Коласу ў Мінску, Ф. Скарыне ў Полацку.

**Кантрольныя пытанні і заданні для самападрыхтоўкі студэнтаў:**

1. З якой важнай прапановай выступіла дэлегацыя БССР ў 1946 г. у Генеральнай Асамблеі ААН?
2. У чым сутнасць эканамічнай рэформы ў БССР у 60-ыя гады?
3. Што характарызуе грамадска-палітычнае жыццё СССР і БССР ў 60-80-я гг. ХХ ст.?
4. Назавіце творы беларускіх пісменнікаў, якія працавалі ў 60-80-я гг. ХХ ст.

**Літаратура:**


1. Беларусь: страницы истории / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории ; редсовет: А.А. Коваленя [и др.]. – Минск, 2011.
2. Беларусь: страницы истории / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории; редсовет: А.А. Коваленя [и др.]. – Минск, 2011.
3. Бригадин, П.И. История Беларуси в контексте европейской истории: курс лекций. – Минск, 2007.
4. Герб, Сцяг і Гімн Беларускай Дзяржавы = Герб, Флаг и Гимн Белорусской Державы : навукова-папулярнае выданне / аўтар тэксту А. Марціновіч. – Мінск, 2011.
5. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. / М. У. Смяховіч [і інш.] ; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. — Мінск, 2012. – Кн. 2.

6. Новик, Е.К., Качалов, И.Л., Новик, Н.Е. История Беларуси: с древнейших времен до 2012 г. : учебное пособие. — 3-е изд., испр. и доп. – Минск, 2012.

## Тэма 8.1. Рэспубліка Беларусь у 1990-2012 гг.

*Кючавыя паняцці:* Дзяржаўны суверэнітэт; Садружнасць Незалежных Дзяржаў;Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 г; рэспубліканскія рэферэндумы; Нацыянальны сход;сацыяльна-арыентаваная рынечная эканоміка; беларуская мадэль сацыяльна-эканамічнага развіцця;прынцып шматвектарнасці ў знешняй палітыцы; Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі; сацыяльная дзяржава; ідэалогія беларускай дзяржавы; няйтральная дзяржава; інтэграцыя; парк высокіх тэхналогій.

**План лекцыі:**

1. Абвяшчэнне і ўмацаванне дзяржаўнага суверэнітэту.
2. Эвалюцыя палітычнай сістэмы ў Рэспубліцы Беларусь.
3. Эканамічныя пераўтварэнні, пераадоленне крызісу і пераход да ўстойлівага росту.
4. Геапалітычнае становішча Рэспублікі Беларусь.
5. Адукацыя, навука і культура Рэспублікі Беларусь.

### 1.Абвяшчэнне і ўмацаванне дзяржаўнага суверэнітэту

У канцы 1980-х гг. у СССР значна ўзмацніліся дэзінтаграцыйныя працэсы, што стала вынікам комплексу прычын унутранага і знешняга характару і найшло сваё адлюстраванне ў абвяшчэнні рэспублікамі, якія ўваходзілі ў склад саюзнай дзяржавы, суверэнітэту і незалежнасці. Першымі адпаведныя дэкларацыі прынялі прыбалтыйскія рэспублікі — Эстонія, Латвія і Літва.

**27 ліпеня 1990 г.** Вярхоўны Савет БССР прыняў *«Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі»*. Прыняцце Дэкларацыі сведчыла аб тым, што рэспубліка выбрала ўласны шлях развіцця, але не выключала магчымасці добраахвотнага аб'яднання разам з іншымі рэспублікамі ў новы саюз.

Дэкларацыя, прынятая Вярхоўным Саветам, абвяшчала верхавенства Канстытуцыі БССР і яе законаў на тэрыторыі рэспублікі, самастойнасць і паўнату дзяржаўнай улады ў яе межах, незалежнасць Беларусі ў знешніх

адносінах, надавала беларускай мове статус дзяржаўнай. Дзяржаўны суверэнітэт сцвярджаўся ў імя свабоднага развіцця і дабрабыту, годнага жыцця кожнага грамадзяніна рэспублікі на аснове забеспячэння правоў асобы ў адпаведнасці з Канстытуцыяй БССР і яе міжнароднымі абавязацельствамі.

**25 жніўня 1991 г.** Вярхоўны Савет БССР прыняў рашэнне *аб наданні статуса канстытуцыйнага закона Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР, прынятай 27 ліпеня 1990 г.*

**26 жніўня 1991 г**. быў прыняты *Закон "Аб забеспячэнні палітычнай і эканамічнай самастойнасці БССР"*, згодна з якім усе прадпрыемствы, арганізацыі і ўстановы агульнасаюзнага падпарадкавання, якія знаходзіліся на яе тэрыторыі, пераводзіліся ва ўласнасць Беларускай ССР. Вярхоўны Савет БССР прыняў рашэнне аб часовам прыпыненні дзейнасці КПБ — КПСС на тэрыторыі рэспублікі, дэпартызацыі органаў дзяржаўнай улады і кіравання, дзяржаўных прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў. **19 верасня 1991 г.** Вярхоўны Савет БССР зацвердзіў новую назву краіны — *«Рэспубліка Беларусь»*, а ў скарочаным варыянце – *"Беларусь",* прыняў рашэнне пра ўвядзенне новай дзяржаўнай сімволікі.

**8 снежня 1991 г.** ў рэзідэнцыі Віскулі ў Белавежскай пушчы кіраўнікі Беларусі, Расіі і Украіны падпісалі *Пагадненне аб спыненні існавання СССР і аб стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў* (СНД). 10 снежня 1991 г. Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь ратыфікаваў пагадненне аб стварэнні СНД і прыняў рашэнне аб дэнансацыі дагавора аб утварэнні СССР ад 1922 г. У склад СНД увайшлі 12 краін. Сталіцай СНД быў вызначаны г. Мінск.

## 2.Эвалюцыя палітычнай сістэмы ў Рэспубліцы Беларусь

**15 сакавіка 1994 г.** Вярхоўны Савет прыняў новую *Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь.* Згодна Канстытуцыі, Беларусь – унітарная дэмакратычная сацыяльная прававая дзяржава, якая аснована на прынцыпе раздзяленя ўлад: заканадаўчай, выканаўчай і судовай.

Рэспубліка Беларусь як *унітарная* дзяржава падзяляецца на адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі (вобласці), якія не маюць статусу самастойных дзяржаўных утварэнняў. *Дэмакратычны* характар беларускай дзяржавы вызначаецца тым, што адзінай крыніцай дзяржаўнай улады з'яўляецца народ. Рэспубліка з'яўляецца *прававой дзяржавай* таму, што дзейнасць усіх органаў улады, жыццё грамадства вызначаюцца

Канстытуцыяй і адпаведнымі законамі, выкананне якіх з’яўляецца абавязковым для ўсіх. Тэрмін *“сацыяльная дзяржава”* азначае, што асноўнай мэтай Рэспублікі Беларусь з’яўляецца стварэнне ўмоў для свабоднага і годнага развіцця асобы і рэалізацыі яе інтарэсаў, якія суадносяцца з інтарэсамі грамадства.

Канстытуцыя ўстанавіла прэзідэнцкую форму дзяржаўнага кіравання, паводле якой Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь з'яўляецца кіраўніком дзяржавы, гарантам правоў і свабод чалавека і грамадзяніна. Згодна Аснаўному Закону, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь увасабляе адзінства народа, гарантуе рэалізацыю асноўных напрамкаў унутранай і знешняй палітыкі, прадстаўляе беларускую дзяржаву ў адносінах з іншымі дзяржавамі і міжнароднымі арганізацыямі. Прэзідэнт прымае меры па ахове суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, яе нацыянальнай бяспекі і тэрытарыяльнай цэласнасці, забяспечвае палітычную і эканамічную стабільнасць, пераемнасць і ўзаемадзеянне органаў дзяржаўнай улады, ажыцяўляе пасрэдніцтва паміж органамі дзяржаўнай улады.

**10 ліпеня 1994 г.** першым *Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь быў абраны А.Р. Лукашэнка.* За яго кандыдатуру аддалі свае галасы звыш 80 % выбаршчыкаў. 20 ліпеня 1994 г. на сесіі Вярхоўнага Савета адбылася афіцыйная цэрэмонія ўступлення Прэзідэнта на пасаду.

У мэтах вырашэння некаторых спрэчных пытанняў, якія ставіла палітычная апазіцыя і якія мелі прынцыповае значэнне для забеспячэння згоды ў грамадстве, па ініцыятыве Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і ў адпаведнасці з яго перадвыбарнай платформай (забеспячэнне суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, эканамічнай і палітычнай стабільнасці, барацьба з карупцыяй і злачыннасцю, паляпшэнне матэрыяльнага дабрабыту народа) **14 мая 1995 г.**быў праведзены *рэспубліканскі рэферэндум.* Беларускі народ падтрымаў прапановы кіраўніка дзяржавы аб наданні рускай мове роўнага статусу з беларускай, развіцці эканамічнай інтэграцыі з Расійскай Федэрацыяй, прадугледжана магчымасць датэрміновага роспуску Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь у выпадку парушэння Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, устанаўленні новых Дзяржаўнага сцяга і Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь.

**24 лістапада 1996 г.** адбыўся ініцыіраваны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкам *рэспубліканскі рэферэндум.*Беларускі народ прагаласаваў за прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. са змяненнямі і дапаўненнямі (новая рэдакцыя Канстытуцыі Рэспублікі

Беларусь), прапанаванымі А.Р. Лукашэнкам, выказаўся супраць свабоднай, без абмежаванняў куплі і продажу зямлі, супраць адмены смяротнай кары ў Рэспубліцы Беларусь.

На рэспубліканскім рэферэндуме была падтрымана прапанова А.Р. Лукашэнкі *аб перанясенні Дня незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дня рэспублікі) з 27 ліпеня на 3 ліпеня*– дзень вызвалення Мінска ад гітлераўскіх захопнікаў у Вялікай Айчыннай вайне.

У адпаведнасці з новай рэдакцыяй Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь замест аднапалатнага Вярхоўнага Савета быў сфарміраваны двухпалатны *Нацыянальны сход, які з'яўляецца прадстаўнічым і заканадаўчым органая улады.* Ён складаецца з Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі. Прэзідэнт з'яўляецца кіраўніком дзяржавы, гарантам Канстытуцыі, правоў і свабод чалавека і грамадзяніна. Кіраўніком выканаўчай улады з'яўляецца прэм'ер-міністр урада, пашыраны правы і паўнамоцтвы Савета Міністраў. Канстытуцыйны Суд сочыць за адпаведнасцю Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь законаў, якія прымаюца ў нашай краіне.

**17 кастрычніка 2004 г.**адбыўся *рэспубліканскі рэферэндум* па пытанню прыняцця паправак у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, звязаных з тэрмінам паўнамоцтваў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Па выніках рэферэндума Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь выбіраецца на 5 гадоў непасрэдна народам Рэспублікі Беларусь на падставе ўсеагульнага, свабоднага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні. З Канстытуцыі выключана палажэнне аб тым, што адна і тая ж асоба можа быць Прэзідэнтам не болей дзвух тэрмінаў.

Вынікі рэспубліканскіх рэферэндумаў паказалі, што абсалютная большасць грамадзян Рэспублікі Беларусь падтрымлівае Прэзідэнта.

У Рэспубліцы Беларусь існуе шматпартыйная сістэма. Сёння ў Беларусі дзейнічае 15 палітычных партый. Сярод вядучых вылучаюцца Аб'яднаная грамадзянская партыя, Ліберальна-дэмакратычная партыя, Беларуская сацыял-дэмакратычная грамада, Сацыял-дэмакратычная партыя народнай згоды, Партыя БНФ, Камуністычная партыя Беларусі і інш. Большасць з іх знаходзяцца ў апазіцыі да існуючай улады і не маюць рэальнага ўплыву на палітычную сітуацыю ў краіне.

Таксама ў рэспубліцы працуе 2,2 тысячы грамадскіх аб'яднанняў. На прэзідэнцкіх выбарах (верасень 2001 г., сакавік 2006 г., снежань 2010 г.) перамогу атрымаў дзейнічаючы Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка.

**3. Эканамічныя пераўтварэнні, пераадоленне крызісу і пераход да ўстойлівага росту.**

У эканамічнай сферы пасля распаду СССР і стварэння сувярэнных дзяржаў адбыўся рэзкі пераход да ліберальнай рыначнай эканомікі па заходніх рэцэптах «шокавай тэрапіі». Пачалася прыватызацыя прадпрыемстваў і пераход на свабоднае цэнаўтварэнне, у сельскай гаспадарцы быў узяты курс на развал калгасаў і замену іх фермерскімі гаспадаркамі. Гэта прывяло да рэзкага зніжэння аб'ёмаў вытворчасці і ўзроўня жыцця насельніцтва. У Беларусі ў 1991-1995 гг. валавы нацыянальны прадукт скараціўся на 35%, рэальная зарплата зменшылася на палову. 60% насельніцтва аказалася за рысай беднасці. Палажэнне яшчэ больш ускладнялася ў сувязі з узрастаючай інфляцыяй, ростам беспрацоўя, нарастаннем іншых сацыяльных праблем.

У той жа час у эканоміцы рэспублікі паступова праяўляліся элементы рыначнай эканомікі, прававой базай для якіх стала прыняцце ў 1991–1995 гг. законаў “Аб уласнасці”, “Аб нацыянальным банку”, “Аб прадпрыемстве”, “Аб арэндзе”, “Аб прадпрымальніцтве” і інш. Яны дэкларавалі свабоду распаражэння прадпрымальнікаў выробленай прадукцыяй, частковую свабоду цэнаўтварэння і прыватызацыю, стваралі спрыяльны клімат для замежных інвестыцый і развіцця дробнага прадпрымальніцтва.

З увядзеннем прэзідэнцкага кіравання быў узяты курс на *сацыяльна-арыентаваную рыначную эканоміку*, якая спалучае ў сабе перавагі рыначнай канкурэнцыі і эфектыўнай сістэмы абароны інтарэсаў насельніцтва, ідэі рыначнага самарэгулявання і дзяржаўнага кіравання. Выкарыстоўваючы яе, дзяржава праводзіць моцную і эфектыўную эканамічную і сацыяльную палітыку, абараняе інтарэсы ўсіх класаў і пластоў насельніцтва, у тым ліку і тых, хто па розных прычынах зарабляе мала, ці зусім нічога не зарабляе (састарэлыя, інваліды, шматдзетныя сем’і, студэнты, навучэнцы і г. д.). Гэта выключае сацыяльныя катаклізмы і забяспечвае сацыяльную стабільнасць у грамадстве.

Улічваючы вопыт краін з развітай рыначнай інфраструктурай, Рэспубліка Беларусь стала на шлях дзяржаўнага рэгулявання эканомікі. Правядзенне дзяржаўнай патэрналісцкай палітыкі забяспечвае павышэнне эфектыўнасці эканомікі, абарону інтарэсаў айчынных таваравытворцаў, недапушчэнне “праядання” крэдытаў, узмацнення інфляцыі, развіцця крымінальных і ценявых структур.

Прыватызацыя праводзіцца пры ўдзеле і пад кантролем дзяржавы, у інтарэсах умацавання яе магутнасці і павышэння дабрабыту народа. Грамадзяне рэспублікі і дзяржава адмовіліся ад куплі-продажу зямель сельскагаспадарчага прызначэння, ад дэмантажу буйной калгасна-саўгаснай вытворчасці і замены яе сялянскай (фермерскай) гаспадаркай. Калгас, саўгас, сялянская (фермерская) гаспадарка маюць роўныя правы і магчымасці існавання, калі яны эфектыўна гаспадараць на зямлі.

Асаблівасцю *беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця*з'яўляецца тое, што ў цэнтры яе знаходзіцца Чалавек з яго інтарэсамі, памкненнямі, жаданнем жыць у свабоднай, дэмакратычнай і квітнеючай краіне. Усё ў імя чалавека і для дабрабыту чалавека – такі глыбінны сэнс беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця, унутранай і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь. Дзяржава для народа клапоціцца і будзе клапаціцца аб росце заработнай платы, пенсій, стыпендый і іншых выплат насельніцтву, аб паляпшэнні жыллёвых умоў, умоў працы і адпачынку, каб чалавек адчуваў сябе камфортна, ганарыўся тым, што ён жыве і працуе ў краіне, імя якой Рэспубліка Беларусь.

Рэспубліка Беларусь адкрыта для эканамічнага супрацоўніцтва з усімі краінамі свету. Яна прыцягвае ў народную гаспадарку капіталы айчынных і замежных інвестараў. Сёння краіна, маючы велізарны вытворча-эканамічны, навукова-тэхнічны і інтэлектуальны патэнцыял, робіць стаўку на ўласныя сілы і сродкі, прыцягваюцца іншаземныя інвестыцыі ў тым выпадку, калі яны даюць нам эканамічную выгаду і адпавядаюць нацыянальным інтарэсам.

Беларусь дасягнула істотнага росту па выжнейшых макраэканамічных паказчыках, стабілізавалася эканамічнае становішча краіны. Дзяржаўная эканамічная палітыка дазволіла захаваць і развіць прамысловыя гіганты, з якімі ва ўсім свеце асацыіруюць Беларусь (“МТЗ”, “МАЗ”, “БелАЗ”, “Беларуськалій” і інш.). Толькі за 2006-2010 гг. пабудавана 155 новых прадпрыемстваў. Адбылося фактычна поўнае тэхналагічнае пераўзбраенне сяла.

У падрыхтаваным ААН Дакладзе аб чалавечым вымярэнні ў 2009 г. у рэйтынгу краін па індэксу развіцця чалавечага патэнцыялу (ІРЧП) Беларусь заняла 68-е месца (з 182) і ўвайшла ў групу дзяржаў з высокім узроўнем (ІРЧП). Па гэтым паказчыку Беларусь апярэдзіла ўсе краіны СНД (Расія – 71-е месца, Казахстан – 82-е, Арменія – 84-е, Украіна – 85-е, Азейбарджан – 86-е і г.д.) і такія еўрапейскія дзяржавы, як Албанія, Македонія, Боснія і Герцагавіна, Турцыя.

У 2006 г. былі абмеркаваны і зацвержаны асноўныя напрамкі сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2006-2010 гг, дзе у якасці асноўнай задачы пастаўлена павышэнне якасці жыцця людзей. Сусветны эканамічны крызіс, які пачаўся ў другой палове 2008 г., ускладніў яе рэалізацыю, але, тым не меньш, большасць прагнозных паказчыкаў была выканана. У асноўным паспяхова выконваюцца праграмныя ўстаноўкі сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2011-2015 гг. якія былі вызначаны на IV Усебеларускім народным сходзе ў снежні 2010 г.

Такім чынам, галоўным вынікам сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь у 1994–2013 гг. з'яўлялася тое, што ў краіне была створана і дзейнічае аптымальная сацыяльна-эканамічная сістэма, заснаваная на паступовым, эвалюцыйным шляху эканамічных пераўтварэнняў. Забяспечаны высокія тэмпы эканамічнага росту. Захаваны і паглыблены сацыяльныя гарантыі для людзей – жыллё, пенсіі, бясплатныя за кошт бюджэту адукацыя і лячэнне. Сёння Рэспубліка Беларусь – стабільная, паспяховая, цывілізаваная краіна з моцнай эканомікай, развітымі навукай і культурай, адной з лепшых у свеце сістэмай адукацыі. Моцная дзяржаўная ўлада, моцная сацыяльная палітыка і апора на народ – сакрэт поспехаў Рэспублікі Беларусь.

**4. Геапалітычнае становішча Рэспублікі Беларусь.**

Росту аўтарытэту Беларусі садзейнічала тое, што з самага пачатку самастойнага выхаду на міжнародную арэну ў якасці базавых прынцыпаў знешняй палітыкі яна абрала бяз'ядзернасць і нейтралітэт. Рэспубліка заявіла аб гатоўнасці прытрымлівацца прынцыпаў Статута ААН, Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека і ўзятых міжнародных абавязацельстваў. У лютым 1992 г. Беларусь падпісала Хельсінскі Заключны акт нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе 1975 г., далучылася да шэрагу іншых міжнародных пагадненняў.

Міжнародная супольнасць адгукнулася на гэта хуткім прызнаннем Рэспублікі Беларусь як суверэннай дзяржавы. Па стане на 2011 г. Беларусь устанавіла дыпламатычныя адносіны з 168 дзяржавамі. У 50 з іх адкрыта 60 дыпламатычных прадстаўніцтваў, у тым ліку 48 пасольстваў, 7 генеральных консульстваў і 1 консульства. Акрамя гэтага, 11 адзяленняў пасольства Рэспублікі Беларусь дзейнічала ў рэгіёнах Расійскай Федэрацыі, 1 адзяленне пасольства Рэспублікі Беларусь – у Германіі (у Бонне) і 1 – у Казахстане (Алмааты).

Зыходзячы з рэалій геапалітычнага становішча краіны, беларускае кіраўніцтва паклала ў аснову знешняй палітыкі дзяржавы *прынцып шматвектарнасці*, разумеючы яго як адсутнасць геаграфічных абмежаванняў у рабоце і ўдзяленне роўнай увагі ўсім рэгіёнам свету. Важнейшай задачай беларускай дыпламатыі з’яўляецца падтрыманне баланса паміж еўрапейскай і еўразійскай палітычнай і эканамічнай прасторамі. Рэспубліка Беларусь з’яўляецца паслядоўным прыхільнікам фарміравання шматпалярнай сістэмы міжнародных адносін, адлюстроўваючых шматвобразнасць сучаснага свету і ўлічваючай інтарэсы ўсіх дзяржаў планеты.

Асаблівае значэнне надавалася замацаванню партнёрства з Расіяй. Узаемныя палітыка-эканамічныя інтарэсы дзвюх дзяржаў прывялі да падпісання ў **лютым 1995 г.***Дагавора аб дружбе, добрасуседстве і супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй*. Ён стаў прававой асновай для заключэння шэрагу іншых пагадненняў.

Паступова ў развіцці інтэграцыйнага працэсу ўсё большую вагу стала набываць ідэя палітычнага яднання дзвюх краін. Яна знайшла адлюстраванне ў дагаворы ад **2 красавіка 1996 г.** аб стварэнні *Супольнасці Беларусі і Расіі.* Дагавор прадугледжваў стварэнне Вышэйшага савета Супольнасці, прадастаўленне грамадзянам Беларусі і Расіі роўных правоў у адукацыі, працаўладкаванні, ахове здароўя, аплаце працы і г. д. Далейшае палітычнае збліжэнне дзяржаў было замацавана дагаворам аб *стварэнні Саюза Беларусі і Расіі* ад **2 красавіка 1997 г**. Гэты дзень абвешчаны *Днём яднання народаў Беларусі і Расіі.*

Палітычная накіраванасць інтэграцыі выклікала крытычную занепакоенасць часткі беларускага грамадства. Аднак у кантэксце заяў аб тым, што падпісаныя дакументы ўлічваюць інтарэсы абодвух бакоў, прадугледжваюць захаванне шырокай самастойнасці і не пагражаюць іх суверэнітэту, быў зроблены наступны крок: **8 снежня 1999 г**. у Маскве прэзідэнты краін падпісалі *Дагавор аб стварэнні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі.*У адпаведнасці з дагаворам былі створаны Вышэйшы дзяржаўны Савет і Савет Міністраў Саюзнай дзяржавы, ўведзены пасады старшынь Саветаў і ўстаноўлены агульны бюджэт. Далейшае паглыбленне інтэграцыйнага працэсу беларускае кіраўніцтва звязвала з распрацоўкай праекта канстытуцыйнага акта Саюзнай дзяржавы, правядзеннем рэферэндуму ў абедзвюх дзяржавах, абраннем саюзнага парламента і фарміраваннем наднацыянальных органаў улады.

Шырокія міжнародныя сувязі Беларусі адкрываюць магчымасці вырашэння важных палітычных і эканамічных задач. На парадку дня стаяць пытанні далейшага ўмацавання пазіцый Беларусі ў Еўропе і сусветным супольніцтве, пераадолення пэўнай палітычнай і эканамічнай дыскрымінацыі ў краінах Еўрасаюза, прыцягненне замежных інвестыцый, каардынацыя дзеянняў з членамі СНД і краінамі-удзельніцамі Мытнага саюзу ў сферы мытнай палітыкі, узаемнага гандлю і гандлю з трэцімі краінамі, выкарыстанне вопыту замежных краін у вырашэнні праблем пераходу да рынкавай эканомікі, забеспячэнне эфектыўнага ўдзелу міжнародных структур у пераадоленні наступстваў чарнобыльскай катастрофы і г. д. Эфектыўнасць знешнепалітычнай дзейнасці беларускага кіраўніцтва і надалей будзе вымярацца тым, наколькі яна садзейнічае вырашэнню ўнутраных праблем краіны і забяспечвае інтарэсы беларускага народа ў міжнародным супольніцтве.

**5.Адукацыя, навука і культура Рэспублікі Беларусь.**

На працягу 90-х гг. былі зроблены захады па ўдасканаленні нацыянальнай сістэмы *адукацыі.* З 1998 г. пачалася рэформа 4,5 тыс. агульнаадукацыйных школ. Яе асноўнымі рысамі сталі дэмакратызацыя сістэмы адукацыі, арыентацыя яе на агульначалавечыя каштоўнасці, стварэнне ўмоў для гарманічнага развіцця асобы, павышэнне якасці і эфектыўнасці адукацыі. Пачаўся пераход школ на 12-гадовае навучанне, у т. л. абавязковае 10-гадовае. Узніклі новыя формы навучальных устаноў, з'явілася гімназіі, ліцэі, каледжы. У 90-я гг. пашырылася сетка вышэйшых навучальных устаноў. Сістэма дзяржаўнай вышэйшай адукацыі Беларусі аб'яднала 44 універсітэты, акадэміі. Побач з імі ўзніклі 20 недзяржаўных навучальных устаноў, навучанне ў якіх платнае. Выпрабаванне часам з іх вытрымалі толькі 12, аднак альтэрнатыўнасць формаў ВНУ стала фактам. За дзесяцігоддзе колькасць студэнтаў узрасла з 190 тыс. да 300 тыс. чалавек. У 2001 г. студэнтам стаў кожны другі выпускнік сярэдняй школы. Па колькасці студэнтаў у разлікуна 10 000 насельніцтва Беларусь выйшла на сярэднееўрапейскі ўзровень (300 чалавек), што з'яўляецца найбольшым паказчыкам у гісторыі нашай краіны.

У 90-я гады складаныя працэсы адбываліся ў *навуковай сферы.* Тэмпы развіцця навуковага патэнцыялу знізіліся. Колькасць супрацоўнікаў, занятых у навуцы, паменшылася ў два разы, а фінансаванне з дзяржбюджэту – у 4 разы. Аднак і ў гэтых умовах у структуры Нацыянальнай акадэміі навук

Беларусі з'явіліся новыя навуковыя ўстановы: інстытуты праблем выкарыстання прыродных рэсурсаў і экалогіі, радыёбіялогіі, сацыялогіі, малекулярнай і атамнай фізікі, прыкладной оптыкі і тэхналогіі металаў і інш. У 1993 г. Інстытут ядзернай энергетыкі пераўтвораны ў Акадэмічны навукова-тэхнічны комплекс "Сосны", у склад якога ўвайшлі Інстытут праблем энергетыкі, Інстытут радыяцыйных фізіка-хімічных праблем і Інстытут радыяэкалагічных праблем. Роля вядучай навуковай установы нададзена Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, у сценах якой сканцэнтравана каля 70% фундаментальных даследаванняў краіны. У 1993 г. быў прыняты Закон "Аб асновах дзяржаўнай навукова-тэхнічнай палітыкі", які ўсклаў на Акадэмію навук адказнасць за развіццё ў краіне фундаментальных навуковых даследаванняў.

*Беларуская культура* сёння – гэта найважнейшы рухавік сацыяльнага прагрэсу, трывалы падмурак нашай ідэалогіі і маралі. Яна зберагае гістарычную памяць і духоўны код народа, сваімі асаблівымі сродкамі асэнсоўвае і адлюстроўвае жыццё, ствараючы яркі і велічны мастацкі вобраз эпохі, абуджае ў людзей шчырыя патрыятычныя і грамадзянскія пачуцці. Багатыя культурныя дасягненні – адзін з бяспрэчных паказчыкаў высокага ўзроўню развіцця краіны. Веданне сваёй і сусветнай культуры, паважлівае стаўленне да яе фарміруе і выхоўвае нацыю.

Важны этап у развіцці беларускай культуры пачаўся ў канцы 1980-х – пачатку 1990-х гг. у сувязі са станаўленнем беларускай незалежнай дзяржавы. Упершыню за ўсю гісторыю беларускай дзяржаўнасці былі прыняты законы, якія рэгламентуюць узаемаадносіны дзяржавы і культуры, у тым ліку “Аб культуры”, “Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны”, “Аб бібліятэчнай справе”, “Аб музеях і Музейным фондзе” і г.д. У 1990-я гг. узніклі новыя формы матэрыяльнай падтрымкі культуры. Сярод іх выдзяляюцца Фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва (заснаваны ў 1997 г.) і Фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі (заснаваны ў 1996 г.).

Сёння ў сферы культуры працуюць амаль 65 тыс. чалавек, якія прадстаўляюць 8 тыс. арганізацый культуры. У сістэме Міністэрства культуры дзейнічаюць 27 дзяржаўных тэатраў, канцэртную дзейнасць ажыццяўляюць 16 дзяржаўных арганізацый, налічваецца каля 3,5 тыс. клубных устаноў, 4 тыс. бібліятэк, функцыянуюць больш за 150 музеяў, каля 140 кінатэатраў. Сетку ўстаноў адукацыі ў сферы культуры і мастацтва

складаюць 3 ВНУ, 21 установа сярэдняй спецыяльнай адукацыі, каля 500 дзіцячых школ мастацтва.

З сярэдзіны 80-х гг. XX ст. у *беларускай літаратуры* назіраецца адыход ад сацыялістычнага рэалізму, адкрываюцца магчымасці для свабоды творчасці беларускіх літаратараў. Новыя творы пісьменнікаў і паэтаў, прысвечаныя праблемам пошуку выйсця з нацыянальна-духоўнай дэградацыі – спадчыны савецкага рэжыму, прадстаўляюць асабістае бачанне сучаснага жыцця, звяртаюцца да старонак мінулага. Гэта, перш за ўсё, творы патрыярхаў сучаснай беларускай літаратуры *В. Быкава, І. Шамякіна, Я. Брыля, В. Адамчыка, Р. Барадуліна, Н. Гілевіча.* Тэма мінулага пераважае ў творчасці *У. Арлова, Т. Бондар, Л. Дайнекі, В. Коўтун, А. Лойкі, К. Тарасава, В. Чаропкі.*Не застаецца без увагі тэма гераізму ў час апошняй вайны (*В. Адамчык,В. Карамазаў, І. Чыгрынаў*). У першыя гады незалежнасці набыла вастрыню тэмарэпрэсій і культу асобы (*Г. Далідовіч, І. Навуменка,А. Кудравец, Л. Геніюш*). Не страчвае цікавасці тэма вёскі, своеасаблівага беларускаганацыянальнага асяродку; тэма гаспадара, цесна звязанага са сваёй зямлёй (*В.Федарэнка, С. Грахоўскі, І. Пташнікаў*). Сапраўднай трагедыяй для нашага народа сталаЧарнобыльская катастрофа, паказаная ў творах *А. Адамовіча, С. Алексіевіч, В. Гігевіча,С. Законнікава, В. Казько, Б. Сачанкі, І. Шамякіна* і інш.

Новы час аказаў немалы ўплыў на*тэатральнае мастацтва*. У рэспубліцы працуе 28 дзяржаўных тэатраў. Разам зшырокавядомымі ў свеце аўтарытэтнымі калектывамі працуюць новыя лабараторыі,студыі (“Маладзёжны тэатр”, “Вольная сцэна”, “Дзе – Я?”). Рэпертуар тэатральныхкалектываў папаўняецца творамі нацыянальнай тэматыкі (балет *А. Мдывані і В. Елізар’ева* “Страсці (Рагнеда)” – Дзяржпрэмія Рэспублікі Беларусь 1996 г., опера“Князь Наваградскі”, спектаклі “Звон – не малітва”, “Саламея”, “Князь Вітаўт”,“Пінская шляхта”, “Сны аб Беларусі”). Праводзяцца тэатральныя фестывалі –“Панарама” ў Мінску і “Белая вежа” ў Брэсце. Многае робяць па адраджэнні беларускайкультуры спевакі і музыканты (Дзяржаўны народны хор імя Г. Цітовіча, Дзяржаўнаяакадэмічная харавая капэла імя Р. Шырмы, Нацыянальны аркестр сімфанічнай іэстраднай музыкі пад кіраўніцтвам М. Фінберга, Дзяржаўны акадэмічны сімфанічныаркестр, вакальная група “Чысты голас”, вакальна-інструментальныя ансамблі “Сябры”і “Песняры”). Творчасць многіх кампазітараў змяшчаецца ў бок нацыянальнай тэматыкі(*А. Мдывані, В. Кузняцоў, А. Бандарэнка*). Стала традыцыяй правядзенне шматлікіхмузычных

фестываляў (“Славянскі базар у Віцебску”, “Залаты шлягер”, “Беларускаямузычная восень”, “Магутны Божа”, “Мінская вясна”, “Музы Нясвіжа”, “МузычнаеПалессе” і інш.), якія прадстаўляюць розныя накірункі і жанры сучаснага беларускагамузычнага мастацтва. Росту цікавасці да нацыянальнай музыкі ў маладзёжным асяроддзіспрыяе творчасць фолк- і рок-гуртоў “Палац”, “Тройца”, “Крыві”, “Юр’я”, “NRM”,“Крамбамбуля” і інш.

Увогуле сучасная мастацкая культура Беларусі характарызуецца пошукам новыхформ праяўлення, пашырэннем альтэрнатыўных метадаў, стракатасцю жанраў. “Новымпавевам” стала арыентацыя творчасці на масавы попыт; сучаснае мастацтва носіцьпераважна відовішчны характар. Сфера культуры і мастацтва камерцыялізуецца.

Заапошні час адкрылася некалькі недзяржаўных галерэй (“Бел-арт”, “ЛаСандр-арт”, “Ў”,“Універсітэт культуры”). Шырокае развіццё жанру пейзажа сведчыць прапераарыентацыю мастакоў на новы масавы рынак (работы *Ф. Янушкевіча,Я. Баракоўскага*). Папулярнасцю карыстаюцца таксама гістарычныя сюжэты(*Я. Бартальёнак, А. Марачкін, Ю. Піскун*). Стала папулярнай станкавая скульптура,зарыентаваная на замежны попыт (*У. Слабодчыкаў, Г. Гаравая*). Шырока вядомая наватза межамі Беларусі айчынная школа графікі *(М. Купава, В. Шаранговіч, А. Кашкурэвіч,*інш.). Чарговы цыкл карцін “Чорная быль” створаны бліскучым беларускім мастакомМ. *Савіцкім.*У 2010 г. у нашай краіне працавала 147 музеяў краязнаўчага, мастацкага і іншыхнакірункаў.

У спіс сусветнай культурнай спадчыны ЮНЭСКА уключаны чатыры аб’екты,што знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі, – Белавежская пушча, Мірскі і Нясвіжскі замкі,геадэзічная дуга Струве.

# ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## ПЛАНЫ СЕМІНАРСКІХ ЗАНЯТКАЎ, ХРАНАЛОГІЯ, ТЭРМІНАЛАГІЧНЫ СЛОЎНІК, ТЭМЫ РЭФЕРАТАЎ

### Семінар 1.Старажытнае грамадства, ранняе і высокае сярэдневякоўе на тэрыторыі Беларусі (ад старажытных часоў – да другой паловы XIII ст.).

1. Насельніцтва на тэрыторыі Беларусі ў эпоху каменнага, бронзавага і ранняга жалезнага вякоў.
2. Першыя дзяржаўныя ўтварэнні ўсходніх славян на тэрыторыі Беларусі: Полацкае і Тураўскае княствы.
3. Культура беларускіх зямель у IX-XIII стст.

### ХРАНАЛОГІЯ

**2,5 млн. гадоў таму назад – канец 3-га тысячагоддзя да н. э.** – каменны век на тэрыторыі Беларусі.

**100–35 тыс. гадоў таму назад –9 тыс. гадоў да н.э.** – эпоха палеаліту (старажытнага каменнага веку).

**9–5 тыс. гадоў да н.э.** – эпоха мезаліту (сярэдняга каменнага веку).

**5–3 тыс. гадоў да н.э** – эпоха неаліту (новага каменнага веку ).

**26–23 тыс. гадоў да н.э.** – першыя стаянкі людзей каля в.Бердыж Чачэрскага раёна і в. Юравічы Калінкавіцкага раёнана Гомельшчыне.

**Пачатак 2-га тыс. да н.э. – канец VIII ст. да н. э.** – бронзавы век на тэрыторыі Беларусі.

**VII ст. да н.э. – канец V-га ст. н. э.** – жалезны век на тэрыторыі Беларусі.

**V–VIII стст.** – рассяленне славян сярод балтаў на тэрыторыі Беларусі.

**VIII–IX стст.** – існаванне на тэрыторыі Беларусі ўсходнеславянскіх племянных аб'яднанняў – крывічоў-палачан, дрыгавічоў, радзімічаў.

**Канец IX ст.** – утварэнне Кіеўскай Русі.

**862 г.** – першае летапіснае ўпамінанне пра Полацк у «Аповесці мінулых гадоў».

**960-я гг. – 980 г.** – княжанне ў Полацку першага гістарычна вядомага князя Рагвалода.

**980 г.** – першае летапіснае ўпамінанне аб Тураве.
**988 г.** – пачатак распаўсюджвання хрысціянства вялікім князем Уладзімірам Святаславічам на Русі.
**992 г.** – заснаванне Полацкай епархіі.
**1005 г.** – заснаванне Тураўскай епархіі.
**1044 – 1101 гг.** – княжанне ў Полацку Усяслава Брачыславіча (Чарадзея).
**1054 г.** – раскол хрысціянскай царквы на каталіцкую і праваслаўную.
**50-я гг. XI ст.** – будаўніцтва ў Полацку Сафійскага сабора.
**1067 г., 3 сакавіка** – бітва на Нямізе. Першае летапіснае ўпамінанне пра Менск у «Аповесці мінулых гадоў».
**1097 г.** – Любецкі з'езд князёў, які замацаваў спадчыннае ўладанне валасцямі і феадальную раздробленасць старажытнарускай дзяржавы Кіеўскай Русі.
**1161 г.** – ювелір Лазар Богша стварыў узвіжальны крыж для Спаскай царквы (крыж Еўфрасінні Полацкай).
**XI ст.** – стварэнне Тураўскага Евангелля. Самая ранняя (з тых, што захаваліся) кніга, створаная на беларускіх землях.
**1101- 1119 гг.** – княжанне Глеба Усяслававіча ў Менску.
**Каля 1104- 1167 гг.** – жыццё і дзейнасць Ефрасінні Полацкай.
**1127 г.** – паход кіеўскага князя Мсціслава Уладзіміравіча на Полацкую зямлю.
**Каля 1130-1182 гг.** – жыццё і творчасць Кірылы Тураўскага.
**1157-1162 гг.** – княжэнне ў Тураве Юрыя Яраслававіча – прадстаўніка мясцовай княжацкай дынастыі.
**1203-1216 гг.** – супроцьстаянне Полацка агрэсіі нямецкіх рыцараў ва Усходняй Прыбалтыцы.
**1237 г.** – аб’яднанне мечаносцаў з Тэўтонскім ордэнам – заснаванне Лівонскага ордэна.
**1240 г.** – звесткі пра ўдзел Якава Палачаніна ў Неўскай бітве і праяўленую ім мужнасць.

## ТЭРМІНАЛАГІЧНЫ СЛОЎНІК

**Апсіда —** Паўкруглы выступ у сцяне хрысціянскіх царкоўных будынкаў.

**Асіміляцыя —** Працэс далучэння пэўных этнічных груп да асноўнага этнаса.

**Бранзалет** — Аздабленне круглай формы з металу (бронза, жалеза або срэбра) жалезнага веку з круглага дроту таўшчынёй 1 см.

**Бронзавы век —** Перыяд ў гісторыка-культурным развіцці чалавецтва, для якога ўласцівы ўзнікненне і актыўнае пашырэнне металургіі, апрацоўкіі выкарыстання бронзы.

**Вал —** Доўгі і высокі земляны насып абарончага прызначэння.

**Верв —** Сельская абшчына ў усходніх славян.

**Веча —** Найбольш старажытны орган дзяржаўнай улады ў усходніх славян, які прадстаўляў сабою агульны сход дарослых свабодных мужчын.

**Вялес** — Бог жывёлагадоўлі і гандлю ўсходніх славян.

**Гарадзішча** — Асноўны тып паселішча на Беларусі жалезнага веку.

**Дажбог —** Бог дабрабыту, урадлівасці ўсходніх славян.

**Даніна —** Форма феадальнай эксплуатацыі залежнага насельніцтва ў выглядзе натуральнага падатка.

**Дзесяціна** — Збор у карысць царквы ў выглядзе даніны ці грошай.

**Дзяцінец —** Цэнтральная ўмацаваная частка славянскага горада феадальных часоў.

**Дружына —** Аб’яднанне прафесійных воінаў часоў ранняга сярэднявечча, якія страцілі сувязь са сваімі родаміі абшчынамі, пабудаваннае на прынцыпе асабістай адданасці правадыру і зацікаўленнасці у яго поспехах.

**Духі —** Надзвычайныя істоты ў язычніцтве, якія валодаюць незвычайнымі здольнасцяміі сілай.

**Жалезны век —** Перыяд гісторыка-культурнага развіцця чалавецтва, які характэрызуецца з’яўленнем і шырокім распаўсюджваннем металургіі жалеза, вырабам з яго розных прылад працы і зброі.

**Жрэц —** Служыцель язычніцкага культу.

**Жыжаль** — Бог агню, апякун рамяства ўсходніх славянаў.

**Закупы —** Катэгорыя сялян, якія не мелі магчымасці весці гаспадарку на абшчынным надзеле і сяліліся на зямлі феадала, атрымлівалі ад яго пазыку і павінны былі працаваць да выплаты доўгу.

**Збіральніцтва—** Форма гаспадарчай дзейнасці старажытных людзей, заснаваная на збіранні прыроднага харчу.

**Зніч —** Бог пахавальнага агню ўсходніх славянаў.

**Зюзя** — Бог холаду ўсходніх славянаў.

**Каменны век —** Перыяд гісторыка-культурнага развіцця чалавецтва, калі першабытныя людзі пачынаюць вырабляць прылады працы і зброі з каменю, косціі дрэва, узнікненне радавога грамадства, прымітыўных міфалагічных уяўленняў аб прыродным асяроддзі, мастацтва.

**Купа —** Пазыка, якую сяляне атрымлівалі ад феадала, калі яны не мелі магчымасці весці гаспадарку на абшчынным надзеле і сяліліся на яго зямлі.

**Купалле—** Старажытнае свята дахрысціянскага паходжання, якое святкуецца кожны год з вечара 6  па 7 ліпеня.

**Ледніковы перыяд —** Перыяд гісторыка-культурнага развіцця чалавецтва, калі большая частка еўрапейскага кантынэнту была пакрыта магутным ледавіком, а кліматычныя ўмовы прыледавіковай зоны былі вельмі суровыя і неспрыяльныя для жыцця чалавека.

**Лёля —** Багіня вясны і кахання ўсходніх славянаў.

**Летапісанне —** Запіс падзей па гадах у храналагічнай паслядоўнасці.

**Лунніца —** Металічнае ўпрыгожанне ў выглядзе паўмесяца.

**Матрыярхат** — Перыяд генэзісу радавой абшчыны, характэрнай рысай якога з'яўляецца вядучая роля жанчыны ў гаспадарчым жыцці, у сістэме сямейна-шлюбных адносін.

**Мезаліт —** Перыяд каменнага веку, калі чалавек істотна ўдасканальвае прылады працы і зброі, выраблены з крэменю, косціі дрэва, стварае лук і стрэлы, значна палепшыўшы яго магчымасці.

**Неаліт —** Перыяд каменнага веку, характэрнымі рысамі якога з'ўляюцца павялічэнне  ролі рыбалоўства у жыцці чалавека, вынаходства глінянага посуду і новых прылад працы з крэменю, косціі дрэва, ў апрацоўцы якіх чалавек дасягае значных поспехаў.

**Неандэртальцы —** Першабытныя людзі, якія мелі невялікі рост (155-165 см), галовы з пакатым ілбом, выступаючымі надвочнымі валікаміі скошанай ніжняй сківіцай, аб'ёмам галаўнога мозга ў сярэднім 1500 куб. см.

**Павучэнне —** Царкоўны твор, прысвечаны розным біблейскім сюжэтам, які прызначаўся для казанняў у царкве.

**Палеаліт —** Перыяд у гісторыі чалавецтва, характэрнымі рысамі якога на тэрыторыі Беларусі выступаюць з'яўленне першых людзей, якія пачалі вырабляць прылады працы з крэменю, і займаліся збіральніцтвам, паляваннем і рыбалоўствам.

**"Палеалітычная Вянера" —** Выраблная з касці, пераважна маманта, фігурка жанчыны, якая сведчыла аб паяўленні ў чалавека каменнага веку прымітыўных рэлігійных уяўленняў.

**Палюддзе** — Збор даніны са свабоднага насельніцтва, якое пражывала на падуладнай князю тэрыторыі.

**Патрыярхат** — Перыяд генэзісу радавой абшчыны ў часы жалезнага веку, характэрнай рысай якога з’яўляецца вядучая роля мужчыны ў гаспадарчым жыцці, у сістэме сямейна-шлюбных адносін.

**Пацеркі —** Аздабленне жалезнага веку круглай, кольцападобнай, верацёнападобнай ціншай формы дыяметрам ад 0,5 прыкладна да 2 см, зробленае з металу, бурштыну, шкла, якія маглі насіць ў каралях або прышываць да вопраткі.

**Пераплут —** Бог хмельнага вяселля ўсходніх славянаў.

**Племя** — Трывалае аб’яднанне некалькіх родаў, якія звязаны агульнасцю паходжання.

**Прашча —** Старажытная зброя-рэмень, з дапамогай якой кідалі камень ці металічны шар.

**Прытча —** Іншасказальнае апавяданне з павучальнай высновай, часцей рэлігійнага зместу.

**Пярсценак—** Аздабленне жалезнага веку круглай ці спіралепадобнай формы дыяметрам ад 1,5 да 2 см, зробленае з металічнай пласціны шырынёй ад 0,3 да 0,5 см.

**Пярун —** Бог грому, маланкі, вайны, вярхоўнае бажаство ўсходніх славян.

**Радавая абшчына** — Аб’яднанне кроўных сваякоў, якія мелі агульную ўласнасць і вялі калектыўную гаспадарку.

**Радовіч —** Свабодны, але збяднелы смерд у ўсходніх славян, які на дагаварных ўмовах працаваў у гаспадарцы феадала.

**Род** — Аб’яднанне людзей аднаго паходжання, якое лічылалася спачатку па мацярынскай лініі ад адной родапачынальніцы, і з’яўлялася ўласнікам пэўнай тэрыторыі.

**Род —** Бог неба ўсходніх славянаў, які спарадзіў усё на зямлі.

**Саюз плямёнаў —** Тып часовага аб’яднання плямёнаў, заснаваны на дагаворы і пэўных абавязках іх у адносінах адзін другога.

**Сварог —** Бог агню ўсходніх славян.

**Святавіт —** Бог вайны ўсходніх славян.

**Свяцілішча —** Язычніцкае культавае збудаванне, месца правядзення абрадаў і ахвярапрынашэнняў.

**Смерды —** Несвабодныя ці паўсвабодныя княскія даннікі ва ўсходніх славян ў IX — XI стст., якія сядзелі на зямліі неслі павіннасці на карысць князя.

**Стаянка—** Пасяленне першабытнага чалавека перыяду каменнага веку.

**Стрыбог —** Бог вятроў усходніх славян.

**Сукаватка—** Прымітыўная цяглавая прылада для рыхлення глебы і згортвання ў яе насення.

**Суседская абшчына—** Тып абшчыны, для якой былі ўласцівы прыватная ўласнасць і індывдуальная гаспадарка.

**Удзел —** Састаўная частка буйных вялікіх княстваў, якой кіраваў хто-небудзь з членаў вялікакняскай сям'і.

**Фрэска —** Роспіс вадзянымі фарбамі па свежай тынкоўцы, звычайна ў культавым будынку.

**Халопы —** Катэгорыя людзей ў складзе чэлядзі, вядомая ва ўсходніх славян ў XI — XIII стст., якая была пазбаўлена асабістай свабоды.

**Хорс —** Славянскае бажаство сонечнага святла.

**Чурынгі—** Пласціны з біўняў маманта, аздобленыя геаметрычнымі арнаментамі (паралельныя лініі, зігзагі, шасцівугольнікі), якія выкарыстоўваліся ў магічных мэтах.

**Чэлядзь —** Катэгорыя насельніцтва ў усходніх славян, якая знаходзілася ў залежнасці ад феадала, працавала на яго і палажэнне якой было вельмі цяжкім.

**Язычніцтва —** Сістэма рэлігійных вераванняў, для якой уласцівы адухатварэнне розных прыродных з'яў і пакланенне ім.

## ГІСТАРЫЧНЫЯ ПЕРСАНАЛІІ

**Брачыслаў** – полацкі князь з 1003 г. па 1044 г., сын Ізяслава Уладзіміравіча, унук Рагнеды і Уладзіміра Святаславіча. Першы князь адроджанай полацкай дынастыі Рагвалодавічаў. Пашырыў межы Полацкага княства, далучыў землі паміж Заходняй Дзвіной і Дзісной, дзе заснаваў горад Браслаў.

**Еўфрасіння Полацкая** (свецкае імя Прадслава) – полацкая князёўна, унучка Усяслава Чарадзея, асветніца, ігумення манастыра св. Спаса ў Полацку, першая жанчына на Русі, якая была кананізавана ў святыя.

**Ізяслаў Уладзіміравіч** – полацкі князь з 988 г., сын кіеўскага князя Уладзіміра і полацкай князёўны Рагнеды. Узнавіў полацкую дынастыю. Паводле летапіснай легенды, за заступніцтва за маці хлопчык Ізяслаў быў разам з ёю адасланы бацькам на Полаччыну ў пабудаваны для іх г. Ізяслаў (цяпер г. Заслаўе пад Мінскам). Даследчыкі мяркуюць, што пры ім адбылося прыняцце хрысціянства на Полацкай зямлі, створана адно з першых епіскапстваў (992 гг.), уведзена пісьменства.

**Кірыла і Мяфодзій** – славянскія асветнікі, стваральнікі славянскай азбукі, прапаведнікі хрысціянства. Кананізаваны праваслаўнай і каталіцкай царквамі. Свята 11 мая старога стылю ў Балгарыі, а з 1986 г. у славянскіх рэспубліках былога СССР, у тым ліку ў Беларусі, адзначаецца як дзень славянскага пісьменства і культуры. У Мінскай Святадухаўскай царкве ёсць прытвор Кірылы і Мяфодзія, дзейнічае Кірыла-Мяфодзіеўскае брацтва.

**Кірыла Тураўскі** – епіскап, славуты пісьменнік, прапаведнік, царкоўны дзеяч, майстар аратарскай прозы. Захавалася каля 70 твораў К. Тураўскага розных жанраў: малітвы, павучанні, прытчы, каноны. Ужо ў пачатку XIII ст. шанаваўся як святы (пра афіцыйную яго кананізацыю звестак няма).

**Лазар Богша** – полацкі майстар ювелір XII ст., вольны рамеснік. У 1161 г. стварыў па заказу полацкай князёўны Еўфрасінні – шэдэўр дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларусі – крыж Еўфрасінні Полацкай. Крыж шасціканцовы (даўжыня 51 см.), аснова яго драўляная. На пярэдняй і адваротнай плоскасці прымацавана па 11 залатых пласцін, аздобленых перагародчатымі каляровымі эмалямі з выявамі святых, каштоўнымі камянямі. Бакі крыжа абкладзены сярэбранымі пазалочанымі пласцінамі. На іх прасечаны надпіс, у якім паведамляецца гісторыя стварэння рэліквіі, дата, імя майстра. Да 1941 г. зберагаўся ў Магілёўскім краязнаўчым музеі, а потым страчаны.

**Рагвалод** – першы гістарычна вядомы полацкі князь. Паводле летапісаў, прыйшоў «з-за мора». Заваяваў наўгародскія воласці, за што ў 980 г. быў забіты разам з жонкаю і 2 сынамі наўгародскім князем Уладзімірам Святаславічам.

**Рагнеда** – полацкая князёўна, дачка князя Рагвалода. Пасля захопу Полацка вымушана была стаць жонкай князя Уладзіміра. Маці князёў Ізяслава і Яраслава Мудрага. Пасля высылкі з Кіева на радзіму пастрыглася ў манахіні пад імем Анастасіі.

**Рурыкавічы** – назва прадстаўнікоў правячай дынастыі ў княствах Кіеўскай Русі ў X–XIII стст. і княжацкіх родах, што паходзілі ад Рурыка. Мяркуецца, што пачынальнік рода. – варажскі князь Рурык, быў прызваны на княжанне наўгародцамі ў 862 г.

**Уладзімір Святаславіч** – князь наўгародскі з 969 г., потым кіеўскі, брат Яраполка. Каля 980 г. захапіў Полацк і Кіеў. У 988 – 989 гг. увёў на Русі хрысціянства як дзяржаўную рэлігію. У гады яго княжання Кіеўская Русь дасягнула высокага палітычнага, эканамічнага і культурнага ўзроўню. У канцы княжання пачалі з’яўляцца прыкметы раздробленасці Кіеўскай Русі.

Кананізаваны праваслаўнай царквой. У народнай памяці застаўся шчодрым князем, якога ўслаўляюць быліны і называюць «Красное солнышко».

**Усяслаў Брачыслававіч** – князь полацкі з 1044 г. Змагаўся з кіеўскімі князямі за самастойнасць і незалежнасць Полацкага княства, у час Кіеўскага паўстання 1068 – 1069 гг. 7 месяцаў быў вялікім князем кіеўскім. У гады яго княжання Полацкае зямля дасягнула найвышэйшай магутнасці. Пабудаваў Полацкі Сафійскі сабор. За рашучасць, розум і энергію празваны Чарадзеем.

## ЛІТАРАТУРА:

1. Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2011. – Т. 2 : Л–Я.
2. Археалогія Беларусі : энцыклапедыя. У 2 т. Т. 1. А-К / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. Ю. У. Каласоўскі. – Мінск, 2009.
3. Гісторыя Беларусі: у 2 ч. / пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. – Мінск, 2007.
4. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветных цывілізацый / пад рэд. В. І. Галубовіча, Ю. М. Бохана. – Мінск, 2007.
5. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2000-2006. – Т. 1: Старажытная Беларусь: ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст.
6. Ковкель, И. И. История Беларуси с древнейших времен до нашего времени / И. И. Ковкель, Э. С. Ярмусик. – Минск, 2006.
7. Трещенок, Я. И. История Беларуси: учеб. пособие: в 2 ч. / Я. И. Трещенок. – Могилев, 2004. – Ч. 1: Досоветский период.
8. Эканамічная гісторыя Беларусі: вучэб. дапам. / пад рэд. В. І. Галубовіча. – Мінск, 1999.
9. Чарняўскі, М. М. Ілюстраваная гісторыя старадаўняй Беларусі: першабытны перыяд. – Мінск, 2003.
10. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск, 1993 – 2003.
11. Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. – Мінск, 1989.

## ТЭМЫ РЭФЕРАТАЎ

1. Засяленне славянамі тэрыторыі Беларусі.
2. Старажытны Полацк – бацька гарадоў беларускіх.
3. Рагнеда – Гарыслава – Анастасія.
4. Усяслаў Чарадзей – славуты князь Полацкай зямлі.
5. Асоба Усяслава Брачыславіча Чарадзея па раману Леаніда Дайнекі “След ваўкалака”.

6. Вобразы палачан у аповесці В. Іпатавай “За морам Хвалынскім”.
7. Рэканструкцыя штодзённага жыцця насельніцтва Беларусі пачатку XIII ст. па раману Леоніда Дайнека “Меч князя Вячкі”.
8. Прыняцце хрысціянства і візантыйскі ўплыў на культуру беларускіх зямель.
9. Жыццёвы шлях і асветніцкая дзейнасць Еўфрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага.
10. Архітэктурныя збудаванні на тэрыторыі Беларусі XI – XIIIстст.
11. Барацьба нашых продкаў з іншаземнымі захопнікамі ў канцы XII – пачатку XIII ст .

**Семінар 2. Беларускія землі ў складзе ВКЛ (XIII-XVI стст.)**

1. Стварэнне Вялікага Княства Літоўскага. Шляхі ўваходжання славянскіх зямель у ВКЛ і іх правы.
2. Знешняя палітыка ВКЛ ў XIV–XVI стст. і яе асноўныя накірункі.
3. Эканамічнае развіццё беларускіх зямель ў складзе ВКЛ(XIV–XVI стст.).
4. Дзяржаўна-палітычны лад ВКЛ.
5. Культура Беларусі ў другой палове XIII – першай палове XVI ст.

## ХРАНАЛОГІЯ

**Каля 1230–1263 гг.** – княжанне ў Новагародку (Навагрудку) вялікага князя Міндоўга. Заснаванне дзяржавы – Вялікага Княства Літоўскага.

**1253 г.** – хрышчэнне князя Міндоўга ў каталіцтва і каранаванне яго каралём Літвы ў г. Навагародку.

**1264–1266 гг.** – княжанне ў Вялікім Княстве Літоўскім вялікага князя Войшалка (сына Міндоўга).

**1267 г.** – першае ўпамінанне пра г. Магілёў (“Магілёўскя хроніка“).

**1267–1270 гг.** – княжанне ў Вялікім Княстве Літоўскім вялікага князя Шварна Данілавіча.

**1270–1282 гг.** – княжанне ў Вялікім Княстве Літоўскім вялікага князя Трайдэна (Трайдзеня).

**1293 – 1316 гг**. – княжанне ў Вялікім Княстве Літоўскім вялікага князя Віценя.

**XIII ст**. – на балцкіх землях, не захопленых крыжакамі, выдзяляюцца дзве вялікія вобласці – Аўкштайція (Сярэдняе і Верхняе Панямонне, у тым ліку і тэрыторыя цяперашняй Гродзенскай вобласці) і Жамойць (Ніжняе

Панямонне каля Балтыйскага мора). Адзін з раёнаў Аўкштайцii – Літва – стаў цэнтрам аб'яднання балцкiх плямён.

**XIII ст**. – напісанне Аршанскага Евангелля.

**1307 г.** – далучэнне да ВКЛ (па дагавору "раду") Полацкай зямлі на правах аўтаноміі.

**1315 г.** – далучэнне да Вялікага Княства Літоўскага Берасцейскай зямлі.

**1316–1341 гг.** – княжанне ў Вялікім Княстве Літоўскім вялікага князя Гедыміна.

**1323 г.** – перанос Гедымінам сталіцы ВКЛ з Навагародкаў Вільню.

**1320 г.** – далучэнне да Вялікага Княства Літоўскага Віцебскага княства.

**1320-1330 гг.** – далучэнне да Вялікага Княства Літоўскага Турава-Пінскай зямлі.

**1345–1377 гг.** – княжанне ў Вялікім Княстве Літоўскім вялікага князя Альгерда (сумесна з братам Кейстутам).

**1362 (1363 г).** – бітва з мангола-татарамі на р. Сінія Воды (Падольская зямля на Украіне), далучэнне да ВКЛ Кіеўскай, Чарнігава-Северскай, Падольскай, Валынскай і Пераяслаўскай зямель.

**1377–1392 гг.** – княжанне ў Вялікім Княстве Літоўскім вялікага князя Ягайлы.

**1380 г., 8 верасня** – Кулікоўская бітва паміж войскамі Залатой Арды і вялікага князя Маскоўскага Дзмітрыя Іванавіча (Данскога). Паражэнне татар. Удзел у Бітве ўзялі Андрэй і Дзмітрый Альгердавічы.

**1385 г., 14 жніўня** – падпісанне Крэўскай уніі паміж ВКЛ і Польшчай, згодна з якой Ягайла прыняў каталіцтва і абавязваўся аб'яднаць Польшчу з Літвою, ахрысціць язычнікаў Жамойціі і Аўкштайціі, даць правы на валоданне і поўнае распараджэнне зямлёй феадалам-католікам, узяўшы шлюб з польскай каралевай Ядзвігай.

**1387 г**. – утварэнне Віленскага біскупства.

**1387 г**. – Вільня атрымала Магдэбургскае права.

**1387 г**. – прывілей Ягайлы, які юрыдычна замацоўваў палітычныя і эканамічныя правы феадалаў каталіцкага веравызнання.

**1390 г.** – Брэст атрымаў Магдэбургскае права.

**1392 г.** – падпісанне Востраўскага пагаднення паміж Ягайлам і Вітаўтам аб падзеле ўлады.

**1392-1430 гг.** – княжэнне ў Вялікім Княстве Літоўскім вялікага князя Вітаўта.

**1399 г.** – паражэнне войска Вітаўта ад татар у бітве на р. Воркслe.

**1409–1411 гг.** – "Вялікая вайна" паміж ВКЛ, Польшчай, з аднаго боку, і Тэўтонскім ордэнам – з другога.

**1410 г., 15 ліпеня** – Грунвальдская бітва – разгром Тэўтонскага ордэна аб'яднанымі войскамі ВКЛ і Польскага каралеўства.

**1413 г.** – Гарадзельская ўнія (Гарадельскі прывілей), па якой было дэкларавана выключнае права феадалаў-католікаў займаць дзяржаўныя пасады ў ВКЛ.

**1430 – 1432 гг.** – княжанне ў Вялікім Княстве Літоўскім вялікага князя Свідрыгайлы.

**1432–1436 гг.** – грамадзянская вайна ў ВКЛ, у часе якой дзяржава часова была падзелена на Вялікае Княства Літоўскае з цэнтрам у г. Вільні і Вялікае Княства Рускае з цэнтрам у г. Полацку. (1435 – бітва пад г. Вількамірам – паражэнне вялікага князя Свідрыгайлы).

**1432–1440 гг.** – княжанне ў Вялікім Княстве Літоўскім вялікага князя Жыгімонта Кейстутавіча.

**1440–1492 гг.** – княжанне ў Вялікім Княстве Літоўскім вялікага князя Казіміра IV Ягелончыка (сына Ягайлы і Софьі Гальшанскай).

**1441 г.** – Слуцк атрымаў Магдэбургскае права.

**1447 г.** – прыняццё агульназемскага прывілея Казіміра IV, якім былі замацаваны шырокія правы баяр ВКЛ у палітычным, сацыяльным і эканамічным жыцці дзяржавы. Прывілей паклаў пачатак юрыдычнаму афармленню асабістай залежнасці сялян ад феадалаў.

**1449 г.** – пагадненне паміж ВКЛ і Вялікім Княствам Маскоўскім. За ВКЛ прызнавалася права на Смаленшчыну, княствы ў вярхоўях р. Акі.

**1468 г.** – выдадзены Судзебнік вялікага князя Казіміра – першы кодэкс крымінальна-працэсуальнага права ў ВКЛ, складзеным на аснове мясцовага звычаёвага права і судова-адміністрацыйнай практыкі.

**Каля 1470 –каля 1533 г.** – жыццё і дзейнасць М. Гусоўскага, аўтара напісанай на лацінскай мове "Песні пра зубра" (1523 г.).

**Каля 1490 – каля 1551 г.** – жыццё і дзейнасць Ф. Скарыны, беларускага і ўсходнеславянскага першадрукара.

**1498 г**. – Полацк атрымаў Магдэбургскае права.

**1499 г**. – Менск атрымаў Магдэбургскае права.

**1492–1506 гг.** – княжанне ў Вялікім Княстве Літоўскім вялікага князя Аляксандра.

**1492 г.** – прывілей Аляксандра аб правядзенні ўнутраннай і знешняй палітыкі ВКЛ толькі са згоды Рады.

**1492-1494 гг.** – першая адкрытая вайна паміж ВКЛ і Вялікім Княствам Маскоўскім у серыі міждзяржаўных войн канца XV – першай паловы XVI ст. Была ўстаноўлена новая мяжа паміж дзяржавамі. Права на Вяземскае княства і княствы ў вярхоўях р. Акі прызнана за Маскоўскай дзяржавай. ВКЛ адмовілася ад прэтэнзій на гарады Ноўгарад, Пскоў, Разань, Цвер.
**1500-1503 гг. –** другая вайна паміж ВКЛ і Вялікім Княствам Маскоўскім у серыі міждзяржаўных войн канца XV – першай паловы XVI ст. ВКЛ страціла гарады Бранск, Веліж, Гомель, Дарагабуж, Любеч, Мцэнск, Ноўгарад-Северскі, Пуціўль, Старадуб, Хоцім, Чарнігаў і інш.
**1506 г., 5 жніўня** – разгром войскамі ВКЛ пад камандваннем М. Глінскага войска крымскіх татар.
**1506–1548 гг.** – княжанне ў Вялікім Княстве Літоўскім вялікага князя Жыгімонта I Старога.
**1506-1508 гг.** – трэцяя вайна паміж ВКЛ і Вялікім Княствам Маскоўскім у серыі міждзяржаўных войн канца XV – першай паловы XVI ст. Скончылася падпісаннем пагаднення аб “вечным міры”, у якім былі падцверджаны межы, што былі зафіксаваны ў папярэдніх міждзяржаўных пагадненях.
**1508 г.** – мяцеж Глінскіх – групоўкі феадалаў ВКЛ, якіх узначальваў М. Глінскі.
**1512-1522 гг.** – чацвёртая вайна паміж ВКЛ і Вялікім Княствам Маскоўскім у серыі міждзяржаўных войн канца XV – першай паловы XVI ст. ВКЛ страціла г. Смаленск, які апынуўся ў складзе Маскоўскай дзяржавы.
**1514 г., 8 верасня** – паражэнне маскоўскіх войскаў пад г. Орша. Войска ВКЛ ўзначальваў К. Астрожскі.
**1517 г., 6 жніўня** – выданне Ф. Скарынай у Празе першай беларускай і ўсходнеславянскай кнігі “Псалтыр”.
**1517 г**. – выступленне прафесара Вітэнбергскага ўніверсітэта Марціна Лютэра, пачатак рэфармацыйнага руху ў Еўропе, які завяршыўся афармленнем пратэстантызму.
**1522-1525 гг.** – друкарская дзейнасць Ф. Скарыны ў Вільні (у 1522 г. выйшла “Малая падарожная кніжыца”, у 1522 г. – “Апостал”).
**1523 г. –** выданне М. Гусоўскім на лацінскай мове “Песні пра зубра”.
**1529 г. –** прыняцце Першага Статута ВКЛ.
**1529 г.** – узнікненне тэрміна “пратэстантызм”, пасля таго, як некалькі князёў і група гарадоў Свяшчэннай Рымскай імперыі выступілі з

пратэстам супроць рашэння імператара аб забароне далейшага распаўсюджаня некаталіцкіх хрысціянскіх рухаў.

**1530-1593 гг.** – жыццё і дзейнасць Сымона Буднага – беларускага гуманіста, асветніка, рэлігійнага рэфарматара, філосафа, аднага з заснавальнікаў Нясвіжскай друкарні, дзе ён выдаў у 1562 г. на старабеларускай мове "Катэхізіс".

**1534 г.** – іспанскі шляхціц Ігнацій Лаёла заснаваў для барацьбы з Рэфармацыяй каталіцкі манаскі ордэн Таварыства Ісуса (езуіты).

**1534-1537 гг**. – пятая вайна паміж ВКЛ і Вялікім Княствам Маскоўскім у серыі міждзяржаўных войн канца XV – першай паловы XVI ст. Гомелская зямля вярталася да ВКЛ, а Себеж і Завалочча пераходзілі да Маскоўскай дзяржавы.

**1548–1572 гг.** – княжанне ў Вялікім Княстве Літоўскім вялікага князя Жыгімонта II Аўгуста (сына Жыгімонта Старога).

**Каля 1540-1599 гг. –** жыццё і дзейнасць Васіля Цяпінскага – беларускага пісьменніка, гуманіста, кнігавыдаўца. В. Цяпінскі стварыў друкарню, дзе ў 1570-1580-я гг. выдаў паралельна на царкоўна-славянскай і беларускай мовах перакладзенае ім "Евангелле" з уласнай прадмовай.

## ТЭРМІНАЛАГІЧНЫ СЛОЎНІК

**Ваяводствы** – адміністратыўна-тэрытарыяльныя адзінкі ў ВКЛ. З'явіліся ў 1413 г. пасля рэформы Вітаўта. На чале ваяводства стаяў ваявода. Дзяліліся на больш дробныя адзінкі – паветы і воласці. Галоўнай асобай у ваяводстве быў ваявода, які ўзначальваў тут адміністрацыйныя, гаспадарчыя, ваенныя і судовыя органы. Назначаўся ваявода вялікім князем і Радаю пажыццёва з ліку заможных і знатных феадалаў, ураджэнцаў ВКЛ. Ваявода ўваходзіў у склад Рады і быў абавязаны прысутнічаць на пасяджэннях сойма. Бліжэйшымі памочнікамі ваяводы былі: кашталян – па ваенных справах; падваявода – па адміністрацыйна-судовых; ключнік – наглядаў за зборам даніны і чыншаў; гараднічы – камендант замка, які клапаціўся аб яго рамонце і ўтрыманні.

**Гетман найвышэйшы** – камандаваў узброенымі сіламі дзяржавы, калі на чале іх не стаяў сам вялікі князь. У час ваенных дзеянняў ён меў самыя шырокія паўнамоцтвы адносна ўсіх падначаленых асоб, у тым ліку права караць вінаватых. Яго намеснікам быў гетман польны, той, хто ўзначальваў войска ў паходзе.

**Жэмайція (Жмудзь, Жамойція)** – тэрыторыя цэнтральнай і заходняй часткі сучаснай Літвы, дзе адбываўся працэс утварэння літоўскага этнасу. Доўгі час Жэмайція была арэнай барацьбы з крыжакамі.

**Залатая Арда** – дзяржава, што існавала ў сярэдзіне XIII – XV стст., створана нашчадкамі мангольскага хана Чынгісхана са сталіцай ў г. Сарай (Ніжняе Паволжжа). У перыяд найбольшай магутнасці ўключала ў свой склад Сярэднюю Азію, Паўночны Каўказ, палавецкія стэпы. Вяла войны з ВКЛ.

**Канцлер** – кіраваў дзяржаўнай канцылярыяй, пад яго наглядам ажыццяўлялася падрыхтоўка законапраектаў, прывілеяў, грамат і іншых дакументаў з дзяржаўнай канцылярыі. У яго знаходзілася вялікая дзяржаўная пячатка, без якой ніводзін закон не мог уступіць у сілу. Канцлер падпісваў і найважнейшыя дзяржаўныя акты. Яму падпарадкоўваліся шматлікія пісары, дзякі, талмачы. У канцылярыі пісьмова на старажытнабеларускай мове (з 1696 г. – на польскай) афармляліся ўсе пастановы і распараджэнні князя і Рады. Дакументы, што выходзілі з канцылярыі і прыходзілі туды, запісваліся ў асобныя кнігі, якія называліся Літоўскай Метрыкай.

**Літва** – у XIII ст. гістарычная назва тэрыторыі Верхняга Панямоння. Балцкая тэрыторыя, але ў значнай ступені каланізаваная славянамі. Знаходзілася ў цэнтры фарміравання Вялікага Княства Літоўскага, да якога перайшла назва.

**Магдэбургскае права** – права феадальнага горада на самакіраванне, паводле якога эканамічная дзейнасць, маёмасныя правы, грамадска-палітычнае жыццё, саслоўны стан гараджан рэгуляваліся ўласнай сістэмай юрыдычных нормаў. Па магдэбургскаму праву гараджане вызваляліся ад феадальных павіннасцей, ім гарантаваліся свабодныя заняткі рамяством, гандлем, земляробствам і дазвалялася выбіраць свой орган улады – магістрат, суд, ствараць рамесныя аб'яднанні – цэхі.

**Маршалак земскі** – старшынстваваў на пасяджэннях сойма і Рады, абвяшчаў пастановы гаспадара і Рады на гэтых пасяджэннях, быў даглядчыкам за парадкам і этыкетам пры двары і падчас афіцыйных цырымоній кіраваў прыёмам замежных паслоў, дапускаў да гаспадара просьбітаў са скаргамі і чалабітнымі, судзіў за злачынствы, зробленыя на сойме.

**Масква – Трэці Рым** – ідэалагічная формула, з дапамогай якой вялікія князі маскоўскія абгрунтоўвалі свае прэтэнзіі на землі ВКЛ, населеныя праваслаўнымі, якіх яны лічылі сваімі падданымі. Згодна з гэтай канцэпцыяй

Масква з’яўляецца пераемніцай Рымскай імперыі і Візантыі (першага і другога Рыму) і адзінай праваслаўнай дзяржавай.

**Пагоня** – 1) усеагульны збор войска ў ВКЛ; 2) назва герба ВКЛ.

**Падскарбій земскі** – даглядчык дзяржаўнай казны, выконваў абавязкі міністра фінансаў, вёў улік дзяржаўных прыбыткаў і выдаткаў, наглядаў за спагнаннем натуральных і грашовых падаткаў і збораў.

**Паны-рада** – вышэйшы орган улады ў ВКЛ. У склад рады ўваходзілі вышэйшыя службовыя асобы дзяржавы (канцлер, маршалак земскі, гетман найвышэйшы, ваяводы і інш.), а таксама прадстаўнікі каталіцкага духавенства і найбуйнейшыя феадалы. Узнікла як дапаможны орган пры вялікім князі, у канцы XV ст. набыла большую самастойнасць. Да кампетэнцыі Рады належалі: выбранне вялікага князя, абарона дзяржавы, міжнародныя справы, выданне законаў, разгляд найважнейшых судовых спраў. Для вырашэння неадкладных пытанняў існавала тайная рада (віленскі біскуп, віленскія ваявода і кашталян, трокскія ваявода і кашталян).

**Сойм** – саслоўна-прадстаўнічы орган улады ВКЛ і Польшчы. Складаўся з прадстаўнікоў шляхты. На вальны (агульна-дзяржаўны) сойм збіраліся: вялікі князь, службовыя асобы цэнтральнага і мясцовага кіравання, буйныя феадалы, якія ўваходзілі ў паны-раду, каталіцкія і праваслаўныя біскупы. З 1566 г. у склад сойма выбіраліся таксама па 2 прадстаўнікі ад кожнага павета. Да кампетэнцыі вальнага сойма належылі: выбранневялікага князя, справы вайны і міру, узаемаадносіны з іншымі краінамі, устанаўленне падаткаў і рэгуляванне заканадаўства. Сойм абмяжоўваў уладу вялікага князя і паноў-рады, паступова яго роля ў кіраванні ВКЛ узрастала. Акрамя вальнага збіраліся павятовыя і ваяводскія соймікі.

**Тэўтонскі ордэн**– ваенна-рэлігійная арганізацыя нямецкіх рыцараў. Створана ў XII ст. у Палесціне. Ордэн быў запрошаны мазавецкім князем Конрадам у 1230 г. у Прыбалтыку для барацьбы з прусамі. Заваяваўшы прусаў, стварыў у Прыбалтыцы сваю дзяржаву. Вёў працяглыя войны з ВКЛ.

**Харугва** – баявая адзінка ў арміях сярэднявечча, уключала ў свой склад ад 60 да 600 копій.

**Чорная Русь** – гістарычная вобласць у басейне Верхняга і Сярэдняга Нёмана. На мяжы I і II тыс. н.э. заселена і каланізавана славянамі. На тэрыторыі Чорнай Русі ў XII ст. узнікла Гарадзенскае княства, пазней – Навагародскае, Ваўкавыскае і г.д. Адыграла ролю цэнтральнай часткі, вакол якой ішло ўтварэнне Вялікага Княства Літоўскага. Буйнейшы горад Чорнай Русі Навагародак быў першай сталіцай ВКЛ.

## ГІСТАРЫЧНЫЯ ПЕРСАНАЛІІ

**Альгерд** – вялікі князь ВКЛ. Кіраваў сумесна з братам Кейстутам. Павялічыў тэрыторыю дзяржавы ў 2 разы. Вёў войны з татарамі і Масквою.

**Вітаўт** – вялікі князь ВКЛ. Праводзіў цэнтралізатарскую палітыку. Пры кіраванні Вітаўта ВКЛ дасягнула найбольшай магутнасці.

**Віцень** – вялікі князь ВКЛ. У 1293 г. сеў на вялікакняжацкі трон. Веў барацьбу з крыжакамі. Праводзіў цэнтралізатарскую палітыку. Пачаў выкарыстоўваць «Пагоню» як дзяржаўны герб ВКЛ.

**Войшалк** – старэйшы сын Міндоўга, князь Навагародка. Выдае сястру замуж за валынскага князя Шварна, а сам прымае праваслаўе і становіцца манахам. Пасля забойства Міндоўга пачаў барацьбу супраць змоўшчыкаў. Разам з навагародцамі і саюзнымі пінянамі заваяваў удзелы сваіх ворагаў і пачаў княжыць у Вялікім Княстве Літоўскім. У 1267 г. годзе быў забіты галіцка-валынскімі князямі.

**Гедымін** – вялікі князь ВКЛ. У 1323 г. перанс сталіцу ВКЛ Вільню. Пачаў будаўніцтва каменных замкаў, абараняўшых землі ВКЛ ад крыжакоў. Пры Гедыміне ў склад ВКЛ увайшла большая частка зямель сучаснай Беларусі.

**Іван III** – вялікі князь маскоўскі. Аб’яднаў землі Паўночна-Усходняй Русі ў адзіную дзяржаву. Пачаў серыю войн з ВКЛ за гегемонію ва Усходняй Еўропе.

**Канстанцін Астрожскі** – вялікі гетман ВКЛ, удзельнік войн ВКЛ з Масквою. Перамог войскі вялікага князя маскоўскага Васіля III пад г. Орша ў 1514 г. З’яўляўся мецэнатам і падтрымліваў праваслаўную царкву ў ВКЛ.

**Міндоўг** – першы вялікі князь ВКЛ, з’яўляўся адначасова і князем Навагародка, які ён зрабіў сваѐ й сталіцай. У 1253 г. прыняў каталіцтва і каранаваўся каралеўскай каронай. Вёў барацьбу з галіцка-валынскімі князямі і крыжакамі. Быў забіты ў выніку змовы.

**Ягайла** – вялікі князь ВКЛ, кароль Польшчы. У 1385 г. заключыў з Польшчай Крэўскую ўнію. Па выніках Востраўскага пагаднення 1392 г. вымушаны быў саступіць вялікакняжацкі стол Вітаўту. Галоўнакамандуючы аб’яднанай арміі Польшчы і ВКЛ пад час Вялікай вайны з Тэўтонскім ордэнам (1409 – 1411).

## ЛІТАРАТУРА

1. Беларускія летапісы і хронікі. – Мінск, 1997.

2. Вішнеўскі, А. Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах / А. Ф. Вішнеўскі, Я. А. Юхо. – Мінск, 2003.
3. Вялікае Княства Літоўскае. Энцыклапедыя: у 2 т. – Мінск, 2005; 2006.
4. Гісторыя Беларусі: у 6 т. – Мінск, 2000–2006. – Т. 2: Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.].
5. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пач.XXI ст.: у 2 кн. – Кн. 1 / А. А. Каваленя [і інш.]. Рэд.кал. А. А. Каваленя [і інш.]. – Мінск, 2011.
6. Дзмітрачкоў, П. Ф. Беларусь у складзе Вялікага княства Літоўскага (другая палова XIII – першая палова XVII ст.). – Магілёў, 2003.
7. Иллюстрированная хронология истории Беларуси. – Минск, 1998.
8. Кушнярэвіч, А. М. Мураваная дабастыённая фартыфікацыя Вялікага Княства Літоўскага. – Мінск, 2011.
9. Мысліцелі і асветнікі Беларусі: Энцыкл. Даведнік. – Мінск, 1995.
10. Падокшын, С. А.Беларуская думка ў кантэксце гісторыі і культуры. – Мінск, 2003.
11. Рэлігія і царква на Беларусі: энцыклапед. даведнік. – Мінск, 2001.
12. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г: Тэкст. Даведнік. Каментарыі. – Мінск, 1989.
13. Францыск Скарына і яго час. Энцыклапедычны даведнік. – Мінск, 1988.
14. Хрестоматия по истории Белоруссии. С древнейших времен до 1917 г. – Минск, 1977.
15. Цітоў, А.К. Краіна майстроў : рамесныя цэхі Беларусі, 16 – канец 18 ст. – Мінск, 2013.
16. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск, 1993 – 2003.
17. Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. – Мінск, 1989.

## ТЭМЫ РЭФЕРАТАЎ

1. Крэўская ўнія і яе вынікі. Ягайла і Вітаўт.
2. Вялікі князь Вітаўт і яго дзяржаўна-палітычная дзейнасць.
3. Грунвальдская бітва і яе значэнне.
4. Адносіны паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Маскоўскай дзяржавай у канцы XV – першай палове XVI стст.
5. Кнігадрукаванне: Ф. Скарына і яго паслядоўнікі.

6. Беларуска-літоўскія летапісы як гістарычна-літаратурныя творы.
7. Беларускае сярэднявечча – “краіна замкаў”.
8. Культавае будаўніцтва на Беларусі ў XIII – XVI стст.
9. Паходжанне назвы “Белая Русь”.

## Семінар 3. Беларусь у складзе Рэчы Паспалітай (1569 г. – канец XVIII ст.)

1. Люблінская ўнія і стварэнне Рэчы Паспалітай.
2. ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай. Унутраная і знешняя палітыка ў канцы XVI – пачатку XVII стст. Войны сярэдзіны XVII ст. і іх наступствы для Беларусі.
3. Рэлігійная сітуацыя на беларускіх землях.
4. Палітычны крызіс у Рэчы Паспалітай (канец XVII – XVIII ст. Прычыны і спробы рэформ. Падзелы Рэчы Паспалітай.
5. Культура Беларусі ў XVII–XVIII стст.

## ХРАНАЛОГІЯ

**1550 г.** – пачатак распаўсюджання ў Беларусі ідэй Рэфармацыі.

**1533 г.** – заснаванне ў Брэсце кальвінісцкай абшчыны, першай пратэстанцкай абшчыны на тэрыторыі Беларусі.

**1557 г.** – прыняцё “Уставы на валокі”. Пачатак усталявання фальваркапаншчыннай сістэмы.

**1557-1633 гг.** – жыццё і дзейнасць Льва Іванавіча Сапегі, вядомага дзяржаўнага дзеяча ВКЛ.

**1558–1583 гг.** – Лівонская (Інфлянцкая) вайна паміж ВКЛ, Лівоніяй, Польшчай і Швецыяй, з аднаго боку, і Рускай дзяржавай – з другога, за Прыбалтыку, Беларусь і выхад да Балтыйскага мора.

**1562 г. –** Сымон Будны выдаў у г. Нясвіжы першую ў межах Беларусі друкаваную кнігу на старабеларускай мове – “Катэхізіс”.

**1563 г., 15 лютага** – войскі Івана Грознага захапілі г. Полацк.

**1563 г. –** Віленскі прывілей Жыгімонта II Аўгуста аб ураўнані ў правах хрысціянскай шляхты ВКЛ незалежна ад веравызнаня.

**1564 г., 26 студзеня –** войска ВКЛ пад камандваннем гетмана Мікалая Радзівіла Рудога нанесла паражэнне рускім войскам пад камандваннем ваяводы Пятра Шуйскага ў бітве на р. Уле каля Чашнікаў.

**1565 г.** – адміністрацыйная і судовая рэформы ў ВКЛ. Дзяржава падзялялася на ваяводствы, паветы і воласці. Беларускія землі ўваходзілі ў склад Віленскага, Віцебскага, Берасцейскага, Менскага, Мсціслаўскага, Навагрудскага, Полацкага і Трокскага ваяводстваў. Уводзіліся павятовыя соймікі і павятовыя суды. На тэрыторыі Беларусі было 16 паветаў.

**1566 г.** – прыняцце Другога Статута ВКЛ.

**1569 г., 1 ліпеня** – падпісанне Люблінскай уніі – пагадненння аб дзяржаўна-палітычным саюзе ВКЛ з Польшчай, паводле якога ўтварылася федэратыўная дзяржава – Рэч Паспалітая.

**1569 г.** – Віленскі біскуп Валер'ян Пратасевіч запрасіў ў ВКЛ 13 прадстаўнікоў ордэна езуітаў.

**1572-1592 гг**. – жыццё і дзейнасць Мяленція Сматрыцкага.

**1573 г.** – Акт Варшаўскай канфедэрацыі аб свабодзе веравызнаня ў Рэчы Паспалітай.

**1573-1574 гг.** – княжэнне Генрыха Валуа (Валезы), сына французскага караля Генрыха II Валуа. Першы выбраны кароль Рэчы Паспалітай. Падпісаў "Пакта канвента" і "Генрыкавы артыкулы".

**1576-1586 гг.** – кіраванне ў Рэчы Паспалітай Стэфана Баторыя.

**1577 г**. – Пётр Скарга выдаў кнігу "Аб адзінстве царквы божай", дзе прапагандаваў ідэю аднаўлення Фларэнційскай уніі 1439 г.

**1579 г.** – вызваленне г. Полацка войскамі Стэфана Баторыя.

**1579 г.** – заснаванне Віленскай езуіцкай акадэміі (Віленскага ўніверсітэта).

**1582 г.** – Ям-Запольскае перамір'е паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай на 10 годоў, якім завяршалася Лівонская вайна.

**1587-1593 гг.** – пабудова італьянскім архітэктарам Я. М. Бернардоні ў г. Нясвіжы касцёла Божага Цела – першага касцёла ў стыле барока на тэрыторыі ВКЛ.

**1587-1632 гг.** – княжэнне ў ВКЛ Жыгімонта III Вазы.

**1588 г.** – прыняцце III Статута ВКЛ.

**1595-1596 гг.** – казацкія выступленні пад кіраўніцтвам Севярына Налівайкі.

**1596 г.** – Брэсцкая царкоўная ўнія, стварэнне ўніяцкай (грэка-каталіцкай) царквы на тэрыторыі Беларусі і Украіны.

**1600-1629 гг.** – вайна паміж Рэччу Паспалітай і Швецыяй. Завяршылася заключэннем перамір'я ў г. Альтмарку (цяпер г. Новы Тарг у Польшчы) на 6 гадоў.

**1604-1605 гг.** – паходы Ілжэдзмітрыя I у г. Маскву.

**1605 г., 27 верасня** – Кірхгольмская бітва ў час вайны паміж Рэччу Паспалітай і Швецыяй 1600-1629 гг. каля вёскі Кірхгольм (цяпер г. Салалспілс, Латвія). Войска Рэчы Паспалітай на чале з гетманамі К. Радзівілам і Я. Хадкевічам разбіла шведскую армію Карла IX, якая страціла дзве трэці свайго складу.

**1607-1610 гг.** – паход Ілжэдзмітрыя II на Маскву.

**1609-1618 гг.** – вайна паміж Рэччу Паспалітай і Маскоўскай дзяржавай пасля заключэння Васілём Шуйскім ваеннага саюзу са Швецыяй.

**1610 г. –** гетман Станіслаў Жалкеўскі нанёс паражэнне расійска-шведскаму войску каля в. Клушына.

**1610 г., восень** – войскі Рэчы Паспалітай занялі г. Маскву, рускія баяры абралі царом сына Жыгімонта Вазы Уладзіслава IV.

**1612 г. –** другое апалчэнне (першае – 1611 г.) пад кіраўніцтвам К. Мініна і Дз. Пажарскага вызваліла Маскву ад шляхецкіх атрадаў.

**1618 г.** – Дэўлінскае пагадненне на 14,5 гадоў у выніку завяршэння вайны паміж Рэччу Паспалітай і Маскоўскай дзяржавай 1609-1618 гг. Да Рэчы Паспалітай адыйшлі г. Смаленск і Чарнігава-Северскія землі.

**1623 г. –** выступленне жыхароў г. Віцебска супроць гвалтоўнага ўвядзення ўніі. Забойства ўніяцкага архіепіскапа Іасафата Кунцэвіча.

**1632-1648 гг. –** княжанне Уладзіслава IV Вазы.

**1632–1634 гг.** – вайна паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай (Смаленская вайна). Завяршылася ў 1632 г. Палянаўскім мірам (на р. Палянаўка) тэрмінам на 20 гадоў. Уладзіслаў IV Ваза за выкуп адмаўляўся ад сваіх правоў на маскоўскі прастол і тытул. Смаленск вяртаўся ў склад ВКЛ.

**1632 г. –** аднаўленне Уладзіславам IV Вазай дзейнасці праваслаўнай царквы ў ВКЛ. Кіеўскім мітрапалітам быў назначаны Пётр Магіла.

**1634-1689 гг.** – жыццё і дзейнасць Казіміра Лышчынскага – беларускага мысліцеля, грамадска-палітычнага дзеяча і педагога, аўтара рукапіснага трактата "Аб неіснаванні Бога". Паводле прыгавору сеймавага суда быў абезгалоўлены і спалены на вогнішчы.

**1648–1651 гг.** – антыфеадальная казацка-сялянская вайна ў Беларусі, якая разгарнулася ў сувязі з пачаткам паўстання Б. Хмяльніцкага ва Украіне.

**1649 г., студзень –** паход па Палессю войск Януша Радзівіла. Узяты гарады Тураў, Мазыр, Бабруйск, Рэчыца.

**1649 г., 31 ліпеня** – першая Лоеўская бітва – шляхецкае войска пад камандваннем Януша Радзівіла разбіла казацкія атрады пад камандваннем Міхайлы Крычэўскага і Сцяпана Падбайлы.

**1652 г.** – упершыню выкарыстана права “ліберум вета” шляхціцам-паслом Уладзіславам Сіцынскім. За 1652-1764 гг. з 55 сеймаў Рэчы Паспалітай 48 былі сарваны.
**1654 г. –** Пераяслаўская рада. Казакі прынялі рашэннеаб пераходзе Украіны пад царскую “высокую руку”.
**1654–1667 гг.** – вайна паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай за Беларусь і Украіну.
**1655 г., 31 ліпеня** – захоплена маскоўскімі войскамі сталіца ВКЛ г. Вільня.
**1667 г.** – Андрусаўскае перамір’е, якім скончылася вайна 1654 – 1667 гг., тэрмінам на 13,5 год. Руская дзяржава пакідала за сабой захопленае Смаленскае ваяводства, Северскія землі з Чарнігавам і Старадубам. Рэч Паспалітая пагаджалася з адыходам да Расіі Левабярэжнай Украіны і передавала на два гады Кіеў.
**1668 г.** – сейм Рэчы Паспалітай адыход ад каталіцтва прыраўняў да дзяржаўнага злачынства.
**1696 г.** – пастанова ўсеагульнай канфедэрацыі саслоўяў Рэчы Паспалітай аб забароне пісаць дзяржаўныя дакументы на беларускай мове ў ВКЛ.
**1697 г.** – прыняццё пастановы “Ураўнанне правоў”, паводле якой шляхта ВКЛ ураўноўвалася ў правах з польскай.
**1700–1721 гг.** – Паўночная вайна паміж Паўночным саюзам (Расія, Данія, Саксонія, Рэч Паспалітая) і Швецыяй.
**1708 г., 27 верасня –** разгром расійскімі войскамі шведскага корпуса под командваннем А. Левенгаупта каля в. Лясная (Слаўгарадскі р-н Магілёўскай вобл.), які ішоў з абозам з Рыгі на дапамогу Карлу XII.
**1709 г., 28чэрвеня –** паражэнне шведскай арміі Карла XII пад Палтавай.
**1717 г. –** першы “нямы сейм” у Рэчы Паспалітай (Варшаўскі). Практычна пагадзіўся з пратэктаратам Расіі над Рэччу Паспалітай. Кароль павінен быў вывесці з Рэчы Паспалітай саксонскае войска, а шляхта – распусціць канфедэрацыі. Скарачалася войска: Польшча – 24 тыс., а ВКЛ – 6 тыс.
**1719 г. –** Аўстрыя, Саксонія і Прусія падрыхтавалі план падзелу Рэчы Паспалітай. Петр I яго не падтрымаў. Дамовіліся аб так званай «абароне парадку» у Рэчы Паспалітай.
**1730-я гг.** – афармленне архітэктурнага стылю “віленскае барока”. Яго распрацаваў архітэктар Ян Глаўбіц.
**1740-1744 гг. –** паўстанне сялян у Крычаўскім старостве пад кіраўніцтвам Васіля Вашчылы.
**1764 г.** – сейм Рэчы Паспалітай устанавіў смяротнае пакаранне за змену каталіцкага веравызнання.

**1764-1795 гг. –** княжанне Станіслава Аўгуста Панятоўскага, апошняга вялікага князя ВКЛ і караля Польшчы.

**1764-1766 гг. –** эканамічныя рэформы ў Рэчы Паспалітай (невыкарыстанне права "ліберум вета" пры разглядзе эканамічных пытанняў; стварэнне Скарбавай камісіі, якая кантралявала фінансы краіны; увядзенне адзінай мытнай пошліны; налог на яўрэяў).

**1765 г.** – пачатак аграрнай рэформы Антонія Тызенгаўза ў сталовых эканоміях.

**1767 г. –** утварэнне дысідэнцкіх канфедэрацый: Слуцкай праваслаўна-пратэстанцкай і Торуньскай пратэстанцкай. У г. Радам утварылася прарасійская канфедэрацыя на чале з Каралем Станіславам Радзівілам (Пане Каханку).

**1768 г.** – па патрабаванню Расіі Варшаўскі сейм ураўняў ў правах пратэстантаў з католікамі і праваслаўнымі.

**1768 г. –** утварэнне антыдысідэнцкай Барскай канфедэрацыі.

**1771 г., верасень –** паражэнне канфедэрацкага войска на чале з Міхалам Казімірам Агінскім ад расійскага войска на чале з А. Суворавым каля мястэчка Сталавічы.

**1772 г. –** першы падзел Рэчы Паспалітай паміж Прусіяй, Аўстрыяй і Расіяй. Далучэнне ўсходняй часткі Беларусі да Расійскай імперыі.

**1773-1775 гг.** – трохгадовы сейм сазваны для зацвярджэння раздзела Рэчы Паспалітай. Супроць былі Тадэвуш Рэйтан, Самуэль Корсак і Станіслаў Багушэвіч.

**1773 г.** – заснаванне Эдукацыйнай камісіі – першага ў Еўропе міністэрства адукацыі.

**1773 г.** – расфарміраванне рымскім папам ордэна езуітаў.

**1775-1784 гг.** – будаўніцтва Каралеўскага (Днепра-Бугскага) канала.

**1776 г.** – пачатак выхаду "Газеты Гродзенскай" – першага перыядычнага выданя на тэрыторыі Беларусі.

**1788–1792 гг.** – Чатырохгадовы ("Вялікі") сейм Рэчы Паспалітай прыняў рашэнне аб правядзенні рэформ у краіне.

**1791 г., 3 мая** – прыняцце сеймам Канстытуцыі Рэчы Паспалітай.

**1792 г., май-верасень** – стварэнне і дзейнасць Тарговіцкай канфедэрацыі, накіраванай супроць Канстытуцыі 3 мая.

**1793 г.** – другі падзел Рэчы Паспалітай паміж Прусіяй і Расіяй. Далучэнне цэнтральнай часткі Беларусі да Расійскай імперыі.

**1793 г., чэрвень-лістапад** – другі “нямы сейм” у Рэчы Паспалітай (Гродзенскі) – апошні сейм Рэчы Паспалітай. Зацвердзіў другі падзел Рэчы Паспалітай.
**1794 г. –** усталяванне мяжы яўрэйскай аселасці.
**1794 г., сакавік-верасень** – паўстанне пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі. Мэта паўстання – аднавіць Рэч Паспалітую ў межах 1772 г.
**1794 г., 7 мая** – прыняццё “Паланецкага ўніверсала”.
**1795 гг.** – трэцці падзел Рэчы Паспалітай паміж Аўстрыяй, Прусіяй і Расіяй. Уключэнне ўсёй тэрыторыі Беларусі ў склад Расійскай імперыі.

## ТЭРМІНАЛАГІЧНЫ СЛОЎНІК

**Адукацыйная камісія** – установа па кіраўніцтву народнай асветай у Рэчы Паспалітай. Заснавана сеймам у 1773 – 1775 гг. Надавала школам свецкую накіраванасць, абвяшчала прынцып бессаслоўнай адукацыі. Вышэйшай ступенню новай сістэмы адукацыі з'яўляліся ўніверсітэты, сярэднюю ступень складалі акруговыя і падакруговыя школы, ніжнюю – парафіяльнныя вучылішчы, адкрыццё якіх прадугледжвалася ў гарадах і мястэчках. Адукацыйная камісія была распушчана ў 1794 г., у беларускіх губернях існавала да пачатку XIX ст.

**Берэсцкая ўнія** – царкоўны сабор 1596 г., які абвясціў аб аб’яднанні праваслаўнай царквы з каталіцкай на тэрыторыі Рэчы Паспалітай. Пагадненне прадугледжвала прызнанне вярхоўнай улады папы рымскага і асноўных дагматаў каталіцызму пры захаванні праваслаўнай абраднасці і багаслужэння на царкоўнаславянскай і роднай мовах.

**Генрыкавы артыкулы**– акты пра абмежаванне вярхоўнай улады ў Рэчы Паспалітай сеймам, прынятыя ў 1573 г. пры абранні каралём і вялікім князем Генрыка Валуа (Валезы). У другой палове XVII – XVIII стст. падцвярджаліся ўсімі каралямі Рэчы Паспалітай. У іх абвяшчалася свабоднае абранне караля, яго абавязак склікаць сейм раз у два гады і без сеймавай згоды не зацвярджаць новыя падаткі і пошліны. Калі кароль парушаў свае абяцанні, шляхта мела права адмовіцца ад падпарадкавання і выступіць супраць яго.

**Дысідэнты** – асобы, якія не падзяляюць пануючага ў краіне веравызнання. У Рэчы Паспалітай (XVII – XVIII стст.) – хрысціяне-некатолікі (праваслаўныя і пратэстанты).

**Казацкі загон** – атрад, які не ўваходзіў у сталую вайсковую арганізацыю казацтва. Загоны дзейнічалі самастойна. Адыгралі значную

ролю ў пашырэнні сацыяльных канфліктаў на тэрыторыі Беларусі ў XVI – XVII стст.

**Казацтва** (цюрк.: казак – вольны чалавек) – утварылася ў XV ст. з сялян і гарадскіх жыхароў, якія ўцякалі на малазаселеныя ўскраіны ВКЛ і Маскоўскай дзяржавы. Казацтва стварыла сваю арыгінальную сацыяльна-эканамічную, вайсковую і палітычную арганізацыю. Яе галоўныя рысы: адсутнасць прыгонніцтва, фармальна роўнае права ўсіх членаў на карыстанне зямлёй і інш. Запарожскае казацтва ў значнай ступені складалася з беглых беларускіх сялян. Доўгі час яно стрымлівала напады крымскіх татараў і туркаў на землі ВКЛ.

**Канстытуцыя Рэчы Паспалітай** – асноўны закон Рэчы Паспалітай, прыняты 3 мая 1791 г. Адна з найбольш дэмакратычных у свой час. Была першым у Еўропе і другім у свеце (пасля Канстытуцыі ЗША) асноўным законам, зафіксаваным пісьмова. Захоўваючы феадальны лад у краіне, Канстытуцыя разам з тым адкрывала шлях буржуазным рэформам, ліквідавала выбарнасць караля, права ліберум вета, адмяніла ўнію Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага, стварыўшы тым самым унітарную дзяржаву.

**Канфедэрацыя** – у Рэчы Паспалітай часовы саслоўны палітычны саюз для дасягнення пэўнай мэты. Існаванне было выклікана слабасцю дзяржаўнай улады. Стварэнне канфедэрацый было забаронена сеймам 1717 г., Чатырохгадовым сеймам і Канстытуцыяй 3 мая 1791 г., але гэта не было ажыццёўлена.

**Контррэфармацыя** – рэлігійна-палітычны рух у Еўропе ў другой палове XVI – XVII стст., узначалены папствам і накіраваны супраць рэфармацыі. Мела на мэце рэстаўрацыю страчаных пазіцый каталіцызмам. На Беларусі ўзмацнілася пасля падпісання Люблінскай уніі 1569 г.

«**Ліберум вета**» – звычай у дзяржаўным праве ВКЛ і Рэчы Паспалітай, паводле якога кожны дэпутат сейма ці сейміка (нават без абгрунтавання) мог выказаць нязгоду з любой сеймавай пастановай, што азначала спыненне пасяджэння і скасоўвала ўсе прынятыя на ім рашэнні. Першы раз сейм быў сарваны ў 1652 г. Ліквідаваны Канстытуцыяй 3 мая 1791 г.

**Магнаты** – буйныя феадалы-землеўласнікі, прадстаўнікі радавітай знаці, найбольш уплывовая частка феадальнага саслоўя.

**Паланецкі ўніверсал** – зварот Т. Касцюшкі да насельніцтва Рэчы Паспалітай, у якім абвяшчалася асабістае вызваленне сялян ад прыгоннай залежнасці, змяншэнне паншчыны, вызваленне сялян – удзельнікаў

паўстання ад феадальных павіннасцей пасля перамогі. Рэалізацыя ўніверсала сустрэла процідзеянне шляхты.

**Рэфармацыя** – грамадска-палітычны рух у Заходняй Еўропе ў XVI ст., накіраваны супраць каталіцкай царквы і феадальных парадкаў. Паклала пачатак пратэстантызму, асабліва такім яго плыням, як лютэранства і кальвінізм.

**Рэч Паспалітая –** афіцыйная назва феадальнай федэратыўнай дзяржавы, у якую аб'ядналіся Польшча («Карона») і ВКЛ у выніку Люблінскай уніі 1569 г. У склад «Кароны» уваходзілі польскія і ўкраінскія ваяводствы, у ВКЛ – беларускія і літоўскія землі. Існавала Рэч Паспалітая да 1795 г. і была ліквідавана ў выніку трэцяга падзелу яе тэрыторыі.

**Статуты ВКЛ 1529, 1566, 1588 гг.** – зборы законаў феадальнага права. Асабліва сярод іх вылучаўся Статут 1588 г., які абагульніў тагачасныя дзяржаўна-прававыя ідэі, некаторыя з якіх нават апярэджвалі свой час. Так, у Статуце 1588 г.знайшла адлюстраванне тэорыя падзелу ўлад на заканадаўчую (сейм), выканаўчую (вялікі князь, адміністрацыйны апарат) і судовую (Трыбунал ВКЛ, земскія і падкаморскія суды і інш.). Статут таксама абавязваў вярнуць адлучаныя ад княства землі, забараняў назначаць на дзяржаўныя пасады і надзяляць зямлёй «чужаземцаў», у тым ліку і падданых Польшчы, захаваў адасобленасць дзяржаўных устаноў ВКЛ, арміі, заканадаўства, эканомікі і фінансаў. Уладаром дзяржавы прызнаваўся вялікі князь. Дзяржаўнай мовай ВКЛ абвяшчалася беларуская.

**Сялянскія атрады шышоў** – партызанскія атрады, якія ствараліся сялянамі з мэтай самаахovы супраць спроб рабавання населеных пунктаў Беларусі войскамі заваёўнікаў. Асабліва шырокае распаўсюджанне атрымалі ў час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай (1654–1667 гг.)

**Трыбунал ВКЛ 1581 г.** – вышэйшы апеляцыйны суд Вялікага Княства Літоўскага, пастановы якога мелі сілу пастаноў сейма. Складаўся з суддзяў, якія штогод выбіраліся шляхтай на дэпутацкіх сейміках (па 2 суддзі-дэпутаты ад павета або ваяводства, калі яно не падзялялася на паветы).

**Уніяты** – паслядоўнікі Берэсцкай уніі 1596 г.

**Шляхта** – прывілеяванае саслоўе на Беларусі, Літве, Польшчы і Украіне ў XIII – пачатку XX стст. У ВКЛ і Рэчы Паспалітай займала пануючае становішча на падставе феадальнай ўласнасці на зямлю. Адыгравала вялікую ролю ў палітычным, гаспадарчым і культурным жыцці да канца XVIII ст. Была вайсковым саслоўем.

## ГІСТАРЫЧНЫЯ ПЕРСАНАЛІІ

**Агінскі М. К.** – дзяржаўны дзеяч Рэчы Паспалітай, ваявода Віленскі з 1764 г., гетман Вялікі Літоўскі, з 1768 г. – адзін з кандыдатаў Кацярыны II на польскі пасад. Жыў у Слоніме, дзе пабудаваў некалькі прадпрыемстваў, друкарню, стварыў оперны тэатр і капэлу. Пісаў музыку (опера «Зменены філосаф» і інш.) і літаратурныя творы. Па яго ініцыятыве і на яго сродкі будаваўся Агінскі канал.

**Валовіч Я. Б.** – дзяржаўны і грамадскі дзеяч ВКЛ. Адзін з лідэраў апазіцыі Люблінскай уніі 1569 г. Яго падтрымкай як мецэната карысталіся вядомыя гуманісты-рэфарматары С. Будны, В. Цяпінскі. Пад яго і Л. Сапегі кіраўніцтвам быў падрыхтаваны Статут ВКЛ 1588 г.

**Вашчыла В. М.** – кіраўнік антыфеадальнага паўстання сялян Крычаўскага староства ў 1740 – 1744 гг., войт в. Селішча. Пасля падаўлення паўстання ўцёк у Расію, дзе быў арыштаваны і памёр у турме.

**Касцюшка Т.** – палітычны і ваенны дзеяч Рэчы Паспалітай, удзельнік змагання паўночна-амерыканскіх штатаў за незалежнасць у 1776 г., кіраўнік нацыянальна-вызваленчага паўстання 1794 г. у Польшчы, Беларусі, Літве. Паходзіў з беларускай шляхты. За ўдзел у паўстанні 1794 г. быў зняволены, у 1796 г. амністыраваны Паўлам I. Выехаў спачатку ў ЗША, потым жыў у Францыі, Швейцарыі. Пахаваны ў Кракаве. Яго імем названа самая высокая гара ў Аўстраліі, адна з акруг штата Індыяна, горад у штаце Місісіпі, астравы на Алясцы (ЗША).

**Кунцевіч І.** – уніяцкі царкоўны дзеяч Рэчы Паспалітай. Насаджаў уніяцтва на Беларусі гвалтоўнымі метадамі, за што быў забіты гараджанамі пад час Віцебскага паўстання 1623 г. За забойства архіепіскапа 19 чалавек было прыгаворана да пакарання смерцю, а Віцебск пазбаўлены магдэбургскага права. Кунцевіч быў кананізаваны каталіцкай царквой.

**Панятоўскі С.А.** – апошні польскі кароль і вялікі князь Літоўскі, паходзіў з Беларусі (маёнтак Волчын Брэсцкага павета), да 1764 г. – стольнік Вялікага княства Літоўскага.

**Сапега Л.І.** – палітычны і грамадскі дзеяч ВКЛ, канцлер (1589–1623), гетман (1623–1633), адзін з арганізатараў трыбунала ВКЛ 1581 г. і складальнікаў Статута ВКЛ 1588 г. У сваёй палітыцы адстойваў суверэнітэт ВКЛ у складзе федэратыўнай Рэчы Паспалітай, выступаў супраць права польскай шляхты набываць у княстве маёнткі і пасады.

**Скарга П.** – царкоўна-рэлігійны і палітычны дзеяч Рэчы Паспалітай, у 1579 – 1584 гг. – першы рэктар Віленскай езуіцкай акадэміі, ініцыятар і прапагандыст Берэсцкай уніі. Прыхільнік моцнай цэнтралізаванай дзяржавы.

Палітычным ідэалам лічыў тэакратыю, пад якой разумеў кіраванне царкоўнай улады пры дапамозе караля.

**Хмяльніцкі Б.** – гетман Украіны. Бацькі – выхадцы з Беларусі. У 1648 г. узначаліў казацкі рух супраць Польшчы. Атрымаў шэраг перамог. Пасылаў казацкія загоны на Беларусь. У 1654 г. падпісаў пагадненне з Рускай дзяржавай (Пераяслаўская Рада)

## ЛІТАРАТУРА


1. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. / А.А. Каваленя [і інш.] ; рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.]. – Мінск, 2011. – Кн. 1.
2. Новик, Е. К., Качалов, И. Л., Новик, Н. Е. История Беларуси: с древнейших времен до 2012 г. : учебное пособие. — 3-е изд., испр. и доп. – Минск, 2012.
3. Белоруссия в эпоху капитализма: сб. документов и материалов: в 4 т. - Минск, 1983; 1990.
4. Белоруссия в эпоху феодализма: сб. документов и материалов: в 4 т. — Минск, 1959–1979.
5. Вішнеўскі, А. Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах / А. Ф. Вішнеўскі, Я. А. Юхо. – Мінск, 2003.
6. Гісторыя Беларусі: у 6 т. – Т. 3: Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (ХУІІ–ХУШ стст.). – Мінск, 2004.
7. Канфесіі на Беларусі (канец XVIII – XX ст.). – Мінск, 1998.
8. Круталевич, В. А. История Беларуси: становление национальной державности (1917–1922 гг.). – Минск, 2003.
9. Хрестоматия по истории Белоруссии. С древнейших времен до 1917 г. – Минск, 1977.
10. Цітоў, А.К. Краіна майстроў : рамесныя цэхі Беларусі, 16 – канец 18 ст. – Мінск, 2013.
11. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск, 1993 – 2003.
12. Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. – Мінск, 1989.
13. Юхо, Я. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: у 2 ч. – Мінск, 2000; 2003.


## ТЭМЫ РЭФЕРАТАЎ

1. Л. Сапега – дзяржаўны дзеяч сярэдневечнай Беларусі.

2. Войны сярэдзіны XVII ст. і іх уплыў на гісторыю Беларусі.
3. Брэсцкая царкоўная ўнія 1596 г. Уніяцкая царква.
4. Дзейнасць ордэна езуітаў (палітыка, адукацыя).
5. Абарончыя і культавыя збудаванні другой паловы XVI–XVIII ст.у Беларусі.
6. Палацы і палацава-паркавыя ансамблі другой паловы XVI–XVIII ст. у Беларусі.
7. Магнацкія тэатры на тэрыторыі Беларусі ў XVIII ст..
8. ПаўстаннепадкіраўніцтвамТ. Касцюшкі ў Польшы, Беларусі і Літве.

**Семінар 4. Беларусь у складзе Расійскай дзяржавы(1795-1917 гг.)**

1. Грамадска-палітычны рух у Беларусі (першая палова XIX ст.). Тайныя таварыствы.
2. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў першай палове XIX ст. Рэформа дяржаўнай вёскі.
3. Адмена прыгоннага права. Іншыя буржуазныя рэформы ў Беларусі.
4. Грамадска-палітычны рух у другой палове XIX ст. Паўстанне 1863-1864 гг. у Беларусі.
5. Культура Беларусі ў XIX – пачатку XX ст.

## ХРАНАЛОГІЯ

**1802 г. –** адміністрацыйна-тэрытарыяльная рэформа беларускіх зямель. Стварэнне 5-ці губерняў: Віленскай, Гродзенскай, Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай.

**1803 г.** – рэарганізацыя Галоўнай Віленскай школы (1796-1803 гг.) у Віленскі ўніверсітэт.

**1803-1804 гг.** – рэформа сістэмы адукацыі, стварэнне Віленскай вучэбнай акругі на чале з князем Адамам Чартарыйскім.

**1803 г.** – у г. Свіслач адчынена першая на тэрыторыі Беларусі гімназія.

**1807 г**. – пачатак будаўніцтва Бабруйскай крэпасці па праекту Тэадора Нарбута – уражэнца Беларусі, ваеннага інжынера, гісторыка і археолага.

**1811 г.** – складанне па даручэнню цара Аляксандра I “плана Агінскага”.

**1812 г., чэрвень** – пераправа французскай арміі Напалеона праз р. Нёман.

**1812 г., ліпень** – стварэнне па загаду Напалеона Часовага ўрада Вялікага Княства Літоўскага.

**1812 г., ліпень** – бітва каля в. Салтанаўка пад г. Магілёвам. Подзвіг генерала М. М. Раеўскага.

**1812 г., ліпень** – бітва паміж французскімі і расійскімі войскамі пад Клясціцамі каля г. Полацка. Подзвіг генерала Я. П. Кульнёва.

**1812 г., 26 жніўня** – Барадзінская бітва.

**1812 г., лістапад** – бітва паміж французскімі і расійскімі войскамі пры пераправе праз р. Беразіну каля в. Студзёнка.

**1812-1820 гг. –** дзейнасць Полацкай езуіцкай акадэміі.

**1817 г.** – у Віленскім універсітэце створана тайнае студэнцкае таварыства *філаматаў* (аматараў навук).

**1819 г.** – адкрыццё ў г. Гомелі, у маёнтку графа М. П. Румянцава, першай у Расійскай імперыі *ланкастэрскай школы* – школы ўзаемнага навучання.

**1820 г.** – у Віленскім універсітэце створана тайнае студэнцкае таварыства *філарэтаў* (аматараў дабрачыннасці).

**1823 г.** – распрацоўка дзекабрыстамі С. І. Мураўёвым-Апосталам і М. П. Бестужавым-Руміным "Бабруйскага плана" паўстання.

**1824 г.** – на р. Сож прайшоў выпрабаванне першы параход, пабудаваны ў гомельскім маёнтку графа М. П. Румянцава англійскім механікам А. Смітам.

**1825 г., 14 снежня** – спроба групы дваранскіх рэвалюцыянераў (*дзекабрысты*) пачаць узброенае выступленне ў г. Пецярбургу на Сенацкай плошчы ў дзень прысягі новаму імператару Мікалаю І.

**1820-е гг. –** з'яўленне *першых фабрык* на тэрыторыі Беларусі. Гродзенская губ. мяст. Хомск Кобрынскагапаветаі мяст. Косова Слонімскага павета.

**1830-я гг. –** пачатак прамысловага пераварота ў Беларусі.

**1830-1831 гг. –** шляхецкае нацыянальна-вызваленчае паўстанне ў Полшчы, Літве і Беларусі.

**1831 г.** – скасаванне Статута Вялікага Княства Літоўскага ў Віцебскай і Магілёўскай губерніях і ўвядзенне расійскага заканадаўства.

**1831-1848гг.** – дзейнасцьКамітэта па справах Заходніх губерняў.

**1831 г. –** указ "Аб разборы шляхты ў заходніх губернях і аб уладкаванні гэтага роду людзей".

**1832 г.** – закрыццё Віленскага ўніверсітэта ў сувязі з удзелам яго студэнтаў у паўстанні 1830-1831 гг.

**1836 г.** – перавод выкладання ўсіх вучэбных прадметаў на рускую мову.

**1836-1839 гг.** – дзейнасць у г. Вільні заснаванага Францам Савічам "Дэмакратычнага таварыства".

**1839 г.** – скасаванне Полацкім царкоўным саборам Берэсцкай царкоўнай уніі і далучэнне ўніятаў да Рускай праваслаўнай царквы.

**1840 г.**– указ аб выкарыстанні ў афіцыйных дакументах назвы «Северо-Западный край».
**1840 г.** – адкрыццё Горы-Горацкай земляробчай школы.
**1840-1857 гг**. – правядзенне рэформы П.Д. Кісялёва ў дзяржаўнай вёсцы.
**1840 г.** – адмена дзейнасці Статута ВКЛ на тэрыторыі Мінскай, Віленскай, Гродзенскай губерняў і Беластоцкай вобласці.
**1840-я гг.** – з'яўленне ў Беларусі тэлеграфа.
**1840-1900 гг.** – жыццё і дзейнасць Францішка Багушэвіча, беларускага паэта і публіцыста.
**1842 г.** – заснаванне ў Лагойску па ініцыятыве Канстанціна Тышкевіча першага ў Беларусі гістарычнага музея.
**1844-1857 гг.** – правядзенне інвентарнай рэформы ў памешчыцкай вёсцы.
**1848 г.** – стварэнне земляробчага інстытута ў Горы-Горках – першай ў Расійскай імперыі вышэйшай навучальнай установы, дзе рыхтаваліся аграномы і заатэхнікі.
**Другая палова XIX – пачатак XX ст.** – час станаўлення новай беларускай літаратурнай мовы.
**1857 г., 20 лістапада –** рэскрыпт імператара Аляксандра II віленскаму генерал-губернатару У. І. Назімаву аб падрыхтоўцы праектаў "паляпшэння быту памешчыцкіх сялян".
**1861 г., 19 лютага** – Маніфест Аляксандра II аб адмене прыгоннага права ў Расійскай імперыі.
**1860-1870 гг. –** правядзенне буржуазных рэформ у Расійскай імперыі (земская рэформа, судовая, школьная, гарадского самакіравання).
**1860-1870 гг. –** спецыялізацыя сельскай гаспадаркі Беларусі на вытворчасці збожжа: жыта, асўа, ячменю.
**1862 г.** – на тэрыторыі Беларусі пракладзена першая чыгунка – Пецярбургска-Варшаўская.
**1862-1863 гг.** – выйшла 7 нумароў першай нелегальнай беларускай дэмакратычнай газеты "Мужыцкая праўда".
**1863-1864 гг.** – паўстанне ў Польшчы, Літве і Беларусі.
**1863 г.** – ліквідацыя часоваабавязаннага становішча памешчыцкіх сялян у Гродзенскай, Віленскай і Мінскай губернях (а пазней ў Віцебскай і Магілёўскай губернях).
**1864 г.** – адкрыццё першай у Расійскай імперыі настаўніцкай семінарыі ў Маладзечне.
**1872-1882 гг.** – правядзенне судовай рэформы ў Беларусі.

**1875 г.** – правядзеннегарадской рэформыў Беларусі.

**1897 г.** – першы Усерасійскі перапіс насельніцтва.

**1898 г.** – увядзенне ў эксплуатацыю першага электрычнага трамвая ў Віцебску.

**1882-1942 гг.** – жыццё і дзейнасць класіка беларускай літаратуры *Янкі Купалы* (Івана Дамінікавіча Луцэвіча).

**1882-1956 гг.** – жыццё і дзейнасць класіка беларускай літаратуры *Якуба Коласа* (Канстанціна Міхайлавіча Міцкевіча).

**1884 г.** – стварэнне беларускімі студэнтамі-народнікамі групы "Гоман" у г. Пецярбургу.

**1897 г. –** стварэнне ў г. Вільні Усеагульнага яўрэйскага рабочага саюза ў Літве, Польшчы і Расіі (Бунд).

**1898 г.** – I з'езд Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі (РСДРП) у г. Мінску.

**1902 г.** – утварэнне партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў (эсэраў).

**1903 г.** – падзел РСДРП на бальшавікоў і меньшавікоў.

**1903 г.** – афармленне Беларускай сацыялістычнай грамады (БСГ).

**1905 г., 17 кастрычніка** – Маніфест цара Мікалая II аб увядзенні палітычных свабод (свабода слова, сходаў, друку, саюзаў) і стварэнні парламента – Дзяржаўнай думы з заканадаўчымі паўнамоцтвамі.

**1905 г., 18 кастрычніка** – "Курлаўскі растрэл у Мінску".

**1906 г. –** указ аб выхадзе сялян з абшчыны. Пачатак аграрнай рэформы П. А. Сталыпіна.

**1906-1915 гг.** – выданне ў г. Вільні газеты "Наша ніва".

**1907 г., 3 чэрвеня –** роспуск II Дзяржаўнай думы царом Мікалаем II. Завяршэнне першай расійскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі.

**1910-1913 гг.** – дзейнасць першага нацыянальнага прафесійнага тэатра пад кіраўніцтвам Ігната Буйніцкага – "бацькі беларускага тэатра".

**1911 г. –** увядзенне выбарных земстваў у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях.

**1914 г., ліпень (жнівень) –** пачатак Першай сусветнай вайны. Увядзенне ваеннага становішча ў Беларусі.

**1917 г., 27 лютага** – перамога Лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў Расіі.

**1917 г., сакавік, ліпень –** правядзенне з'ездаў беларускіх нацыянальных арганізацый.

## ТЭРМІНАЛАГІЧНЫ СЛОЎНІК

**Адыходніцтва** – часовы адыход сельскага насельніцтва на промыслы або сельскагаспадарчыя прадпрыемствы, гаспадаркі іншых рэгіёнаў.

**Акцыянерныя таварыствы** – прадпрыемствы, дзе капітал утвараўся з грашовых укладаў шэрага прадпрымальнікаў і існаваў у форме акцый, якія свабодна прадаваліся і купляліся.

**Буржуазія** – клас уласнікаў сродкаў вытворчасці ў капіталістычным грамадстве, які жыве за кошт дадатковых сродкаў, атрымліваемых пры дапамозе прымянення наёмнай працы.

**Двоеўладдзе** – своеасаблівае перапляценне дзвюх улад у Расіі пасля Лютаўскай рэвалюцыі (1917 г.): Часовага ўрада і Петрагарадскага Савета. На Беларусі двоеўладдзе праявілася ў адначасовым існаванні Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў, часовых грамадскіх камітэтаў, якія ўзначальвалі камісары Часовага ўрада і ўлады ваенных.

**Заходнерусізм** – плынь грамадска-палітычнай думкі, адна з форм палітычнай свядомасці на Беларусі ў XIX – пачатку XX стст. Узнiклаў 30-я гады XIX ст. пад уплывам рэакцыйнай нацыянальнай палітыкі царызму. Канцэпцыя заходнерусізму грунтуецца на сцвярджэнні, што беларусы не самастойны этнас, а адгалінаванне рускага народа.

**Земствы** – выбарныя органы для кіравання ў губернях і паветах мясцовай гаспадаркай, адукацыяй, аховай здароўя.

**Інвентары** – дакументы, дзе ўтрымліваюцца апісанні феадальных уладанняў у Беларусі, Украіне, Літве і Польшы, запісаны нормы павіннасцей сялян у адпаведнасці з памерам і якасцю іх надзелаў.

**Камітэт па справах Заходніх губерняў** – дарадчы орган пры імператары Мікалаі I у 1831 – 1848 гг. Мэта яго дзейнасці – разгляд прапаноў дзяржаўных устаноў і дзеячаў, выпрацоўка рэкамендацый ураду, накіраваных на ўзмацненне пазіцый самаўладдзя на тэрыторыі Заходніх губерняў.

**Канфіскацыя** – прымусовае адабранне маёмасці.

**Капіталізм** – грамадска-эканамічная фармацыя, заснаваная на прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці і эксплуатацыі наёмнай працы капіталам.

**Латыфундыі** – буйныя прыватнаўласніцкія зямельныя ўладанні.

**Люстрацыя** – правядзенне падрабязнага апісання ўсіх дзяржаўных маёнткаў і строгае вызначэнне павіннасцей дзяржаўных сялян у залежнасці ад іх гаспадарчага становішча.

**Менталітэт** – своеасаблівы спосаб мыслення асобнага чалавека ці якой-небудзь супольнасці людзей. Менталітэт уключае ўяўленні аб прасторы і

чалавеку, адносіны чалавека да розных з'яў грамадскага жыцця, уяўленні аб праве, маралі, сям'і, жыцці і смерці.

**Міравыя суды** – асобы від суда са спрошчаным судаводствам для разгляду нязначных іскаў і дробных крымінальных злачынстваў.

**Нацыя** – гэта гістарычная супольнасць людзей, якія пражываюць на адной тэрыторыі, звязаны агульным эканамічным і сацыяльна-палітычным жыццём і маюць адзіную мову, культуру і самасвядомасць.

**Нацыянальная самасвядомасць** – сукупнасць уяўленняў, пачуццяў і ведаў чалавека аб сваёй прыналежнасці да пэўнай нацыі.

**Пралетарыят** – рабочы клас, клас наёмных працоўных, крыніцай існавання якіх з'яўляецца продаж сваёй рабочай сілы ўласнікам сродкаў вытворчасці.

**Прамысловы пераварот** – паступовы пераход ад мануфактуры да фабрыкі, ад ручной да машыннай працы.

**Прыгоннае права** – форма феадальнай залежнасці сялян: прымацаванне іх да зямлі і падначаленне адміністрацыйнай і судовай уладзе феадала.

**Разбор шляхты** – выключэнне з дваранскага саслоўя пры непрадастаўленні дакументаў на дваранскае званне.

**Разначынцы** – людзі рознага чына і звання, катэгорыя насельніцтва Расіі канца XVIII – XIX ст. Выхадцы з розных саслоўяў, якія атрымалі адукацыю і займаюцца разумовай працай, інтэлегенцыя, якая выйшла з народа.

**Расслаенне сялянства** – рост маёмаснай і класавай няроўнасці ў асяроддзі сялян; з аднаго боку колькасна павялічвалася сельская буржуазія, з другога – сельскі пралетарыят і паўпралетарыят.

**Рыса аселасці** – у Расіі ў 1794 – 1917 гг. мяжа тэрыторыі, на якой дазвалялася жыхарства яўрэям. Правы грамадзянства і мяшчанства ім дазвалялася мець толькі ў літоўска-беларускіх і ўкраінскіх губернях.

**Секулярызацыя** – канфіскацыя царкаўнай маёмасці на карысць дзяржавы. На тэрыторыі Беларусі праведзена ў 1841 – 1843 гг., большай часткай у адносінах да каталіцкай царквы.

**Сервітуты** – абмежаванае права карыстання чужой уласнасцю (права праезду, выпасу жывёлы, рыбнай лоўлі, карыстанне сенажацямі). Сервітуты былі вельмі пашыраны на Беларусі ў феадальныя часы. У парэформенны перыяд адбывалася напружаная барацьба сялян за права карыстання сервітутамі.

**Сіндыкаты** – формы аб’яднання прадпрымальнікаў для рэгулявання аб’ёмаў вытворчасці і адзінай цаны на сваю прадукцыю.

**Устаўныя граматы** – акты, якімі вызначаліся адносіны часоваабавязаных сялян з памешчыкамі пасля сялянскай рэформы 1861 г.

**Фабрыка** – форма арганізацыі вытворчасці; прамысловае прадпрыемства, заснаванае на выкарыстанні сістэмы машын.

**Часоваабавязаныя сяляне** – былыя памешчыцкія сяляне ў Расіі, якія на падставе рэформы 1861 г. былі вызвалены ад прыгону, але да пэўнага часу павінны былі выконваць феадальныя павіннасці на карысць памешчыкаў. На Беларусі часовааабавязаны стан быў скасаваны ў 1863 г., а ўвогуле па Расійскай імперыі – у 1882 г.

## ГІСТАРЫЧНЫЯ ПЕРСАНАЛІІ

**Аляксандр II**– расійскі імператар (1855–1881). З яго імем звязаны шматлікія рэформы, якія стварылі ўмовы для капіталістычнага развіцця краіны. Палітычны курс характарызуецца непаслядоўнасцю.

**Багушэвіч Ф.** – беларускі паэт, празаік, публіцыст і перакладчык. Пісаў пад псеўданімамі Мацей Бурачок, Сымон Рэўка з-пад Барысава. Удзельнік паўстання 1863 – 1864 гг. Пачынальнік крытычнага рэалізму ў беларускай літаратуры. Аўтар двух паэтычных зборнікаў «Дудка беларуская» і «Смык беларускі». Пры жыцці творы Ф. Багушэвіча былі забаронены ў царскай Расіі.

**Каліноўскі К.** – беларускі рэвалюцыянер-дэмакрат, мысліцель, публіцыст. Кіраўнік паўстання 1863–1864 гг. на Беларусі і ў Літве. Аўтар твораў рэвалюцыйнай публіцыстыкі «Пісьмы з-пад шыбеніцы», адзін з выдаўцоў газеты «Мужыцкая праўда».

**Карскі Я.Ф.** – заснавальнік беларускага мовазнаўства і літаратуразнаўства, этнограф, палеограф і фалькларыст. Яго трохтомная праца «Беларусы» названа энцыклапедыяй беларусазнаўства. У ёй упершыню была навукова абгрунтавана нацыянальная самабытнасць беларусаў як асобнага славянскага народа.

**Каяловіч М. В.** – гісторык, этнограф, прафесар Пецярбурскай духоўнай акадэміі. Адзін з ідэолагаў «заходнерусізму». Аўтар работ па палітычнай і царкоўнай гісторыі Беларусі.

**Ластоўскі В. Ю.** – гісторык, публіцыст, літаратуразнавец, грамадскі і палітычны дзеяч. Супрацоўнік рэдакцыі газета «Наша ніва», рэдактар газеты

«Гоман», член БСГ. Аўтар «Кароткай гісторыі Беларусі». Актыўны ўдзельнік беларускага культурнага адраджэння і нацыянальна-вызваленчага руху.

**Луцкевіч А. І.** – палітычны і грамадскі дзеяч, гіторык, педагог, літаратурны крытык, вядучы беларускі публіцыст. Разам са сваім братам Іванам быў сярод заснавальнікаў Беларускай сацыялістычнай грамады, ініцыятарам стварэння газеты «Наша ніва». Яго намаганнямі ў 1921 г. адкрыты Беларускі музей. У 1918–1920 гг. з'яўляўся Старшыней Рады Народных Міністраў БНР. Пасля далучэння Заходняй Беларусі да Польшчы жыў і працаваў у Вільні. Паводле афіцыйнай версіі памёр у Сяміпалацінскай вобласці (Казахстан) у 1946 г.

**Луцкевіч І. І.** – беларускі грамадскі дзеяч, археолаг, этнограф, публіцыст. Брат А. Луцкевіча. Збіральнік і даследчык беларускіх старажытнасцей. Яго асабістая калекцыя стала асновай Беларускага музея ў Вільні. Стаяў ля вытокаў фарміравання беларускай нацыянальнай ідэі. Аўтар навуковых прац па гісторыі, мастацтве, кніжнай культуры Беларусі. Памёр у 1919 г. у Закапанэ (Польшча), у 1991 г. перазахаваны ў Вільні.

**Раманаў Е. Р.** – беларускі этнограф, фальклярыст і археолаг. Вывучаў матэрыяльную і духоўную культуру беларусаў: жыллё, сямейны побыт, народныя абрады. Склаў археалагічныя карты Магілёўскай, Віцебскай і Гродзенскай губерняў.

**Сямашка І.** – царкоўны дзеяч, з 1829 г. – уніяцкі епіскап у Мсціслаўлі. Пад яго кіраўніцтвам адбылося аб'яднанне ўніяцкай царквы Расіі з праваслаўнай. У час паўстання 1863 – 1864 гг. падтрымліваў віленскага генерал-губернатара М.М. Мураўёва.

## ЛІТАРАТУРА

1. Беларусь и война 1812 года : документы / сост. А.М. Лукашевич, Д.Л. Яцкевич ; редкол.: В.И. Адамушко (гл. ред.) [и др.]. – 2-е изд. – Минск, 2013.
2. Беларусь: страницы истории / редсовет: А.А. Коваленя [и др.]. – Минск, 2011.
3. Белоруссия в эпоху капитализма: сб. документов и материалов: в 4 т. - Минск, 1983; 1990.
4. Вішнеўскі, А. Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах / А. Ф. Вішнеўскі, Я. А. Юхо. – Мінск, 2003.

5. Гісторыя Беларусі: у 6 т. – Т. 4: Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.). – Мінск, 2005.
6. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. / А.А. Каваленя [і інш.] ; рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.]. – Мінск, 2011. – Кн. 1.
7. Каханоўскі, А. Г. Гісторыя Беларусі другой паловы XIX ст. : вучэб.-метад. дапам. / А. Г. Каханоўскі. – Мінск, 2012.
8. Ковкель, И. И. История Беларуси с древнейших времен до нашего времени / И. И. Ковкель, Э. С. Ярмусик. – Минск, 2006.
9. Новик, Е.К., Качалов, И.Л., Новик, Н.Е. История Беларуси: с древнейших времен до 2012 г. : учебное пособие. — 3-е изд., испр. и доп. – Минск, 2012.
10. Рэлігія і царква на Беларусі: энцыклапед. даведнік. – Мінск, 2001.
11. Хрестоматия по истории Белоруссии. С древнейших времен до 1917 г. – Минск, 1977.
12. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск, 1993 – 2003.

## ТЭМЫ РЭФЕРАТАЎ

1. Вайна 1812 г. і Беларусь.
2. Тайныя студэнцкія таварыствы. Дзекабрысты.
3. К. Каліноўскі. Жыццё, светапогляд, дзейнасць.
4. Рэвалюцыя 1905-1907 гг. у Беларусі.
5. Гарады і мястэчкі Беларусі ў XIX ст.
6. П. А. Сталыпін і Беларусь.
7. Першая сусветная вайна і Беларусь.
8. Грамадска-палітычная дзейнасць газеты “Наша Ніва”.
9. Развіццё адукацыі ў Беларусі ў XIX ст.
10. Беларуская літаратура і нацыянальнае адраджэнне.

## Семінар 5. Станаўленне беларускай дзяржаўнасці. Усталяванне савецкай грамадска-палітычнай сістэмы ў Беларусі

1. Лютаўская і Кастрычніцкая рэвалюцыі і нацыянальны рух.
2. Станаўленне беларускай дзяржаўнасці.
3. Савецка-польская вайна 1919–1920 гг. Рыжскі мір.
4. Грамадска-палітычнае і эканамічнае жыццё ў БССР у 1920-1930-я гг.
5. Культура Беларусі ў пачатку XX ст.

## ХРАНАЛОГІЯ

**1917 г., 25 кастрычніка (7 лістапада)** –ўзброенае паўстанеў Петраградзе, звяржэнне Часовага ўрада, пераход улады да бальшавікоў.

**1917 г., 25 кастрычніка – 20 лістапада –** усталяванне савецкай улады пад кіраўніцтвам бальшавікоў на неакупаванай германскімі войскамі тэрыторыі Беларусі.

**1917 г., лістапад –** ліквідацыя Стаўкі Вярхоўнага галоўнакамандуючага ў г. Магілёве.

**1917 г., 26 лістапада** – утварэнне вышэйшага органа савецкай улады на тэрыторыі Беларусі – *Абласнога выканаўчага камітэта Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Заходняй вобласці і фронту* (*Аблвыкамзаха)*; выканаўчай улады – *Савета Народных Камісараў (СНК) Заходняй вобласці і фронту.*

**1917 г., 5 – 18 снежня** – *Усебеларускі з'езд* (кангрэс) прадстаўнікоў беларускіх партый і арганізацый. 18 (30) снежня – *роспуск Усебеларускага з'езда* ў адпаведнасці з пастановаю СНК Заходняй вобласці і фронту.

**1918 г., 3 сакавіка** – Брэсцкі мірны дагавор паміж Савецкай Расіяй і дзяржавамі германскага блока, падзел тэрыторыі Беларусі паміж Саветскай Расіяй і Германіяй.

**1918 г., 21 лютага, 9 сакавіка, 25 сакавіка** – прыняцце 1, 2 і 3 Устаўных грамат – афіцыйных дакументаў, выдадзеных Выканкамам Рады Усебеларускага з'езда і Рады БНР, у якіх былі абвешчаны ідэі незалежнасці Беларусі, формы арганізацыі ўлады, а таксама правы і свабоды ўсіх народаў Беларусі.

**1918 г., 21 – 23 снежня** – канферэнцыя беларускіх секцый РКП(б) у Маскве, якая прыняла пастанову аб стварэнні Рабоча-сялянскага ўрада і абвяшчэнні БССР.

**1918 г., 30 – 31 снежня** – VI Паўночна-заходняя абласная канферэнцыя РКП(б) у Смаленску. Прынята рэзалюцыя аб неабходнасці абвяшчэння самастойнай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусь (ССРБ).

**1918 г., 31 снежня** – стварэнне Часовага рэвалюцыйнага рабоча-сялянскага ўрада Беларусі на чале з З. Жылуновічам.

**1919 г., 1 студзеня** – апублікаванне «Маніфеста Часовага Рабоча-сялянскага Савецкага ўрада Беларусі» аб абвяшчэнні ССРБ.

**1919 г., 2–3 лютага** – I Усебеларускі з'езд Саветаў Беларусі. Прыняцце 1-й Канстытуцыі ССРБ. Утварэнне Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Літвы і Беларусі (ЛітБел).

**1919 г., люты – 1920 г., кастрычнік** – польска-савецкая вайна.

**1920 г., 31 ліпеня** – прынясце ў вызваленым ад польскіх войск г. Мінску «Дэкларацыі аб абвяшчэнні незалежнасці ССРБ» (другое абвяшчэнне рэспублікі на тэрыторыі Беларусі).

**1921 г., 18 сакавіка** – падпісанне ў Рызе мірнага дагавора паміж РСФСР, УССР і Польшчай, паводле якога Заходняя Беларусь адышла да Польшчы.

**1921 г., сакавік –** пераход да новай эканамічнай палітыкі (нэпу).

**1921 г. –** адкрыццё Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, першым рэктарам якога стаў вучоны-гісторык У. І. Пічэта.

**1921 – 1936 гг.** –дзейнасць у Заходняй Беларусі «Таварыства беларускай школы» (ТБШ).

**1922 г., люты –** адкрыцце Інстытута беларускай культуры (Інбелкульта).

**1922 г., 30 снежня –** I Усесаюзны з'езд Саветаў у г. Маскве. Прынясце Дэкларацыі і Дагавора аб утварэнні СССР.

**1923 – 1938 гг. –** гады дзейнасці Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ).

**1924 г., сакавік –** першае ўзбуйненне тэрыторыі Беларусі (у склад рэспублікі ўвайшлі паветы Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губерняў з пераважна беларускім насельніцтвам).

**1924 г., ліпень –** афіцыйны пачатак правядзення беларусізацыі ў БССР.

**1926 г., снежань** – другое ўзбуйненне тэрыторыі Беларусі (у склад рэспублікі ўвайшлі Рэчыцкі і Гомельскі паветы).

**1926 г. –** стварэнне кінарэжысёрам Ю. Тарычам першага беларускага мастацкага фільма “Лясная быль”.

**1927 г.**–прынясце 2-й Канстытуцыі БССР.

**1928 г. –** адкрыццё ў Ленінградзе кінастудыі мастацкіх фільмаў “Савецкая Беларусь”.

**1928–1932 гг. –** ажыццяўленне першага пяцігадовага плана развіцця народнай гаспадаркі БССР.

**1929 г., люты –** пачатак правядзення ўсеагульнай калектывізацыі вескі.

**1929 г. –** стварэнне Беларускай акадэміі навук.

**1929 – 1930 гг. –** хваля рэпрэсій у БССР супраць прадстаўнікоў так званага нацыянал-дэмакратызму.

**1932 г. –** адкрыццё ў г. Мінску Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі.

**1933 г. –** адкрыццё ў г. Мінску Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балета.

**1933-1937 гг.** – ажыццяўленне другога пяцігадовага плана развіцця народнай гаспадаркі БССР.
**1937 г. –** прынясце 3-й Канстытуцыі БССР («перамогшага сацыялізму»).
**1938-1942 гг.** – ажыццяўленне трэццяга пяцігадовага плана развіцця народнай гаспадаркі БССР.

## ТЭРМІНАЛАГІЧНЫ СЛОЎНІК

**Абласны выканаўчы камітэт Заходняй вобласці і фронту (Аблвыкамзах)** – першы вышэйшы заканадаўчы орган савецкай улады на тэрыторыі Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай, неакупаванай германскімі войскамі часткі Віленскай і Смаленскай губерняў, што ўтваралі Заходнюю вобласць, а таксама на Заходнім фронце. Дзейнічаў з 26 лістапада па 1 студзеня 1919 г. Ліквідаваны ў сувязі са стварэннем Часовага рэвалюцыйнага рабоча-сялянскага ўрада БССР.

**Беларуская Народная рэспубліка (БНР)** – абвешчана 9 сакавіка 1918 г. II Устаўной граматай. 25 сакавіка на пасяджэнні яе Рады III Устаўной граматай абвешчана незалежнасць БНР. Ініцыятары стварэння – члены БСГ (Луцкевіч А., Лёсік Я. і інш.). Урад БНР (Народны сакратыярат) абвяшчаў поўную незалежнасць Беларусі ад Расіі, адмену дэкрэтаў СНК Заходняй вобласці, дэмакратычныя свабоды. У кастрычніку 1925 г. прынята рашэнне аб самаліквідацыі органаў БНР.

**Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка** – існавала са студзеня 1919 г.да верасня 1991 г.у складзе СССР. Была абвешчана 01.01.1919 г. Маніфестам Часовага Рабоча-сялянскага Савецкага ўрада Беларусі. У студзені 1919 г. Смаленская, Віцебская і Магілёўская губерніі ССРБ былі перададзены ў склад РСФСР. 27 лютага 1919 г. ва ўмовах пачаўшайся савецка-польскай вайны Мінская і Віленская губерніі аб'ядналіся з Літоўскай савецкай рэспублікай. Утварылася Літоўска-Беларуская савецкая сацыялістычная рэспубліка (ЛітБел). 31 ліпеня 1920 г. прымаецца «Дэкларацыя аб абвяшчэнні незалежнасці ССРБ». Аднак як суверэнная дзяржава беларуская рэспубліка пасля другога абвяшчэння існавала да 1924 г. у межах шасці паветаў Мінскай губерніі (Бабруйскага, Барысаўскага, Ігуменскага, Мазырскага, часткова Мінскага і Слуцкага). Яе плошча складала 52,4 тыс. кв. км., а насельніцтва – 1 544 000 чалавек.

**Беларускі нацыянальны камісарыят (Белнацком)** – адзін з аддзелаў наркамнаца РСФСР. Створаны ў студзені 1918 г. Першы камісар – А. Чарвякоў. Друкаваны орган – газета «Дзянніца». Яго прадстаўнікі ўваходзілі

ў склад Часовага ўрада БССР. Ліквідаваны ў да сакавіку 1919 г. у сувязі з утварэннем ССРБ і ЛітБел.

**Беларускія секцыі РКП (б)** – арганізацыі, якія існавалі ў 1918 г. як часткі мясцовых партыйных арганізацый у розных гарадах РСФСР. Складаліся, пераважна, з бежанцаў-беларусаў – членаў РКП(б). Першая секцыя ўзнікла ў Петраградзе ў красавіку 1918. Распушчаны ў студзені 1919 г. Члены секцый прымалі ўдзел у стварэнні ССРБ.

**Брэсцкі мірны дагавор (3 сакавіка 1918 г.)** – трактат аб міры, заключаны савецкай Расіяй з Германіяй. Украіна і Фінляндыя прызнаваліся самастойнымі дзяржавамі. Беларусь згодна з мірным дагаворам была падзелена па лініі Дзвінск – Свянцяны – Ліда – Пружаны – Брэст. Неакупіраванымі заставаліся толькі 14 паветаў Віцебскай і Магілёўскай губерняў. У лістападзе 1918 г. Брэсцкія пагадненні былі ануляваны. Канчаткова скасаваны паводле Версальскіх мірных пагадненняў 1919 г.

**Ваенна-рэвалюцыйныя камітэты (ВРК)** – часовыя надзвычайныя органы ўлады пры вайсковых камітэтах у перыяд барацьбы за ўстанаўленне ўлады бальшавікоў. Дзейнічалі ў кастрычніку 1917 – сакавіку 1918 г. Галоўнымі задачамі ВРК былі: захоп улады бальшавікамі, звяржэнне Часовага ўрада і яго органаў на месцах, падаўленне апазіцыйных сіл.

«**Лінія Керзана**» – умоўная назва лініі, якую прапанавала тэрытарыяльная камісія Парыжскай мірнай канферэнцыі 1919–1920 гг. як часовую ўсходнюю граніцу Польшчы. Праходзіла праз Гродна – Ялаўку – Няміраў – Брэст-Літоўск і далей ад Перамышля да Карпат. Атрымала назву ад імя Дж. Керзана – міністра замежных спраў Англіі, які 7 ліпеня 1920 г. накіраваў савецкаму ўраду ноту з патрабаваннем спыніць наступленне Чырвонай Арміі па гэтай лініі пад час савецка-польскай вайны.

**Літоўска-Беларуская савецкая сацыялістычная рэспубліка (ЛітБел)** – існавала ў час грамадзянскай вайны і ваеннай інтэрвенцыі (з лютага па ліпень 1919 г.) у складзе Віленскай, Мінскай, часткі Ковенскай і Гродзенскай губерняў. Адміністрацыйны цэнтр – Вільня. Плошча – 207 тыс. кв. км, насельніцтва – каля 4 млн. чалавек. Пасля падпісання мірнага дагавора паміж Літвой і РСФСР у ліпені 1920 г. і другога абвяшчэння БССР 31 ліпеня 1920 г. ЛітБел юрыдычна спыніла існаванне.

**Народны сакратарыят Беларусі** – орган выканаўчай улады, сфарміраваны 21 лютага 1918 г. Выканаўчым камітэтам Рады Усебеларускага з’езда. У кастрычніку 1918 г. перайменаваны ў Раду (Савет) народных міністраў БНР.

**Рада Беларускай Народнай Рэспублікі (Рада БНР)** – створана ў сакавіку 1918 г. як «найвышэйшая ўстанова края», якой «даручана ўся паўната улады на Беларусі». Дзейнічала ва ўмовах нямецкай, потым польскай акупацыі. У кастрычніку 1925 г. прынята рашэнне аб самаліквідацыі органаў БНР.

**Рыжскі мірны дагавор** (18 сакавіка 1921 г.) – дагавор паміж РСФСР і УССР, з аднаго боку, і Польшчай, з другога, пра спыненне савецка-польскай вайны і нармалізацыю адносін. Згодна з ім да Польшчы адыходзілаЗаходняя Беларусь, тэрыторыя якой складала 113 тыс. кв. км, з насельніцтвам 4,6 млн. чалавек (1931 г.). Дагавор дзейнічаў да пачатку другой сусветнай вайны і уз'яднання Заходняй Беларусі з БССР.

**Часовы Рабоча-сялянскі Савецкі урад Беларусі** – вышэйшы орган дзяржаўнай улады БССР з 01.01.1919 г. да 02.02.1919 г. Сфарміраваўся ў ходзе нацыянальна-дзяржаўнага самавызначэння Беларусі ў форме суверэннай савецкай рэспублікі; спыніў існаванне ў перыяд работы I Усебеларускага з’езда Саветаў (02.02.1919 г. – 03.02.1919 г.), які прыняў Канстытуцыю Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі 1919 г. і выбраў Цэнтральны Выканаўчы Камітэт.

## ГІСТАРЫЧНЫЯ ПЕРСАНАЛІІ

**Жылуновіч З.Х.** (псеўд. Цішка Гартны) – прадстаўнік беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, дзяржаўны і грамадскі дзеяч БССР, гісторык, публіцыст, пісьменнік. З 1918 г. сакратар Беларускага нацыянальнага камісарыята (Белнацкома), рэдактар «Дзянніцы» – першай савецкай газеты на беларускай мове. Адзін з галоўных ініцыятараў абвяшчэння незалежнасці БССР, аўтар маніфеста аб яе абвяшчэнні. З 01.01. да 02.02.1919 г. – старшыня Часовага ўрада Савецкай Беларусі. Акадэмік АН Беларусі (1928 г.). У 1931 г. абвінавачаны ў «нацыянал-дэмакратызме» і арыштаваны. Памёр у псіхіятрычнай бальніцы. Поўнасцю рэабілітаваны ў 1987 г.

**Ландар К.І.** – савецкі партыйны і дзяржаўны дзеяч, удзельнік барацьбы за савецкую ўладу на Беларусі. З кастрычніка 1917 г. – старшыня ВРК Заходняга фронту, у лістападзе 1917 г. – СНК Заходняй вобласці і фронту.

**Лёсік Я. Ю.** – беларускі грамадскі і палітычны дзеяч, мовазнавец, пісьменнік. Акадэмік АН Беларусі (1928 г.). Дзядзька Якуба Коласа. Адзін з лідэраў Беларускай Сацыялістычнай Грамады. Удзельнік I Усебеларускага

з'езда 1917 г., адзін з ініцыятараў абвяшчэння БНР, старшыня яе Найвышэйшай Рады з 1919 г. Пасля завяршэння грамадзянскай вайны прызнаў савецкую ўладу, займаўся навуковай, культурна-асветніцкай і літаратурнай дзейнасцю. Абвінавачаны ў «нацыянал-дэмакратызме». Памёр ў 1940 г. ад сухотаў у саратаўскай турме. Поўнасцю рэабілітаваны ў 1988 г.

**Мяснікоў А.Ф.** – рэвалюцыянер, савецкі партыйны і дзяржаўны дзеяч, адзін з кіраўнікоў устанаўлення савецкай улады на Беларусі. З верасня 1917 г. – старшыня Паўночна-Заходняга камітэта РСДРП(б), са студзеня 1918 г. – старшыня Аблвыкамзаха. Выступаў супраць самастойнасці беларускай рэспублікі. Загінуў у 1925 г. у авіяцыйнай катастрофе.

**Чарвякоў А.Р.** – савецкі партыйны і дзяржаўны дзеяч, адзін з кіраўнікоў устанаўлення савецкай улады на Беларусі. У студзені – маі 1918 г. – камісар Белнацкома. У першым урадзе БССР – наркам асветы. Старшыня СНК БССР (1920–1924 гг.). Старшыня ЦВК БССР (1920–1937 гг.). Актыўны прыхільнік палітыкі беларусізацыі. У чэрвені 1937 г. у час XVI з'езда КП(б)Б пакончыў жыццё самагубствам. Поўнасцю рэабілітаваны ў 1989 г.

## ЛІТАРАТУРА

1. Вішнеўскі, А. Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах / А. Ф. Вішнеўскі, Я. А. Юхо. – Мінск, 2003.
2. Гістарычны шлях беларускай нацыі і дзяржавы. – Мінск, 2001.
3. Гісторыя Беларусі: Вучэбны дапаможнік для ВНУ / Пад рэд. А.Р. Каханоўскага, А.А. Яноўскага. – Мінск, 1997.
4. Гісторыя Беларусі: Вучэбны дапаможнік: у 2 ч. Ч.2. Люты 1917 –1997 гг. / Пад рэд. Я. Новіка, Г. С. Марцуля. – Мінск, 1998.
5. Гісторыя Беларусі: у 6 т.– Т. 5: Беларусь у 1917–1945 гг. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, – 2007.
6. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пач.XXI ст.: у 2 кн. – Кн. 1 / Рэд.кал. А. А. Каваленя [і інш.];– Мінск, 2011.
7. Очерки истории науки и культуры Беларуси IX–XX вв. – Минск. 1996.
8. Рэлігія і царква на Беларусі: энцыклапед. даведнік. – Мінск, 2001.
9. Ходзін, С. М.Гісторыя культуры Беларусі ў 1920–1930-я гг. – Мінск, 2001.
10. Эканамічная гісторыя Беларусі. Курс лекцый. – Мн, 1993.
11. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск, 1993 – 2003.

## ТЭМЫ РЭФЕРАТАЎ

1. Стварэнне БНР, ССРБ і Літбел.
2. Аднаўленне савецкай ўлады. Уваходжанне Савецкай Беларусі ў склад СССР.
3. Узбуйненні тэрыторыі БССР. Канстытуцыя 1927 г..
4. Палітыка беларусізацыі.
5. НЭП у БССР.
6. Палітыка індустрыялізацыі ў Беларусі.
7. Калектывізацыя ў Беларусі і яе вынікі.

## Семінар 6. Беларусь у гады Другой сусветнай вайны і Вялікай Айчыннай вайны

1. Далучэнне Заходняй Беларусі да БССР і палітыка савецкай ўлады.
2. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Прычыны паражэння савецкіх войск на першым этапе вайны.
3. Акупацыйны рэжым. Калабарацыйны рух.
4. Партызанскі і падпольны рух у гады Вялікай Айчыннай вайны. Вызваленне Беларусі.

### ХРАНАЛОГІЯ

**1939 г., 23 жніўня** – падпісанне савецка-германскага Дагавора аб ненападзенні тэрмінам на 10 гадоў (пакт Молатава-Рыбентропа).

**1939 г., 1 верасня –** пачатак Другой сусветнай вайны.

**1939 г., 17 верасня** – паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну.

**1939 г., 28 верасня –** заключэнне дагавора аб дружбе і граніцы паміж СССР і Германіяй.

**1939 г., 10 касірычніка –** прыняццё па ініцыятыве І. В. Сталіна рашэння аб передачы г. Вільні і Віленскага краю Літве.

**1939 г., кастрычнік – 1940 г., сакавік –** савецка-фінская вайна.

**1939 г., лістапад –** прыняцце Вярхоўным Саветам БССР закона аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад БССР.

**1941 г., 22 чэрвеня** – пачатак Вялікай Айчыннай вайны, напад Германіі на СССР.

**1941 г., 22 чэрвеня – канец 20 ліпеня** – гераічная абарона Брэсцкай крэпасці.

**1941 г., 28 чэрвеня –** захоп Мінска германскімі войскамі.

**1941 г., 3-26 ліпеня** – абарона Магілёва часцямі Чырвонай Арміі і апалчэнцамі**.**

**1941 г., 6-10 ліпеня –** "Лепельскі контрудар" – адзін з буйнейшых у пачатовы перыяд вайнытанкавых баёў, у якім з абодзвюх бакоў было задзейнічана каля 1600 баявых машын.

**1941 г., 14 ліпеня –** першае выкарыстанне савецкіх рэактыўных установак "Кацюша" у раёне г. Орша.

**1941 г., 12-19 жніўня –** абарона Гомеля.

**1941 г., 30 верасня – 1942 г., 20 красавіка** – Маскоўская бітва.

**1942 г., май –** стварэнне Цантральнага штаба партызанскага руху пад кіраўніцтвам П. Панамарэнкі пры Стаўцы Вярхоўнага Галоўнакамандавання.

**1942 г., 9 верасня –** стварэнне Беларускага штаба партызанскага руху пад кіраўніцтвам П. Калініна.

**1942 г., 17 ліпеня – 1943 г., 2 лютага** – Сталінградская бітва.

**1943 г., 5 ліпеня – 23 жніўня** – Курская бітва.

**1943 г., 23 верасня** – пачатак вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

**1944 г., 23 чэрвеня – 29 жніўня** – Беларуская наступальная аперацыя «Баграціён» .

**1945 г., 9 мая** – завяршэнне Вялікай Айчыннай вайны.

**1945 г., 2 верасня** – падпісанне Японіяй акта безагаворачнай капітуляцыі, завяршэнне Другой сусветнай вайны.

## ТЭРМІНАЛАГІЧНЫ СЛОЎНІК

**Аперацыя «Баграціён»** – кодавая назва стратэгічнай наступальнай аперацыі па вызваленні Беларусі, Украіны і Прыбалтыкі, якая праводзілася з 23 чэрвеня 1944 па 29 жніўня 1944 г. У правядзенні аперацыі ўдзельнічалі франты: 1-ы Прыбалтыйскі (камандуючы І.Х. Баграмян); 1-ы Беларускі (камандуючы К.К. Ракасоўскі); 2-і Беларускі (камандуючы Г.Ф. Захараў); 3-і Беларускі (камандуючы І.Д. Чарняхоўскі); войскі Дняпроўскай флатыліі і беларускія партызаны. У гонар Беларускай аперацыі на 21 кіламетры ад Мінска на шашы Мінск – Масква насыпаны курган Славы.

**Армія Краёва** – падпольная ваенная арганізацыя, якая падпарадкоўвалася польскаму эміграцыйнаму ўраду ў Лондане. Яе дзейнасць грунтавалася на тэорыі двух ворагаў – Германіі і СССР. Распушчана ў студзені 1945 г.

**Беларуская цэнтральная рада** – марыянетачны ўрад на чале з Р. Астроўскім, заснаваны ў снежні 1943 г. замест Рады даверу, якая створана К. Готбергам, што займаў пасаду генеральнага камісара Беларусі пасля забойства В. Кубэ.

**Вермахт** – узброеныя сілы Германіі ў 1935 – 1945 гг. У гады вайны вермахт складаўся з сухапутных войск, ваенна-паветраных і ваенна-марскіх сіл.

**Генацыд** – знішчэнне асобных груп насельніцтва па расавых, нацыянальных, этнічных і палітычных або рэлігійных матывах.

**Германізацыя** – працэс насаджэння нямецкай мовы і культуры.

**Гета** – ізаляваная частка горада, адведзеная ўладамі для пражывання яўрэяў. На Беларусі было больш за 100 гета. За гады акупацыі тут загінула каля 400 тысяч яўрэяў.

«**Лінія Сталіна**» – 1) неафіцыйная назва абарончых збудаванняў, узведзеных на заходняй граніцы СССР у 1928 – 1939 гг. На тэрыторыі Беларусі «Лінія Сталіна» праходзіла праз раёны Полацка, Мінска, Слуцка, Мазыра; 2) гісторыка-мемарыяльны комплекс у раёне г. Заслаўля Мінскага раёна. Створаны ў 2004 – 2005 гг.

**Калабарацыяністы** – асобы, палітычныя партыі, грамадскія рухі, арганізацыі на часова акупіраваных гітлераўскімі войскамі тэрыторыях іншых краін, якія ў гады Другой сусветнай вайны супрацоўнічалі з захопнікамі ў праве так званага будаўніцтва «Новай Еўропы». Беларускія калабарацыяністы ставілі мэтай стварэнне беларускай нацыянальнай дзяржавы пад пратэктаратам Германіі.

**Канцлагеры** – месцы, дзе праходзіла масавае знішчэнне насельніцтва і прымусова выкарыстоўвалася праца. На Беларусі было створана звыш 260 лагероў смерці, іх філіялаў і аддзяленняў: для ваеннапалонных, для цывільнага насельніцтва, жаночыя, штрафныя, перасыльныя лагеры СС і інш.

**Народнае апалчэнне** – добраахвотніцкія ваенныя і ваенізіраваныя фарміраванні, якія ствараліся для дапамогі Чырвонай Арміі з савецкіх грамадзян, не падлеглых першачарговаму прызыву па мабілізацыі; адна з форм масавага патрыятычнага руху савецкага народа, яго непасрэднага ўдзелу ў вайне супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

«**Новы парадак**» – дзяржаўная сістэма палітычных, эканамічных і ваенных мер, накіраваных на ліквідацыю савецкага ладу, эксплуатацыю нацыянальных багаццяў і рэсурсаў, прыгнечанне і знішчэнне людзей.

**План «Барбароса»** – кодавая назва плана вайны супраць СССР і яго разгрома за 3 – 4 месяцы. Названы па імені германскага караля і імператара «Свяшчэннай рымскай імперыі» Фрыдрыха І Барбароса (XII ст.), які імкнуўся вайной падпарадкаваць суседнія дзяржавы.

**Рэйкавая вайна** – спланаваная ў стратэгічным маштабе акцыя партызан па адначасовым масавым разбурэнні чыгуначных камунікацый з мэтай дэзарганізацыі ваенных перавозак. Праводзілася напярэдадні буйных наступальных аперацый Чырвонай Арміі (з 03.08.1943 – па ліпень 1944 г. )

**Саюз беларускай моладзі** – антысавецкая маладзёная арганізацыя на Беларусі ў час нямецка-фашысцкай акупацыі. Створаны ў 1943 г. пад кіраўніцтвам В. Кубэ на ўзор «Саюза гітлераўскай моладзі».

**Фашызм** – праварадыкальны палітычны рух і ідэалагічная плынь, узнік у Італіі ў 1919 г. Характэрнымі для фашызму з'яўляліся антыкамунізм, знішчэнне дэмакратычных свабод, культ насілля, шавінізм, расізм, антысемітызм, агрэсія.

**Халакост** *(лац. «спалены цалкам»)* – 1) тэрмін навуковай літаратуры, які ўжываецца як сінонім генацыду; 2) тэрмін гістарыяграфіі XX ст. для абазначэння сістэматычнага праследавання і знішчэння яўрэяў нацыстамі і іх памагатымі ў Германіі і на захопленых ёю тэрыторыях у час Другой сусветнай вайны.

## ГІСТАРЫЧНЫЯ ПЕРСАНАЛІІ

**Бурдзейны А. –** генерал, камандуючы танкавым корпусам, які вызваляў Мінск.

**Гаўрылаў П. М., Кіжаватаў А. М., Наганаў А. Ф., Фамін Я. М.** – кіраўнікі абароны Брэсцкай крэпасці.

**Заслонаў К. С.** (партызанскі псеўданім – Дзядзька Косця) – адзін з кіраўнікоў падполля і партызанскага руху ў Віцебскай вобласці. Герой Савецкага Саюза. У 1948 г. у г. Орша Віцебскай вобласці створаны мемарыяльны музей К. Засланава; яго імем названа дэпо ст. Орша.

**Калінін П. З.** – партыйны і дзяржаўны дзеяч БССР, адзін з арганізатараў і дзеячаў партыйнага падполля і партызанскага руху на Беларусі. У гады вайны другі сакратар ЦК КП(б)Б. З верасня 1942 г. начальнік Беларускага штаба партызанскага руху. Аўтар кнігі "Партызанская рэспубліка".

**Корж В. З.** – удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыіі і грамадзянскай выйны ў Іспаніі. Работнік Пінскага абкама КП(б)Б. Арганізаваў і ўзначаліў партызанскі атрад, адзін з першых на Беларусі, які потым пераўтварыўся ў

партызанскую брыгаду. У час баявых дзеянняў атрымаў воінскае званне генерал-маёра.

**Кубэ В.** – са жніўня 1941 г. узначальваў акупацыйную адміністрацыю Генеральнай акругі Беларусь. Быў забіты ў 1943 г. мінскімі падпольшчыкамі. За гэты акт членам падполля Мазанік А. Р., Осіпавай М. Б. і Траян Н. В. прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

**Купрыянава Н.Ф.** – маці пяці сыноў, якія загінулі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Узнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР. Стала правобразам Маці-патрыёткі ў скульптурнай кампазіцыі манумента, які пастаўлены ў 1975 г. у г. Жодзіна. Памерла ў 107-гадовым узросце. У 1980 г. у доме, дзе жыла Н.Ф. Купрыянава, быў адкрыты музей.

**Машэраў П. М.** – арганізатар Расонскага партыйна-камсамольскага падполля, камандзір партызанскага атрада імя Шчорса, камісар партызанскай брыгады імя Ракасоўскага Віцебскай вобласці, сакратар Вілейскага падпольнага абкома камсамола. У 26 гадоў стаў Героем Савецкага Саюза.

**Панамарэнка П. К.** – дзяржаўны дзеяч, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў падполля і партызанскага руху. У Вялікую Айчынную вайну ўзначальваў Цэнтральны штаб партызанскага руху.

**Паўлаў Дз. Р.** – удзельнік грамадзянскай вайны, вайны ў Іспаніі, савецка-фінляндскай вайны. З чэрвеня 1940 г. па чэрвень 1941 г. – камандуючы вайскамі Заходняй асобай ваеннай акругі. 27 ліпеня 1941г. асуджаны і расстраляны. Рэабілітаваны 31.07. 1957 г.

**Ракасоўскі К. К.** – маршал Савецкага Саюза. Удзельнік Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў. У Вялікую Айчынную вайну камандаваў 16-й арміяй на Заходнім фронце, войскамі 1-га і 2-га Беларускіх франтоў. Ганаровы грамадзянін г. Гомеля.

**Фролікаў Д. –** камандзір танка, які першым уварваўся ў Мінск. Загінуў у 1844 г.

**Чарняхоўскі І. Д.** – ваенны дзеяч, генерал арміі (1944), двойчы Герой Савецкага Саюза (1943, 1944). З красавіка 1944 г. камандуючы войскамі 3-га Беларускага фронта, што прымалі ўдзел у вызваленні Беларусі. У гонар Чарняхоўскага пас. Косіна Лагойскага раёна перайменаваны ў Чарняхоўскі, яго імем названы горад у Калінінградскай вобласці.

**Шмыроў М. П.** (партызанскі псеўданім – Бацька Мінай) – адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху ў Віцебскай вобласці. Герой

Савецкага Саюза (1944). Акупанты, каб адпомсціць яму, узялі ў заложнікі чацвярых яго дзяцей і двух сваякоў і ў лютым 1942 г. расстралялі.

**Якубоўскі І.І.** – ураджэнец Горацкага раёна, двойчы Герой Савецкага Саюза, маршал Савецкага Саюза. Удзельнік абарончых баёў пад Мінскам, Магілёвам, Сталінградскай і Курскай бітваў, вызвалення Украіны, Польшчы, Берлінскай і Пражскай аперацый і г.д. Яго імем названы Кіеўскае вышэйшае танкавае інжынернае вучылішча, вуліцы ў Асіповічах, Бялынічах, Магілеве, Мінску, Горках.

## ЛІТАРАТУРА


1. Беларусь: страницы истории / редсовет: А.А. Коваленя [и др.]. – Минск, 2011.
2. Бригадин, П.И. История Беларуси в контексте европейской истории: курс лекций. – Минск, 2007.
3. Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны): учеб. пособие / Под ред. А. А. Ковалени, Н. С. Сташкевича. – Минск, 2004.
4. Гісторыя Беларусі: у 2 ч.: курс лекцый. / Пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. – Мінск, 2000; 2002.
5. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. / М.У. Смяховіч [і інш.] ; рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.]. – Мінск, 2012. – Кн. 2.
6. Новик, Е.К., Качалов, И.Л., Новик, Н.Е. История Беларуси: с древнейших времен до 2012 г. : учебное пособие. — 3-е изд., испр. и доп. – Минск, 2012.
7. Гісторыя Беларусі: у 6 т.– Т. 5: Беларусь у 1917–1945 гг. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2007.


## ТЭМЫ РЭФЕРАТАЎ

1. Абарончыя баі ў Беларусі (ліпень-жнівень 1941 г.).
2. Дзейнасць камсамольска-маладзёжнага падполля на акупіраванай тэрыторыі Беларусі.
3. Палітыка нямецкіх улад на акупаванай тэрыторыі.
4. Барацьба падпольшчыкаў у акупіраваным Мінску.
5. Узаемадзеянне партызан і войскаў Чырвонай Арміі ў перыяд вызвалення Беларусі.

6. Злачынствы немецка-фашысцкіх акупантаў і іх памагатых на тэрыторыі Беларусі.
7. Героі Вялікай Айчыннай вайны – мае землякі.
8. Вялікая Айчынная вайна ў лёсе маёй сям'і (гісторыі малой Радзімы).

**Семінар 7. Савецкая Беларусь: дасягненні і праблемы стваральнай працы народа (другая палова 40-х – 80-я гады ХХ ст.)**

1. Аднаўленне гаспадаркі БССР ў пасляваенныя гады.
2. Грамадска-палітычнае і сацыяльнае жыццё БССР ў канцы 40-х – 50 гг.
3. Сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР ў 60 – 80 гг.
4. Культура БССР ў другой палове ХХ ст.

## ХРАНАЛОГІЯ

**1945 г., 26 чэрвеня** – падпісанне дэлегацыяй БССР як адной з краін-заснавальніц Арганізацыі Аб'яднаных Нацый яе Статута.

**1946-1950 гг.** – ажыццяўленне чацьвёртага пяцігадовага плана развіцця народнай гаспадаркі БССР.

**1947 г.** – адмена картачнай сістэмы забеспячэння насельніцтва.

**1947 г.** – выпушчаны першыя самазвалы МАЗ-205 на Мінскім аўтамабільным заводзе.

**1949-1950 гг.** – правядзенне масавай калектывізацыі сельскай гаспадаркі ў заходніх абласцях БССР.

**1951 г.**– зацверджаны Дзяржаўны сцяг БССР.

**1952 г.** – у г. Мінску адкрылася першая тралейбусная лінія.

**1952 г.** – беларускія спартсмены ўпершыню прынялі ўдзел у XV Алімпійскіх гульнях у Хельсінкі (Фінляндыя).

**1953-1964 гг.** – палітыка лібералізацыі грамадска-палітычнага жыцця ў СССР.

**1953 г.**– на Мінскім трактарным заводзе выпусцілі першы серыйны колавы трактар «Беларусь».

**1954 г.**– уступленне БССР у міжнародную арганізацыю працы (АП) і Арганізацыю па пытаннях асветы, навукі і культуры (ЮНЕСКА).

**1954 г.** – першыя групы моладзі адпраўлены з Беларусі ў Казахстан на асваенне цалінных зямель.

**1954 г.** – адкрыццё ў г. Мінску манумента Перамогі.

**1956 г.** – ХХ з'езд КПСС, пачатак «палітычнай адлігі».

**1956 г., 1 студзеня** – першая перадача Мінскага тэлецэнтра.

**1957–1965 гг.** – дзейнасць Савета народнай гаспадаркі БССР.

**1958 г.** – выпушчаны першыя кар’ерныя самазвалы на Беларускім аўтамабільным заводзе ў г. Жодзіне.

**1958 г. –** заснаванне новага беларускага горада – Салігорска.

**Канец 1950-х – пачатак 1960-х гг. –** барацьба з падсобнымі гаспадаркамі ў калгаснікаў.

**1960 г.** – выпушчана першая ЭВМ “Мінск-1” на Мінскім заводзе электронных вылічальных машын імя Р. К. Арджанікідзе

**Першая палова 1960-х гг.** – будаўніцтва першага і другога салігорскіх калійных камбінатаў, Гомельскага суперфасфатнага і Гродзенскага азотна-тукавага заводаў

**1960 г.–** з’яўленне ў Беларусі новага віду транспарта – трубаправоднага (газаправод «Дашава – Мінск»).

**1961 г., кастрычнік** – на ХХІІ з’ездзе КПСС была прынята прагарама пабудовы камунізму ў СССР да пачатку 1980-х гадоў.

**1961 г. –** пачатак выпуску халадзільнікаў “Мінск-1”.

**1962 г. –** пуск першага ў беларусі рэактара ў пасёлку Сосны Мінскага раёна.

**1963 г.** – увядзенне ў строй першай чаргі Салігорскага калійнага камбіната, пачатак вытворчасці калійных угнаенняў.

**1964 г. –** атрыманне першай прамысловай нафты на Рэчыцкім радовішчы.

**1964 г. –** пераход да 10-гадовай сярэдняй адукацыі.

**1965 г.–** гаспадарчая рэформа, ініцыятарам якой быў старшыня Савета Міністраў СССР А. М. Касыгін, пачатак пераводу прадпрыемстваў на гаспадарчы разлік.

**1965–1980 гг.–** дзейнасць П. М. Машэрава на пасадзе Першага сакратара ЦК КП(б)Б.

**Канец 1960-х гг.** – пачатак стварэння ў БССР буйных жывёлагадоўчых комплексаў.

**1960-е – 1980-е гг. –** правядзенне шырокамасштабных меліярацыйных работ на Палессі.

**1969 г.** – адкрыццё: 1) мемарыяльнага архітэктурна-скульптурнага комплексу «Хатынь» (у Лагойскім раёне); 2) Кургана Славы Савецкай Арміі – вызваліцельніцы Беларусі (Смалявіцкі раён).

**1974 г.–** прысваенне г. Мінску ганаровага звання «Горад -герой».

**1974 г.–** адкрыццё ў г. Полацку помніка Францыску Скарыну.

**1977 г., чэрвень** – у Мінску пачалося будаўніцтва метрапалітэна.

**1977 г. –** першы касмічны палёт ураджэнца Беларусі У. В. Кавалёнка.

**1978 г.–** прынядце 4-й Канстытуцыі БССР.

**1982 г.** – стварэнне Аграрна-прамысловага комплексу СССР з мэтай павышэння эфектыўнасці сельскай гаспадаркі і прынядце "Харчовай праграмы" СССР.

## ТЭРМІНАЛАГІЧНЫ СЛОЎНІК

**Аўтарытарызм** – палітычны рэжым, які характарызуецца неабмежаванай уладай адной асобы (групы асоб) ці дзяржаўнага органа.

**Беларускі эканамічны раён** – адзін з 105 створаных у СССР тэрытарыяльна-эканамічных адзінак (як вынік рэарганізацыі кіраўніцтва прамысловасцю і будаўніцтвам у 1957 г.).

**Валюнтарызм** – палітычны напрамак, пры якім воля кіруючай асобы, выканаўчай улады або палітычнай партыі з'яўляецца вызначальнай у грамадскім жыцці.

**Інтэнсіўны шлях** – шлях развіцця прамысловасці, які звязаны з ростам вытворчасці на аснове паляпшэння якасных паказчыкаў, перш за ўсё ўкаранення ў вытворчасць дасягненняў навукі і тэхнікі і павышэння прадукцыйнасці працы.

**Інтэнсіфікацыя вытворчасці** – развіццё вытворчасці на аснове выкарыстання больш эфектыўных сродкаў вытворчасці, тэхналагічных працэсаў, передавых метадаў арганізацыі працы, дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу.

**Навукова-тэхнічная рэвалюцыя** – укараненне навейшых дасягненняў навукі і тэхнікі ў вытворчасць, якаснае пераўтварэнне прадукцыйных сіл на аснове навуковых дасягненняў.

**Меліярацыя** *(лац. melioratio – паляпшэнне)* – комплекс гідратэхнічных і гаспадарча-арганізацыйных мерапрыемстваў, накіраваных на карэннае паляпшэнне глебы. На Беларусі меліярацыйныя работы маюць шматвяковую гісторыю. Паводле архіўных дакументаў, іх пачатак адносіцца да першай паловы XVI ст. У савецкі час буйнамаштабныя меліярацыйныя работы пачаліся на Палессі ў сярэдзіне 60-х гадоў XX ст.

**Рух за камуністычныя адносіны да працы** – адна з формаў сацыялістычнага спаборніцтва, якая была шырока распаўсюджана на прадпрыемствах Беларусі ў 60-я – пачатку 70-х гадоў XX ст. Прадугледжваў спалучэнне барацьбы за дасягненне высокіх вытворчых паказчыкаў з актыўным удзелам у грамадскім жыцці, імкненнем да павышэння культурнага ўзроўню працоўных.

**Саўнаргас** (Савет народнай гаспадаркі) – орган, створаны ў 1957 г. для кіраўніцтва прадпрыемствамі прамысловасці і будаўніцтва ў межах Беларускага эканамічнага раёна.

«**Халодная вайна**» – тэрмін, якім абазначаецца перыяд ваенна-палітычнай канфрантацыі дзяржаў супрацьлеглых сістэм, калі адкрытых ваенных сутыкненняў не адбываецца, але вядзецца гонка ўзбраенняў, ужываюцца спробы эканамічнага націску, арганізуюцца ваенна-палітычныя блокі і саюзы. Першым адкрытым ідэалагічным маніфестам «халоднай вайны» лічыцца прамова У. Чэрчыля (1946 г.) у г. Фултан ЗША. Спынілася ў канцы 80 – пачатку 90-х гадоў XX ст. у сувязі з роспускам Арганізацыі Варшаўскага дагавора і распадам СССР.

**Хімізацыя** – кірунак навукова-тэхнічнага прагрэсу ў народнай гаспадарцы, які характарызуецца ўкараненнем хімічных матэрыялаў і метадаў апрацоўкі ў вытворчасць і побыт.

**Экстэнсіўны шлях** – шлях развіцця эканомікі за кошт пашырэння вытворчасці і прыцягнення дадатковых капіталаў і працоўных рук.

## ГІСТАРЫЧНЫЯ ПЕРСАНАЛІІ

**Азгур З. І.** – беларускі скульптар, народны мастак СССР і БССР. Стварыў шэраг скульптурных партрэтаў герояў Вялікай Айчыннай вайны: М.Гастэлы, М. Шмырова, В. Талаша; прадстаўнікоў беларускай культуры: Ф. Скарыны, М. Гусоўскага. З'яўляецца аўтарам помніка П. Машэраву ў Віцебску. У 1999 г. адкрыты ў Мінску мемарыяльны музей гэтага скульптара.

**Жэбрак А.Р.** – беларускі генетык, селекцыянер, грамадскі дзеяч. З 1940 г. акадэмік АН БССР, з 1947 г. прэзідэнт Акадэміі навук. 16.10.1947г. звольнены з пасады за выступленні супраць «лысенкаўшчыны».

**Кавалёнак У. В.** – лётчык-касманаўт СССР (нарадзіўся ў в. Белае Крупскага раёна Мінскай вобласці). Двойчы Герой Савецкага Саюза, Герой ГДР. Правёў у космасе 216,38 сутак.

**Касыгін А. М.** – савецкі партыйны і дзяржаўны дзеяч. У 1964 – 1980 гг. – старшыня Савета Міністраў СССР. Адзін з ініцыятараў эканамічнай рэформы 1965 г., у аснову якой была пакладзена ідэя спалучэння цэнтралізаванага кіравання эканомікай з элементамі рынка і гаспадарчага разліку. Аднак, увогуле, рэформа не закранала асноў існуючай сістэмы вядзення народнай гаспадаркі.

**Клімук П.** – лётчык-касманаўт (нарадзіўся ў в. Камароўка Брэсцкага раёна). Двойчы Герой Савецкага Саюза, тройчы лятаў у космас (1973, 1975,

1978). Узначальваў Расійскі цэнтр падрыхтоўкі касманаўтаў імя Ю. Гагарына. У космасе правёў 78,8 сутак.

**Мазураў К. Т.** – беларускі партыйны і дзяржаўны дзеяч, актыўны ўдзельнік Вялікай Айчыннай вайны, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў патрыятычнага падполля і партызанскага руху. З 1953 па 1956 г. займаў пасаду Старшыні Савета Міністраў БССР, а ў 1956 – 1965 гг. – пасаду Першага сакратара ЦК КПБ. Выступаў супраць перадачы прысядзібных участкаў у грамадскія гаспадаркі і ўкаранення кукурузы ў замест кармавых траў і бульбы. Пра яго з павагай гаварылі: «асцярожны беларус».

**Машэраў П.М.** – беларускі партыйны і дзяржаўны дзеяч, актыўны ўдзельнік Вялікай Айчыннай вайны, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў патрыятычнага падполля і партызанскага руху. Герой Савецкага Саюза і Герой Сацыялістычнай Працы. З 1965 г. па 1980 г. працаваў Першым сакратаром ЦК КПБ. У перыяд яго дзейнасці Беларусь дасягнула значных поспехаў у сваім развіцці, стала адной з развітых рэспублік былога СССР. Карыстаўся вялікай павагай сярод насельніцтва за прастату ў абыходжанні, даступнасць, дэмакратычнасць. Загінуў у аўтакатастрофе.

**Шырма Р.Р.** – народны артыст Беларусі і СССР, дырыжор, фальклярыст, музычны і грамадскі дзеяч. У 1940 г. арганізаваў і да 1970 г. узначальваў харавую капэлу. У 1966 – 1978 гг. быў старшынёй праўлення Саюза кампазітараў БССР і сакратаром праўленння Саюза кампазітараў СССР.

## ЛІТАРАТУРА


1. Беларусь: страницы истории / редсовет: А.А. Коваленя [и др.]. – Минск, 2011.
2. Гістарычны шлях беларускай нацыі і дзяржавы. – Мінск, 2001.
3. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. / М. У. Смяховіч [і інш.] ; рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.] . – Мінск, 2012. – Кн. 2.
4. Иллюстрированная хронология истории Беларуси. – Минск, 1998.
5. Очерки истории науки и культуры Беларуси. IX–XXвв. – Минск. 1996.
6. Рэлігія і царква на Беларусі: энцыклапед. даведнік. – Мінск, 2001.
7. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск, 1993 – 2003.
8. Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. – Мінск, 1989.
9. Юхо, Я. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: у 2 ч. – Мінск, 2000;2003.

## ТЭМЫ РЭФЕРАТАЎ

1. Дапамога народаў СССР Беларусі ў аднаўленні эканомікі рэспублікі ў пасляванны час.
2. Роля і месца БССР на міжнароднай арэне ў перыяд канфрантацыі дзвюх грамадска-палітычных сістэм у другой палове 40-х – першай палове 80-х гг. ХХст.
3. Жыццё і дзейнасць П. М. Машэрава.
4. Роля навукі ў развіцці прамысловай вытворчасці БССР у 60-пачатку 80-х гг.
5. Аграрны комплекс  БССР ў 50-х – першай палове 80-х гг.
6. Вышэйшая адукацыя  БССР у 50-х – першай палове 80-х гг.
7. Творчасць выдатных дзеячаў культуры БССР (З. Азгур, М. Савіцкі і інш.).
8. Развіццё архітэктуры БССР у 50-х – першай палове 80-х гг.
9. Асаблівасці развіцця беларускага тэатра ў 50-х – першай палове 80-х гг.
10. Беларуская музычная культура ў 50-х – першай палове 80-х гг.

## Семінар 8. Суверэнная Рэспубліка Беларусь ва ўмовах глабалізацыі

**План**

1. Нарастанне крызіснай сітуацыі. Перабудова і яе вынікі.
2. Абвяшчэнне суверэннай Рэспублікі Беларусь. Асноўныя рысы яе сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага жыцця ў сучасных умовах.
3. Беларусь на міжнароднай арэне. Знешняя палітыка ў 90-я гг.
4. Беларусь на сучасным этапе. Змены ў грамадска-палітычным і сацыяльна-эканамічным развіцці.
5. Беларускае замежжа. Эміграцыя і яе культура.

## ХРАНАЛОГІЯ

**1985 г., красавік** – узяты курс на «паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця» у СССР.

**1985-1991 гг. –** правядзенне ў СССР палітыкі перабудовы.

**1986 г., 26 красавіка** – аварыя на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі.

**1989 г., чэрвень** – заснавана Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны.

**1990 г.** – Вярхоўны Савет рэспублікі прыняў закон “Аб грамадскіх аб’яднаннях”, “Аб мовах у Беларускай ССР”, аб уласнасці ў Беларусі, якія прадугледжваў наяўнасць прыватнай, калектыўнай і дзяржаўнай уласнасці.
**1990 г., 27 ліпеня** – Вярхоўны Савет БССР урачыста прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай ССР. Прыняты закон «Аб культуры ў Беларускай ССР».
**1991 г., сакавік** – усесаюзны рэферэндум аб лёсе СССР. У БССР за захаванне Саюза ССР прагаласавала 82,7% ад усіх, хто прыняў удзел у рэферэндуме.
**1991 г., 19–21 жніўня** – утварэнне Дзяржаўнага камітэта па надзвычайнаму становішчу (ДКНС), увядзенне надзвычайнага становішча ў СССР (спроба дзяржаўнага перавароту).
**1991 г., 25 жніўня** – прыняццё Вярхоўным Саветам БССР закона «Аб наданні статусу канстытуцыйнага закона Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР».
**1991 г., 26 жніўня** – прыняцце Закона «Аб забеспячэнні палітычнай і эканамічнай самастойнасці Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі». У гісторыі Беларусі пачаўся новы этап – этап незалежнай дзяржавы.
**1991 г., 17 – 19 верасня** –сесія Вярхоўнага Саветапрыняла рашэнне перайменаваць БССР у “Рэспубліку Беларусь”, а ў скарочаных назвах – «Беларусь». Зацверджаны законы «Аб дзяржаўным сцягу Рэспублікі Беларусь», «Аб дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусь».
**1991 г., 8 снежня** – падпісанне Пагаднення аб стварэнні СНД.
**1992 г.** – адкрыццё ў Мінску прадстаўніцтва ААН; падпісанне Рэспублікай Беларусь у Хельсінкі Заключнага акта Савета па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе. Абвяшчэнне Рэспублікі Беларусь бяз’ядзернай зонай і дзяржавай, якая імкнецца да нейтралітэту. Канчатковы вывад ядзернай зброі за межы рэспублікі – 1996 г.
**1992 г.**– прыняцце закона «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны».
**1992 г.**– пачатак правядзення ў г. Віцебску Беларуссю, Расіяй і Украінай фестывалю песні “Славянскі базар” .
**1993 г.**– уваходжанне Рэспублікі Беларусь у Арганізацыю Дагавора аб калектыўнай бяспецы (АДКБ).
**1993 г.** – увядзенне ў абарачэнне разліковых білетаў Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь.

**1993 г. –** пачатак правядзення ў г. Маладзечне фестывалю маладых выканаўцаў беларускай песні.
**1994 г., люты –** Беларусь упершыню накіравала нацыянальную каманду на XVII зімовую Алімпіяду ў Нарвегіі.
**1994 г., 15 сакавіка–** прыняцце Вярхоўным Саветам Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.
**1994 г., 10 ліпеня –** Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь абраны А.Р. Лукашэнка.
**1995 г., 14 мая–** рэспубліканскі рэферэндум па пытаннях дзяржаўнага статуса беларускай і рускай моў, новай дзяржаўнай сімволікі (герба і сцяга), эканамічнага збліжэння (інтэграцыі) з Расіяй.
**1995 г.** – далучэнне Беларусі да Праграмы НАТА «Партнёрства дзеля міру».
**1996 г., 2 красавіка** – падпісанне Дагавора аб стварэнні Супольнасці Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі.
**1996 г., 24 лістапада** – рэспубліканскі рэферэндум, які адобрыў унясенне дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь і перанясенне Дня незалежнасці з 27 ліпеня на 3 ліпеня.
**1996 г.** – Рэспубліка Беларусь упершыню была прадстаўлена самастойнай нацыянальнай камандай на XXVI Алімпійскіх гульнях у Атланце (ЗША).
**1997 г., 2 красавіка** – утварэнне Саюза Беларусі і Расіі.
**1996, 2001, 2006, 2010 гг.** – першы, другі, трэці і чацвёрты Усебеларускія народныя сходы.
**1999 г., 8 снежня** – падпісанне паміж Беларуссю і Расіяй Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы.
**2000 г.** – заснаванне Еўразійскай эканамічнай супольнасці (ЕўрАзЭС).
**2001, 2006, 2010 гг.** – выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, перамогу на выбарах атрымаў А. Р. Лукашэнка.
**2002 г.** – зацвярджэнне Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь.
**2004 г., 17 кастрычніка** – рэспубліканскі рэферэндум аб унясенні паправак у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, звязаных з парадкам правядзення выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.
**2004 г., сакавік** – прыняцце Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2020 г. (НСУР-2020).
**2005 г., сакавік** – прыняцце Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі на 2005 – 2010 гг.

**2005 г.** – падпісанне Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб стварэнні Парку высокіх тэхналогій.
**2006 г.** – адкрыццё Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ў новым будынку.
**2007 г., сакавік** – прынясце Дзяржаўнай праграмы інавацыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь.
**2010 г., верасень**– уступіў у дзеянне закон "Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі", прыняты 23 ліпеня 2008 г.
**2012 г., 1 студзеня** – уступілі ў сілу 17 пагадненняў, якія фарміруюць дагаворна-прававую базу Адзінай эканамічнай прасторы Беларусі, Казахстана і Расіі – стварэнне Мытнага саюза Рэспублікі Беларусь, Рэспублікі Казахстан і Расійскай Федэрацыі.
**2014 г., 29 мая** – падпісанне міждзяржаўнага Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе (ЕЭС) паміж Расіяй, Казахстанам і Беларуссю.

## ТЭРМІНАЛАГІЧНЫ СЛОЎНІК

**Галоснасць** – публічнасць, права чалавека выражаць публічна свае погляды і перакананні, свабода вуснага і пісьмовага слова, адкрытасць і даступнасць для насельніцтва інфармацыі аб тым, што адбываецца ў дзяржаве і грамадстве.

**Гаспадарчы разлік** – метад кіравання дзяржаўнымі прадпрыемствамі, заснаваны на ўліку выдаткаў вытворчасці, устанаўленні планавай даходнасці прадпрыемства; сістэма забеспячэння бясстратнай, прыбытковай работы вытворчых звенняў гаспадаркі і іх адказнасці за сваю дзейнасць.

**Дэмакратызацыя** – распаўсюджванне і замацаванне формаў дзяржаўнага ладу, заснаваных на прызнанні прынцыпу народаўладдзя, свабоды, роўнасці грамадзян.

**Дзяржава прававая** – прававая форма арганізацыі і дзейнасці публічнай палітычнай улады і яе ўзаемаадносін з індывідамі як суб'ектамі права.

**Дзяржава сацыяльная** – дзяржава, якая імкнецца забяспечыць кожнаму грамадзяніну належныя ўмовы існавання, сацыяльнай абароненасці, саўдзельніцтва ў кіраванні вытворчасцю.

**Ідэалогія беларускай дзяржавы** – сукупнасць ідэй і ідэалаў, якія адлюстроўваюць нацыянальна-гістарычныя традыцыі і каштоўнасці беларускага народа, адпавядаюць мэтам і асаблівасцям развіцця беларускага грамадства.

**Інвестыцыі** – доўгатэрміновыя ўкладанні капіталу ў галіны эканомікі ўнутры краіны і за мяжой.

**Інтэграцыя** *(лац. integer – цэлы)* – працэс, вынікам якога з'яўляецца дасягненне адзінства і цэласнасці, узгодненасць унутры сістэмы, заснаванай на ўзаемасувязі і ўзаемадапаўняльнасці асобных спецыялізаваных элементаў.

**Канстытуцыя** – асноўны закон дзяржавы, што вызначае яе грамадскае і дзяржаўнае ўладкаванне, парадак і прынцыпы ўтварэння органаў улады, выбарчую сістэму, асноўныя правы і абавязкі грамадзян.

**Нацыянальны суверэнітэт**– незалежнасць і поўнаўладдзе суб'екта дзяржаўна-палітычных і прававых адносін пры прыняцці рашэнняў у межах сваёй кампетэнцыі і выкананні паўнамоцтваў улады. Так, суверэнітэт БССР быў абвешчаны Дэкларацыяй 27 ліпеня 1990 г.

**Нейтральная дзяржава** – дзяржава, знешнепалітычны курс якой характарызуецца няўдзелам ва ўзброеных канфліктах (войнах) і ваенна-палітычных саюзах.

**Парламент (Нацыянальны Сход Рэспублікі Беларусь) –** вышэйшы заканадаўчы орган Рэспублікі Беларусь; складаецца з дзвюх палат: Савета Рэспублікі і Палаты Прадстаўнікоў.

**Самафінансаванне** – сістэма гаспадарання, пры якой прадпрыемствы пакрываюць свае бягучыя затраты і затраты на расшыранае ўзнаўленне з уласных крыніц.

**Савет Міністраў –** выканаўчая галіна ўлады ў Рэспубліцы Беларусь, цэнтральны орган дзяржаўнага кіравання.

**Сацыяльна арыентаваная рыначная эканоміка** – мадэль эканамічнага развіцця, пры якой існуе дзяржаўны і прыватны сектары эканомікі, а дзяржава займае вызначальную ролю ў рэгуляванні эканамічных працэсаў і фарміраванні ўмоў для забеспячэння патрэб насельніцтва.

## ГІСТАРЫЧНЫЯ ПЕРСАНАЛІІ

**Алфёраў Ж. І.** – лаўрэат Нобелеўскай прэміі па фізіцы, ураджэнец Беларусі. Яго адкрыцці ў галіне сучасных інфармацыйных тэхналогій, у прыватнасці, вынаходніцтва хуткіх транзістараў, лазерных дыёдаў, інтэгральных мікрасхем-«чыпаў», дазволілі зрабіць звычайнымі такія рэчы, як прайгравальнік кампакт-дыскаў, пульт дыстанцыйнага кіравання, сонечныя батарэі, мабільныя тэлефоны. Ж.І. Алфёраў ўзнагароджаны ордэнам Ф. Скарыны, ганаровы грамадзянін г. Віцебска.

**Андрэйчанка У. П.** – дзяржаўны дзеяч Рэспублікі Беларусь – Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

**Карват У.М.** – ваенны лётчык, якому ў 1996 г. першаму ў рэспубліцы прысвоена (пасмяротна) вышэйшая ступень адзнакі Рэспублікі Беларусь –

Герой Беларусі. Цаной уласнага жыцця ён адвёў палаючы самалёт у бок ад в. Вялікае Гацішча Баранавіцкага раёна і тым захаваў жыццё многіх людзей. Герой Беларусі – вышэйшая ваінская і працоўная ўзнагарода.

**Кішчанка А. –** беларускі мастак, аўтар «Габелену стагоддзя», якому прысвоены статус гісторыка-культурнай спадчыны. На габелене адлюстравана звыш 80 вядомых палітыкаў і дзеячаў культуры XX ст. Ён быў вытканы ўручную на Барысаўскім камбінаце прыкладнога мастацтва. Яго плошча складае 266 м², а вес – 286 кг. Габелен унесены ў кнігу рэкордаў Гінесу.

**Лукашэнка А. Р.** – дзяржаўны дзеяч Рэспублікі Беларусь. У 1990 – 1994 гг. – дэпутат Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. 10.07.1994 г. абраны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. Галоўнакамандуючы Узброенымі сіламі Рэспублікі Беларусь, узначальвае Савет Бяспекі. У 2001 г., 2006 г. і 2010 г. быў абраны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь на чарговы тэрмін. Паслядоўна прытрымліваецца курса эканамічнага і сацыяльнага развіцця краіны з мэтай умацавання беларускай дзяржаўнасці і паляпшэння дабрабыту народа.

**Мулявін У. Г. –** народны артыст СССР (1991 г.), музыкант, заснавальнік і мастацкі кіраўнік беларускага вакальна-інструментальнага ансамбля «Песняры». Аўтар шматлікіх апрацовак беларускіх песень. У 2001 г. узнагароджаны ордэнам Ф. Скарыны. У Маскве на Алеі зорак закладзена зорка ў гонар У. Мулявіна і ансамбля «Песняры».

**Мясніковіч М. У.** – дзяржаўны дзеяч Рэспублікі Беларусь, доктар эканамічных навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі. З снежня 2010 г. займае пасаду прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь.

**Пташук М. М.** – вядомы беларускі кінарэжысёр. Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. Народны артыст Беларусі (1990 г.). Зняў шэраг кінафільмаў па творах беларускіх пісьменнікаў: «Вазьму твой боль» (па І. Шамякіну), «Чорны замак Альшанскі» (па У. Караткевічу), «Знак бяды» (па В. Быкаву). Рэжысѐр пяцісерыйнай кінастужкі «Час выбраў нас». Апошні фільм – «У жніўні 44-га ...».

**Рубінаў А. М.** – дзяржаўны дзеяч Рэспублікі Беларусь. З 2010 г. – Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

**Савіцкі М. А.** – савецкі і беларускі мастак. Народны мастак СССР (1978 г.) і БССР (1972 г.), сапраўдны член Расійскай Акадэміі мастацтваў і Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, узнагароджаны ордэнам Ф. Скарыны (№ 1). У 2006 г. мастаку прысвоена званне «Герой Беларусі». У гады Вялікай Айчыннай вайны М. Савіцкі –

удзельнік абароны Севастопаля. Быў вязнем фашысцкіх канцлагераў Бухенвальд, Дахаў і інш. Аўтар мастацкіх твораў, прысвечаных Вялікай Айчыннай вайне, ратнаму і працоўнаму подзвігу савецкіх людзей, наступствам аварыі на Чарнобыльскай АЭС і інш. (цыклы карцін «Лічбы на сэрцы», «Чорная быль» і інш).

**Сакалоўскі Н.** – беларускі кампазітар, адзін з аўтараў Дзяржаўнага гімна БССР, існаваўшага з 1955 г. Тэкст гімна на словы М. Клімковіча быў дапрацаваны У. Карызнай. Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь уяўляе сабой музыкальна-паэтычны твор, які заклікае да аб'яднання ўсіх жыхароў нашай краіны – Рэспублікі Беларусь.

**Філарэт** – мітрапаліт Мінскі і Слуцкі (у свеце Вахрамееў Кірыла Варфаламеевіч), праваслаўны царкоўны дзеяч Беларусі. Заснавальнік першай у рэспубліцы праваслаўнай духоўнай акадэміі. Пры яго ўдзеле ўзноўлены крыж Е. Полацкай (1997 г.). За шматгадовы ўклад у духоўнае адраджэнне беларусаў, умацаванне сяброўства і брацкіх сувязей паміж народамі, развіццѐ міжканфесійнага дыялога ўдастоены звання Героя Беларусі.

## ЛІТАРАТУРА


1. Адамушко, В. Современная геральдика Беларуси / В. Адамушко, М. Елинская. – Минск, 2012.
2. Баландзін, К. І., Хромчанка, Дз. М. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай цывілізацыі / К.І. Баландзін, Дз. М. Хромчанка. – Мінск, 2009.
3. Беларусь: страницы истории /редсовет: А. А. Коваленя [и др.]. – Минск, 2011.
4. Герб, Сцяг і Гімн Беларускай Дзяржавы = Герб, Флаг и Гимн Белорусской Державы : навукова-папулярнае выданне / аўтар тэксту А. Марціновіч. – Мінск, 2011.
5. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. / М. У. Смяховіч [і інш.] ; рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.]. – Мінск, 2012. – Кн. 2.
6. Исторический выбор Беларуси: лекция Президента Республики Беларусь в Белорусском государственном университете, Минск, 14 марта 2003 г. – Минск, 2003.
7. Мельник, В.А. Основы идеологии белорусского государства: учеб. пособие / В.А. Мельник. – Минск, 2011.

8. На шляху станаўлення беларускай нацыі: гістарыяграфічныя здабыткі і праблемы / В. В. Яноўская [і інш.] ; навук. рэд. В. В. Яноўская. – Мінск, 2011.
9. Новик, Е.К., Качалов, И.Л., Новик, Н.Е. История Беларуси: с древнейших времен до 2012 г. : учебное пособие. — 3-е изд., испр. и доп. – Минск, 2012.
10. Основы идеологии белорусского государства: учеб. пособие / под общ. ред. Г. А. Василевича, Я. С. Яскевич. – Минск, 2004.
11. Рэспубліка Беларусь. 20 год незалежнасці : зборнік матэрыялаў Міжнароднай навук.-практ. каферэнцыі, Мінск, 24–25 лістапада 2011 г. / рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. – Мінск, 2012.

## ТЭМЫ РЭФЕРАТАЎ

1. Рэспубліка Беларусь у сістэме міжнародных адносін.
2. Утварэнне незалежнай Рэспублікі Беларусь.
3. Беларуская дыяспара ў краінах блізкага і далёкага замежжа.
4. Чарнобыльская аварыя: вынікі і шляхі пераадолення ў Беларусі.

# РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ

## КАНТРОЛЬНЫЯ ТЭСТЫ

**1. Канчатковае засяленне тэрыторыі Беларусі першабытным чалавекам адбылося ў:**

☐ 1) сярэднім палеаліце;
☐ 2) верхнім палеаліце;
☐ 3) мезаліце;
☐ 4) неаліце.

**2. Першая спроба засяліць землі Беларусі была здзейснена:**

☐ 1) індаеўрапейцамі;
☐ 2) неандэртальцамі;
☐ 3) краманьёнцамі;
☐ 4) балтамі.

**3. Асноўнымі спосабамі здабывання ежы ў каменным веку было:**

☐ 1) збіральніцтва;
☐ 2) земляробства;
☐ 3) паляванне;
☐ 4) рыбалоўства.

**4. З’яўленне вытворчасці керамічнага посуду адбылося ў:**

☐ 1) мезаліце;
☐ 2) неаліце;
☐ 3) бронзавым веку;
☐ 4) жалезным веку.

**5. Пераход да жывёлагадоўлі і земляробства адбыўся ў:**

☐ 1) мезаліце;
☐ 2) неаліце;
☐ 3) бронзавым веку;
☐ 4) жалезным веку.

**6. Зледзяненняў на тэрыторыі Беларусі было:**

☐ 1) 2;
☐ 2) 3;
☐ 3) 4;
☐ 4) 5.

**7.Упершыню чалавек з’явіўся на тэрыторыі Беларусі ў эпоху:**

☐ 1) ніжняга палеаліту;
☐ 2) сярэдняга палеаліту;
☐ 3) верхняга палеаліту;
☐ 4) мезаліту.

**8. Краманьёнцы жылі на тэрыторыі Беларусі ў эпоху:**

☐ 1) ніжняга палеаліту;
☐ 2) сярэдняга палеаліту;
☐ 3) верхняга палеаліту;
☐ 4) мезаліту.

**9. Стаянкі ў Беларусі пакінулі пасля сябе:**

☐ 1) славяне;
☐ 2) індаеўрапейцы;
☐ 3) краманьёнцы;
☐ 4) балты.

**10. Вастраканечнік і скрэбла эпохі сярэдняга палеаліту былі знойдзены:**

☐ 1) на Юравіцкай стаянцы;
☐ 2) на Бердыжскай стаянцы;
☐ 3) каля вёскі Абідавічы;
☐ 4) каля пасёлка Краснасельскі ў Гродзенскай вобласці.

**11. Эпоха мусцье гэта:**

☐ 1) верхні палеаліт;
☐ 2) сярэдні палеаліт;
☐ 3) ніжні палеаліт;
☐ 4) мезаліт.

**12. Старажытны чалавек вынайшаў лук і стрэлы ў эпоху :**

☐ 1) мусцье;
☐ 2) мезаліту;
☐ 3) бронзавага веку;
☐ 4) неаліту.

**13. Першыя заняткі жывёлагадоўляй і прымітыўным земляробствам на тэрыторыі Беларусі адбыліся ў эпоху:**

☐ 1) ранняга палеаліту;
☐ 2) сярэдняга палеаліту;
☐ 3) мезаліту;
☐ 4) неаліту.

**14. Бронзавы век на тэрыторыі Беларусі працягваўся:**

☐ 1) 35 – 9 тысяч гадоў да н.э.;
☐ 2) 9 – 5 тысяч гадоў да н.э.;
☐ 3) пачатку II тыс. – канца VIII ст. да н.э.;
☐ 4) VII ст. да н.э. – канца V ст. н.э.

**15. Эпоха мусцье на тэрыторыі Беларусі працягвалася:**

☐ 1) 100 – 35 тысяч гадоў да н.э.;
☐ 2) 35 – 5 тысяч гадоў да н.э.;
☐ 3) 35 – 9 тысяч гадоў да н.э.
☐ 4) VII ст. – н.э. да V ст. н.э.

**16. Ранні жалезны век на тэрыторыі Беларусі пачаўся ў:**

☐ 1) VIII- VII стст. да н.э.
☐ 2) VII- VI стст. да н.э.
☐ 3) VI-V стст. да н.э.
☐ 4) V-IV стст. да н.э.

**17. Эпоха ранняга жалезнага веку на тэрыторыі Беларусі працягвалася:**

☐ 1) з пачатку II тыс. да канца VIII ст. да н.э.;
☐ 2) з пачатку II тыс. да н.э. і да V ст. н.э.;
☐ 3) з VII ст. да н.э. і да V ст. н.э.;
☐ 4) з канца V тыс. да VIII ст. да н.э.

**18. Бацькоўская радавая абшчына з’яўляецца ў эпоху:**

☐ 1) неаліту;
☐ 2) бронзавага веку;
☐ 3) жалезнага веку;
☐ 4) ранняга сярэднявечча.

**19. Умацаванае паселішча, якое ўзнікла ў Беларусі ў канцы бронзавага і пачатку ранняга жалезнага вяку называецца:**

☐ 1) засценак;
☐ 2) горад;
☐ 3) гарадзішча;
☐ 4) селішча.

**20. Летапісная Літва, на думку сучасных гісторыкаў, знаходзілася:**

☐ 1) на тэрыторыі старажытнай Жамойці;
☐ 2) у міжрэччы Дняпра і Заходняй Дзвіны;
☐ 3) у міжрэччы Прыпяці і Сажа;
☐ 4) у Верхнім Панямонні.

**21. Пазнайце гістарычную асобу і запішыце яе імя.**

Адзіны літоўскі князь, які атрымаў ад папы Рымскага карону і быў абвешчаны каралём Літвы.

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

**22. Смаленскім, Аршанскім і Мсціслаўскім палкамі падчас Грунвальдскай бітвы камандаваў князь:**

☐ 1) Вітаўт;
☐ 2) Канстанцін Астрожскі;
☐ 3) Сямён Лінгвен;
☐ 4) Ягайла.

**23. Галоўны начальнік над узброенымі сіламі ў ВКЛ:**

☐ 1) ваявода;
☐ 2) гетман;
☐ 3) канцлер;

☐ 4) кашталян.

**А24. Ці правільна, што ў перакладзе з польскай мовы "Рэч Паспалітая" – гэта:**

а) "агульная справа"; б) "агульная дзяржава"?

1) Правільна **а)**;
2) правільна **б)**;
3) правільна **а)** и **б);**
4) не правільна **а)** и **б)**.

**25. Сваёй рэзідэнцыяй Стэфан Баторый выбраў:**

☐ 1) Гродна;
☐ 2) Вільню;
☐ 3) Варшаву;
☐ 4) Кракаў.

**26. Дазвол шляхце займацца гандлем і рамяством быў прыняты соймам:**

☐ 1) 1760 г.;
☐ 2) 1764 г.;
☐ 3) 1768 г.;
☐ 4) 1775 г.

**27. На апошнім сойме Рэчы Паспалітай 1793 г. шляхецкія паслы выказалі моцны пратэст і нежаданне падпісываць дамову аб другім падзеле краіны з:**

☐ 1) Аўстрыяй;
☐ 2) Прусіяй;
☐ 3) Расіяй;
☐ 4) Францыяй.

**28. Ці правільна, што карціну «Прысяга Т. Касцюшкі на Кракаўскім рынку», напісаў:**

а) Францішак Смуглевіч; б) Ян Рустэн?

1) Правільна **а)**;
2) правільна **б)**;
3) правільна **а)** и **б);**

4) не правільна **а)** и **б)**.

**29. Статут ВКЛ дзейнічаў на тэрыторыі Гродзенскай, Мінскай, Віленскай і Ковенскай губерняў да:**

☐ 1) 1803 г.;
☐ 2) 1820-е гг.;
☐ 3) 1831 г.;
☐ 4) 1840 г.

**30. Ці правільна, што да 1811 г. дзяржаўныя падаткі з насельніцтва беларускіх губерняў збіраліся:**

а) асігнацыямі (папяровымі грашыма); б) манетай?

1) Правільна **а)**;
2) правільна **б)**;
3) правільна **а)** и **б);**
4) не правільна **а)** и **б)**.

**31. Ці правільна, што лозунгам паўстання ў Польшчы, Літве і Беларусі 1830-1831 гг. былі словы:**

а) “Вольнасць, цэласць, незалежнасць”;

б) “За нашу і вашу свабоду”?

1) Правільна **а)**;
2) правільна **б)**;
3) правільна **а)** и **б);**
4) не правільна **а)** и **б)**.

**32. Дакументы, якія ўтрымоўваюць апісанне феадальных уладанняў, памераў сялянскіх павіннасцяў у Беларусі, Літве, Украіне, Польшчы ў XVI – першай палове XIX ст., - гэта:**

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

**33. Ці правільна, што інвентарная рэформа, якая ажыццяўлялася царскімі ўладамі на тэрыторыі Беларусі з 1844 г., праводзілася ў:**

а) дзяржаўнай вёсцы; б) памешчыцкай вёсцы?

1) Правільна **а)**;
2) правільна **б)**;
3) правільна **а)** и **б);**
4) не правільна **а)** и **б)**.

**34. Пазнайце паэта, якому належаць словы, характарызуючыя беларускую мову: “Самая гарманічная з усіх славянскіх моў, меней за ўсё зменеая”. Запішыце толькі прозвішча.**

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|

**35. Ці правільна, што ў рэскрыпце Аляксандра II віленскаму генерал-губернатору У.І. Назімаву прадугледжвалася:**

а) вызваленне сялян ад прыгоннай залежнасці і надзяленне іх уласнай свабодай;

б) надзяленне сялян зямлёй і адмена феадальных павіннасцяў на карысць памешчыкаў?

1) Правільна **а)**;
2) правільна **б)**;
3) правільна **а)** и **б);**
4) не правільна **а)** и **б)**.

**36. Ці правільна, што рэформа 1861 г. абумовіла варыянт развіцця капіталізма ў сельскай гаспадарцы Беларусі, які меў назву:**

а) амерыканскі; б) пруcкі?

1) Правільна **а)**;
2) правільна **б)**;
3) правільна **а)** и **б);**
4) не правільна **а)** и **б)**.

**37. Віленскі генерал-губернатар М.М. Мураўёў у сваёй палітыцы на беларускіх землях у 1860-е гг. абапіраўся на:**

☐ 1) беларускае сялянства;
☐ 2) мясцовую шляхту;
☐ 3) помешчыкаў, якія перасяліліся з цантральных реэгіёнаў Расіі;

☐ 4) уніяцкую царкву.

**38. Ці правільна, што ў выніку паўстання 1863-1864 гг. урад быў вымушаны пайсці на:**

а) зніжэнне выкупных плацяжоў на 20%;

б) стварэнне павятовых камісій для праверкі і выпраўлення ўстаўных грамат?

1) Правільна **а)**;
2) правільна **б)**;
3) правільна **а)** и **б);**
4) не правільна **а)** и **б)**.

**39. Ці правільна, што ў 1860-1870-е гг. сельская гаспадарка Беларусі спецыялізавалася на:**

а) вытворчасці (жыта, аўса, ячменю);

б) молочна-мясной жывёлагадоўлі?

1) Правільна **а)**;
2) правільна **б)**;
3) правільна **а)** и **б);**
4) не правільна **а)** и **б)**.

**40. Ці правільна, што ў другой палове XIX – пачатку XX ст. сярод гарадскіх жыхароў Беларусі пераважалі:**

а) беларусы; б) рускія?

1) Правільна **а)**;
2) правільна **б)**;
3) правільна **а)** и **б);**
4) не правільна **а)** и **б)**.

**41. Смяротны прысуд цару Аляксандру II прывёў у выкананне 1 сакавіка 1881 г. беларускі народнік:**

☐ 1) С. Кавалік;
☐ 2) І. Грынявіцкі;
☐ 3) Г. Ісаеў;
☐ 4) М. Судзілоўскі.

**42. Ці правільна, што па Маніфестам 17 кастрычніка 1905 г. у Расіі:**

а) адмянялася прыгоннае права;

б) дзяржаўная дума атрымала заканадаўчыя паўнамоцтвы?

1) Правільна **а)**;
2) правільна **б)**;
3) правільна **а)** и **б);**
4) не правільна **а)** и **б)**.

**43. Ці правільна, што першым легальным органам Беларускай сацыялістычнай грамады была газета:**

а) «Наша доля»; б) «Наша ніва»?

1) Правільна **а)**;
2) правільна **б)**;
3) правільна **а)** и **б);**
4) не правільна **а)** и **б)**.

**44. Ці правільна, што па нацыянальнаму пытанню Беларуская сацыялістычная грамада ў час рэвалюцыі 1905-1907 гг. стаяла на пазіцыях стварэння:**

а) аўтаноміі Беларусі ў складзе Расійскай федэратыўнай дэмакратычнай рэспублікі;

б) незалежнай белорускай дзяржавы?

1) Правільна **а)**;
2) правільна **б)**;
3) правільна **а)** и **б);**
4) не правільна **а)** и **б)**.

**45. Беларускі горад, абарона якога ў гады Першай сусветнай вайны войскамі расійскай арміі працягвалася 810 дзён, - гэта:**

☐ 1) Свенцяны;
☐ 2) Смаргонь;
☐ 3) Баранавічы;
☐ 4) Пінск.

**46. Пасля разгрому карнілаўскага мецяжу курс на подрыхтоўку ўзброенага паўстання і захопу ўлады ўзяла партыя:**

☐ 1) эсэраў;
☐ 2) бальшавікоў;
☐ 3) меньшавікоў;
☐ 4) БСГ.

**47. Ці правільна, што ў канцы XIX – пачатку XX ст. буржуазія ў беларускіх губернях па этнической прыналежнасці з'яўлялася пераважна:**

а) рускай, польскай, яўрэйскай; б) беларускай?

1) Правільна **а)**;
2) правільна **б)**;
3) правільна **а)** и **б);**
4) не правільна **а)** и **б)**.

**48. Ці правільна, што характэрнай асаблівасцю беларускага этнасу ў канцы XIX ст. было тое, што:**

а) 90% беларусаў жылі ў сельскай мясцовасці і займаліся сельскай гаспадаркай;

б) нешматлікая беларуская нацыянальная інтэлігенцыя фактычна не дайшла да ўсведамлення самастойнасці свайго становішча?

1) Правільна **а)**;
2) правільна **б)**;
3) правільна **а)** и **б);**
4) не правільна **а)** и **б)**.

**49. Вызначце, каму належаць наступнеыя словы і запішыце толькі прозвішча аўтара.**

"А хто там ідзе, а хто там ідзе
У агромістай такой грамадзе?
- Беларусы…
А чаго ж, чаго захацелася ім,
Пагарджаным век, ім, сляпым, глухім?
- Людзьмі звацца".

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

**50. У адпаведнасці з школьной рэформай у 1864 г. сярэднюю адукацыю ў Беларус давалі:**

☐ 1) народныя вучылішчы;
☐ 2) гарадскія вучылішчы;
☐ 3) реальныя гімназіі (вучылішчы);
☐ 4) школы грамоты.

**51. Наибольш распаўсюджаным тыпом пачатковых школ Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. былі:**

☐ 1) народныя вучылішчы;
☐ 2) гарадскія вучылішчы;
☐ 3) царкоўна-прыходския школы;
☐ 4) школы граматы.

**52. Паводле ваеннай рэформы другой паловы XIX ст., у Беларусі ўсе мужчыны павінны былі служыць у войску з узросту:**

☐ 1) 18 год.;
☐ 2) 20 год.;
☐ 3) 25 год;
☐ 4) 30 год.

**53. Земствы былі ўведзены ў беларускіх губернях:**

☐ 1) Мінскай;
☐ 2) Магілёўскай;
☐ 3) Віцебскай;
☐ 4) Гродзенскай.

**54. Найбольш моцныя праявы сялянскага руху напярэдадні Першай расійскай рэвалюцыі былі ў:**

☐ 1) Гродзенскай губерні;
☐ 2) Віцебскай губерні;
☐ 3) Мінскай губерні;
☐ 4) Магілёўскай губерні.

**55. Ці правільна, што палітыку “паліцэйскага сацыялізма” ці зубатаўшчыну ў Беларусі падтрымоўвала палітычная партыя:**

а) Бунд; б) БСГ?

1) Правільна **а)**;
2) правільна **б)**;
3) правільна **а)** и **б);**
4) не правільна **а)** и **б)**.

**56. Ці правільна, што першыя стаянкі на тэрыторыі Беларусі былі вынайдзены каля вёсак:**

а) Бердыж Чачэрскага раёна на Гомельшчыне і Абідавічы Быхаўскага раёна на Магілёўшчыне;

б) Юравічы Калінкавіцкага раёна і Свяцілавічы Веткаўскага раёна на Гомельшчыне?

1) Правільна **а)**;
2) правільна **б)**;
3) правільна **а)** и **б);**
4) не правільна **а)** и **б)**.

**57. Ці правільна, што Аблвыканкамзах (Абласны выканаўчы камітэт Заходняй вобласці і Заходняга фронту), які выконваў заканадаўчыя функцыі паміж з’ездамі Саветаў, быў створаны:**

а) 26 кастрычніка 1917 г.; б) 27 лістапада 1917 г.?

1) Правільна **а)**;
2) правільна **б)**;
3) правільна **а)** и **б);**
4) не правільна **а)** и **б)**.

**58. Храналагічная паслядоўнасць падзей 1917 г. была наступнай:**

☐ 1) выбары ў гарадскія думы;
☐ 2) ліквідацыя Стаўкі Вярхоўнага галоўнакамандуючага;
☐ 3) абвяшчэнне Дэкларацыі правоў народаў Расіі;

☐ 4) першы з’езд беларускіх партый і арганізацый.

**59. ЦК РКП(б) прыняў рашэнне аб стварэнні беларускай дзяржаўнасці:**

☐ 1) 23 снежня 1918 г.;
☐ 2) 24 снежня 1918 г.;
☐ 3) 30 снежня 1918 г.;
☐ 4) 30 снежня 1919 г.

**60. Ці правільна, што індустрыялізацыя ў БССР праводзілася на аснове:**

а) цяжкай прамысловасці ? б) лёгкай прамысловасці?

1) Правільна **а)**;
2) правільна **б)**;
3) правільна **а)** и **б);**
4) не правільна **а)** и **б)**.

**61. Ці правільна, што калектывізацыя ў БССР у асноўным была завершана ў:**

а) 1933 г.? б) сярэдзіне 1930-х гг.

1) Правільна **а)**;
2) правільна **б)**;
3) правільна **а)** и **б);**
4) не правільна **а)** и **б)**.

**62. Дагавор аб дружбе і мяжы паміж СССР і Германіяй быў заключаны:**

☐ 1) 26 верасня 1939 г.;
☐ 2) 28 верасня 1939 г.;
☐ 3) 30 верасня 1939 г.
☐ 4) 22 чэрвеня 1941 г.

**63. Ці правільна, што ўсе славянскія мовы, уключаючы беларускую належаць да … моўнай сям’і:**

а) індаеўрапейскай; б) фінаўгорскай?

1) Правільна **а)**;

2) правільна **б)**;
3) правільна **а)** и **б);**
4) не правільна **а)** и **б)**.

**64. Пасля вызвалення Заходняй Беларусі ў ваяводствах і павятовых цэнтрах былі створаны:**

☐ 1) Саветы народных дэпутатаў;
☐ 2) Часовыя ўпраўленні;
☐ 3) Народныя камітэты;
☐ 4) Сялянскія камітэты.

**65. Першая карная экспедыцыя гітлераўцаў, што адбылася ў ліпені–жніўні 1941 г., насіла кодавую назву:**

☐ 1) «Котбус»;
☐ 2) «Балотная ліхаманка»;
☐ 3) «Прыпяцкія балоты»;
☐ 4) «Герынг».

**66. У ходзе аперацыі «Баграціён» перад войскамі адпаведных франтоў (размясціць у адпаведнасці з назвамі франтоў) ставіліся задачы:**

1) I Прыбалтыйскі і III Беларускі франты;
2) I Беларускі фронт;
3) II Беларускі фронт.

☐ 1) акружыць і ліквідаваць Бабруйскую групоўку войск і развіць наступленне ў напрамку Мінска;
☐ 2) акружыць і ліквідаваць Віцебскую групоўку войск і развіваць наступленне ў напрамку Мінска і Лепеля;
☐ 3) нанесці франтальныя ўдары ў напрамку Магілёва і Оршы, весці далейшае наступленне ў напрамку Мінска.

**67. Беларускі штаб партызанскага руху ўзначальваў:**

☐ 1) П.М. Машэраў;
☐ 2) В.І. Казлоў;
☐ 3) П.З. Калінін;
☐ 4) П.К. Панамарэнка.

**68. Населяны пункт, каля якога здзейсніў свой подзвіг экіпаж самалёта капітана М. Гастэлы:**

☐ 1) Брэст;
☐ 2) Баранавічы;
☐ 3) Радашковічы;
☐ 4) Гродна.

**69. Першым з раённых цэнтраў Беларусі быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў:**

☐ 1) Ельск Гомельскай вобласці;
☐ 2) Крычаў Магілёўскай вобласці;
☐ 3) Гарадок Віцебскай вобласці;
☐ 4) Камарын Палескай вобласці.

**70. Аперацыя «Бура» – гэта:**

☐ 1) аперацыя Чырвонай Арміі па вызваленні ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў горада Гомеля;
☐ 2) аперацыя Арміі Краёвай па захопе Заходняй Беларусі, Віленшчыны і Заходняй Украіны;
☐ 2) адна з састаўных частак аперацыі «Баграціён»;
☐ 3) стратэгічны план нямецкага камандавання па барацьбе з партызанамі Беларусі.

**71. Масавая калектывізацыя ў заходніх раёнах БССР пачалася ў:**

☐ 1) 1947 г.;
☐ 2) 1948 г.;
☐ 3) 1951 г.;
☐ 4) 1949 г.

**72. Другі этап “рэйкавай вайны” атрымаў назву – “…”**

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | |

**73. Партыйную арганізацыю Беларусі з 1965 па 1980 г. узначальваў:**

- ☐ К.Т. Мазураў;
- ☐ П.М. Машэраў;
- ☐ Ц.Я. Кісялёў;
- ☐ М.М. Слюнькоў.

**74. Абавязковая сярэдняя (10-гадовая) адукацыя ў БССР была ўведзена ў:**

- ☐ 1959 г.;
- ☐ 1966 г.;
- ☐ 1972 г.;
- ☐ 1982 г.

**75. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь была прынята:**

- ☐ 1) 15 сакавіка 1993;
- ☐ 2) 15 сакавіка 1994 г.;
- ☐ 3) 15 красавіка 1995 г.;
- ☐ 4) 20 лістапада 1996 г.

**76. Першы з беларусаў, хто здзейсніў палёт у космас у 1973 г. – гэта …**

- ☐ 1) А. Леонаў;
- ☐ 2) У. Кавалёнак;
- ☐ 3) У. Камароў;
- ☐ 4) П. Клімук.

**77. Метад гаспадарання, пры якім прадпрыемства не атрымлівае фінансавых сродкаў з дзяржбюджэту, а зарабляе грошы само, за кошт сваёй вытворчасці і рэалізацыі яе вырабаў, – гэта …**

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

**78. Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР была прынята:**

- ☐ 1) 27 чэрвеня 1989 г.;
- ☐ 2) 27 ліпеня 1990 г.;
- ☐ 3) 22 жніўня 1991 г.;
- ☐ 4) 19 верасня 1991 г.

**79. Рэспубліка Беларусь падпісала пагадненне аб утварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў:**

☐ 1) 8 снежня 1991 г.;
☐ 2) 10 снежня 1991 г.;
☐ 3) 21 снежня 1991 г.;
☐ 4) 18 снежня 1991 г.

**80. Новая назва нашай краіны – Рэспубліка Беларусь – была зацверджана Вярхоўным Саветам БССР:**

☐ 1) 25 жніўня 1991 г.;
☐ 2) 28 ліпеня 1990 г.;
☐ 3) 19 верасня 1991 г.;
☐ 4) 8 снежня 1991 г.

**81. А. Лукашэнка быў абраны на пасаду першага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь:**

☐ 1) 26 чэрвеня 1994 г.;
☐ 2) 10 ліпеня 1994 г.;
☐ 3) 24 лістапада 1996 г.;
☐ 4) 15 мая 1995 г.

**82. Памілаванне, дараванне віны асобе ці групе людзей дзяржавай – гэта …**

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

**83.Дзяржава, знешнепалітычны курс якой характарызуецца няўдзелам ва ўзброеных канфліктах, ваенных блоках, называлася:**

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

**84. На рэспубліканскі рэферэндум у 1995 г. было вынесена пытанне:**

☐ 1) аб змяненні дзяржаўнага сцяга і герба;
☐ 2) аб адмене смяротнага пакарання;
☐ 3) аб наданні рускай мове статуса дзяржаўнай;
☐ 4) аб праве прэзідэнта распускаць парламент у выпадку парушэння апошнім Канстытуцыі.

**85. Дагавор аб Саюзе Беларусі і Расіі быў падпісаны:**

- ☐ 1) 2 красавіка 1997 г.;
- ☐ 2) 2 красавіка 1996 г.;
- ☐ 3) 15 сакавіка 1994 г.;
- ☐ 4) 10 снежня 1991 г.

# ДАПАМОЖНЫ РАЗДЕЛ

## ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма інтэграваннаны модуль “Гісторыя” прызначана для рэалізацыі на першай ступені вышэйшай адукацыі ў рамках модуляў сацыяльна-гуманітарных дысцыплін. Яна скіравана на авалоданне студэнтамі асноўнымі тэарэтычнымі дасягненнямі гістарычнай навукі, апрацоўку, асэнсаванне і сістэматызацыю вучэбнай інфармацыі, набыццё практыкаарыентаваных уменняў. Вызначальнымі асаблівасцямі дадзенай праграмы ў параўнанні з папярэднімі з’яўляюцца: удасканаленне зместу дысцыпліны, выкарыстанне прафесійнага, кампетэнтнаснага падыходу ў навучанні, значнае павялічэнне ролі і ўдзельнай вагі самастойнай работы студэнтаў, магчымасць выкарыстання сучасных інавацыйных тэхналогій.

Месца вучэбнай дысцыпліны "Гісторыя Беларусі" ў сістэме сацыяльна-гуманітарных ведаў вызначаецца тым, што прадметам яе вывучэння з’яўляюцца найбольш важныя пытанні дзяржаўна-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, канфесійнага, культурнага і духоўнага развіцця беларускага народа ў кантэксце ўсходнеславянскай і заходнееўрапейскай гісторыі з улікам цывілізацыйных характарыстык.

Актуальнасць вывучэння гісторыі Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі абумоўлена неабходнасцю выпрацоўкі аб’ектыўнага навуковага погляду на гісторыю беларускага народа, які сфарміраваўся ў працэсе ўзаемадзеяння разнастайных сацыяльна-эканамічных, этнакультурных, геапалітычных і культурна-цывілізацыйных фактараў. Гэта з’яўляецца абавязковай умовай, якая забяспечвае падрыхтоўку не толькі спецыяліста-прафесіянала, але і фарміраванне ў асобы якасцей грамадзяніна і патрыёта.

### Мэты і задачы інтэгравананага модуля “Гісторыя”

Асноўнымі мэтамі сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі з’яўляюцца фарміраванне і развіццё сацыяльна-асабовых кампетэнцый і практычных навыкаў, неабходных і дастатковых для

вырашэння і выканання грамадскіх, сацыяльна-прафесійных і асабовых задач і функцый.

Задача вывучэння вучэбнай дысцыпліны "Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі" ва ўстановах вышэйшай адукацыі заключаецца ў набыцці студэнтамі практычных навыкаў аналізу гістарычных фактаў і падзей, што забяспечвае фарміраванне сацыяльна-асабовых кампетэнцый студэнта, заснаваных на сістэме каштоўнасцяў, якая сфарміравалася ў працэсе гістарычнага развіцця беларускага народа і эвалюцыі яго дзяржаўнасці, што з'яўляецца тэарэтыка-метадалагічнай асновай, неабходнай для якаснай сацыяльна-прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнты павінны

***ведаць:***

•асаблівасці фармацыйнага і цывілізацыйнага падыходаў да вывучэння гісторыі Беларусі ў кантэксце еўрапейскай гісторыі;

• гістарычныя этапы складвання беларускага этнасу;

• розныя формы дзяржаўных утварэнняў на тэрыторыі Беларусі; станаўленне беларускай дзяржаўнасці і ўмацаванне яе суверэнітэту ў XX - пачатку XXI ст;

• савецкі варыянт мадэрнізацыі і цывілізацыйнага развіцця беларускага грамадства;

• месца і ролю беларускіх земляў у геапалітычных працэсах ў асобныя гістарычныя перыяды, уклад беларускага народа ў перамогу над фашызмам, значэнне і месца суверэннай Рэспублікі Беларусь у сучасным свеце;

• дасягненні беларускага народа ў развіцці матэрыяльнай і духоўнай культуры.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнты павінны

***умець:***

• выкарыстоўваць фармацыйны і цывілізацыйны падыходы да вывучэння асаблівасцяў гістарычнага развіцця беларускага народа;

• характарызаваць умовы і вынікі складвання беларускага этнасу ў асобныя гістарычныя перыяды;

• тлумачыць уплыў розных культурна-цывілізацыйных фактараў на гістарычнае развіцце беларускіх зямель;

• ажыццяўляць параўнальны аналіз рэформ і рэвалюцый у працэсе мадэрнізацыі беларускага грамадства, ацэньваць вынікі функцыянавання

савецкай грамадска-палітычнай сістэмы ў БССР. вызначаць сутнасныя характарыстыкі беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця;

• ацэньваць значэнне Перамогі савецкага народу ў Вялікай Айчыннай вайне, характарызаваць уклад беларускага народа ў барацьбу супраць фашызма;

• аналізаваць працэс складвання беларускай дзяржаўнасці, афармлення і замацоўвання суверэнітэту Рэспублікі Беларусь;

• характарызаваць геапалітычнае становішча беларускіх зямель у асобныя гістарычныя перыяды, аналізаваць месца і ролю суверэннай Рэспублікі Беларусь у сучасным свеце, ва ўмовах інтэграцыі і глабалізацыі.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнты павінны ***валодаць:***

- навыкамі работы з навуковай, навукова-папулярнай і мастацкай літаратурайпадчас падрыхтоўкіда лекцыйных і практычных заняткаў;
- метадаміінтэрпрытацыіз’яў і фактаўгісторыіБеларусі ў кантэксцееўрапейскай гісторыі;
- навыкамі асэнсаванага выкарыстання новых фактаў гісторыі з мэтай папярэджання памылак пры інтэрпрытацыі падзей мінулага і сучаснасці.

На вывучэнне інтэграванага модуля «Гісторыя» вылучаецца 100 гадзін, у тым ліку 34 гадзіны аўдыторныя, з якіх: 18 гадзін – лекцыі, 16 гадзін – семінарскія заняткі. Форма кантролю – экзамен.

## Тэматычны план дысцыпліны “Гісторыя Беларусі”

| Назва раздзелаў і тэм | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | Усяго | З іх | |
| | | Лекцыі | Семінары |
| **Раздзел I.** Фарміраванне беларускага этнасу і дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях | 16 | 10 | 6 |
| *Тэма 1.* Уводзіны ў дысцыпліну “Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі” | 2 | 2 | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| *Тэма 2.* Фарміраванне беларускага этнасу (VI ст. - пачатак XX ст.) | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 3.* Дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях у IX - XVIII ст.ст. | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 4.* Становішча беларускіх зямель у складзе Расійскай дзяржавы (канец XVIII ст. - кастрычнік 1917г.) | 6 | 4 | 2 |
| **Раздзел II.** Станаўленне беларускай дзяржаўнасці і ўмацаванне яе суверэнітэту ў XX - пачатку XXI ст. | 18 | 8 | 10 |
| *Тэма 5.* Фарміраванне і ўмацаванне савецкай грамадска-палітычнай сістэмы ў Беларусі (кастрычнік 1917-чэрвень 1941 гг.) | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 6.* Геапалітычнае становішча Беларусі ў 20 - 30-я гг. XX ст. Заходняя Беларусь у складзе польскай дзяржавы | 2 | | 2 |
| *Тэма 7.* Беларусь у гады Другой сусветнай вайны і Вялікай Айчыннай вайны | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 8.* Савецкая Беларусь: дасягненні і праблемы стваральнай працы народа (1945 - 1991 гг.) | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 9.* Суверэнная Беларусь ў канцы XX - пачатку XXI ст. | 4 | 2 | 2 |
| Усяго | 34 | 18 | 16 |

# ЗМЕСТ

# ІНТЭГРАВАНАГА МОДУЛЯ "ГІСТОРЫЯ"

## Тэма 1. УВОДЗІНЫ Ў ДЫСЦЫПЛІНУ "ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ Ў КАНТЭКСЦЕ ЕЎРАПЕЙСКАЙ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ"

Метадалагічныя асновы вывучэння гісторыі. Перыядызацыя сусветнай гісторыі і гісторыі Беларусі. Фармацыйны і цывілізацыйны падыходы да вывучэння гісторыі. Цывілізацыя як стадыя развіцця грамадства і як лакальны культурна-гістарычны тып. Прадмет вывучэння гісторыі Беларусі ў кантэксце цывілізацыйнага развіцця агульнарускай і еўрапейскай гісторыі. Гістарыяграфічныя школы. Крыніцы вывучэння гісторыі Беларусі.

## Р а з д з е л I
## ФАРМІРАВАННЕ БЕЛАРУСКАГА ЭТНАСУ І ДЗЯРЖАЎНЫЯ ЎТВАРЭННІ НА БЕЛАРСКІХ ЗЕМЛЯХ

### Тэма 2. Фарміраванне беларускага этнасу (VI ст. - пачатак XX ст.)

Найстаражытнае насельніцтва на тэрыторыі беларускіх зямель. Пачатак рассялення славян (VI ст.) і славянізацыя балтаў. Старажытнаруская народнасць як аснова фарміравання рускага, беларускага і украінскага этнасаў.

Паходжанне назвы "Белая Русь" (Беларусь). Эканамічныя і палітычныя фактары фарміравання беларускага этнасу ў XIV - XVIII стст. Усходнеславянскі этнічны падмурак Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойскага (ВКЛ). Роля праваслаўнай царквы ў кансалідацыі беларускага этнасу. Уплыў каталіцтва і уніяцтва. Этнічная самасвядомасць і менталітэт беларусаў. Трансфармацыя ідэнтычнасці и саманазвы беларускага этнасу: рускія, русіны, "тутэйшыя", беларусы. Духоўнае жыццё беларускіх зямель у IX - XVIII стст.

Далейшае развіццё беларускага этнасу ва ўмовах складвання рынкавых адносін у XIX ст. Нацыянальная самасвядомасць беларусаў. Зараджэнне і развіццё беларусазнаўства. Тэорыя "заходнерусізму". Ідэі беларускага нацыянальнага адраджэння ў пачатку XX ст.

## Тэма 3. Дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях у IX-XVIII стст.

Еўропа ў сярэднявеччы. Станаўленне ранніх дзяржаўных утварэнняў на беларускіх землях. Кіеўская Русь. Полацкае і Тураўскае княствы і іх узаемаадносіны з Кіевым і Ноўгарадам. Феадальная раздробленасць. Стварэнне Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойскага. Роля заходнерускіх зямель у працэсе дзяржаўнага будаўніцтва ВКЛ Асаблівасці фарміравання дзяржаўнага і сацыяльна-эканамічннага ладу на беларускіх землях ВКЛ.

Асноўныя тэндэнцыі развіцця сусветнай гісторыі ў Новы час. Эпоха Адраджэння, Рэфармацыя, Асветніцтва. Развіцце капіталізму. Першыя буржуазныя рэвалюцыі ў Заходняй Еўропе.

Беларускіе землі пасля Люблінскай уніі. Уваходжанне ВКЛ у склад Рэчы Паспалітай. Войны XVII - XVIII стст. і іх наступствы для беларускіх зямель. Узмацненне феадальнай анархіі. Паглыбленне крызісу і тры падзелы Рэчы Паспалітай паміж Аўстрыяй, Прусіяй і Расіяй. Уключэнне беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі.

## Тэма 4. Становішча беларускіх зямель у складзе Расійскай дзяржавы (канец XVIII ст. - кастрычнік 1917 г.)

Значэнне ўключэння Беларусі ў склад Расійскай імперыі ва ўмовах фарміравання індустрыяльнага грамадства. Цывілізацыйнае адзінства Беларусі і Расіі. Асноўныя напрамкі палітыкі самадзяржаўя ў Беларусь Беларускія землі ў перыяд Айчыннай вайны 1812 г. Польскае паўстанне 1830-1831 гг. і яго наступствы.

Расійскі шлях палітычнай і эканамічнай мадэрнізацыі. Адмена прыгоннага права. Рэформы 60-70-х гг. XIX ст. і асаблівасці іх здзяйснення на Беларусі. Спецыфіка прамысловага перавароту ў Беларусі Месца эканамікі Беларусі ва ўсерасійскім рынку. Змены ў сацыяльнай струтуры насельніцтва.

Грамадска-палітычныя рухі і аб’яднанні ў Беларусі. Паўстанне 1863-1864 гг. яго уплыў на палітыку ўладаў у Беларусі і грамадска-палітычную думку. Ідэалогія лібералізму, народніцкія і сацыял-дэмакратычныя плыні. Узнікненне агульнарасійскіх і беларускіх партый. Рэвалюцыя 1905-1907 гг. і пачатак расійскага парламентарызму. Сталыпінская афарная рэформа і асаблівасці яе здзяйснення ў Беларусі. Першая сусветная вайна і яе наступствы для Беларусі.

Лютаўская рэвалюцыя і фарміраванне новых улад. Стратэгія і тактыка палітычных партый у адносінах да ўлады, праблемы выбару шляхоў далейшага грамадскага развіцця. Абвастрэнне сацыяльна-эканамічнага, палітычнага крызісу ў Расіі і расстаноўка палітычных сіл на Заходнім фронце і ў Беларусі восенню 1917 г. Перамога Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Петраградзе і ў Беларусі

## Р а з д з е л I I
## СТАНАЎЛЕННЕ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ ЎМАЦАВАННЕ ЯЕ СУВЕРЭНІТЭТУ Ў XX - ПАЧАТКУ XXI СТ.

### Тэма 5. Фарміраваннс і ўмацаванне савецкай грамадска-палітычнай сістэмы ў Беларусі (кастрычнік 1917 - чэрвень 1941 гг.)

Роля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў гістарычным лёсе беларускага народа. Устанаўленне савецкай улады ў Беларусь Першыя рэвалюцыйныя пераўтварэнні. Барацьба супраць германскіх акупантаў.

Праблемы фарміравання беларускай дзяржаўнасці на нацыянальна-дэмакратычнай і рэвалюцыйна-класавай асновах. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі ва ўмовах германскай акупацыі - спроба зацвярджэння беларускай дзяржаўнасці на заходніх парламенцкіх прынцыпах. Утварэнне беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове. Барацьба беларускага народа з польскімі інтэрвентамі. Роля і месца БССР у складзе СССР.

Савецкая мадэль мадэрнізацыі грамадства. Усталяванне савецкай аднапартыйнай грамадска-палітычнай сістэмы ў БССР. Сканцэнтраванне функцый заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады ў руках дзяржаўна-партыйнага апарата. Дэфармацыі ў грамадска-палітычным жыцці БССР. Палітычныя рэпрэсіі 30-х гг. XX ст. Праблема вызначэння грамадска-палітычнага ладу ў СССР.

Шляхі і метады будаўніцтва індустрыяльнага грамадства ў савецкай Беларусі (асаблівасці нэпа, індустрыялізацыя, калектывізацыя).

Уздзеянне савецкага фактару на фарміраванне беларускай нацыі. Станаўленне беларускай савецкай культуры. Палітыка беларусізацыі. Дасягненні і супярэчнасці развіцця культуры і навукі ў 30-я гг. XX ст. Стаўленне савецкай улады да царквы.

## Тэма 6. Геапалітычнае становішча Беларусі ў 20 - 30-я гг. XX ст. Заходняя Беларусь у складзе польскай дзяржавы

Вынікі Першай сусветнай вайны. Беларускае пытанне пры афармленні Версальска-Вашынгтонскай сістэмы. Рыжская мірная дамова 1921 г. у гістарычным лесе беларускага народа.

Грамадска-палітычнае, эканамічнае і нацыянальна-культурнае становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польскай дзяржавы. Рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі ў 20-30-я гг. XX ст.

## Тэма 7. Беларусь у гады Другой сусветнай вайны і ВялікайАйчыннай вайны

Прыход фашыстаў да ўлады ў Італіі і Германіі. Абвастрэнне супярэчнасцяў паміж еўрапейскімі дзяржавамі ў 30-я гг. XX ст. Правал палітыкі калектыўнай бяспекі. Пачатак Другой сусветнай вайны. Вызваленне Чырвонай Арміяй Заходняй Беларусь Аб’яднанне беларускага народа ў складзе БССР.

Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Абарончыя баі на тэрыторыі Беларуси Устанаўленне акупацыйнага рэжыму і яго мэты. Рабаванне гітлераўцамі гаспадарчых і культурных каштоўнасцяў Беларусь Фашысцкі генацыд народа. Калабаранцкія арганізацыі і іх дзейнасць на карысць акупантаў.

Вызначальныя перамогі Чырвонай Арміі (бітвы пад Масквой, Сталінградам, Курскам), іх уплыў на ўздым партызанскага руху і падпольнай барацьбы. Баявая дзейнасць партызан і падпольшчыкаў. Пачатак вызвалення Беларусі. Аперацыя "Баграціён". Завяршальныя пераможныя аперацыі Чырвонай Арміі.

Вынікі вайны для беларускага народа і яго уклад у Перамогу над фашызмам. Ураджэнцы Беларусі на франтах вайны і ў еўрапейскім руху Сапраціўлення. Захаванне памяці аб гераізме савецкага народа.

## Тэма 8. Савецкая Беларусь: дасягненні і праблемы стваральнай працы народа ў пасляваенны перыяд (1945- 1991 гг.)

Геапалітычныя змены на міжнароднай арэне пасля Другой сусветнай вайны. Пачатак "халоднай вайны". Супрацьборства дзвюх сацыяльна-

палітычных сістэм. Барацьба за мір і разбраенне. Крызіс сусветнай сацыялістычнай сістэмы і яе распад. Заканчэнне "халоднай вайны".

Аднаўленне прамысловасці і сельскай гаспадаркі ў першае пасляваеннае пяцігоддзе.. Калектывізацыя ў Заходняй Беларусь Эканамічнае развіццё БССР ва ўмовах пачатку навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. Эканамічная рэформа 1965 г. і яе вынікі. Спецыялізацыя прамысловасці і сельскай гаспадаркі БССР ва умовах адзінага народнагаспадарчага комплексу СССР. Зніжэнне тэмпаў вытворчасці і нарастание крызісных з'яў у эканаміцы. Палітыка перабудовы, курс на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця. Чарнобыльская аварыя і яе наступствы. Паглыбленне эканамічнага крызісу ў СССР і БССР у канцы 80-х гг. XX ст.

Грамадска-палітычнае жыццё ў СССР і БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе. Барацьба з антысавецкімі групоўкамі. Ідэалагічныя кампаніі і неабгрунтаваныя рэпрэсіі па палітычных матывах другой паловы 1940-х - пачатку 1950-х гг. Асуджэнне культа асобы І.В. Сталіна. Спробы дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця ў другой палове 1950-х - 1964 гг. Нарастание кансерватызму ў грамадска-палітычным жыцці ў 1970-я - першай палове 1980-х гг. Першыя крокі па рэфармаванню палітычнай сістэмы ў гады перабудовы. Змяненні ў Канстытуцыях СССР і БССР. Крызіс савецкага федэралізму. "парад суверэнітэтаў рэспублік", барацьба за суверэнітэт Беларусь

Адукацыя, навука і культура БССР у пасляваенны перыяд: дасягненні і праблемы. Дзяржаўная рэлігійная палітыка і становішча канфесій.

## Тэма 9. Суверэнная Беларусь ў канцы XX - пачатку XXI ст.

Жнівеньскія падзеі 1991 г. у СССР і БССР. Абвяшчэнне Рэспублікі Беларусь. Пачатак фарміравання органаў улады і кіравання рэспублікі на прынцыпах суверэнітэту. Распад СССР і ўтварэнне СНД. Заканадаўча-прававое афармленне дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.

Прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. Выбары прэзідэнта і фарміраванне новай сістэмы ўлады. Рэспубліканскія рэферэндумы 1995 і 1996 гг., іх вынікі. Дапаўненні і змяненні ў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь. Эвалюцыя "вертыкалі" улады і кіравання.

Крызісны стан прамысловасці і сельскай гаспадаркі ў пачатку 90-х гг. XX ст. Стварэнне перадумоў пераходу да рынкавай эканоміцы, напрацоўка прававой базы, вызначэнне метадаў і накірункаў рэфармавання эканомікі.

Распрацоўка і рэалізацыя беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага інавацыйнага развіцця краіны. Дасягненні і праблемы беларускай эканомікі. Сусветны эканамічны і фінансавы крызіс і яго наступствы для краін Усходняй Еўропы. Сучасны стан прамысловасці, сельскай гаспадаркі і сацыяльнай сферы Беларусь

Геапалітычнае становішча Рэспублікі Беларусь ва ўмовах сусветных глабалізацыйных працэсах. Міжнароднае прызнанне Рэспублікі Беларусь і змены ў знешнепалітычным механізме краіны. Выпрацоўка стратэгіі і прынцыпаў знешняй палітыкі, яе шматвектарнасць. Беларуска-расійскія адносіны, стварэнне Саюза Беларусі і Расіі. Беларусь і СНД, фарміраванне мытнага саюза і адзінай эканамічнай прасторы.

Адукацыя, навука і культура Рэспублікі Беларусь. Фарміраванне нацыянальнай сістэмы адукацыі. Складанасці навуковай працы, страты і здабыткі беларускай навукі. Стан гісторыка-культурнай спадчыны. Асноўныя накірункі развіцця літаратуры і мастацтва. Узаемаадносіны дзяржавы і царквы, адраджэнне рэлігійна-канфесійнага жыцця.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА
## (дзённая форма атрымання адукацыі)

| Нумар раздзела, тэмы, занятка | Назва раздзела, тэмы, занятка; пералік вывучаемых пытанняў | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | Матэрыяльнае забеспячэнне занятказ (наглядныя метадычныя дапаможнікі і інш.) | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя (семінарскія) заняткі | Лабараторныя заняткі | КСРС | | | |
| 1. | **Фарміраванне беларускага этнасу і дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях** | **10** | **6** | | | | | |
| 1.1. | ***Уводзіны ў дысцыпліну “Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі”.***<br>1.Прадмет, задачы і змест курса.<br>2.Крыніцы вывучэння гісторыі Беларусі.<br>3.Перыядызацыя айчыннай гісторыі. | 2 | | | | Мульты-медыйная прэзентацыя. Карта “Рэспубліка Беларусь”. | [1]<br>[2]<br>[4]<br>[5]<br>[9] | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1.2. | ***Фарміраванне беларускага этнасу (VI ст. - пачатак XX ст.).***<br>1.Першабытнае грамадства ў эпоху каменнага, бронзавага і жалезнага вякоў.<br>2. Засяленне славянамі тэрыторыі Беларусі ўVI - VIII стст. н.э.<br>3.Старажытнаруская народнасць як аснова фарміравання рускага, беларускага і ўкраінскага этнасаў. | 2 | | | | Мульты-медыйная прэзентацыя. | [1]<br>[5]<br>[10]<br>[18]<br>[19]<br>[20]<br>[28]<br>[38] | |
| 1.2.1. | 1.Грамадска-палітычныя і сацыяльна-эканамічныя ўмовы фарміравання беларускага этнасу ў XIV - XVIII стст.<br>2.Фарміраванне этнічнай самасвядомасці. Паходжанне тэрміна “Белая Русь”.<br>3.Умовы і асаблівасці фарміравання беларускай нацыі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. | | 2 | | | | [1]<br>[5]<br>[10]<br>[18]<br>[19]<br>[20]<br>[28]<br>[38] | Франтальнае апытанне. Выступленні з дакладамі і рэфератамі. |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1.3. | ***Дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях у IX - XVIII стст.***<br>1.Першыя дзяржавы-княствы на тэрыторыі Беларусі. Палітычнае і сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель ў IX – XIII стст.<br>2.Сацыяльна-эканамічнае развіццё. Узнікненне гарадоў.<br>3.Феадальная раздробленасць. Знешнепалітычнае становішча ў канцы XII – першай палове XIII ст.<br>4. Культура. Распаўсюджанне хрысціянства (X – першая палова XIII ст.). | 2 | | | | Мульты-медыйная прэзентацыя. Карта "Беларускія землі ў складзе ВКЛ". | [4]<br>[5]<br>[6]<br>[7]<br>[11]<br>[12]<br>[15]<br>[17]<br>[58] | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1.3.1. | 1.Беларусь у часы станаўлення і ўмацавання Вялікага Княства Літоўскага (сярэдзіна XIII – 70-я гг. XV ст.).<br>2.Вялікае Княства Літоўскае ў канцы XV – першай палове XVI ст. Палітычнае становішча, дзяржаўны лад, органы ўлады і кіравання ў ВКЛ.<br>3.Эканамічнае і палітычнае становішча Беларусі ў складзе Рэчы Паспалітай (другая палова XVI- XVII стст.).<br>4.Знешнепалітычнае становішча Рэчы Паспалітай у XVIII ст. Палітычны крызіс Рэчы Паспалітай і яе падзелы.<br>5.Царква і рэлігія на беларускіх землях у XVI – першай палове XVII ст. Адраджэнне і Асветніцтва ў Беларусі. | | 2 | | | | [4]<br>[5]<br>[6]<br>[7]<br>[11]<br>[12]<br>[15]<br>[17]<br>[18]<br>[23]<br>[25]<br>[34]<br>[58] | Франтальнае апытанне. Выступленні з дакладамі і рэфератамі. |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1.4. | ***Становішча беларускіх зямель у складзе Расійскай дзяржавы (канец XVIII ст. - кастрычнік 1917г.).***<br>1.Грамадска-палітычнае становішча ў Беларусі ў першай палове XIX ст.<br>2.Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у першай палове XIX ст.<br>3.Культура Беларусі ў першай палове XIX ст.<br>4. Адмена прыгоннага прпава. Асаблівасці буржуазных рэформаў другой паловы XIX ст. у Беларусі. | 4 | | | | Мульты-медыйная прэзентацыя. | [5]<br>[6]<br>[7]<br>[18]<br>[20]<br>[26]<br>[30]<br>[39]<br>[58] | |
| 1.4.1. | 1. Паўстанне 1863-1864 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі і яго сацыяльна-зканамічныя вынікі.<br>2. Развіцё капіталізму ў другой палове XIX – пачатку XX ст.<br>3.Беларусь у перыяд буржуазна-дэмакратычных рэвалюцый 1905-1907 і Лютаўскай 1917 г.<br>4.Становішча Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны<br>5.Культура Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. | | 2 | | | | | Франтальнае апытанне. Выступленні з дакладамі і рэфератамі. |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2. | **Станаўленне беларускай дзяржаўнасці і ўмацаванне яе суверэнітэту ў XX - пачатку XXI ст.** | **8** | **10** | | | | | |
| 2.5. | ***Фарміраванне і ўмацаванне савецкай грамадска-палітычнай сістэмы ў Беларусі (кастрычнік 1917-чэрвень 1941 гг.).***<br>1. Кастрычніцкая рэвалюцыя і ўсталяванне савецкай ўлады ў Беларусі.<br>2.Фарміраване беларускай дзяржаўнасці на нацыянальна-дэмакратычнай і рэвалюцыйна-класавай асновах. | 2 | | | | Мульты-медыйная прэзентацыя. | [1]<br>[4]<br>[8]<br>[9]<br>[10]<br>[18]<br>[20]<br>[30] | |
| 2.5.1. | 1.Грамадска-палітычнае жыццё БССР у 20-30-я гг. XX ст.<br>2.БССР у гады ноавай эканамічнай палітыкі.<br>3.Калектывізацыя і індустрыялізацыя ў БССР.<br>4.Палітыка беларусізацыі. Развіццё адукацыі, навукі і культуры ў БССР у 1920-1930-я гг. | | 2 | | | | | Франтальнае апытанне. Выступленні з дакладамі і рэфератамі. |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2.6. | ***Геапалітычнае становішча Беларусі ў 20-30-я гг. ХХ ст. Заходняя Беларусь у складзе польскай дзяржавы.***<br>1.Рыжская мірная дамова ў гістарычным лёсе беларускага народа.<br>2.Грамадска-палітычнае, эканамічнае, нацыянальна-культурнае становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польскай дзяржавы.<br>3.Рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчы рух ў Заходняй Беларусі. | | 2 | | | Мульты-медыйная прэзентацыя. | [2]<br>[4]<br>[5]<br>[6]<br>[9]<br>[19]<br>[20]<br>[24] | Тэсціраванне |
| 2.7. | ***Беларусь у гады Другой сусветнай вайны і Вялікай Айчыннай вайны.***<br>1.Абвастрэнне супярэчнасцей паміж вядучымі краінамі свету напярэдадні Другой сусветнай вайны.<br>2. Пачатак Другой сусветнай вайны.<br>3.Акупацыя фашысцкай Германіяй Беларусі. Акупацыйны рэжым.<br>3. | 2 | | | | Мульты-медыйная прэзентацыя. Карта “Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны”. | [3]<br>[4]<br>[5]<br>[6]<br>[9]<br>[23]<br>[24] | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2.7.1. | 1.Баявая дзейнасць партызан і падпольшчыкаў<br>2.Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.<br>3. Вынікі вайны для беларускага народа і яго ўклад у Перамогу над фашызмам. | | 2 | | | | | Франтальнае апытанне. Выступленні з дакладамі і рэфератамі. |
| 2.8. | ***Савецкая Беларусь: дасягненні і праблемы стваральнай працы народа (1945-1991 гг.).***<br>1.Беларусь ва ўмовах супрацьборства дзвюх сацыяльна-палітычных сістэм.<br>2.Сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР у другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг.<br>3.Грамадска-палітычнае жыццё ў СССР і БССР. | 2 | | | | Мульты-медыйная прэзентацыя. Карта “Беларусь у 20-30-я гг. XX ст.” | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[10]<br>[18]<br>[20]<br>[29] | |
| 2.8.1. | 1.БССР у другой палове 1980-х гг. палітыка перабудовы і асаблівасці яе правядзення ў БССР.<br>3.Пачатак працэса дэмакратызацыі ў БССР. Змены ў духоўным жыцці.<br>2.Адукацыя, навука і культура ў БССР у другой палове 1950-х -1980-я гг. | | 2 | | | | | Франтальнае апытанне. Выступленні з дакладамі і рэфератамі. |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2.9. | ***Суверэнная Беларусь ў канцы ХХ – пачатку ХХІ ст.***<br>1.Абвяшчэнне і станаўленне дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.<br>2.Грамадска-палітычнае жыццё ў Рэспубліцы Беларусь у другой палове 1990-х гг. – пачатку ХХ ст. | 2 | | | | Мульты-медыйная прэзентацыя. Карта “Рэспубліка Беларусь”. | [1]<br>[4]<br>[5]<br>[6]<br>[10]<br>[19]<br>[20]<br>[30]<br>[39] | |
| 2.9.1. | 1.Сацыяльна-эканамічнае развіццё Рэспублікі Беларусь.<br>2.Міжнароднае становішча і знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь.<br>3.Адукацыя, навука і культура Рэспублікі Беларусь. | | 2 | | | | | Тэсціраванне |
| | **Усяго** | **18** | **16** | | | | | |

## МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ

## ЗАДАННІ ПА КІРУЕМАЙ САМАСТОЙНАЙ РАБОЦЕ (КСР)

**Тэма 1. Заходняя Беларусь у складзе польскай дзяржавы.**
**План:**

1. Рыжская мірная дамова ў гістарычным лёсе беларускага народа.
2. Грамадска-палітычнае, эканамічнае, нацыянальна-культурнае становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польскай дзяржавы.
3. Рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчы рух ў Заходняй Беларусі.

### Пытанні да праверкі ведаў:

1. Якое значэнне мела Рыжская мірная дамова для гістарычнага лёсу беларускага народа?
2. Якую палітыку праводзілі польскія ўлады на тэрыторыі Заходняй Беларусі?
3. У чым сутнасць рэформаў польскіх улад у сельскай гаспадарцы Заходняй Беларусі?
4. Хто ўзначаліў барацьбу беларускага народа супроць палякаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі?
5. Што такое ТБШ?

### Формы кантроля:

Рэфераты, напісанне рэцэнзіі на навукова-даследчыцкія артыкулы, тэставыя заданні.

### Літаратура


1. Баландзін, К.І., Хромчанка, Дз.М. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай цывілізацыі / К.І. Баландзін, Дз.М. Хромчанка. – Мінск, 2009.
2. Беларусь: страницы истории / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории; редсовет: А.А. Коваленя [и др.]. – Минск, 2011.
3. Бригадин, П.И. История Беларуси в контексте европейской истории: курс лекций. – Минск, 2007.

4. Вішнеўскі, А. Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах / А. Ф. Вішнеўскі, Я. А. Юхо. – Мінск, 2003.
5. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. / М. У. Смяховіч [і інш.] ; рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. — Мінск, 2012. – Кн. 2.
6. Каханоўскі, А. Г. Гісторыя Беларусі другой паловы XIX ст. : вучэб.-метад. дапам. / А. Г. Каханоўскі. – Мінск, 2012.
7. Ковкель, И. И. История Беларуси с древнейших времен до нашего времени / И. И. Ковкель, Э. С. Ярмусик. – Минск, 2006.
8. Новик, Е.К., Качалов, И.Л., Новик, Н.Е. История Беларуси: с древнейших времен до 2012 г. : учебное пособие. — 3-е изд., испр. и доп.  – Минск, 2012.

## Мэта і задачы самастойнай работы

Галоўная мэта – фарміраванне ў студэнтаў навыкаў да самастойнай работы з крыніцамі і навуковай літаратурай па тэмам, якія не могуць быць вынесеныя ў лекцыйны курс і на семінарскія заняткі.

*Задачы*:

- Выявіць сацыяльныя функцыігістарычнай навукі;
- Усвядоміць сутнасць гістарычных крыніц і інфармацыйныя магчымасці;
- Засвоіць агульнанавуковыя метады і іх прымяненне ў працэсе гістарычнага пазнання.

## Рэкамендацыі па выкананню заданняў паКСР.

Напісанне рэцэнзіі на навукова-даследчыцкія артыкулы

*Рэцэнзія* – гэта водгук аб артыкуле, кнізе, любой навуковай рабоце ці мастацкім творы, у якім прадстаўлены аргументаваны аналіз, адзнака і абаснаваны вынікі аб перавагах і недахопах рэцэнзуемай працы. Работа студэнта над рэцэнзіяй прадугледжвае папярэдні аналіз твора, дакладнае яго вывучэнне (падрыхтоўчы этап), а таксама асноўны этап, звязаны з *напісаннем самой рэцэнзіі.*

## Схема рэцэнзіі тэкста падручніка, кнігі ці артыкула.

1. Чаму прысвечаны тэкст? Што зацікавіла і чаму?
2. Правамернасць пастаноўкі тэмы, яе актуальнасць.

3. Што з’яўляецца самым галоўным (вылучаць асноўныя ідэі працы, аб чым яна і якая выснова вынікае з яе аналізу)?
4. Якая новая інфармацыя ці незвычайныя пазіцыі выяўлены ў тэксце?
5. Наколькі поўна раскрыта мэта даследавання?
6. Ці зразумела раскрыты змест тэкста? Якія месцы ў ім найболей цяжкія?
7. Якія пытанні ўзніклі пры чытанні? Аб чым бы хацелася даведацца дадаткова?
8. Якую выснову можна зрабіць з прачытанага?

**Складанне бібліяграфічнага агляду.**

Патрабаванні да бібліяграфічнага агляду:

1. мінімальная колькацць кніг/артыкулаў – 10адз.;
2. кожнаяя кніга/артыкул павінна суправаджацца простай анатацыяй, г.зн. каротім выкладаннем зместу кнігі/артыкула.

**Патрабаванні да рэферата.**

Рэферат павінен мець наступную структуру: тытульны ліст; змест; уводзіны; асноўную частку, якая падзяляецца на главы, раздзелы, падраздзелы; заключэнне, спіс літаратуры ў алфавітным парадку; дадатак (пры неабходнасці).

| Памер вучэбнага рэферата | Памер рэферата пры кампютэрным наборы | Памер рэферата пры напісанні ад рукі |
|---|---|---|
| | 1-12 старонак | 1-15старонак |

На *тытульным лісце* ўказваецца назва ўстановы адукацыі, прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара, назва рэферата, месца знаходжання ўстановы адукацыі, год.

*Змест рэферата* ўключае назву структурных частак, глаў, раздзелаў, падраздзелаў з указаннем нумарацыі старонак арабскімі лічбамі.

Ва *ўводзінах* даецца кароткая характарыстыка тэмы рэферата, обгрунтоўваецца яе актуальнасць, раскрываюцца мэты і задачы работы, даецца спіс літаратуры і крыніц, на падставе якіх падрыхтаваны рэферат.

У *асноўнай часцы* рэферата каротка, але поўна падаецца матэрыял па раздзелам, кожны з якіх раскрывае сваю праблему ці розныя бакі адной праблемы. Кожны зместавы блок (глава, раздзел, падраздзел) павінен мець назву.

Пры напісанні рэферата неабходна ўказваць спасылкі на крыніцы, адкуль узяты матэрыял, у скобках указваць нумар па спіску літаратуры і старонку.

*Заключэне* павінна быць кароткім, канкрэтным, у ім павінны ўтрымоўвацца высновы па выніках працы, а таксама інфармацыя аб згодзе ці незгодзе з аўтарамі цытуемых крыніц. Заключэнне не павінна перавышаць па абёму уводзіны.

Пры кампютэрным наборы неабходна выкарыстоўваць шрыфт 14 пт, інтэрвал – 1,5.

**Прыклады бібліяграфічнага апісання выкарыстаных крыниц (бібліяграфічны спіс)**

| **Характарыстыка крыніцы** | **Прыкладафармлення** |
|---|---|
| Адзін, два ці тры аўтары | Котаў, А.І. Гісторыя Беларусі і сусветная цывілізацыя / А.І. Котаў. – Мінск : Энцыклапедыкс, 2003. – 168 с. |
| Каллектыўны аўтар | Национальная стратегия устойчивого социально-экономического развития Республики Беларусь на период до 2020 г. / Нац. комис. по устойчивому развитию Респ. Беларусь ; редкол. : Л.М. Александрович и [др.]. – Минск : Юнипак, 2004. – 202 с. |
| Асобны том у шматтомным выданні | Гісторыя Беларусі: у 6 т./ рэдкал. : М. Касцюк (гал. Рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2000-2005. – Т.4 : Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XIX ст.) / М. Біч [і інш.]. – 2005. – 518 с. |
| Зборнік артыкулаў, прац | Современные аспекты изучения алкогольной и наркотической зависимости: сб. науч. ст. / НАН Беларуси, Ин-т биохимии; науч. ред. В.В. Лелевич. – Гродно, 2004. – 223 с. |
| Матэрыялы канферэнцый | Правовая система Республики Беларусь : состояние, проблемы, перспективы развития : материалы V межвуз. конф. студентов, магистрантов и аспирантов, Гродно, 21 апр. 2005 г. / Гродн. Гос. Ун-т; редкол. : О.Н. Толочко (отв. ред.) [и др.]. – Гродно, 2005. – 239 с. |

| | |
|---|---|
| Рэсурсы аддаленага доступу | Национальный Интернет-портал Республики Беларусь [Электронный ресурс] / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2005. – Режим доступа : http://www.pravo.by. – Дата доступа : 25.01.2006. |
| Складовая частка кнігі | Ескина, Л.Б. Основы конституционного строя Российской Федерации / Л.Б. Ескина // Основы права : учебник / М.И. Абдулаев [и др.] ; под ред. М.И. Абдулаева. – СПб., 2004. – С. 180–196. |
| Глава з кнігі | Николаевский, В.В. Проблемы функционирования систем социальной защиты в 1970-1980 годах / В.В. Николаевский // Система социальной защиты : теория, методика, практика / В.В. Николаевский. – Минск, 2004. – Гл. 3. – С. 119–142. |
| Складовая частка зборніка | Скуратов, В.Г. Отдельные аспекты правового режима закладных в постсоветских государствах / В.Г. Скуратов // Экономико-правовая парадигма хозяйствования при переходе к цивилизованному рынку в Беларуси: сб. науч. ст. / Ин-т экономики НАН Беларуси, Центр исслед. инфраструктуры рынка; под науч. ред. П.Г. Никитенко. – Минск, 2004. – С. 208–217. |
| Артыкулы з зборнікаў тэзісаў дакладаў і матэрыялаў канферэнцый | Пеньковская, Т.Н. роль и место транспортного комплекса в экономике Республики Беларусь / Т.Н. Пеньковская // География в XXI веке: проблемы и перспективы: материалы Междунар. нуч. конф., посвящ. 70-летию геогр. фак. БГУ, Минск, 4-8 окт. 2004 г. / Белорус. гос. ун-т, Белорус. геогр. о-во ; редкол. : Н.И. Пирожник [и др.]. – Минск, 2004. – С. 163–164. |
| Артыкул з журнала | Масляніцына, І. Жанчыны ў гісторыі Беларусі / І. Масляніцына, М. Багадзяж // Беларус. гіст. часоп. – 2005. – № 1. – С. 49–53. |
| Артыкул з газеты | Дубовик, В. Молодые леса зелены / В. Дубовик // Рэспублика. – 2005. – 19 крас. – С. 8. |
| Артыкул з энцыклапедыі, слоўніка | Аляхновіч, М.М. Электронны мікраскоп / М.М. Аляхновіч // Беларус. энцыкл.: у 18 т. – |

| | |
|---|---|
| | Мінск, 2004. –Т. 18. – Кн. 1. – С. 100. |

Узор тытульнага ліста

Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

***Назва рэферата***
***Рэферат па гісторыі Беларусі***

***Выканала: студэнтка 104 гр., фак-т прыродазнаўства Козак Е.Л.***

***Мінск 20__***

# ЛІТАРАТУРА

## Асноўная

1. Беларусь: страницы истории / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории; редсовет: А.А. Коваленя [и др.]. – Минск, 2011.
2. Бригадин, П.И. История Беларуси в контексте европейской истории: курс лекций. – Минск, 2007.
3. Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны): учеб. пособие / Под ред. А. А. Ковалени, Н. С. Сташкевича. – Минск, 2004.
4. Герб, Сцяг і Гімн Беларускай Дзяржавы = Герб, Флаг и Гимн Белорусской Державы : навукова-папулярнае выданне / аўтар тэксту А. Марціновіч. – Мінск, 2011.
5. Гісторыя Беларусі и сусветная цывілізацыя: дапам. для студэнтаў прыродазн. фак. / А. Г. Каханоўскі [і інш.]. – Мінск, 2008.
6. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветных цывілізацый: вучэб. дапам.: у 2 ч. / Пад рэд. А. А. Кавалені, В. Ф. Касовіча. – Мінск, 2005.
7. Гісторыя Беларусі: у 2 ч.: курс лекцый. / Пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. – Мінск, 2000; 2002.
8. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. / А.А. Каваленя [і інш.] ; рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск, 2011. – Кн. 1.
9. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. / М. У. Смяховіч [і інш.] ; рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. — Мінск, 2012. – Кн. 2.
10. Дзмітрачкоў, П. Ф. Беларусь у складзе Вялікага княства Літоўскага (другая палова XIII – першая палова XVII ст.). – Магілёў, 2003.
11. Исторический выбор Беларуси: лекция Президента Республики Беларусь в Белорусском государственном университете, Минск, 14 марта 2003 г. – Минск, 2003.
12. История Беларуси: учеб. пособие: в 2 ч. / Под ред. Я. И. Трещенка. – Могилёв, 2005.
13. Каханоўскі, А. Г. Гісторыя Беларусі другой паловы XIX ст. : вучэб.-метад. дапам. / А. Г. Каханоўскі. – Мінск, 2012.
14. Ковкель, И. И. История Беларуси с древнейших времен до нашего времени / И. И. Ковкель, Э. С. Ярмусик. – Минск, 2006.
15. На шляху станаўлення беларускай нацыі: гістарыяграфічныя здабыткі і праблемы / В. В. Яноўская [і інш.] ; навук. рэд. В. В. Яноўская ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск, 2011.
16. Новик, Е. К., Качалов, И. Л., Новик, Н. Е. История Беларуси: с древнейших времен до 2012 г. : учебное пособие. — 3-е изд., испр. и доп. – Минск, 2012.

17. Рэспубліка Беларусь. 20 год незалежнасці : зборнік матэрыялаў Міжнароднай навук.-практ. каферэнцыі, Мінск, 24–25 лістапада 2011 г. / рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. – Мінск, 2012.

**Дадатковая**

18. Адамушко, В. Современная геральдика Беларуси / В. Адамушко, М. Елинская ; Департамент по архивам и делопроизводству Министерства юстиции Республики Беларусь. – Минск, 2012.
19. Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2011. – Т. 2 : Л–Я.
20. Археалогія Беларусі : энцыклапедыя. У 2 т. Т. 1. А-К / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. Ю. У. Каласоўскі. – Мінск, 2009.
21. Баландзін, К.І., Хромчанка, Дз.М. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай цывілізацыі / К.І. Баландзін, Дз.М. Хромчанка. – Мінск, 2009.
22. Беларускія летапісы і хронікі. – Мінск, 1997.
24. Беларусь и война 1812 года : документы / сост. А. М. Лукашевич, Д. Л. Яцкевич ; редкол.: В. И. Адамушко (гл. ред.) [и др.]. – 2-е изд. – Минск, 2013.
25. Белоруссия в эпоху капитализма: сб. документов и материалов: в 4 т. - Минск, 1983; 1990.
26. Белоруссия в эпоху феодализма: сб. документов и материалов: в 4 т. — Минск, 1959–1979.
27. Бохан, Ю. М. Узбраенне насельніцтва беларускіх зямель у XIV–XVI стагоддзях. – Мінск, 2012.
28. Вішнеўскі, А. Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах / А. Ф. Вішнеўскі, Я. А. Юхо. – Мінск, 2003.
29. Вучэбны дапаможнік па курсу «Гісторыя Беларусі» для студэнтаў усіх форм навучання і спецыяльнасцей БДУЭіІ. – Мінск, 2006.
30. Вялікае княства Літоўскае. Энцыклапедыя: у 2 т. – Мінск, 2005; 2006.
31. Гістарычны шлях беларускай нацыі і дзяржавы. – Мінск, 2001.
32. Гісторыя Беларусі : вучэб.-метад. комплекс / склад. В.Г. Маскалёў [і інш.]. – Мінск, 2009.
33. Гісторыя Беларусі: у 6 т. – Мінск, 2000–2006. – Т. 1: Старажытная . Беларусь: ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст.; Т. 2: Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага; Т. 3: Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (ХУІІ–ХУШ стст.); Т. 4: Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.); Т. 5: Беларусь у 1917–1945 гг. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.].
34. Глушакова Н. А. Гісторыя Беларусі : вучэбна-метадычны комплекс для студэнтаў усіх факультэтаў / Н. А. Глушакова. – Горкі, 2011.
35. Довнар-Запольский, М. В. История Белоруссии. –3-е изд., испр. и доп. — Минск, 2011.

36. Иллюстрированная хронология истории Беларуси. – Минск, 1998.
37. Ігнатоўскі, У. М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. – Мінск, 1991.
38. Канфесіі на Беларусі (канец XVIII – XX ст.). – Мінск, 1998.
39. Круталевич, В. А. История Беларуси: становление национальной державности (1917–1922 гг.). – Минск, 2003.
40. Кушнярэвіч, А.М. Мураваная дабастыённая фартыфікацыя Вялікага Княства Літоўскага. – Мінск, 2011.
41. Лянцэвіч, В. М. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветных цывілізацый : курс лекцый / В. М. Лянцэвіч. – Мінск, 2012.
42. Мельник, В.А. Основы идеологии белорусского государства: учеб. пособие / В.А. Мельник. – Минск, 2011.
44. Основы идеологии белорусского государства: учеб. пособие / под общ. ред. Г. А. Василевича, Я. С. Яскевич. – Минск, 2004.
45. Очерки истории науки и культуры Беларуси. IX—XX вв. – Минск. 1996.
46. Падокшын, С. А. Беларуская думка ў кантэксце гісторыі і культуры. – Мінск, 2003.
47. Пічета, В. И. История белорусского народа. – Минск, 2003.
48. Рэлігія і царква на Беларусі: энцыклапед. даведнік. – Мінск, 2001.
49. Станаўленне і развіццё суверэннай Рэспублікі Беларусь (1991 – 2010 гг.) : матэрыялы для самастойнай працы / Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія; скл. Н. А. Глушакова. – Горкі, 2011.
50. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г: Тэкст. Даведнік. Каментарыі. – Мінск, 1989.
51. Францыск Скарына і яго час. Энцыклапедычны даведнік. – Мінск, 1988.
52. Ходзін, С. М. Гісторыя культуры Беларусі ў 1920–1930-я гг. – Мінск, 2001.
53. Хрестоматия по истории Белоруссии. С древнейших времен до 1917 г. – Минск, 1977.
54. Цітоў, А.К. Краіна майстроў : рамесныя цэхі Беларусі, 16 – канец 18 ст. – Мінск, 2013.
55. Чарняўскі, М. М. Ілюстраваная гісторыя старадаўняй Беларусі: першабытны перыяд. – Мінск, 2003.
56. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск, 1993 – 2003.
57. Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. – Мінск, 1989.
58. Юхо, Я. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: у 2 ч. – Мінск, 2000; 2003.

## ТЭМАТЫКА РЭФЕРАТЫЎНЫХ РАБОТ

1. Засяленне славянамі тэрыторыі Беларусі ў VI-IX стст.
1. Старажытны Полацк – бацька гарадоў беларускіх.
2. Рагнеда – Гарыслава – Анастасія.
3. Усяслаў Чарадзей – славуты князь Полацкай зямлі.
4. Асоба Усяслава Брачыславіча Чарадзея па раману Леаніда Дайнека “След ваўкалака”.
5. Вобразы палачан у аповесці В. Іпатавай “За морам Хвалынскім”.
6. Рэканструкцыя штодзённага жыцця насельніцтва Беларусі пачатку XIII ст. па раману Леоніда Дайнекі “Меч князя Вячкі”.
7. Прынясце хрысціянства і візантыйскі ўплыў на культуру беларускіх зямель.
8. Жыццёвы шлях і асветніцкая дзейнасць Еўфрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага.
9. Архітэктурныя збудаванні на тэрыторыі Беларусі XI – XIIIстст.
10. Крэўская унія і яе вынікі. Ягайла і Вітаўт.
11. Вялікі князь Вітаўт і яго дзяржаўна-палітычная дзейнасць.
12. Грунвальдская бітва і яе значэнне.
13. Адносіны паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Маскоўскай дзяржавай у канцы XV – першай палове XVI ст.
14. Кнігадрукаванне: Ф. Скарына і яго паслядоўнікі.
15. Беларуска-літоўскія летапісы як гістарычна-літаратурныя творы.
16. Беларусь сярэднявечча – “краіна замкаў”.
17. Культавае будаўніцтва на Беларусі ў XIII – XVI стст.
18. Паходжанне назвы “Белая Русь”.
19. Л.Сапега – дзяржаўны дзеяч сярэдневечнай Беларусі.
20. Войны сярэдзіны XVII ст. і іх уплыў на гісторыю Беларусі.
21. Берэсцкая царкоўная ўнія 1596 г. Грэка-каталіцкая царква.
22. Дзейнасць ордэна езуітаў (палітыка, адукацыя).
23. Абарончыя і культавыя збудаванні другой паловы XVI – XVIII ст.у Беларусі.
24. Палацы і палацава-паркавыя ансамблі другой паловы XVI – XVIII ст. у Беларусі.
25. Магнацкія тэатры на тэрыторыі Беларусі
26. Паўстанне пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі.
27. Вайна 1812 г. і Беларусь.

28. Тайныя студэнскія таварыствы. Дзекабрысты.
29. К. Каліноўскі. Жыццё, светапогляд, дзейнасць.
30. Рэвалюцыя 1905-1907 гг. на Беларусі.
31. Гарады і мястэчкі Беларусі ў XIX ст.
32. П.А. Сталыпін і Беларусь.
33. I сусветная вайна і Беларусь
34. Грамадска-палітычная дзейнасць газеты “Наша Ніва”.
35. Развіццё адукацыі на Беларусі ў XIX ст.
36. Стварэнне Беларускай Народнай рэспублікі. Брэсцкі мір.
37. Стварэнне БССР і Літбел.
38. Узбуйненні БССР. Канстытуцыя 1927 г..
39. Палітыка беларусізацыі ў БССР.
40. НЭП у БССР.
41. Палітыка індустрыялізацыі ў БССР.
42. Калектывізацыя ў БССР.
43. Абарончыя баі ў Беларусі (ліпень- жнівень 1941 г.).
44. Дзейнасць камсамольска-маладзёжнага падполля на акупіраванай тэрыторыі Беларусі.
45. Палітыка нямецкіх улад на акупаванай тэрыторыі.
46. Барацьба падпольшчыкаў у акупіраваным Мінску.
47. Мінскае антыфашыскае падполле.
48. Узаемадзеянне партызан і войскаў Чырвонай Арміі ў перыяд вызвалення Беларусі.
49. Злачынствы немецка-фашысцкіх акупантаў і іх памагатых на тэрыторыі Беларусі.
50. Героі Вялікай Айчыннай вайны – мае землякі.
51. Вялікая Айчынная вайна ў лёсе маёй сям’і (гісторыі малой Радзімы)
52. Дапамога народаў СССР Беларусі ў аднаўленні эканомікі рэспублікі.
53. Роля і месца БССР на міжнароднай арэне ў перыяд канфрантацыі дзвюх грамадска-палітычных сістэм у другой палове 40-х – першай палове 80-х гг. XXст.
54. Жыццё і дзейнасць П.М. Машэрава.
55. Роля навукі ў развіцці прамысловай вытворчасці БССР у 60-пачатку 80-х гг.
56. Вышэйшая адукацыя ў Беларусі (50-х – першай палове 80-х гг).
57. Творчасць выдатных дзеячаў культуры (З. Азгур, М. Савіцкі і інш.).
58. Развіццё архітэктуры ў БССР (50-я – першая палова 80-х гг.)

59. Асаблівасці развіцця беларускага тэатра ў 50-х – першай палове 80-х гг.
60. Беларуская музычная культура.
61. Рэспубліка Беларусь у сістэме міжнародных адносін.
62. Утварэнне незалежнай Рэспублікі Беларусь.
63. Беларуская дыяспара ў краінах блізкага і далёкага замежжа.
64. Чарнобыльская аварыя: вынікі і шляхі пераадолення на Беларусі.

## ПРЫКЛАДНЫЯ ПЫТАННІ

## ДА ЭКЗАМЕНА ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

1. Прадмет, задачы і змест курса “Гісторыя Беларусі”. Крыніцы. Перыядызацыя гісторыі Беларусі.
2. Найстаражытнае насельніцтва на тэрыторыі беларускіх зямель (каменны, бронзФавы і ранні жалезны вякі).
3. Балты і славяне ў VI – VIII стст. Паселішчы на тэрыторыі Беларусі. Гаспадарка. Гандаль. Рамёствы. Жыццё і заняткі. Вераванні старажытных балтаў і славян.
4. Усходнеславянскія саюзы плямён (крывічы-палачане, дрыгавічы, радзімічы).
5. Старажытная (Кіеўская) Русь – супольная дзяржава ўсходніх славян. Полацкае княства ў X – XII стст. Адносіны з іншымі княствамі Кіеўскай Русі. Усяслаў (Брачыслававіч) Чарадзей.
6. Полацкая зямля ў XII – сярэдзіне XIII стст. Феадальная раздробленасць. Менскае княства. Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель.
7. Тураўскае княства ў X - сярэдзіне XIII ст. Адносіны з Кіевам. Тураўскі князь Юрый Яраслававіч. Сацыяльна-эканамічнае развіццё.
8. Знешняя небяспека для беларускіх зямель ў першай палове XIII ст. Барацьба з крыжацкай агрэсіяй і мангола-татарскай пагрозай.
9. Язычніцкія вераванні. Вынікі і значэнне ўвядзення хрысціянства на беларускіх землях.
10. Культура беларускіх зямель IX – сярэдзіны XIII ст. Архітэктура. Мастацтва. Пісьменнасць. Помнікі пісьменства. Рэлігійна-асветніцкія дзеячы Еўфрасіння Полацкая і Кірыла Тураўскі.

11. Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя перадумовы ўтварэння Вялікага Княства Літоўскага. Навагрудскае княства. Міндоўг. Барацьба з крыжакамі.
12. Цэнтралізатарская палітыка і ўмацаванне ўлады вялікіх князёў літоўскіх ў XIV ст. Рост тэрыторыі ВКЛ. Гедымін. Альгерд.
13. Дынастычная барацьба ў Вялікім княстве Літоўскім у другой палове XIV ст. Крэўская ўнія. Ягайла. Кейстут. Вітаўт.
14. Дзяржаўны лад і кіраванне ў ВКЛ у XIII - XIV стст. Гаспадарчае жыццё. Гарады. Рамёствы.
15. Войска і вайсковая справа ў ВКЛ. "Вялікая вайна" і Грунвальдская бітва. Вынікі і значэнне Грунвальдскай бітвы. Суперніцтва з Маскоўскай дзяржавай.
16. Дзяржаўны лад ВКЛ у XV – сярэдзіне XVI стст. Рада і сойм. Вышэйшыя дзяржаўныя і мясцовыя пасады ў ВКЛ. Заканадаўства. Статуты ВКЛ.
17. Сельская гаспадарка і гарадское жыццё на беларускіх землях у XV – першай палове XVII ст. Землеўладанне і землекарыстанне. Станаўленне фальварка-паншчыннай сістэмы гаспадарання. "Валочная памера" 1557 г. Этапы запрыгоньвання сялян.
18. Гарады і замкі на беларускіх землях у XV – першай палове XVII ст. Магдэбургскае права. Гарадское рамяство. Цэхі. Унутраны і знешні гандаль.
19. Царква і рэлігія на беларускіх землях у канцы XV – першай палове XVI ст. Рэлігійная талерантнасць. Асаблівасці развіцця духоўнай культуры. Архітэктура. Мастацтва. Літаратура. Рэнесанс. Мікола Гусоўскі. Францыск Скарына.
20. Фарміраванне беларускага этнасу і яго тэрыторыі ў XIV – XV стст. Эканамічныя і палітычныя фактары кансалідацыі беларускага этнасу (народнасці). Паходжанне назвы "Белая Русь".
21. Люблінская унія 1569 г. і ўтварэнне Рэчы Паспалітай. Умовы аб'яднання Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага. Статус ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай.
22. Дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай. Сейм і кароль Рэчы Паспалітай. "Залатыя вольнасці" шляхты. ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай. Галоўны Трыбунал ВКЛ. III Статут ВКЛ.
23. Рэфармацыя і Контррэфармацыя на тэрыторыі Беларусі ў XVI – XVII стст. Кальвінізм. Арыянства. Дзеячы рэфармацыі (Мікалай Радзівіл Чорны, С. Будны, В. Цяпінскі). Дзейнасць ордэна езуітаў у Беларусі. П. Скарга.

24. Брэсцкая царкоўная ўнія. Брэсцкі царкоўны сабор 1596 г. і яго значэнне. І. Кунцэвіч. Пашырэнне ўніяцтва сярод сельскага насельніцтва і гарадскіх нізоў.
25. Прычыны казацка-сялянскай вайны 1648-1651 гг. на беларускіх землях. Багдан Хмяльніцкі. Вайна Расіі і Рэчы Паспалітай 1654-1667 гг. Беларусь у Паўночнай вайне. Бітва каля вёскі Лясная. Вынікі і наступствы войнаў другой паловы XVII – пачатку XVII стст.
26. Эканамічны стан беларускіх зямель у XVII–XVIII стст. Аднаўленне сельскай гаспадаркі пасля ваеннага ліхалецця другой паловы XVII – пачатку XVII ст. Паўстанне сялян пад кіраўніцтвам В. Вашчылы ў Крычаўскім старостве (1740-1744 гг.), яго прычыны, ход і вынікі.
27. Палітычны стан беларускіх зямель у XVII–XVIII стст. Пашырэнне шляхецкай анархіі. Канфедэрацыі. Недзеяздольнасць сейма Рэчы Паспалітай. “Ліберум вета”. Дысідэнцкае пытанне.
28. Палітычны крызіс Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст. Канстытуцыя 3 мая 1791 г. Першы (1772 г.) і другі (1793 г.) падзелы Рэчы Паспалітай. Паўстанне 1794 г. і яго падзеі ў Беларусі. Т. Касцюшка. Я. Ясінскі. Трэці падзел Рэчы Паспалітай (1795 г.).
29. Гістарычныя ўмовы развіцця культуры беларускага народа ў XVII – XVIII стст. Стан школьнай асветы і выхавання. Адукацыйная камісія. Развіццё навукі: К Нарбут, М. Карповіч, А. Нарушэвіч, М. Пачобут-Адляніцкі.
30. Літаратура і мастацтва ў другой палове XVIII ст. Усталяванне польскай пісьмовай традыцыі ў літаратуры. Друк. “Газета Гродзенска”. Палацава-замкавае будаўніцтва. Прыгонны тэатр. Віленская мастацкая школа.
31. Асноўныя напрамкі палітыкі самадзяржаўя ў Беларусі ў першай палове XIX ст. Падзел тэрыторыі беларускіх зямель на губерні. Саслоўная палітыка расійскага ўрада. Падаткі і павіннасці сялян.
32. Беларусь у вайне 1812 г. Становішча насельніцтва Беларусі падчас вайны. Акупацыйны рэжым. Бітва на р. Беразіна. Вынікі вайны для Беларусі.
33. Грамадска-палітычны рух на беларускіх землях у першай трэці XIX ст. Філаматы. Філарэты. Дзекабрысты. “Таварыства ваенных сяброў”. Паўстанне 1830–1831 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі і яго наступствы.
34. Стан сельскай гаспадаркі Беларусі ў першай палове XIX ст. Рэформа П. Кісялёва ў дзяржаўнай вёсцы (1840-1857 гг.). Правядзенне інвентарнай рэформы ў памешчыцкай вёсцы (1844-1857 гг.). Прамысловасць. Гандаль. Гарады і мястэчкі.

35. Адукацыя, навука і культура Беларусі ў першай палове XIX ст. Тыпы школ. Віленскі ўніверсітэт. Станаўленне навуковых ведаў пра Беларусь і беларускі народ. Станаўленне беларускай літаратурнай мовы. Жывапіс. Тэатр. Музыка.
36. Адмена прыгоннага права ў Беларусі. Маніфест і Палажэнні 19 лютага 1861 г. , парадак іх прымянення ў Беларусі. Рэакцыя сялянства на рэформу. Вынікі і значэнне рэформы 1861 г. Сельская гападарка і прамысловасць Беларусі пасля адмены прыгоннага права.
37. Паўстанне 1863 – 1864 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі. Прычыны і характар паўстання. "Чырвоныя і белыя". К. Каліноўскі. Уплыў паўстання на ўмовы вызвалення сялян беларускіх губерняў ад прыгону.
38. Буржуазныя рэформы (земская, гарадская, судовая і інш.) 60–70-х гг. XIX ст.: асаблівасці іх правядзення ў Беларусі. Палітыка расійскага ўрада па нацыянальна-рэлігійным пытанні. Заходнерусізм.
39. Грамадска-палітычнае жыццё Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. Сялянскі і рабочы рух. Рэвалюцыйныя народнікі. Група "Гоман". Сацыял-дэмакраты. Утварэнне Беларускай сацыялістычнай грамады.
40. Беларусь у часы першай рускай рэвалюцыі 1905-1907 гг. Прычыны, пачатак і ход рэвалюцыі. Маніфест 17 кастрычніка 1905 г. і яго вынікі для Беларусі. Дзяржаўная Дума. Беларускі нацыянальны рух.
41. Сталыпінскія рэформы і іх ажыццяўленне ў Беларусі. Прычыны і мэты аграрнай рэформы. Увядзенне земстваў.
42. Беларусь у часы Першай сусветнай вайны. Акупацыя заходняй часткі Беларусі. Становішча насельніцтва. Беларускі нацыянальны рух.
43. Умовы і асаблівасці фарміравання беларускай нацыі. Этнічная тэрыторыя. Нацыянальны і сацыяльны склад насельніцтва. Агульнасць гаспадарчага жыцця. Нацыянальная самасвядомасць.
44. Адукацыя, навука і культура Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Пачатковыя школы і сярэдняя адукацыя. Навуковае вывучэнне этнаграфіі і мовы беларускага народа. Беларуская літаратура. Тэатр. Жывапіс.
45. Лютаўская і Кастрычніцкая рэвалюцыі 1917 г. Усталяванне Савецкай ўлады ў Беларусі. Аблвыканкамзах. Палітыка ваеннага камунізму і асаблівасці яе правядзення ў Беларусі.
46. Станаўленне беларускай дзяржаўнасці. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР). Утварэнне Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусь (ССРБ). Канстытуцыя ССРБ 1919 г. Утварэнне Літоўска-Беларускай ССР (ЛітБел).

47. Беларуская дзяржаўнасць ва ўмовах грамадзянскай вайны. Польска-савецкая вайна 1919-1920 гг. Дэкларацыя аб абвяшчэнні незалежнасці ССРБ 31 ліпеня 1920 г. Рыжскі мірны дагавор (18.03.1921) і яго вынікі для Беларусі.
48. НЭП у Беларусі. Пераход да новай эканамічнай палітыкі (сакавік 1921 г.). Уплыў нэпа на развіццё сельскай гаспадаркі, прамысловасці і транспарту.
49. Грамадска-палітычнае жыццё БССР у 20-30-я гг. XX ст. Удзел БССР ва ўтварэнні СССР. Канстытуцыі БССР 1927 і 1937 гг.
50. Адукацыя, навука і культура ў БССР у 20-я – 30-я гг. XX ст. Станаўленне і развіццё сістэмы адукацыі ў БССР. Даследаванне беларускага этнасу, яго гісторыі і культуры. Утварэнне Беларускай акадэміі навук. Літаратура. Тэатр. Кіно.
51. Індустрыялізацыя ў савецкай Беларусі. Стварэнне планавай дзяржаўнай эканомікі. Калектывізацыя сельскай гаспадаркі БССР. Вынікі калгаснага будаўніцтва.
52. Заходняя Беларусь ў складзе Польскай дзяржавы (1921-1939 гг.). Умовы жыцця беларускага насельніцтва. Рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчы рух ў Заходняй Беларусі. Беларуская сялянска-рабочая грамада. Б. Тарашкевіч. Культура.
53. БССР у пачатку Вялікай Айчыннай вайны.
54. Акупацыйны рэжым тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.
55. Антыфашысцкая барацьба на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.
56. Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.
57. Аднаўленне народнай гаспадаркі і грамадска-палітычнае жыццё БССР пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны. Калектывізацыя ў заходніх абласцях Беларусі.
58. Адраджэнне і развіццё адукацыі, навукі, літаратуры і мастацтва пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны. Увядзенне 7-гадовага навучання. Беларуская навука. Тэма вайны у творчасці беларускіх літаратараў і мастакоў.
59. Грамадска-палітычнае жыццё Беларусі ў другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг. “Адліга”. Кіруючая роля Камуністычнай партыі. К. Т. Мазураў. П. М. Машэраў. Саветы, камсамол, прафсаюзы ў грамадска-палітычным жыцці.
60. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг. Фарміраванне прамысловага комплексу БССР. Эканамічная

рэформа 1965 г. Замаруджванне тэмпаў росту эканомікі і сацыяльнай сферы ў першай палове 1980-х гг. Узровень жыцця народа.

61. Спробы паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця БССР у другой палове 1980-х гг. Палітыка перабудовы ў СССР. Пачатак працэсу дэмакратызацыі ў БССР.
62. Развіццё адукацыі і навукі ў другой палове 1950-х – 1980-я гг. Рэформа школы і пераход да 8-гадовага навучання. Увядзенне ўсеагульнай сярэдняй адукацыі. Прафесійна-тэхнічнае навучанне. ВНУ. Дасягненні беларускай навукі.
63. Беларуская літаратура ў другой палове 1950-х – 1980-я гг. Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў творах І. Шамякіна, В. Быкава, А. Адамовіча. Творчасць І. Мележа, У. Караткевіча. Беларуская паэзія: Р. Барадулін, Н. Гілевіч.
64. Тэатральнае, музычнае і выяўленчае мастацтва ў другой палове 1950-х – 1980-я гг. Культурна-гістарычная спадчына Беларусі ў беларускім мастацтве. Выяўленчае мастацтва. Жывапіс. Кіно. Скульптура.
65. Абвяшчэнне і ўмацаванне дзяржаўнага суверэнітэту Беларусі. Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР. Белавежскае пагадненне. Стварэнне СНД. Прыняццё Канстытуцыі і ўвядзенне пасады Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Рэспубліканскі рэферэндум 1995 г. і яго вынікі.
66. Эвалюцыя палітычнай сістэмы ў Рэспубліцы Беларусь у другой палове 1990-х. гг. – пачатку XXI ст. Рэспубліканскі рэферэндум 1996 г. і яго вынікі. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 г. (са змяненнямі і дапаўненнямі). Асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы.
67. Эканамічныя пераўтварэнні, пераадоленне крызісу і пераход да ўстойлівага росту ў другой палове 1990-х. гг. – пачатку XXI ст. Распрацоўка беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця. Сацыяльна арыентаваная рыначная эканоміка.
68. Беларусь у інтэграцыйных працэсах на постсавецкай прасторы. Эканамічная інтэграцыя з Расіяй і краінамі СНД. Саюз Беларусі і Расіі. Падпісанне дагавора паміж Беларуссю і Расіяй аб стварэнні саюзнай дзяржавы. Таможанны саюз з Расіяй і Казахстанам.
69. Знешнепалітычная дзейнасць Беларусі (1991-2014 гг.). Прыярытэты знешнепалітычнага курсу Рэспублікі Беларусь. Дзейнасць Беларусі ў ААН. Шматвектарнасць знешняй палітыкі Беларусі.

70. Адукацыя, навука і культура Рэспублікі Беларусь (1991-2012 гг.). Нацыянальная сістэма адукацыі. Развіццё беларускай навукі. Літаратура. Выяўленчае мастацтва. Тэатральнае і музычнае жыццё. Беларускі спорт.